M. Касцюк

# БАЛЬШАВІЦКАЯ СІСТЭМА ЎЛАДЫ НА БЕЛАРУСІ

Экаперспектыва

М. Касцюк

# Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі

Мінск ВП "Экаперспектыва" 2000

УДК 947.6
ББК 63.3(4Беи)
К28

**Касцюк М.**

К28 Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. — Мн.: ВП "Экаперспектыва", 2000. — 308 с.

ISBN 985-6102-30-8.

У кнізе раскрываецца сутнасць таталітарнай формы кіравання сацыяльна-эканамічнымі, грамадска-палітычнымі, культурнымі працэсамі, прычыны і этапы ўсталявання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, яе ўкараненне ў розныя сферы жыцця савецкага, у тым ліку беларускага грамадства. Адлюстраваны стваральныя і адмоўныя бакі гэтай формы праўлення, метады дасягнення пастаўленых мэт, паказаны спробы пераадолення з сярэдзіны 50-х гадоў некаторых праяў таталітарызму і іх непаслядоўны характар.

Разлічана на навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 985-6102-30-8**

© М. Касцюк, 2000

# УСТУП

Гісторыя Беларусі — складаная і супярэчлівая, у якой разам са стваральнымі шмат трагічных старонак. Гэта характэрна як для старажытных часоў, сярэднявечча, так і для Новага, а таксама Навейшага часу. Ды наша гісторыя іншай і быць не магла, таму што ў многім яе вызначала геапалітычнае становішча Беларусі. Яе насельнікаў закраналі як стваральныя павевы з боку суседніх народаў, так і разбуральныя набегі захопнікаў.

У поўнай ступені гэта адносіцца і да перыяду, які завецца савецкім. Нягледзячы на пастаянныя, у многім дэкларатыўныя заявы вышэйшых партыйных і дзяржаўных органаў і іх кіраўнікоў, шматлікую гуманітарную, у тым ліку гістарычную літаратуру, дзе дадзены час падаваўся як самы шчаслівы для беларускага народа, гэта была далёка не ўся праўда. Да таго ж многія старонкі нашай больш аддаленай мінуўшчыны былі невядомыя ці малавядомыя. Яны ці свядома замоўчваліся, ці падаваліся так, як гэта было неабходна партыйна-дзяржаўнай уладзе.

У выніку мы мелі моцна ідэалагізаваную, аднабокую і няпоўную гісторыю. Многія нашы суайчыннікі адчувалі ці нават ведалі гэта. Таму афіцыйныя гістарычныя даследаванні не карысталіся попытам у шырокага кола чытачоў. Гістарычныя кнігі выходзілі абмежаванымі тыражамі і былі набыткам навукоўцаў-прафесіяналаў, выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў, настаўнікаў, некаторых іншых асоб, каму ў сваёй працы трэба было выкарыстоўваць гэту фактычна афіцыйную па сваймy характару літаратуру. Такое становішча, што склалася на працягу дзесяцігоддзяў, здавалася звычайным і неабходным.

І толькі дзякуючы маштабным сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным зменам другой паловы 80—90-х гадоў, пры ўсёй глыбіні крызісу, які ахапіў *літаральна* ўсе бакі жыцця, адбыўся сапраўдны прарыў

у гістарычных ведах. Ён закрануў практычна ўсе асноўныя перыяды гісторыі нашай Бацькаўшчыны, у тым ліку і савецкі час. Пачалося інтэнсіўнае пераасэнсаванне многіх праблем і запаўненне шматлікіх так званых "белых плям". Публікацыі, у якіх асвятляліся новыя гістарычныя сюжэты ці ўдакладняліся ранейшыя, пачалі карыстацца нябачаным дагэтуль попытам вялікай аўдыторыі чытачоў. Цікавасць да гістарычных ведаў рэзка ўзрасла. Яна была скіравана перш за ўсё на тыя тэмы, якія да гэтага часу фактычна не асвятляліся ў гістарычнай ці іншай гуманітарнай літаратуры, — беларускі нацыянальны рух, рэпрэсіўная палітыка бальшавіцкай улады, гісторыя царквы і інш. Ранейшыя ўяўленні аб шмат якіх баках жыцця сталі пераасэнсоўвацца з улікам тых новых матэрыялаў, да якіх гісторыкі ў рэшце рэшт атрымалі пэўны доступ. Гэта датычылася гісторыі грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі, працэсу ажыццяўлення калектывізацыі, найбольш трагічных старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Усё гэта змяніла ўяўленне як гісторыкаў і даследчыкаў гуманітарных навук у цэлым, так і найбольш дасведчанай часткі чытачоў аб гісторыі беларускага народа ў савецкі перыяд, аб сутнасці савецкай дзяржавы, яе характары, наогул аб савецкай сістэме кіравання грамадствам, што ўвесь час рэкламавалася як самая дэмакратычная ў свеце. Яна ўсё больш пачала разглядацца не толькі як бюракратычная, аўтарытарная, дыктатарская, але нават як таталітарная. Для даследчыкаў гістарычных працэсаў, у тым ліку гісторыкаў маладых суверэнных дзяржаў, што ўзніклі на тэрыторыі былога СССР, гэта стала сапраўдным адкрыццём, чаго нельга сказаць аб навукоўцах у іншых краінах.

Яны мелі значна большыя магчымасці быць бліжэй да ісціны, якая заключаецца ў вядомым выразе Спінозы: "Non ridere, non jugere, negue delestari, sed intellegere", што азначае: "Не смяяцца, не сумаваць, не праклінаць, а толькі разумець". Такі падыход праяўляўся ў творчасці заходніх даследчыкаў значна больш, чым у савецкіх, у вывучэнні многіх праблем, у тым ліку такой з'явы, як таталітарызм. Толькі ў апошні час гісторыкі і іншыя даследчыкі ў галіне гуманітарных навук, сярод іх і беларускія, звярнулі ўвагу на праблему таталітарызму. У тым, што гэта з'ява мела месца ў нашай гісторыі XX ст., цяпер сумнявацца не даводзіцца. Дадзены факт

адмаўляюць толькі тыя, хто па палітычных ці маральна-псіхалагічных прычынах не ў стане рэагаваць на рэаліі цяперашняга часу, застаецца ў мінулым, не можа ці не хоча імкнуцца да асэнсавання сапраўднай гісторыі.

Аб'ектыўныя даследчыкі, за якімі, несумненна, будучае, каб паказаць сутнасць таталітарызму, звяртаюць увагу на тое, што ў 20—40-я гады XX ст. характэрнай рысай сусветнага развіцця з'яўляліся супярэчнасць і нават канфлікт паміж дэмакратыяй і таталітарызмам. Як няцяжка нам, былым савецкім гісторыкам, прызнаваць агульнасць шмат якіх рыс пры характарыстыцы ў першую чаргу сталінскай сістэмы кіравання грамадствам з таталітарнымі рэжымамі, але гэта відавочна, таму што пацвярджаецца распаўсюджаннем у СССР такіх рыс таталітарных рэжымаў, як наяўнасць пануючай ідэалогіі, поўнага кантролю з боку партыі, савецкіх, у тым ліку карных органаў за ўсімі бакамі жыцця грамадства, шырокае выкарыстанне рэпрэсій для барацьбы не толькі з яўнымі, але і магчымымі патэнцыяльнымі праціўнікамі існуючага рэжыму, высокая цэнтралізацыя кіравання сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным, культурным жыццём і г.д.

Пад дадзеную сістэму кіравання грамадствам была падведзена адпаведная матэрыяльная база. У першую чаргу яна заключалася ў тым, што ўсю зямлю савецкая дзяржава фактычна забрала сабе ва ўласнасць, а тыя, хто на ёй працаваў, ператварыліся толькі ў землекарыстальнікаў. Тое ж самае было зроблена ў адносінах да прамысловасці і транспарту, дзе заводы і фабрыкі, усе шляхі зносін і камунікацый таксама сталі належаць толькі дзяржаве. Калі браць пад увагу, што ўсё эканамічнае жыццё вялося на аснове жорсткага дзяржаўнага планавання, то будзе яшчэ больш зразумелым, што ўсе рычагі ўздзеяння на грамадства знаходзіліся ў партыйных і дзяржаўных структурах. Гэтыя структуры ў сваю чаргу былі поўнасцю падпарадкаваны вярхоўнаму кіраўніцтву. Абапіраючыся на прынцып "дэмакратычнага" цэнтралізму, яно канцэнтравала ў сваіх руках неабмежаваную партыйна-дзяржаўную ўладу.

Да таго ж у аснове таталітарнай сістэмы ў СССР ляжалі сацыяльна-класавыя падыходы. З улікам гэтага перавага аддавалася пралетарскім элементам, уласная маёмасць якіх была зведзена да мінімуму. Той, хто да іх не адносіўся, не мог разлічваць на

лаяльнасць з боку савецкай улады. Класавы прынцып у вырашэнні розных пытанняў сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця быў абсалютызаваны. Гэтыя абсалютызаваныя і нярэдка абсурдныя падыходы самым непасрэдным чынам адлюстроўваліся на лёсах мільёнаў людзей. Усё гэта разам з іншымі праявамі савецкай рэчаіснасці (аб чым пойдзе гаворка далей) утварыла таталітарную сістэму, што на працягу дзесяцігоддзяў дзейнічала ў краіне.

У яе аснове ляжала аднапартыйнае праўленне, якое па меры свайго ўмацавання выключала альтэрнатыўныя падыходы, плюралізм думак, крытыку тых ці іншых напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, рашэнняў і дзеянняў, нават калі яны былі няправільнымі. Наданне адной партыі, якая мела жорсткую дысцыпліну і безумоўнае падпарадкаванне па іерархічнай лесвіцы, кіруючай ролі ў развіцці грамадства давала ў рукі вярхоўнага кіраўніцтва неабмежаваную і бескантрольную ўладу.

Хаця гэта ўлада ўвесь час называлася савецкай, аднак саветы ўсіх узроўняў былі падпарадкаваны адпаведным партыйным камітэтам. Іх рашэнні прадвызначаліся партыйнымі ўстаноўкамі. Рэальнай улады саветы не мелі, яны з'яўляліся толькі выканаўцамі партыйных рашэнняў. Таму фактычна, на самай справе, у рэальным жыцці ўлада ў краіне, у тым ліку ў Беларускай ССР, была партыйнай.

Як вядома, да XIX з'езда УКП(б), які адбыўся ў 1952 г., у назве Усесаюзнай кампартыі прысутнічала слова "бальшавікоў". К гэтаму тэрміну таталітарная сістэма ў СССР не толькі сфарміравалася, была ўмацавана, але і набыла ў часы сталінскага праўлення свае найбольш выразныя характарыстыкі, дасягнуўшы класічных і нярэдка адыёзных праяў. Слова "бальшавік" мела ў гэты час шырокае распаўсюджанне як у афіцыйных дакументах, так і ў паўсядзённым жыцці. Таму ёсць усе падставы называць таталітарную сістэму ў СССР прымяняльна да дадзенага перыяду бальшавіцкай.

Разам з тым калі ў наступныя дзесяцігоддзі паступова, супярэчліва, непаслядоўна пераадольваліся крайнасці сталінскага праўлення, а слова "бальшавік" стала набыткам гісторыі, у аснове таталітарнай сістэмы ў СССР працягвала заставацца дамінуючая роля партыі ва ўсіх сферах жыцця. Яна па-ранейшаму

з'яўлялася станавым хрыбтом праўлення, а саветы былі падпарадкаваны ёй ва ўсіх адносінах. Толькі тэарэтычна ў рашэннях, якія прымаліся, іх значэнне павышалася. Але на практыцы гэтыя органы народнага прадстаўніцтва, як і раней, заставаліся толькі выканаўцамі партыйнай лініі і прынятых на розных партыйных узроўнях рашэнняў.

Аднак выраз "савецкая таталітарная сістэма" ў апошнія гады ўсё больш уваходзіць у гуманітарную, у тым ліку гістарычную літаратуру. На погляд аўтара, ён можа выкарыстоўвацца з улікам вышэй адзначанай акалічнасці — бясспрэчнага прыярытэту партыі перад саветамі. У савецкія часы на практыцы гэта з'яўлялася адной з асноўных характарыстак сістэмы ўлады ў СССР. Дадзеная асаблівасць абумовіла назву прапанаванай чытачу манаграфіі.

Асновы бальшавіцкага праўлення, як вядома, былі закладзены ў першыя гады існавання пралетарскай дыктатуры, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, ва ўмовах палітыкі ваеннага камунізму. І хаця тады склаліся спецыфічныя ваенныя абставіны, але сфарміраваныя ў дадзены час прынцыпы кіравання грамадствам знайшлі потым прадаўжэнне і ў перыяд мірнага будаўніцтва. Паказальна, што савецкая ўлада на працягу значнага часу так і не змагла адысці ад метадаў кіраўніцтва, закладзеных у пачатку яе існавання, ва ўмовах ваенна-рэвалюцыйнай дыктатуры.

Таталітарныя спосабы ўздзеяння на жыццё грамадства некалькі адступілі толькі ў сувязі з вымушаным увядзеннем новай эканамічнай палітыкі (НЭПа). Перш за ўсё гэта праявілася ў эканамічным і культурным жыцці. Што датычыцца грамадска-палітычнай сферы, то тут адступленне адзначалася менш за ўсё. Гарантам такога становішча з'яўлялася манапольнае праўленне бальшавіцкай партыі, якое ўсё больш нарастала.

Аднак ужо ў 20-я гады партыйна-дзяржаўнай уладай ствараліся ўмовы для ўзмацнення таталітарных тэндэнцый фактычна ва ўсіх галінах жыцця. Эканоміка ўсё больш трапляла пад партыйна-дзяржаўны кантроль. Тая ж тэндэнцыя наглядалася і ў культурным будаўніцтве. Яшчэ больш узмацніўся нагляд з боку партыі і дзяржавы за грамадска-палітычнай сферай. У выніку закладваліся асновы для нарастання таталітарнага праўлення.

Дадзены працэс быў завершаны ў першай палове 30-х гадоў, калі гэтыя тэндэнцыі прывялі да фарміравання культу асобы — неабходнага атрыбута таталітарнай сістэмы. З яго стварэннем фактычна завяршыўся працэс усталявання ў Савецкім Саюзе, у тым ліку ў Беларускай ССР, таталітарнага рэжыму. Праяўлялася гэта ва ўсім, пачынаючы ад татальнага кантролю ў сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці і канчваючы імкненнем пранікнуць у розум і душу кожнага чалавека, каб падпарадкаваць іх агульным канонам жыцця.

Увесь астатні час праўленне Сталіна характарызавалася ўзмацненнем таталітарнай накіраванасці. Гэта мела месца ў другой палове 30-х гадоў і яшчэ ў большай ступені аб гэтым можна гаварыць у адносінах да спецыфічных умоў Вялікай Айчыннай вайны, калі таталітарныя метады ў спалучэнні з ваеннымі абставінамі былі даведзены да крайніх праяў. У пасляваенны перыяд сталінскага праўлення таталітарныя спосабы кіравання яшчэ больш замацаваліся і фактычна закасцянелі ва ўсіх сваіх кампанентах.

Палітычная "адліга" другой паловы 50-х — першай паловы 60-х гадоў у некаторай ступені садзейнічала падрыву таталітарнай сістэмы. Аднак праведзеныя зверху рэформы ў розных галінах жыцця закранулі толькі некаторыя яго бакі, а не глыбінныя асновы таталітарызму.

Наступнае дваццацігоддзе характарызавалася адступленнем у многіх адносінах ад праведзеных рэформаў і вяртаннем на неасталінісцкія пазіцыі. Пры адноснай дэмакратызацыі жыцця таталітарная сістэма захоўвалася ва ўсіх сваіх асноўных характарыстыках. Рэформы другой паловы 60-х гадоў пры ўсёй іх неабходнасці так і не былі даведзены да канца.

Толькі з сярэдзіны 80-х гадоў паступова пачаўся адыход ад найбольш характэрных праяў таталітарнага праўлення — звышвысокай цэнтралізацыі кіравання сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыццём. Наступіла пэўная дэмакратызацыя грамадства, большая яго адкрытасць у міжнародных справах. Гэты працэс, пачаты па ініцыятыве вярхоўнага кіраўніцтва партыі і дзяржавы, пайшоў у шырокія пласты народа, што вельмі яго ўзмацніла і прывяло да неабходнасці рэфармавання жыцця ўсяго грамадства.

Аднак адсутнасць навукова абгрунтаванай канцэпцыі пераўтварэнняў, непаслядоўнасць дзеянняў партыйна-дзяржаўных улад прывялі ў пачатку 90-х гадоў да глыбокага крызісу практычна ва ўсіх сферах.

У дадзеных умовах таталітарная сістэма кіравання была істотна падарвана, аднак да канца ўсё ж не пераадолена. Яе рэцыдывы сустракаюцца ў шмат якіх краінах, што ўзніклі на абшарах былога СССР.

Гэта ўвогуле заканамерна, таму што ў грамадскім развіцці заўсёды прысутнічае інерцыйнасць. Яна звязана з тым, што практычна немагчыма ў кароткі тэрмін якасна змяніць не толькі прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны, але і свядомасць кансерватыўнай часткі грамадства, якая імкнецца максімальна захаваць мінулае, хаця яно ў пэўных адносінах і дыскрэдытавана.

Беларусь як ні адна іншая рэспубліка былога СССР была моцна прывязанай да Цэнтра. Гэтаму садзейнічала не толькі этнічная блізкасць беларусаў да асноўнай нацыянальнай супольнасці краіны — рускіх, слаба выяўленая нацыянальная адметнасць і самасвядомасць беларускага народа, але і мэтанакіраваная палітыка цэнтральных улад да як мага больш цеснай залежнасці Беларускай ССР ад саюзных структур.

Пры гэтым не магло не ўлічвацца геапалітычнае становішча Беларусі, яе непасрэдная блізкасць да краін Цэнтральнай Еўропы, што рабіла нашу рэспубліку важным заходнім фарпостам усёй дзяржавы. Каб фарпост быў мацнейшым, значная ўвага надавалася яго эканамічнаму развіццю, ідэалагічнай апрацоўцы насельніцтва, умацаванню ўсіх кампанентаў таталітарнай сістэмы.

Усё гэта рабіла Беларускую ССР важным звяном бальшавіцкага таталітарызму, што адыгрывала істотную ролю не толькі ва ўнутранай палітыцы дзяржавы, але выконвала і міжнародную функцыю, якая ўзмацнілася пасля Вялікай Айчыннай вайны, калі Беларуская ССР стала адной з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

На працягу савецкага перыяду сваёй гісторыі Беларусь не толькі зрабіла істотны крок наперад у эканамічным, сацыяльным і культурным развіцці, але і ў поўнай меры зведала ўціск таталітарнага праўлення — ад жорсткай цэнтралізацыі ўсіх бакоў жыцця, безумоўнага падпарадкавання саюзным партыйным і дзяр-

жаўным органам да масавых палітычных неабгрунтаваных рэпрэсій, што хвалямі абрушваліся на розныя пласты беларускага грамадства ці на ўсё насельніцтва цалкам. Да таго ж грамадзянская і асабліва Вялікая Айчынная войны сталі жахлівым выпрабаваннем, аднымі з найбольш трагічных старонак нашай гісторыі, якія шмат прыбавілі ў агульную скарбонку народнага гора. Падчас апошняй вайны Беларусь панесла вельмі цяжкія страты — не далічылася больш чым кожнага чацвёртага свайго жыхара.

Так што і ў сэнсе стваральнай працы, унушальнага развіцця прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі, дасягненняў у адукацыі, навуцы, культуры, як і ў цяжкіх выпрабаваннях, Беларусь з'явілася не толькі надзвычай важным, але і шмат у якіх адносінах адметным звяном бальшавіцкай таталітарнай сістэмы.

Пры напісанні дадзенай працы аўтар выкарыстаў пераважна архіўныя крыніцы. Пры гэтым шмат якія рысы з характарыстыкі таталітарнай сістэмы СССР заснаваны на матэрыялах Расійскага цэнтра захавання і выкарыстання дакументаў навейшай гісторыі, які знаходзіцца ў Маскве. Сюды ў апошнія гады перададзены некаторыя матэрыялы з прэзідэнцкага архіва Расійскай Федэрацыі. У гэтых дакументах нярэдка праходзяць сюжэты, звязаныя з Беларускай ССР. Яны сведчаць не толькі аб адносінах да яе цэнтральнага партыйнага і савецкага кіраўніцтва, але і раскрываюць у некаторых напрамках становішча спраў на месцы.

Многія матэрыялы, якія характарызуюць розныя аспекты жыцця беларускага народа ва ўмовах савецкай рэчаіснасці, выяўлены ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Пераважна гэта дакументы, доступ да якіх раней быў фактычна закрыты. Яны дазваляюць скласці ўяўленне аб тых баках жыцця беларускага грамадства, якія раней былі малавядомыя ці зусім засакрэчаныя.

Значная колькасць фактычных даных узята аўтарам з публікацый апошніх гадоў, якія зроблены не толькі гісторыкамі, але і іншымі прадстаўнікамі гуманітарных ведаў. Гэта ў асноўным артыкулы (манаграфій пакуль мала) на розныя актуальныя тэмы, пераважна новыя. Яны выклікаюць вялікую цікавасць як у навукоўцаў, так і ў шырокай грамадскасці нетрадыцыйнымі падыходамі, выкарыстаннем раней не вядомых дакументаў.

Разам з тым у прапанаванай чытачу манаграфіі ма-

ецца матэрыял, грунтоўна прадстаўлены ў беларускай гістарычнай літаратуры папярэдніх дзесяцігоддзяў, які характарызуе дасягненні Беларусі ў тых ці іншых галінах дзейнасці. Гэты матэрыял дазваляе паказаць шлях беларускага грамадства за гады савецкай улады, параўнаць становішча рэспублікі пачатку 20-х і канца 80-х гадоў амаль да цяперашняга часу.

Спалучэнне гэтага раней шырока вядомага матэрыялу, што раскрывае дасягненні беларускага грамадства пры савецкай уладзе, з новымі, яшчэ нядаўна закрытымі дакументальнымі данымі, якія характарызуюць шляхі і метады будаўніцтва новага жыцця, цяжкія выпрабаванні народа, дазволіла больш поўна адлюстраваць наша недалёкае мінулае, паказаць розныя напрамкі функцыяніравання таталітарнай сістэмы ў СССР — стваральныя і звязаныя з моцным уціскам на грамадзян, падаўленнем дэмакратычных свабод, рэпрэсіямі і іншымі актамі. У такім падыходзе — спалучэнні дадатнага і адмоўнага вопыту з савецкай рэчаіснасці, неігнараванні ніводнага з бакоў — прынцыповае навуковае крэда аўтара. Яно дазваляе адлюстраваць нашу гісторыю найбольш поўна і аб'ектыўна.

Матэрыял у даследаванні выкладзены ў храналагічнай паслядоўнасці, па асноўных этапах развіцця савецкага грамадства. Эвалюцыя таталітарнай сістэмы ў прынцыпе супадае з імі.

Храналагічныя межы даследавання ахопліваюць перыяд амаль у 80 гадоў — з часу Кастрычніцкай рэвалюцыі да сярэдзіны 1994 г., калі ў Рэспубліцы Беларусь быў абраны першы прэзідэнт А.Р.Лукашэнка. Дарэчы, у выступленні на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 17 красавіка 1998 г. прэзідэнт канстатаваў адмову ад "татальнага кіравання грамадскімі працэсамі", у тым ліку ад "татальнага планавання, якое было калісьці ў нашай дзяржаве". Пры гэтым было заўважана, што "эфектыўная дзяржава нічога агульнага не мае з так званым поўным адзяржаўленнем грамадскага жыцця, з мадэллю дамінуючай ці тым больш таталітарнай дзяржавы"[1]. Такім чынам, у выступленні фактычна прызнана існаванне ў Савецкім Саюзе таталітарнай сістэмы кіравання грамадствам. Даследаванню гэтай складанай з'явы прымяняльна да Беларусі прысвечана дадзеная кніга.

---

[1] Звязда. 1998. 18 крас.

## РАЗДЗЕЛ 1

# ТАТАЛІТАРЫЗМ — З'ЯВА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

### 1. Сутнасць таталітарызму

У апошнія гады ў навуковай і асабліва публіцыстычнай літаратуры ўсё часцей пачало ўжывацца паняцце "таталітарызм". Ім аперыруюць прадстаўнікі розных напрамкаў гуманітарных ведаў. Сэнс, што ўкладваецца ў дадзенае паняцце, вельмі шырокі і нярэдка значна адрозніваецца ў залежнасці ад галіны гуманітарных ведаў ці непасрэдна падрыхтоўкі і поглядаў даследчыкаў.

Між тым сутнасць гэтай складанай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай з'явы ўвогуле вядома. У аснове паняцця "таталітарызм" ляжыць позналацінскае слова "totalitas", што азначае цэльнасць, паўнату. Ёсць меркаванні, што слова "таталітарызм" паходзіць ад лацінскага слова "totalis", г. зн. увесь, цэлы, поўны. Ва ўсякім разе абодва варыянты паходжання паняцця таталітарызму вельмі блізкія. У іх аснове ляжыць лацінскі корань toto, які скіроўвае нашы ўяўленні на разуменне цэлага, усёабдымнага, нават усёахопнага. Значыць, сэнс паняцця "таталітарызм" зводзіцца да суцэльнага, маштабнага, усебаковага кіравання грамадствам з выразна акрэсленых аўтарытарных пазіцый.

З гэтага вынікае, што таталітарызм — даведзеная да крайнасці форма дыктатарскага праўлення, якая характарызуецца поўным (татальным) кантролем дзяржавы над усім жыццём грамадства. Для гэтай формы ўлады ў першую чаргу характэрны не абмежаваныя на практыцы паўнамоцтвы ўладных структур на чале з лідэрам, аўтарытэт якога ўзводзіцца ў культ, забарона дэмакратычных арганізацый ці іх адзяржаўленне, фактычнае ігнараванне аб'яўленых у канстытуцыі ці іншых

заканадаўчых актах правоў і свабод грамадзян, мілітарызацыя эканамічнага і іншых бакоў жыцця, узмацненне карных органаў, пашырэнне іх функцый, рэпрэсіі ў адносінах да апазіцыі і носьбітаў іншадумства, моцны палітычны ўціск, заснаваны на ідэалогіі адзінай кіруючай партыі.

Паняцце таталітарызму даследчыкі ўжываюць у адносінах да гісторыі XX ст. і называюць яго феноменам дадзенага часу. Гэта робіцца не без падстаў, хаця праявы таталітарных падыходаў у кіраванні грамадствам (і нават вельмі выразныя) назіраліся і раней, пераважна ў антычны перыяд і ў сярэднявеччы. У адносінах да ўсходнеславянскай гісторыі гэта перш за ўсё дэспатычнае праўленне ў другой палове XVIст. Івана IV Жахлівага ў Маскоўскай дзяржаве з татальнай падазронасцю, вышукам, палітычным дазнаннем, апрычнінай.

Пераход да буржуазнага грамадства, яго эвалюцыя суправаджаліся пэўным развіццём дэмакратычных тэндэнцый, хаця ў час Французскай рэвалюцыі канца XVIII ст. дыктатура якабінцаў утрымлівала праявы таталітарнага праўлення. Аднак увогуле дэмакратычныя тэндэнцыі пераважалі не толькі ў гісторыі Францыі, але і іншых заходніх дзяржаў.

Найбольш выразна таталітарныя формы кіравання грамадствам праявіліся ў шэрагу краін у XX ст. Шмат хто з даследчыкаў звязвае гэта з развіццём сродкаў масавай інфармацыі, якія дазволілі ў шырокіх памерах і даволі эфектыўна ўплываць на свядомасць насельніцтва. Такі падыход уяўляецца апраўданым, хаця характэрна і тое, што ў перыяд падрыхтоўкі першай сусветнай вайны і ў час ваенных дзеянняў, калі ваюючыя дзяржавы знаходзіліся ў спецыфічных ваенных умовах, таталітарныя формы праўлення не былі даведзены да класічных праяў.

Гэта адбылося пазней, у 20—30-х гадах, пасля таго як у Расіі адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя і ў сусветным супольніцтве ўзнікла дзяржава з новым сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным ладам. Фарміраванне ў гэты час у Італіі, Германіі, шэрагу іншых краін таталітарных фашысцкіх рэжымаў было вынікам унутранага развіцця часткі буржуазнага грамадства. Тое, што іншыя буржуазныя краіны ўступілі ў барацьбу з гэтымі фашысцкімі рэжымамі і нават пайшлі на ваенна-палітычны саюз з СССР, дыктавалася неабходнас-

цю іх самазахавання. Гэта сведчыла таксама аб пераважнай тэндэнцыі дэмакратычнага развіцця буржуазнага грамадства.

Факт існавання таталітарных рэжымаў падштурхнуў вучоных-гуманітарыяў да іх вывучэння. Першыя спробы навуковага асэнсавання таталітарызму былі зроблены заходнееўрапейскімі даследчыкамі яшчэ перад другой сусветнай вайной. У прыватнасці, у 1939 г. немец Ф.Боркенау прапанаваў лічыць асноўнай прыкметай таталітарызму аднапартыйную сістэму, якую ўзначальвае кіраўнік адзінай у краіне партыі [1].

У выніку паражэння ў другой сусветнай вайне фашысцкай Італіі і нацысцкай Германіі, краху ў гэтых краінах таталітарных рэжымаў у заходняй частцы свету значна актывізаваліся даследаванні дадзенай формы дзяржаўнага кіравання. Х.Арэндт пашырыла значэнне паняцця таталітарызму. Аддаючы належнае ролі партыі і яе лідэра, яна звярнула ўвагу на дзяржаўную ідэалогію, якая з'яўляецца пануючай, а таксама на масавы тэрор як сродак запалохвання насельніцтва і падпарадкавання яго аўтарытарным структурам[2].

Пры гэтым даследчыкі адразу звярнулі ўвагу на тое, што паміж таталітарнымі рэжымамі ў Італіі і Германіі і формай камуністычнага праўлення ў СССР шмат агульнага. Таму ў заходняй гістарыяграфіі і наогул у грамадска-палітычнай літаратуры даследаванні таталітарных рэжымаў пачалі распаўсюджвацца на СССР і яго саюзнікаў. Найбольш значную работу ў дадзеным напрамку правялі К.Фрыдрых і яго калегі. Яны, у прыватнасці, звярнулі ўвагу на ролю сродкаў масавай інфармацыі ва ўсталяванні і функцыяніраванні таталітарных рэжымаў, адзначылі, што іх фарміраванне стала магчымым у выніку высокага ўзроўню развіцця тэхналогіі масавай інфармацыі і спосабаў рэгулявання ў паводзінах людзей[3].

У далейшым заходнія даследчыкі актыўна распрацоўвалі праблему таталітарызму. Сярод іх Т.Адарно, Д.Дзюі, Э.Канецці, Г.Маркузэ, К.Попер, Э.Фром, Л.Шапіра і інш. Гэта вылілася нават у шматгадовую дыскусію па дадзенай праблеме.

Спробы раскрыць сутнасць таталітарнага праўлення

---

[1] *Borkenau F.* The Totalitarian enemy. Z., 1939. P. 25.

[2] *Arendt H.* The Origins of Totalitarianism. N. Y., 1951.

[3] *Friedrich C.J.* Totalitarian Dictatorship and Autocracy. Cambridge (Mass). P.9 — 10.

меліся і ў еўрапейскіх краінах народнай дэмакратыі. Паказальная ў гэтых адносінах манаграфія балгарскага даследчыка Жэлю Жэлева — Прэзідэнта Балгарыі ў пачатку 90-х гадоў. Кніга па дадзенай праблеме[1] была ім закончана яшчэ ў 1967 г. Аднак надрукаваць яе не ўдалося. Яна распаўсюджвалася ў розных краінах у рукапісным варыянце і выйшла з друку толькі ў 1982 г. Аўтар, у прыватнасці, сцвярджае, што "мы, марксісты, першыя ў гісторыі стварылі таталітарны рэжым, таталітарную дзяржаву — аднапартыйную дзяржаўную сістэму, пабудаваную на гвалтоўным знішчэнні іншых палітычных партый або на дэградацыі іх да ўзроўню звычайных казённых арганізацый, падначаленых ва ўсім камуністычнай партыі".

Не з усімі пазіцыямі дадзенай кнігі можна пагадзіцца, але многія яе палажэнні не выклікаюць пярэчанняў. Сярод іх думка аб тым, што, калі працэс адзяржаўлення ўласнасці завяршаецца, таталітарны рэжым цалкам усталяваны. Такім чынам, ствараецца камуністычны варыянт таталітарнага рэжыму. Звяртаюць на сябе ўвагу тэзісы аўтара аб зрастанні дзяржаўнага апарату з партыйным, аб кантролі партыі над дзяржаўнымі органамі, аб перадачы іх функцый партыйным структурам, аб дзяржаўнай аплаце апарату партыі і інш.

Што датычыцца савецкай гістарыяграфіі, як і ўсяго савецкага грамадазнаўства, то падыходы да даследавання таталітарызму на працягу ўсіх дзесяцігоддзяў існавання савецкай улады заўсёды былі звернуты выключна на іншыя краіны. Аднак у большасці выпадкаў гэта істотная з'ява ў жыцці грамадства наогул замоўчвалася. Магчыма, самы характэрны прыклад у дадзеных адносінах — "Советская историческая энциклопедия". У гэтым фундаментальным 16-томным выданні, якое ажыццёўлена на працягу 1961—1976 гг. і ўтрымлівае надзвычай вялікі фактычны матэрыял па гісторыі ўсіх народаў і дзяржаў ва ўсе перыяды іх існавання, зусім абыдзена паняцце таталітарызму. Стваральнікі энцыклапедыі палічылі за лепшае не даваць яго, і нават у дачыненні да буржуазных дзяржаў, як гэта звычайна ў такіх выпадках рабілася раней: усё адмоўнае — у іх, усё дадатнае — у нас. Відаць, тут зыходзілі з таго, каб чытач не перанёс сутнасць дадзенага паняцця на савецкую рэчаіснасць і не ўбачыў шмат агульнага.

---

[1] *Желю Желев.* Фашизмът (тоталитарная държава). София, 1990.

І толькі ў 80-х гадах пачалі з'яўляцца некаторыя сведчанні звароту даследчыкаў да гэтай праблемы. У прыватнасці, у "Философском энциклопедическом словаре" (1983) паняццю "таталітарызм" прысвечаны кароткі артыкул. Аднак яго трактоўка поўнасцю вытрымана ў духу партыйна-савецкай прапаганды, хаця правільна сцвярджаецца, што "асабліва шырокае распаўсюджванне таталітарызм атрымаў з развіццём фашызму, пасля таго як стаў афіцыйнай ідэалогіяй фашысцкай Германіі і Італіі". У перыяд "халоднай вайны", як указваецца далей у дадзеным выданні, паняцце таталітарызму выкарыстоўвалася антыкамуністычнай прапагандай у адносінах да сацыялістычных дзяржаў, якія паклёпніцкі атаясамліваліся з фашысцкімі рэжымамі і супрацьпастаўляліся "дэмакратычнаму", "свабоднаму" грамадству. Рэакцыйныя буржуазныя палітыкі і ідэолагі і цяпер, як сцвярджалася далей, спрабуюць выкарыстаць яго ў антыкамуністычных мэтах. У сучасных умовах дактрына таталітарызму дыскрэдытавана ў вачах шырокіх мас і страціла былы ўплыў, аднак абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей у капіталістычных краінах выклікае ажыўленне таталітарных неафашысцкіх тэндэнцый. Барацьба з ідэалогіяй і практыкай таталітарызму — важнейшая задача камуністычнага руху, марксісцка-ленінскай грамадскай навукі[1]. Такая мэта ставілася ў заключнай частцы гэтага артыкула.

Толькі з пачаткам радыкальных пераўтварэнняў, з канца 80-х гадоў у Савецкім Саюзе, а затым у незалежных дзяржавах, якія ўтварыліся пасля яго распаду, у першую чаргу ў Расійскай Федэрацыі, даследчыкі пачалі ўсё больш звяртацца да гэтай праблемы[2]. Сярод указаных прац вызначаюцца

---

[1] Философский энциклопедический словарь. М., 1983. С.690.

[2] *Борисов Ю.С., Курицын В.М., Хван Ю.С.* Политическая система конца 20—30-х годов. О Сталине и сталинизме // Историки спорят. М., 1988; *Гозман Л., Эткинд А.* Культ власти. Структура тоталитарного сознания // Осмыслить культ Сталина. М., 1989; *Яны ж.* Люди и власть. От тоталитаризма к демократии // В человеческом измерении. М., 1989; *Волкогонов Д.* Триумф и трагедия. Политический портрет И.В.Сталина: В 2 кн. М., 1990; *Медведев Р.Л.* О Сталине и сталинизме. М., 1990; *Игрицкий Ю.И.* Концепция тоталитаризма: Уроки многолетних дискуссий на Западе // История СССР. 1990. № 6; *Ён жа.* Снова о тоталитаризме // Отечественная история. 1993. № 1; *Горинов М., Доценко Е.* 30-е годы // История Отечества: Люди, идеи, решения. Очерки истории Советского государства. М., 1991; *Авторханов А.Г.* Технология власти // Вопросы истории. 1991. № 1 — 12; 1992. № 1 — 3, 6 — 7, 10 — 12; 1993. № 2—3; *Гаджиев К.С.* Тоталитаризм как феномен XX века // Вопросы философии. 1992. № 2; *Загладин Н.В.* Тоталитаризм и демократия: Конфликт века // Кентавр. 1992. № 5 — 10; *Иванова Г.М.* ГУЛАГ в системе тоталитарного государства. М., 1997; і інш.

перш за ўсё тыя, дзе даецца шырокі погляд аўтараў на дадзеную праблему. У даследаваннях Ю.І.Ігрыцкага не толькі аналізуецца замежная і айчынная літаратура, але і вызначаюцца асноўныя крытэрыі таталітарызму, формы і ступені яго праяў у гітлераўскай Германіі, у Італіі ў час праўлення Мусаліні і ў СССР — Сталіна. Зроблены шэраг назіранняў агульнага характару ў першую чаргу ў адносінах да Савецкага Саюза.

З прац іншага характару выдзяляюцца публікацыі па матэрыялах навуковых дыскусій, канферэнцый, "круглых сталоў" па праблеме таталітарызму[1]. Для іх характэрны шматаспектны падыход да гэтай праблемы, хаця тэмы выступленняў і адпаведных публікацый бываюць вузкімі. Аднак у комплексе яны даюць дастаткова шырокае ўяўленне аб прадмеце абмеркавання. Паказальнымі ў дадзеных адносінах з'яўляюцца матэрыялы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Таталітарызм як гістарычны феномен", праведзенай у красавіку 1989 г. у Інстытуце філасофіі Акадэміі навук СССР па ініцыятыве Усесаюзнай асацыяцыі маладых філосафаў і гісторыкаў. У прадмове да дадзенага выдання адказны рэдактар А.А.Кара-Мурза дастаткова крытычна і аб'ектыўна ахарактарызаваў стан даследаванняў па праблеме таталітарызму ў Савецкім Саюзе, якія мелі-ся пад канец 80-х гадоў. Яны ўяўлялі сабою своеасаблівы "комплекс правінцыяльнасці", што не мог не ўплываць на тых, хто гаварыў і пісаў аб таталітарызме. З гэтых абставін вынікала пастаянная рызыка першаадкрыццяў і перафармулявання рэчаў, якія сталі ў кантэксце назапашанага ў сусветнай літаратуры вопыту звычайнымі, калі не трывіяльнымі. У той жа час, як адзначана ў прадмове, даследчыкам, якія прадстаўляюць СССР, ёсць шмат што сказаць аб феномене таталітарызму як увогуле, так і ў яго айчыннай, напэўна, найбольш адкрытай і трагічнай мадыфікацыі[2].

---

[1] Природа тоталитарной власти. Обсуждение за "круглым столом" редакции // Социологические исследования. 1989. № 5; Тоталитаризм как исторический феномен. М., 1989.

[2] Тоталитаризм как исторический феномен. С.5—6.

Дадзенае выданне ўтрымлівае шмат розных назіранняў, якія датычаць як агульных падыходаў да таталітарызму, прычын яго ўзнікнення, зместу, форм праяўлення, вынікаў, так і ўсяго таго, што знайшло канкрэтнае адлюстраванне ў гісторыі народаў Савецкага Саюза. У прыватнасці, Б.С.Арлоў сцвярджае, што ў аснове любой таталітарнай сістэмы ляжаць тры прыкметы: строга іерархічная вертыкальная сістэма кіравання; існаванне ідэалогіі, якая падтрымлівае ў насельніцтва перакананасць у апраўданасці такой сістэмы (усё гэта спалучаецца з рэпрэсіўным апаратам, што выключае любое праяўленне іншадумства); наяўнасць харызматычнага лідэра, які дэманструе сабой і сваімі ўчынкамі правільнасць выбранай мэты і спосабаў яе дасягнення[1].

Не абыдзена праблема таталітарызму ў СССР і ў аўтарытэтным выданні Інстытута расійскай гісторыі Расійскай Акадэміі навук "История России. XX век" (1996). У адпаведным раздзеле кнігі, у прыватнасці, сцвярджаецца, што грамадства, якое ўзнікла ў выніку Кастрычніцкага перавароту ў 1917 г. і грамадзянскай вайны, у аснове сваёй утрымлівала зародак таталітарнасці, што ўзнікненне савецкай таталітарнай сістэмы ў пачатку XX ст. было адным са спосабаў выхаду урбанізаванага і маргіналізаванага грамадства з глабальнага грамадскага крызісу. Пры гэтым выказана меркаванне, што, магчыма, таталітарнасць з'явілася спосабам самазахавання расійскай цывілізацыі[2].

Побач з крытычнымі адносінамі па некаторых пазіцыях да "таталітарнай школы", якая створана на Захадзе, у кнізе зроблена спроба высветліць асобныя прычыны ўзнікнення "чырвонага" таталітарызму. Разам з тым канстатуецца, што савецкая сістэма "аказалася мацнейшай у смяротнай схватцы з другой праварадыкальнай таталітарнай сістэмай — германскім фашызмам..." У выданні робіцца вывад, што "савецкі таталітарызм так і не змог вырашыць тыя асноўныя задачы, якія дэкларуваліся дактрынай і дзеля чаго сістэма прыносіла ў ахвяру цэлыя пакаленні, не змагла не толькі забяспечыць усеагульны дабрабыт, але і проста нармальнае, дастойнае чалавечага існавання жыццё, хаця б "накарміць" народ, без хранічных дэфіцытаў і чэргаў (ільвіную долю нацыянальнага багацця з'ядалі ВПК і бюракратычны апарат)...

---

[1] Тоталитаризм как исторический феномен. С.97.

[2] История России. XX век. М., 1996. С. 398—399.

Ствараючы сучасную індустрыю, развіваючы гарады, фарміруючы новыя сацыяльныя пласты, звязаныя са складанымі відамі дзейнасці і валодаючы высокім адукацыйным узроўнем, таталітарызм падрываў свае асновы"[1]. У кнізе зроблены таксама іншыя вывады па дадзенай праблеме.

Сярод даследаванняў расійскіх гісторыкаў апошняга часу па разглядаемай праблеме неабходна адзначыць кнігу "Тоталитаризм в Европе XX в. Из истории идеологий, движений, режимов и их преодоления". У ёй утрымліваецца аналіз многіх бакоў таталітарызму, які разглядаецца як феномен XX ст. Дадзеную форму праўлення, на думку аўтараў, вызначае сукупнасць такіх прыкмет, як унітарная ідэалогія, масавы народны рух і жорсткі, дыктатарскі, рэпрэсіўны рэжым, які імкнецца да татальнага панавання над кожнай асобай і грамадствам у цэлым. З гэтых пазіцый раскрываюцца розныя бакі працэсу фарміравання і функцыяніравання таталітарных ідэалогій, рухаў і рэжымаў у Савецкім Саюзе, Германіі, Італіі. Пры гэтым палітыка "ваеннага камунізму" ў савецкай Расіі разглядаецца "як форма таталітарнага рэжыму". Прасачыўшы асноўныя этапы эвалюцыі таталітарнай сістэмы ў СССР, аўтары паказваюць яго паступовую эрозію. Пры параўнанні таталітарнага праўлення ў СССР і Германіі адзначана, што ў гэтых краінах ва ўладзе знаходзіліся падобныя, але не ідэнтычныя рэжымы.

У кнізе не абыдзены такі аспект праблемы, як з'яўленне новых рэжымаў таталітарнага тыпу ў краінах Усходняй Еўропы пасля другой сусветнай вайны. Высвятляюцца суадносіны ўнутраных і знешніх прычын, што прывялі да іх усталявання. Ацэньваючы сучаснае становішча ў Еўропе, аўтары прыходзяць да высновы, што таталітарызм XX ст. уяўляе сабой сур'ёзную грамадскую тэндэнцыю, якую небяспечна недаацэньваць[2].

Даследаванне праблемы таталітарызму пачалося і на Украіне[3]. Як і ў іншых дзяржавах, што ўзніклі на тэрыторыі былога СССР, украінскія гісторыкі імкнуцца раскрыць сутнасць сталінскага праўлення і паказаць яго праявы ў сваім рэгіёне. Перш за ўсё гэта датычыць най-

---

[1] История России. XX век. С. 400—403.

[2] Тоталитаризм в Европе XX в. Из истории идеологий, движений, режимов и их преодоления: Памятники исторической мысли. М., 1996.

[3] *Шаповал Ю.І.* Сталінізм і Украіна // Украінский історичний журнал. 1990. № 12; 1991. № 2; і інш.

больш змрочных старонак гісторыі украінскага народа — масавых палітычных рэпрэсій, голаду ў пачатку 30-х гадоў, які забраў жыцці соцень тысяч людзей, наступу на нацыянальную культуру і інш.

Што датычыць асэнсавання праблемы таталітарызму на Беларусі, то гэта работа таксама толькі пачынаецца. Зроблены першыя спробы ўсвядоміць дадзеную з'яву з боку яе праяўлення ў сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным, культурным жыцці, на бытавым і псіхалагічным узроўнях. У прыватнасці, у заключэнні да другой часткі "Нарысаў гісторыі Беларусі" адзначаецца, што ў 30-я гады дыктатарскі рэжым у Савецкім Саюзе, у тым ліку Беларускай ССР, набыў нямала прыкмет таталітарнага праўлення — татальнае падаўленне іншадумства, татальная слежка, татальныя рэпрэсіі, татальнае вынішчэнне таго, што не адпавядала класаваму падыходу і афіцыйнаму курсу[1]. Гэты вывад зроблены на аснове таго дакументальнага матэрыялу, які маецца ў кнізе, хаця ў ёй ідзе гаворка аб дыктатарскім змесце партыйна-дзяржаўнай сістэмы кіравання грамадствам у Савецкім Саюзе.

Характэрна, што беларускія даследчыкі падыходзяць да праблемы таталітарызму даволі асцярожна. Такая абачлівасць не спрыяе актывізацыі дадзенай работы, не садзейнічае набліжэнню яе да таго ўзроўню, на якім ужо прызнаны таталітарны змест бальшавіцкай сістэмы кіравання грамадствам.

У большай ступені праведзена вывучэнне праяў таталітарнага праўлення на беларускай зямлі. У апошнія гады ў дадзеным напрамку з'явілася значная колькасць публікацый. Яны датычаць новага бачання найбольш трагічных старонак нашай гісторыі[2]. Значныя намаганні сканцэнтраваны на раскрыцці рэпрэсіўнай сталінскай

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1995. Ч. 2. С. 508.

[2] *Антонович Т.М., Лапец П.Д., Протько Т.С.* В поисках утраченного времени // Коммунист Белоруссии. 1990. № 1; *Яны ж.* Так сеялись "зубы дракона..." // Коммунист Белоруссии. 1990. № 2; *Платонаў Р., Сташкевіч М.* "Дзве аперацыі супраць "ворагаў народа" // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1; *Протько Т.С.* Как нам язык отрезали // Крыніца. 1992. № 3—4; *Яна ж.* Тайный политический сыск // Крыніца. 1992. № 5—6; *Яна ж.* Сезам, откройся // Крыніца. 1992. № 9—10; *Касцюк М.* Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1—2; *Павлов Я.С.* "Болевые точки" истории Беларуси. Мн., 1997; і інш.

палітыкі на Беларусі[1]. Пры гэтым робіцца аналіз сацыяльнага і нацыянальнага складу рэпрэсіраваных на падставе статыстычных распрацовак, якімі ўжо ахоплена да 100 тыс. чалавек[2].

Пэўная ўвага таксама нададзена вывучэнню новых аспектаў ажыццяўлення калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у тым ліку яе прымусоваму характару, праявам голаду ў 1932—1933 гг. у паўднёвых і цэнтральных раёнах БССР, правядзенню ў жыццё сталінскага закону ад 7 жніўня 1932 г. аб ахове маёмасці прадпрыемстваў і калгасаў[3]. Даследчыкі вывучаюць правядзенне сталінскай рэпрэсіўнай палітыкі сярод сялян[4], інтэлігенцыі[5], ажыццяўленне дэпартацый насельніцтва з Заходняй Беларусі пасля яе далучэння да БССР у верасні 1939 г.[6]

Як бачна, даследаванні па праблеме бальшавіцкага таталітарызму, яго праяў на Беларусі пашыраюцца. Аўтар дадзенай працы таксама імкнецца ўнесці ў гэту справу свой уклад. Пры гэтым мы падыходзім да асэнсавання таталітарнай сістэмы як надзвычай складанай з'явы, што стала вынікам супярэчлівага развіцця грамадства. Гэта супярэчлівасць у міжнародным маштабе заключалася ў тым, што краіны з таталітарнымі рэжымамі на час

---

[1] *Адамушка У.* Лічбы на сэрцы (колькі чалавечых лёсаў пакалечыў таталітарны рэжым) // Беларуская думка. 1992. № 7; *Адамушко В.И., Иванова Н.В.* Помилуйте (документы по репрессиям 1939—1941 гг. в Вилейской области) // Молодечно. 1992; *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі. Мн., 1994; і інш.

[2] Звязда. 1994. 24 лістап.

[3] *Костюк М.П.* Коллективизация: Как это было // Политический собеседник. 1989. № 4. *Ён жа.* Калектывізацыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1997. Т. 4. С. 17 — 22.

[4] *Врублевский А.П., Протько Т.С.* Из истории репрессий против белорусского крестьянства. 1929—1934. Мн., 1992.

[5] *Платонаў Р.* АДПУ—НКУС супраць беларускіх пісьменнікаў // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 3; *Ён жа.* "Партыйная справа" Янкі Нёманскага // Полымя. 1996. № 1; *Міхнюк У.* Арыштаваць у высылцы: Дакументальны нарыс пра Алеся Дудара. Мн., 1996; *Ён жа.* Вязень сумлення // Полымя. 1996. № 2; і інш.

[6] *Хацкевіч А.* Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939—1941) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1—2; *Pawlow I.S.* Represjonowanie polskich osadnikow w zachodnich obwodach Bialorusi; *Kosciuk M.P.* Czynnik polski w stalinowskiej polityce represyjnej lat trzydziestych na Bialorusi // Polska — Bialorus. 1918—1945. Warszawa, 1994.

іх існавання аказаліся ў баку ад агульнай тэндэнцыі развіцця міжнароднага супольніцтва ў дэмакратычным напрамку.

Што датычыць унутрыпалітычных супярэчнасцей, то ў кожнай з краін з таталітарнымі рэжымамі яны свае. У Савецкім Саюзе гэтыя супярэчнасці заключаліся ў наступным.

Бальшавіцкае кіраўніцтва змагло ажыццявіць шырокае прыцягненне народа да актыўнай вытворчай дзейнасці, выклікаць высокі працоўны энтузіязм асноўнай яго часткі. Гэта дазволіла дасягнуць унушальных поспехаў у некаторых напрамках дзейнасці грамадства — развіцці прамысловасці, транспарту, навукі, культуры. Канкрэтныя матэрыялы, што раскрываюць дадзенае палажэнне, будуць прыведзены ў наступных раздзелах кнігі. Аднак метады і сродкі выканання пастаўленых задач з'яўляліся тыпова адміністрацыйна-каманднымі, аўтарытарнымі — ігнараванне эканамічных стымулаў працы, абсалютызацыя планавання, амаль поўнае выключэнне з гаспадарчага жыцця прыватнай уласнасці і г.д.

У эканамічных адносінах таталітарная сістэма ў СССР фактычна выклікала адчужанасць працоўных ад сацыялістычнай, г. зн. ад дзяржаўнай і кааператыўна-калгаснай, уласнасці, забяспечыла строга цэнтралізаванае кіраванне сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, нярэдка ігнаруючы пры гэтым аб'ектыўныя законы эканамічнага развіцця. У многім стаўка была зроблена на пазаэканамічныя метады прыцягнення працоўных да вытворчай дзейнасці.

У палітычных адносінах таталітарызм азначаў узурпацыю ўлады адным чалавекам і яго акружэннем. Народаўладдзе існавала толькі на паперы. Была выпрацавана адпаведная сістэма прызначэння кадраў, як правіла, не нацыянальных, а прысланых з Цэнтра ці з іншых месцаў. У гэтым заключаўся пэўны разлік, скіраваны на раз'яднанне кіруючых кадраў і мясцовага насельніцтва. Такая практыка бярэ пачатак з першых гадоў савецкай улады.

Таталітарная сістэма прывяла да ліквідацыі калектыўнага кіраўніцтва ў партыі і дзяржаве. Фактычна апынуўся па-за законам плюралізм думак, які падмяняўся асабістымі рашэннямі, што нярэдка знаходзіла замацаванне ў адпаведных пастановах самых высокіх партыйных і дзяржаўных органаў. Асноўным метадам запалохвання кадраў і ўсіх працоўных, сродкам падаўлення іншадум-

ства сталі рэпрэсіі, якія праяўляліся ў розных формах і прымалі вялікія памеры.

Фактычна працоўныя былі адхілены ад кіравання сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі працэсамі. Устаноўлена дыктатура камуністычнай партыі, прычым не ўсёй, а толькі яе кіраўніцтва. У гэтых адносінах можна гаварыць, што вышэйшае партыйнае звяно ўяўляла сабой партыю ў партыі. Да таго ж партыю кантралявалі органы дзяржбяспекі, фактычна падпарадкаваныя асабіста кіраўніку дзяржавы — генеральнаму сакратару ЦК партыі.

У ідэалагічных адносінах таталітарызм уяўляе сабою жорсткую рэгламентацыю падыходаў і характарыстык да ўсяго, што адбылося, адбываецца ці павінна адбыцца. Кіраванне рознымі галінамі навукі, культуры, мастацтва ажыццяўляе адзін чалавек і яго акружэнне. Прычым гэта кіраванне нярэдка тэндэнцыйнае і некампетэнтнае. Яно слаба ўлічвае характар, ступень развіцця як айчыннай, так і замежнай навукі. Прэтэнзіі на беспамылковасць часта відавочныя, але пярэчыць, выказваць свае меркаванні небяспечна.

У маральна-псіхалагічных адносінах прыхільнікі таталітарных метадаў імкнуцца ўкараніць у свядомасць людзей ідэалістычныя па сваёй сутнасці думкі аб непазбежнасці існавання вярхоўнага кіраўніка, неабходнасці толькі апраўдання яго дзеянняў. Гэта прыводзіць да дэіндывідуалізацыі асобы, насаджэння поглядаў аб працоўных як асобных “винтиках”. Адсюль робіцца вывад аб непаўнацэннасці кожнага асобна ўзятага чалавека. На справе гэта прыводзіць да страты сапраўднай актыўнасці членаў грамадства. У іх паніжаецца адказнасць як за свой уласны лёс, так і за развіццё дзяржавы.

І нарэшце, у міжнародным маштабе таталітарны бальшавіцкі рэжым, асабліва ў сталінскія часы, прывёў да выкарыстання камуністычнага і рабочага руху ў розных краінах з мэтаю ўмацавання адзінаўладдзя ў СССР. Пры гэтым эксплуатаваўся факт матэрыяльнай залежнасці рэвалюцыйнага руху за мяжой ад савецкай дапамогі. Паказальным у дадзеных адносінах з'яўляецца выказванне Сталіна, зробленае 28 мая 1928 г. у гутарцы са студэнтамі Інстытута чырвонай прафесуры, Камакадэміі і Свярдлоўскага універсітэта. Там узыходзячы дыктатар сказаў: ад таго, як мы вырашым

праблему хлеба, залежыць не толькі лёс савецкай улады, але і сусветнай рэвалюцыі, таму што сусветная рэвалюцыя можа сілкавацца толькі савецкім хлебам[1].

Дарэчы, такі напрамак у знешняй палітыцы быў закладзены яшчэ Леніным. Як сведчаць рассакрэчаныя ў апошні час новыя дакументы, менавіта ён даў пачатак шырокаму фінансаванню ствараемых пры савецкай дапамозе камуністычных і рабочых партый у замежных краінах. Цяпер вядома яго запіска Берзіну з прапановай, каб для напісання агітацыйных брашур ён прыцягваў адпаведныя творчыя сілы з-за мяжы і патрабаваў плаціць ім "за работу і паездкі архішчодра"[2]. Савецкі ўрад рэгулярна фарміраваў бюджэт Камінтэрна, даваў значныя грошы на фінансаванне рэвалюцыйнага руху за мяжой.

Дадзеныя і іншыя характарыстыкі бальшавіцкай таталітарнай сістэмы будуць дапаўняцца ў наступных раздзелах працы. Гэта будзе зроблена таксама за кошт раскрыцця праяў таталітарызму на Беларусі ў розных сферах сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, нацыянальна-культурнага жыцця. Шмат у якіх адносінах гэтыя праявы былі асабліва рэльефна выражанымі на беларускай зямлі. Яны пашыраць і паглыбяць уяўленне аб сутнасці таталітарызму ў СССР, асабліва ў яго сталінскай інтэрпрэтацыі.

## 2. Прычыны і этапы ўсталявання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы

Як усялякая значная сацыяльна-эканамічная і грамадска-палітычная з'ява, таталітарная сістэма ў СССР узнікла не на пустым месцы. Да яе ўсталявання прывёў шэраг прычын як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару. Калі мець на ўвазе шырокі палітычны аспект, то яна стала вынікам развіцця краіны ў пераходны перыяд. Мэтанакіраваны скачок ад капіталізму, які меў у Расіі сярэдні ўзровень развіцця, да сацыялізму, што ўяўляўся ў агульных абрысах і не вельмі выразна, стварыў спрыяльныя ўмовы для фарміравання аўтарытарных метадаў кіраўніцтва грамадствам.

---

[1] *Авторханов А.Г.* Технология власти // Вопросы истории. 1991. №1. С.130.

[2] Аргументы и факты. 1992. № 6.

Гэта быў рух не наперад, як яго падавала афіцыйная партыйна-савецкая прапаганда, а назад, ад адноснай дэмакратыі да таталітарызму, што не выпадкова. Значныя перадумовы ў дадзеных адносінах былі створаны тады, калі маладую савецкую дзяржаву ўзначальваў Ленін. Аднак яго аўтарытэт не перарос у культ, ва ўсякім разе пры яго жыцці. Сталін жа ўзвышаў Леніна, каб ўзняцца самому. Гэта была свядомая палітыка, разлічаная на пэўныя, неабходныя яму вынікі.

Усталяванне і развіццё да выразнага праяўлення таталітарных рэжымаў у СССР, Германіі, Італіі хаця па часе і адбывалася амаль паралельна, усё ж уяўляла сабой аўтаномныя з'явы. Кожны з іх вырастаў на сваёй унутранай глебе. Аднак глебы гэтыя ў сацыяльна-эканамічных адносінах былі прынцыпова рознымі: пераход ад прыватнай уласнасці да панавання дзяржаўнай і кааператыўнай (фактычна дзяржаўнай) у СССР і традыцыйна-класічная прыватная ўласнасць буржуазнага тыпу ў Германіі і Італіі.

У той жа час у грамадска-палітычным аспекце фарміраванне таталітарных рэжымаў мела шмат агульнага: аднапартыйнасць, культ асобы кіраўніка, адзіная ідэалогія, падаўленне іншадумства, рэпрэсіі (праўда, у розных памерах) і інш.

Пералічаныя заўвагі дапамагаюць лепш зразумець асаблівасці ўсталявання таталітарнага рэжыму ў савецкай дзяржаве. Гэта неабходна, таму што агульныя рысы заўсёды дапаўняліся канкрэтнай практыкай у кожнай з краін. Такое асэнсаванне дапаможа высветліць грамадска-палітычную прыроду дадзенай складанай з'явы.

Якія ж канкрэтна-гістарычныя прычыны прывялі да ўсталявання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы? У яе ўсталяванні адыграла ролю і складанае міжнароднае становішча савецкай краіны. Аднак рашаючымі сталі ўнутраныя фактары, важнейшыя з якіх наступныя.

Прыход да ўлады бальшавікоў у кастрычніку 1917 г. і ўзнікненне савецкай дзяржавы вялі да імкнення ўсталяваць аўтарытарнае праўленне ў форме дыктатуры пралетарыяту. Ва ўмовах грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі гэта дыктавалася рэальнымі абставінамі. Іншая справа, што ў далейшым, у перыяд мірнага развіцця, вярхоўнае кіраўніцтва партыі і дзяржавы не толькі не адышло ад гэтых метадаў ажыццяўлення ўнутранай палітыкі, але пасля невялікага ад-

ступлення ад яе ў 20-я гады, у перыяд новай эканамічнай палітыкі, значна іх узмацніла і давяло характар праўлення да таталітарнага рэжыму. Пры гэтым у поўнай ступені былі выкарыстаны асновы, закладзеныя ў першыя гады савецкай улады.

Бальшавіцкі таталітарызм фарміраваўся ва ўмовах, калі ў эканоміцы суседнічалі і перапляталіся розныя сацыяльна-эканамічныя ўклады. Яны адлюстроўвалі як капіталістычную, так і сацыялістычную накіраванасць гаспадаркі. Хаця тэндэнцыя замены адной сістэмы на іншую была даволі ўстойлівай, тым не менш сам факт пераходу, барацьба новага са старым выклікалі імкненне да стабілізацыі абставін. Але гэта па-ранейшаму звязвалася з моцнай асобай, цвёрдай уладай, таму што іншых, дэмакратычных, уяўленняў у большасці грамадзян краіны не было.

Максімальнае паскарэнне тэмпаў пабудовы новага грамадства садзейнічала ўзмацненню адміністрацыйна-аўтарытарных пачаткаў. Гэта адбывалася з-за хуткай дэпралетарызацыі рабочага класа ў выніку прыцягнення ў горад на будоўлі індустрыі значнай колькасці сельскага насельніцтва. З іншага боку, павелічэнне на вёсцы кіруючых кадраў з ліку грамадзян, якія былі накіраваны сюды для правядзення партыйнай лініі, зніжала яе самабытнасць, набліжала ў ідэйна-палітычных адносінах да горада.

Нягледзячы на тое што для 20-х гадоў у першую чаргу характэрна функцыяніраванне новай эканамічнай палітыкі і на яе аснове пэўнае ўзаемадзеянне дэмакратычных і цэнтралізаваных пачаткаў, кіраўніцтва эканомікай ды і грамадска-палітычным жыццём усё больш канцэнтравалася ў вышэйшых эшалонах улады. Ва ўмовах недастатковага развіцця дэмакратыі такая цэнтралізацыя садзейнічала стварэнню таталітарнай сістэмы. Гэта тым больш відавочна, што паступова зніжаўся ўзровень дэмакратычных форм кіравання, памяншалася іх магчымасць супрацьстаяць цэнтралізацыі.

У дадзеным працэсе немалую ролю адыграў бюракратычны апарат, які шмат чаго пераняў ад дарэвалюцыйных часоў. Хаця савецкай уладай, асабліва ў першыя гады яе існавання, было нямала зроблена ў мэтах яго дэмакратызацыі, аднак тэндэнцыя бюракратызацыі жыцця ўсё больш нарастала, і ўрэшце рэшт гэта прывяло да ўзмацнення бюракратычнай сістэмы кіравання.

Важнай акалічнасцю ў дадзеным працэсе было тое, што ў кастрычніку 1917 г. рэвалюцыя перамагла ў краіне, якая фактычна не прайшла школу буржуазнай дэмакратыі. На працягу 20-х гадоў дэмакратычныя інстытуты не змаглі замацавацца настолькі, каб стаць перашкодай на шляху зараджэння і разрастання аўтарытарных форм кіравання.

Несумненна, што рашаючую ролю ў стварэнні савецкай таталітарнай сістэмы і ў яе далейшым развіцці адыграў Сталін. Пасля таго як стаў у 1922 г. генеральным сакратаром ЦК партыі, ён, несумненна, вызначыў сабе мэту любымі сродкамі дабіцца асабістай улады. Спачатку гэта рабілася даволі асцярожна і непрыкметна, затым усё больш настойліва, адкрыта і нахабна. У гэтым яму дапамагала адпаведнае акружэнне, што ім фарміравалася з дапамогай сваёй высокай партыйнай пасады, якую ён займаў больш за тры дзесяцігоддзі. Разлік быў просты: каб давераныя людзі, прыцягнутыя з розных куткоў краіны і надзеленыя адпаведнай уладай, дапамаглі ўзвысіць асобу генсека.

Важная роля ў гэтай справе адводзілася сродкам масавай інфармацыі. Прычым і тут спачатку вытрымлівалася строгая паступовасць. Першыя публікацыі пра Сталіна былі асцярожнымі. Затым, у канцы 20-х гадоў, іх змест стаў у дачыненні да яго ўзвышаным і патэтычным. Па сведчанню сучаснікаў, высокапастаўленыя асобы са сталінскага акружэння фактычна спаборнічалі паміж сабой у майстэрстве ўхвалення генеральнага сакратара.

Масавая апрацоўка свядомасці людзей давала вынікі. Вера ў Сталіна і яго справы мацнела, нават калі гаворка ішла аб чарговым судовым працэсе над "адступнікамі ад сацыялізму". Прыдуманыя абвінавачанні і вынесеныя на іх аснове смяротныя прыгаворы атрымлівалі адабрэнне на шматлікіх мітынгах. Многія заразіліся "злым энтузіязмам". Паўсюдна вышуквалі "ворагаў народа". Дарэчы, гэты выраз належыць Сталіну. Упершыню ён ужыў яго ў 1932 г. у законе аб ахове маёмасці дзяржустаноў і калгасаў, які напісаў асабіста сам[1]. Шпіёнаманія дасягнула неймаверных памераў. Яна заахвочвалася. Былі нават прадугледжаны меры пакарання "за недоносительство".

---

[1] *Игрицкий Ю.И.* Снова о тоталитаризме // Отечественная история. 1993. № 1. С. 13.

Да фарміравання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы вяла і яшчэ адна з асноўных прычын — унутрыпартыйная барацьба і ў першую чаргу барацьба супраць Троцкага. У адрозненне ад Сталіна ён не хаваў свае аўтарытарныя падыходы да сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця краіны, як і асабістыя дыктатарскія імкненні. Самым надзейным сродкам спыніць Троцкага з'яўлялася падтрымка Сталіна, што і было зроблена большасцю партыйных дзеячаў у 20-я гады. Але гэта ўзмацніла пазіцыі Сталіна, садзейнічала стварэнню глебы для ўзвышэння яго асобы. У выніку быў страчаны час, калі можна было не дапусціць перарастання аўтарытэта кіраўніка ў культ яго асобы і ўсталявання таталітарнага рэжыму.

Істотна пры гэтым змянілася і сама партыя. Усё больш заарганізаваным станавілася яе жыццё, змяншалася пралетарскае ядро, звужалася ўнутрыпартыйная дэмакратыя. Гэта рабілася адпаведна ўяўленню Сталіна аб тым, што кампартыя павінна быць "свайго рода ордэнам мечаносцаў унутры дзяржавы савецкай, накіроўваючай органы апошняй і адухатвараючай іх дзейнасць"[1].

У мэтах узвышэння сваёй асобы Сталіным быў выкарыстаны і нізкі агульнаадукацыйны ўзровень насельніцтва краіны, зусім недастатковая ступень развіцця палітычнай культуры. У значнай колькасці людзей яшчэ заставаліся царысцкія настроі. Дэмакратычныя тэндэнцыі былі слабымі.

Адпаведную ролю адыграла і тое, што ў першыя гады савецкай улады ўзнікла і атрымала распаўсюджанне ваенна-камуністычная ідэалогія. Яе падтрымлівала значная частка як камуністаў, так і беспартыйных. Пераход да новай эканамічнай палітыкі і пэўнай дэмакратыі быў для іх вельмі складаным. Пры гэтым некаторыя з іх ажыццявіць гэты пераход так і не змаглі. Незалежна ад свайго жадання, часцей за ўсё несвядома, яны садзейнічалі ўсталяванню аўтарытарнай улады.

Такім чынам, ужо гэты кароткі пералік розных бакоў тагачаснай рэчаіснасці сведчыць, што фарміраванне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы з'явілася вынікам дзейнасці многіх фактараў, як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных. Пры гэтым істотную ролю адыграла імкненне Сталіна да асабістай улады. Ім мэтанакіравана выкарыстоўвалася ўсё, што магло спрыяць дасягненню пастаўленай мэты.

---

[1] *Сталин И.* Соч. Т.5. С.71.

Эвалюцыя кожнай грамадска-палітычнай з'явы, у тым ліку такой заганнай, як таталітарная сістэма праўлення, становіцца больш зразумелай, калі выдзеліць этапы яе развіцця. Гэта дапаможа лепш усвядоміць яе прыроду, месца ў агульным гістарычным кантэксце, дазволіць раскрыць працэс распаўсюджвання таталітарызму як углыбіню, так і ўшырыню, на ўсё новыя галіны сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця.

Пачатак фарміравання таталітарнай сістэмы ў бальшавіцкай Расіі быў пакладзены Леніным. Іменна тады, калі ён узначальваў савецкую дзяржаву, былі закладзены асновы таталітарызму. Ужо з ліпеня 1918 г., пасля разгрому выступлення левых эсэраў, у краіне фактычна пачала ўсталёўвацца аднапартыйнасць. Гэта з'явілася пачаткам фарміравання аўтарытарнага праўлення. Праз некалькі месяцаў, пасля замаху на Леніна, пачаўся чырвоны тэрор, былі закладзены асновы будучага ГУЛАГа. Высокай цэнтралізацыі дасягнула кіраўніцтва сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыццём. Адзіная камуністычная ідэалогія, непрымірымасць да іншадумства і многае другое таксама бяруць пачатак з першых гадоў савецкай улады.

Аднак Ленін разумеў, да чаго гэта можа і павінна прывесці. Адсюль і яго ініцыятыва аб пераходзе да новай эканамічнай палітыкі, якая, як правамерна сцвярджае Ю.І.Ігрыцкі, "нетаталітарная па сваёй сутнасці"[1]. Вялікім выпрабаваннем для краіны абярнуўся адыход ад НЭПа, зроблены ў канцы 20-х гадоў па ініцыятыве Сталіна. У выніку паслядоўнага разгрому ў партыі іншадумцаў пазіцыі Сталіна як генеральнага сакратара значна ўзмацніліся. Ён стаў адзіным партыйным лідэрам, а тыя, хто на гэта прэтэндаваў, былі адціснуты з палітычнай арэны.

Асаблівае месца заняла тут барацьба з правымі, якія ўяўлялі апошнюю і самую значную перашкоду ўсталяванню аўтарытарнага праўлення. Характэрна, што барацьба з імі вялася ўжо без чарговых саюзнікаў з палітбюро ЦК, якіх затым неабходна было аб'яўляць апазіцыянерамі. Метады барацьбы былі таксама некалькі іншымі. Напрыклад, платформа правых у адроз-

---

[1] *Игрицкий Ю.И.* Снова о тоталитаризме // Отечественная история. 1993. № 1. С. 12 — 13.

ненне ад трацкісцкай не друкавалася, але яе асуджалі паўсюдна.

У гэты час яшчэ існавала неабходнасць у выкарыстанні часовых адступленняў, адпаведных заяў. Так, у час паездкі ў Сібір у пачатку 1928 г. Сталін па сутнасці паставіў пытанне аб тым, што ўслед за сацыялізацыяй прамысловасці трэба гэта ж зрабіць і з сельскай гаспадаркай. Мелася на ўвазе пакрыць усе раёны краіны без выключэння калгасамі і саўгасамі, якія б маглі замяніць як здатчыкі хлеба дзяржаве не толькі кулакоў, але і аднаасобных сялян[1].

Аднак гэты намер сустрэў шырокае процідзеянне, у першую чаргу з боку Бухарына і яго прыхільнікаў. І тут Сталін часова адступае. Больш таго, 13 лютага 1928 г. ён падпісвае пісьмо ўсім арганізацыям УКП(б), у якім гаварылася: "Размовы аб тым, што мы быццам бы адмяняем нэп, уводзім харчразвёрстку, раскулачванне і г.д., з'яўляюцца контррэвалюцыйнай балбатнёй, супраць якой неабходна рашучая барацьба. Нэп ёсць аснова нашай эканамічнай палітыкі і застаецца такою на доўгі гістарычны перыяд"[2]. Калі ўлічыць, што ў 1929 г. было зроблена адваротнае, то выразна бачны характар дадзенай заявы.

Ужо ў гэты час праявілася імкненне Сталіна і яго акружэння абмежаваць уздзеянне ленінскіх ідэй на працоўных і ў першую чаргу на моладзь. Асцярожна і паслядоўна, пераважна не адкрытым, а завуаліраваным шляхам праводзілася думка, што пасада генсека найбольш уплывовая ў краіне і што Сталін адпавядае ёй найлепшым чынам. Гэта эластычная і злавесная тактыка апраўдала сябе.

Адыгралі сваю ролю і пагрозы адставак Сталіна з паста генеральнага сакратара, да якіх ён час ад часу прыбягаў. Асаблівае значэнне тут мела шостая па ліку пагроза адстаўкі. Яна адносіцца да 1927 г. і была зроблена на першым пленуме ЦК пасля XV з'езда УКП(б). Сталін тады звярнуўся з наступнай заявай: "Я дапускаю, што да апошняга часу былі ўмовы, якія ставілі партыю ў неабходнасць мець мяне на гэтай пасадзе як чалавека больш ці менш крутога, які прадстаўляў вядомае супрацьяддзе небяспекам з боку апазіцыі... Цяпер апазіцыя не толькі разбіта, але і выключана з партыі. А між тым у нас

---

[1] *Сталин И.* Соч. Т. 11. С. 7.

[2] Там жа. С. 15.

маецца ўказанне Леніна (маецца на ўвазе перамяшчэнне Сталіна з пасады генсека. — *М.К.*), якое, па-мойму, патрэбна правесці ў жыццё, таму прашу пленум вызваліць мяне ад пасады генеральнага сакратара. Запэўніваю вас, таварышы, што партыя ад гэтага толькі выйграе"[1]. Разлік быў дакладным: пленум просьбу адхіліў.

Значны крок у напрамку фарміравання таталітарнай сістэмы быў зроблены ў 1929 г. у сувязі з 50-годдзем Сталіна. У друку з'явіліся публікацыі, дзе адкрыта ўзвышалася асоба генсека і з гэтай мэтай нават пераглядаліся некаторыя старонкі гісторыі. Асабліва вылучаўся артыкул Варашылава "Сталін і Чырвоная Армія", у якім роля Леніна як арганізатара абароны рэвалюцыі памяншалася, а Сталіна — павялічвалася.

Не засталіся ў баку ад гэтай падзеі і вытворчыя калектывы з БССР. Генеральнаму сакратару ЦК партыі былі накіраваны прывітанні ад будаўнікоў БелДРЭС імя Сталіна, ад агульнага сходу членаў і кандыдатаў у члены КП(б)Б разам з беспартыйнымі рабочымі Мінскай абутковай фабрыкі, ад дзесяткаў калектываў рабочых і служачых з Віцебска, Гомеля і іншых месцаў[2].

Менавіта ў 1929 г. з'явіўся сталінскі артыкул "Год вялікага пералому", які, як цяпер зразумела, азначаў рэзкі паварот да аўтарытарных метадаў кіраўніцтва сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыццём.

З пачатку 30-х гадоў станаўленне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы пайшло больш хуткімі тэмпамі. Гэтаму садзейнічалі некаторыя поспехі ў стварэнні новага грамадства, у першую чаргу ў ажыццяўленні індустрыялізацыі і ў культурным будаўніцтве. Задачы першай пяцігодкі і асабліва яе дасягненні сталі ўсё часцей звязвацца з імем Сталіна. Яго валявыя падыходы да вырашэння праблем унутранай і знешняй палітыкі, міжнароднага рабочага і камуністычнага руху праяўляліся ўсё больш выразна.

Аднак у гэты час таталітарныя метады кіраўніцтва яшчэ не ўсюды сталі пераважнымі. Гэта датычыць нават адносін да органаў АДПУ з боку партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў нізавога і сярэдняга звяна, якія ня-

---

[1] Родина. 1994. № 1. С. 68.

[2] Расійскі цэнтр захавання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі (далей — РЦЗВДНГ), ф. 17, воп. 85, спр. 532, арк. 111—133.

рэдка ігнаравалі тыя даныя, што ім паведамляліся. У прыватнасці, аб гэтым сведчыць запіска АДПУ ў КП(б)Б, накіраваная 25 чэрвеня 1930 г. У ёй адзначалася, што асноўнай задачай органаў АДПУ з'яўляецца своечасовая інфармацыя партыйных, савецкіх, прафесійных і іншых арганізацый аб магчымых ненармальнасцях і ў першую чаргу аб разлажэнні апарату і аб настроях мас. Але савецкія партыйныя і прафсаюзныя органы кепска рэагуюць на іх інфармацыю і часта не даюць адказаў.

Толькі па Мінску за першыя пяць месяцаў 1930 г. было зроблена 280 паведамленняў ва ўладныя структуры і кіраўнікам устаноў. Амаль усе гэтыя пісьмы ўтрымлівалі просьбу інфармаваць аб прынятых мерах. Аднак атрымана было не больш за 15 адказаў. У запісцы выказвалася думка, што неабходна прыняць адпаведныя прымусовыя меры для выпраўлення становішча[1].

Той факт, што кіраўнікі розных органаў і ўстаноў у пачатку 30-х гадоў яшчэ маглі дазволіць сабе сур'ёзна не ставіцца да пісьмаў з АДПУ, сведчыць аб іх адносінах да гэтай арганізацыі. Яна пакуль не была ўзвышана да таго становішча, якое зойме ў недалёкім будучым. Бальшавіцкая таталітарная сістэма яшчэ знаходзілася на шляху фарміравання.

Тон у гэтым працэсе задаваў генеральны сакратар ЦК УКП(б) Сталін. Яго выступленні станавіліся ўсё больш жорсткімі. Ранейшыя дыпламатычныя захады пасля разгрому ўсіх апазіцыйна настроеных сіл ужо былі непатрэбнымі. Адным са сведчанняў гэтага з'явілася яго прамова на студзеньскім пленуме ЦК партыі ў 1933 г. У ёй, у прыватнасці, было сказана: "Патрэбна мець на ўвазе, што рост моцы савецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленне апошніх рэшткаў паміраючых класаў. Іменна пагэтаму, што паміраюць і дажываюць апошнія дні, яны будуць пераходзіць ад адных форм наскокаў да другіх, больш рэзкіх форм наскокаў, апелюючы да адсталых пластоў насельніцтва і мабілізуючы іх супраць савецкай улады. Няма такой агіднасці і абману, якія б гэтыя былыя людзі не ўзвялі на савецкую ўладу... На гэтай глебе могуць ажыць і зашавяліцца разбітыя групы старых контррэвалюцыйных партый эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтра і ўскраін, могуць

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ), ф. 4, воп. 21, спр. 249, арк. 55.

ажыць і зашавяліцца асколкі контррэвалюцыйных апазіцыйных элементаў з трацкістаў і правых ухілістаў. Гэта, канешне, не страшна... Але ўсё гэта трэба мець на ўвазе, калі мы хочам пакончыць з гэтымі элементамі хутка і без асаблівых ахвяр. Вось чаму рэвалюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна цяпер бальшавікам"[1].

Такая ўстаноўка, што асабліва неабходна рэвалюцыйная пільнасць, каб пакончыць з рэшткамі паміраючых класаў, калі іх супраціўленне ва ўмовах росту моцы савецкай дзяржавы не страшна, не магла не трактавацца як заклік да шырокай барацьбы з "унутраным ворагам". Вядома, да ажыццяўлення якіх шырокіх рэпрэсій гэта прывяло праз некалькі гадоў.

Новы этап у развіцці таталітарных метадаў кіраўніцтва пачаўся ў 1934 г. На XVII з'ездзе партыі, які раней называлі "з'ездам пераможцаў", быў зроблены апошні захад спыніць спаўзанне партыі і краіны ў вадаварот сталінскага праўлення. Аднак нясмелая спроба змясціць Сталіна з пасады генеральнага сакратара не была ажыццёўлена. Вынікам гэтага з'явілася актывізацыя падрыхтоўкі да правядзення шырокіх рэпрэсій.

Паказальна, аднак, што ў гэты час Сталін яшчэ не лічыў магчымым публічна далучаць да свайго імя самыя высокія эпітэты, якія яму прапаноўвала яго акружэнне. У справаздачным дакладзе ЦК УКП(б) XVII з'езду партыі, які быў ім крыху падрэдагаваны, у заключнай частцы, дзе быў заклік "Няхай жыве вялікі Сталін!", ён закрэсліў слова "вялікі", пакінуў усё астатняе і дапісаў яшчэ адну пазіцыю: "Няхай жыве ЦК!"[2] Значыць, генсек яшчэ пакуль устрымліваўся ад таго, што стане нормай праз зусім невялікі час.

Разам з тым у мэтах аслаблення кантрольных функцый адбыўся падзел аб'яднаных органаў ЦКК—РСІ. Былі ліквідаваны дэмакратычныя інстытуты ў дзейнасці партыі. Гэта можна праілюстраваць на прыкладзе камісій, якія функцыяніравалі пры палітбюро ЦК УКП(б). Яны ствараліся для вывучэння і аналізу розных пытанняў партыйнага, сацыяльна-эка-

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.227, арк. 123.
[2] РЦЗВДНГ, ф.558, воп.1, спр.3117, арк.87.

намічнага і грамадска-палітычнага жыцця. У 1929 г. налічвалася больш за 110 такіх камісій, у 1935 г. — 89, у 1936 г. — 36, у 1937 г. —ніводнай.

У сярэдзіне 30-х гадоў быў узмоцнены і пастаўлены над партыяй і народам рэпрэсіўны апарат. АДПУ рэарганізаваны ў НКУС. Пры ім ствараліся пазасудовыя органы — асобыя нарады. У практыку ўсё больш ўваходзіў пазасудовы разгляд спраў з прымяненнем выключнай меры пакарання — расстрэлу.

Правядзенне шырокіх рэпрэсій патрабавала "тэарэтычнага" абгрунтавання. Гэта было зроблена ў 1937 г. на лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК УКП(б). Пасля прыняцця ў канцы 1936 г. "Канстытуцыі перамогшага сацыялізму" Сталін дабіўся адабрэння прапанаванага ім яшчэ ў 1928 г. глыбока памылковага, проста парадаксальнага тэзіса: быццам бы з узмацненнем пазіцый сацыялізму, далейшым прасоўваннем савецкай дзяржавы наперад класавая барацьба ў краіне будзе ўсё больш і больш абвастрацца. Дадзенае рашэнне, прынятае партыйным пленумам насуперак усялякай логіцы і здароваму сэнсу, павінна было апраўдаць беззаконне і рэпрэсіі. Гэтым актам бальшавіцкі таталітарны рэжым атрымаў сваё канчатковае афармленне.

Адпаведнымі станавіліся характарыстыкі тых, хто не падзяляў палітычныя падыходы вярхоўных кіраўнікоў партыі і дзяржавы. Выступаючы 5 сакавіка 1937 г. з заключным словам на згаданым пленуме ЦК, Сталін гаварыў: "Цяпер, я думаю, ясна для ўсіх, што цяперашнія шкоднікі і дыверсанты, якім бы сцягам яны ні маскіраваліся, трацкісцкім ці бухарынскім, даўно ўжо перасталі быць палітычнай плынню ў рабочым руху, што яны ператварыліся ў беспрынцыпную і безыдэйную банду прафесійных шкоднікаў, дыверсантаў, шпіёнаў, забойцаў. Зразумела, што гэтых паноў давядзецца граміць і выкарчоўваць бязлітасна, як ворагаў рабочага класа, як здраднікаў нашай радзімы. Гэта зразумела і не патрабуе далейшых тлумачэнняў"[1]. Дадзеная тэрміналогія характэрная для таго часу, калі бальшавіцкі таталітарызм набыў свае сталыя формы і яго сталінская інтэрпрэтацыя была рэалізавана ў тэорыі і на практыцы.

Аднак развіццё і далейшае ўкараненне таталітарнай сістэмы працягвалася і ў наступныя часы. Адным са

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.558, воп.1, спр.3209, арк.3.

сведчанняў гэтага з'явіліся рашэнні XVIII з'езда УКП(б), які адбыўся ў 1939 г. На ім, у прыватнасці, фактычна была адхілена ідэя аб самакіраванні грамадства. У ідэалогіі ўсё больш дамінавалі догмы, закладзеныя ў "Кароткім курсе гісторыі УКП(б)". У ім было дадзена не толькі сталінскае разуменне гісторыі партыі, але і зроблена спроба абгрунтаваць і замацаваць тую сістэму кіравання грамадствам, што была створана ў Савецкім Саюзе.

Важнейшым кампанентам любой таталітарнай сістэмы з'яўляецца культ асобы яе кіраўніка. У канцы 30-х гадоў дадзены фактар поўнасцю сфарміраваўся ў СССР. Гэта адбылося пры непасрэдным садзейнічанні Сталіна. У другой палове 30-х гадоў ён ужо не змякчаў характарыстыкі ў свой адрас, а, наадварот, узмацняў іх.

Паказальныя ў гэтых адносінах яго праўкі да справаздачнага даклада ЦК XVIII партыйнаму з'езду. Яны, як і раней, датычыліся ўспрыняцця яго выступлення дэлегатамі вышэйшага форуму партыі. У канцы даклада ім дапісана: "Усе дэлегаты ўстаюць, стоячы вітаюць т.Сталіна і ўстройваюць яму працяглую авацыю. Выкрыкі: "Ура! Няхай жыве таварыш Сталін! Вялікаму Сталіну ўра! Нашаму любімаму Сталіну ўра!"[1]

Мэце ўмацавання культу асобы і, зразумела, бальшавіцкай таталітарнай сістэмы павінна была служыць біяграфія Сталіна. Пытанне аб гэтым узнікла не пазней, чым у пачатку 30-х гадоў, калі свае паслугі ў яе напісанні прапанаваў Я.Яраслаўскі. Аднак на яго пісьме Сталін напісаў 1 жніўня 1931 г. рэзалюцыю: "Я супраць. Я думаю, што не прыйшоў яшчэ час для біяграфій"[2].

Біяграфія з'явілася пазней. У сувязі з тым што М.Горкі па сутнасці адмовіўся ўдзельнічаць у гэтай працы, яна была напісана вядомым французскім пісьменнікам-камуністам А.Барбюсам і выйшла з друку ў 1936 г. Дадзены факт сведчыць, што час для выхаду біяграфіі цяпер ужо настаў. Таталітарная сістэма ў СССР знаходзілася на заключным этапе свайго афармлення.

У гэтым кантэксце ўяўляюць цікавасць тыя ўстаўкі, што рабіліся Сталіным да сваёй біяграфіі. У прыватнасці, у папраўленай і дапоўненай кароткай біяграфіі, што з'явілася ў 1939 г., ім была зроблена, як свед-

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.558, воп.1, спр.3221, арк. 68.

[2] *Волкогонов Д.* Триумф и трагедия. Политический портрет И.В. *Сталина: В 2 кн.* М., 1990. Кн. 1. С.339.

чаць архіўныя матэрыялы, наступная ўстаўка: "У гэтай барацьбе з малаверамі і капітулянтамі, трацкістамі і зіноўеўцамі, бухарынымі і каменевымі канчаткова склалася пасля выхаду Леніна са строю тое кіруючае ядро нашай партыі ў складзе Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Куйбышава, Фрунзе, Дзяржынскага, Кагановіча, Арджанікідзе, Кірава, Яраслаўскага, Мікаяна, Андрэева, Шверніка, Жданава, Шкіратава і іншых, якое адстаяла вялікую справу Леніна і вывела савецкі народ на шырокую дарогу індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Кіраўніком гэтага ядра і вядучай сілай партыі і дзяржавы быў тав. Сталін"[1].

"Па-майстэрску выконваючы задачы правадыра партыі і народа, — працягваў ён далей, — і маючы поўную падтрымку ўсяго савецкага народа, Сталін, аднак, не дапускаў у сваёй дзейнасці і ценю зазнайства, самалюбавання. У сваім інтэрв'ю нямецкаму пісьменніку Людвігу, дзе ён адзначае вялікую ролю геніяльнага Леніна ў справе пераўтварэння нашай радзімы, Сталін проста заяўляе аб сабе: "Што датычыць мяне, то я толькі вучань Леніна, і мая мэта — быць дастойным яго вучнем"[2].

Акрамя ўставак Сталіным былі зроблены і некаторыя ўдакладненні ў тэкст сваёй біяграфіі. Замест фразы: "Сталін — гэта Ленін сёння" ён напісаў: "Сталін — дастойны прадаўжальнік справы Леніна, ці, як кажуць у нас у партыі, Сталін — гэта Ленін сёння"[3]. Такія ўстаўкі ці ўдакладненні былі ў асноўным захаваны ў наступных выданнях біяграфіі[4].

Гэтыя самаацэнкі, як і стварэнне самой біяграфіі, сведчаць аб росквіце з сярэдзіны 30-х гадоў культу асобы Сталіна як неад'емнай рысы бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Непамернае ўсхваленне яе кіраўніка, наданне яму статуса непагрэшнага і беспамылковага дзеяча моцна скоўвалі і заарганізоўвалі ўсё сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё ў краіне.

Для працэсу фарміравання ў Савецкім Саюзе, а разам з тым і ў Беларускай ССР таталітарнага рэжыму характэрна ўзмацненне адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання. Дамінаваў суб'ектыўны падыход

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.558, воп.1, спр.3400, арк.53.

[2] Там жа, арк. 54.

[3] Там жа, арк.141.

[4] Иосиф Виссарионович Сталин. Краткая биография. 2-е изд., испр. и доп. М., 1948. С. 104—105.

у вырашэнні самых важных пытанняў. Характэрнай праявай такіх падыходаў з'явілася недаацэнка законаў эканамічнага развіцця грамадства і пераведічэнне ролі суб'ектыўных фактараў. Паказальны ў гэтых адносінах вывад, зроблены Сталіным у 1934 г. у справаздачным дакладзе аб рабоце ЦК УКП(б) XVII партыйнаму з'езду: пасля таго як правільнасць палітычнай лініі партыі пацверджана практыкай шэрагу гадоў, а гатоўнасць рабочых і сялян падтрымліваць гэту лінію не выклікае больш сумненняў, роля так званых аб'ектыўных умоў звялася да мінімуму, тады як роля нашых арганізацый і іх кіраўнікоў стала рашаючай, выключнай[1].

Такім чынам, на працягу першых 20 гадоў існавання савецкай улады ў краіне была сфарміравана таталітарная сістэма кіравання эканамічным, грамадска-палітычным, культурным жыццём. Найбольш актыўна гэты працэс адбываўся ў першыя гады пасля прыходу да ўлады бальшавікоў і з канца 20-х гадоў. У час дзеяння новай эканамічнай палітыкі фарміраванне таталітарнай сістэмы аказалася замаруджаным, але ўмовы для яе развіцця працягвалі ствараццa.

Рашаючы крок у станаўленні таталітарызму ў СССР быў зроблены на працягу першай паловы 30-х гадоў. Затым гэта з'ява ўдасканальвалася і дасягнула пры жыцці Сталіна свайго апагею. Пасля яго смерці бальшавіцкая таталітарная сістэма перацярпела складаную эвалюцыю — ад спробы яе рэфармавання ў другой палове 50-х—60-х гадах да вяртання затым на неасталінісцкія пазіцыі і пераходу да новага, больш паспяховага этапу рэфармавання.

Беларуская ССР як адна з рэспублік Савецкага Саюза з'яўлялася важным суб'ектам усяго гэтага працэсу. Як і ў большасці месцаў краіны, у БССР увогуле адбываліся тыя ж самыя змены ў розных сферах жыцця. Аднак у некаторых адносінах, звязаных з фарміраваннем бальшавіцкай таталітарнай сістэмы і яе дзеяннем, рэспубліка мела свае прыярытэты.

## 3. Беларусь — звяно таталітарызму ў СССР

Усталяванне таталітарнай сістэмы ў Савецкім Саюзе адбывалася не спантанна і не экспромтам. Гэта

[1] XVII съезд ВКП(б). Стенографический отчет. М., 1934. С. 33.

была прадуманая палітыка як з боку тактыкі, так і стратэгіі. Пры яе ажыццяўленні ўсебакова ўлічваліся і ўнутры- і знешнепалітычныя ўмовы. Прымаліся пад увагу магчымыя процідзеянні, рабіліся спробы (і не безвыніковыя) па іх нейтралізацыі.

Важна было ўлічваць размеркаванне палітычных сіл у Цэнтры і на месцах. Пры гэтым стаўка рабілася на безумоўнае падпарадкаванне мясцовых работнікаў цэнтральным органам. Дадзеная палітыка лічылася адзіна правільнай. Яна брала пачатак не толькі з першых гадоў савецкай улады, але мела свае глыбокія карані. Ужо ў часы Расійскай імперыі, як вядома, бюракратызацыя жыцця дасягнула вельмі высокай ступені. Яна ахоплівала ўсе сферы дзейнасці. Стрыжнем такой сістэмы з'яўлялася надзвычай высокая ступень іерархічнай падпарадкаванасці дзяржаўных і іншых органаў. Хаця савецкай уладай у першыя гады яе існавання была аб'яўлена барацьба з бюракратызмам і валакітай, аднак зрухі тут былі нязначныя, а шмат у чым царская расійская бюракратычная сістэма была нават "удасканалена" ў напрамку павышэння цэнтралізацыі кіравання ўсімі сферамі сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця.

Такі стыль работы быў характэрны і для вядучай сілы грамадства — партыйных арганізацый. Выступаючы ў 1933 г. на сакавіцкім пленуме ЦК КП(б)Б, першы сакратар кампартыі Беларусі М.Ф.Гікала гаварыў наконт пастаноў, якіх маецца такая процьма, што часам не ведаеш, куды дзявацца. Пастановы пякуцца, як бліны. Можна нават па якому-небудзь выпадку ці без яго напісаць пастанову на 15 старонках, у якой усё будзе прадугледжана і з пункту гледжання тэорыі, і з пункту гледжання перспектыў і г.д. і да т.п. [1]

Высокая цэнтралізацыя кіравання дзейнасцю грамадства — характэрная рыса ўкладу жыцця ва ўмовах узнікнення таталітарных рэжымаў. Па меры іх умацавання і далейшай эвалюцыі яшчэ большай ступені цэнтралізацыі дасягалі ўсе бакі кіравання. Такое ўзмацняючае ўздзеянне, калі адбывалася пашырэнне і паглыбленне з'явы, стварала замкнутае кола, у якім вырастаў "палітычны монстр", што станавіўся таталітарным рэжымам.

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр. 227, арк. 127.

У дадзеных адносінах заслугоўвае ўвагі тая роля, якая належала Беларускай ССР ва ўзаемаадносінах з Цэнтрам. На гэта былі адпаведныя прычыны, што сфарміраваліся на працягу доўгага перыяду, ва ўсякім разе з таго часу, як беларускія землі далучылі ў апошняй трэці XVIII ст. да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай.

Калі Беларусь знаходзілася ў складзе Расіі, шмат было зроблена, каб як мага мацней і глыбей уцягнуць яе ў расійскую рэчаіснасць, на справе ператварыць у паўночна-заходнюю ўскраіну імперыі. Што датычыць гаспадарчых сувязей, дык у перыяд складвання буржуазных адносін яны былі неабходнымі. Лагічным працэсам былі збліжэнне і ўзаемны ўплыў нацыянальных культур, даволі блізкіх па сваіх асноўных прыкметах. Ненатуральным, але заканамерным ва ўмовах царскага рэжыму з'яўлялася ажыццяўленне палітыкі татальнай русіфікацыі, што актыўна праводзілася ў Беларускім краі. Калі прыняць пад увагу, што перад далучэннем беларускіх зямель да Расіі быў працяглы і жорсткі наступ на беларускі этнас і яго культуру з боку правячых колаў Рэчы Паспалітай, які нават вылі́ўся ў прыняцце ў канцы XVII ст. пастановы аб забароне пісаць дзяржаўныя дакументы на беларускай мове, то ўсё гэта, разам узятае, стварала надзвычай цяжкія ўмовы захавання самабытнасці беларусаў, развіцця іх мовы, традыцый, культуры.

Нягледзячы на заявы савецкай улады аб свабодным развіцці кожнага народа, русіфікатарская палітыка ў многім працягвалася і пасля кастрычніка 1917 г. Гэта ў пэўнай ступені, а, можа, нават у першую чаргу, адносілася да Беларускай ССР, за выключэннем непрацяглага перыяду ў сярэдзіне 20-х гадоў, калі ў рэспубліцы даволі актыўна ажыццяўлялася палітыка беларусізацыі. Усё гэта прывяло да таго, што БССР была моцна прывязана перш за ўсё да Расіі не толькі адміністрацыйна, у межах адной цэнтралізаванай дзяржавы — Савецкага Саюза, але і праз этнічныя ўзаемадачыненні. Дадзеныя сувязі распаўсюджваліся на ўсе сферы жыцця і мелі глыбокі характар.

У эканамічных адносінах гэта выражалася ў цесным перапляценні гаспадарчых сувязей, што складваліся на працягу канца XVIII — пачатку XX ст., калі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, напрыклад, адбывалася раяніраванне, вырошчванне пэўных культур у *Беларускім краі ў суадносінах з паўночна-заходнім рэ-*

гiёнам Расiйскай імперыі. Пры савецкай уладзе гэта раяніраванне і дадзеныя сувязі былі ў асноўным захаваны, за выключэннем Заходняй Беларусі, якая, згодна грабежніцкаму ў адносінах да беларускага народа Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 г., была аддадзена пад уладу Польшчы. Больш таго, эканоміка БССР у сувязі з адным цэнтралізаваным планаваннем, першымі савецкімі пяцігодкамі яшчэ больш інтэгравалася з эканомікай усяго Савецкага Саюза, у першую чаргу Расійскай Федэрацыі і Украінскай ССР. Пашырэнне і паглыбленне эканамічных сувязей з'яўлялася натуральным працэсам і спрыяла яшчэ большаму замацаванню БССР у складзе СССР.

У грамадска-палітычных адносінах Беларуская ССР была цесна звязана з краінай у цэлым не толькі ў адміністрацыйных межах жорстка цэнтралізаванай дзяржавы, але і шляхам тых палітычных дзеянняў, якія былі зроблены вярхоўным кіраўніцтвам у адносінах да беларускага народа. У першую чаргу гэта ўтварэнне БССР. Хаця дадзеная своеасаблівая дзяржаўная адзінка ўзнікла пазней, чым у суседзяў, і ўсё рабілася вельмі тэрмінова ў канцы 1918 г., аднак сам факт атрымання беларускім народам дзяржаўнасці ў форме Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі меў адпаведнае значэнне для ўзмацнення палітычных сувязей з Цэнтрам.

Яшчэ ў большай ступені гэтыя сувязі ўмацаваліся пасля вяртання ў 1924 і 1926 гг. Беларускай ССР усходнебеларускіх тэрыторый, якія ў 1919 г. па ваенна-палітычных меркаваннях былі перададзены Расійскай Федэрацыі. Гэты акт пэўным чынам вылучыў БССР з шэрагу іншых савецкіх рэспублік у сэнсе ўмацавання яе пазіцый.

Аднак нельга не звярнуць увагу на тую акалічнасць, што насельніцтва ўсходніх беларускіх тэрыторый, якое знаходзілася з 1919 г. да сярэдзіны 1920-х гадоў у складзе Расійскай Федэрацыі, жыло па яе законах. У выніку сярод гэтай часткі беларускага народа са спазненнем пачала ажыццяўляцца палітыка беларусізацыі. Менталітэт мясцовых жыхароў тут яшчэ ў большай ступені, чым у насельніцтва астатняй тэрыторыі Беларусі, быў наблізаны да менталітэту рускага народа.

Трэба мець на ўвазе і этнічную блізкасць беларусаў да рускіх наогул. Гэта, як вядома, праяўлялася і праяўляецца як у мове, так і ў звычаях, традыцыях, культуры ў цэлым. Тыя адрозненні, што існуюць паміж

братнімі славянскімі народамі, уключаючы ўкраінцаў, і ў перыяд Расійскай імперыі, і ў савецкі час нярэдка ігнараваліся. Гэта рабілася свядома, для ўзмацнення русіфікатарскіх тэндэнцый. З гэтай мэтай ці замоўчваліся ці адпаведна трактаваліся вялікія адрэзкі нашай гісторыі з сярэднявечча, калі беларускі этнас, яго мова, як і культура наогул, атрымалі значнае развіццё, дасягнуўшы еўрапейскага ўзроўню.

Да таго ж мэтанакіраваныя і сістэматычныя ўнушэнні ў свядомасць беларусаў на працягу доўгага часу думкі, што яны менш за ўсё з'яўляюцца асобнай нацыяй, а больш за ўсё — своеасаблівай і значнай часткай рускага народа, давалі свой плён.

У выніку правядзення ў часы Расійскай імперыі і ў савецкі перыяд палітыкі русіфікацыі нацыянальна свядомая частка беларускага насельніцтва ўвесь час змяншалася. Нават вёска, якая заўсёды была захавальніцай нацыянальных адметнасцей, страчвала сваю самабытнасць.

Высокая ступень русіфікацыі беларусаў рабіла БССР вельмі прыдатным месцам для адпрацоўкі бальшавіцкай мадэлі таталітарызму. Гэта адна з істотных акалічнасцей у разуменні таго, чаму Беларуская ССР лічылася ў цэнтральных партыйных і дзяржаўных органах Савецкага Саюза рэспублікай, найбольш падатлівай для правядзення палітыкі, скіраванай на ўсталяванне цэнтралізаванага кіраўніцтва, а фактычна таталітарнай сістэмы.

Не выпадкова, больш таго, у дадзеных адносінах заканамерна, што прыдуманы ў кабінетах кіраўнікоў карных органаў "Саюз вызвалення Беларусі", які ніколі не існаваў, у найбольш значным варыянце быў здзейснены менавіта ў БССР. Па дадзенай судовай справе ў рэспубліцы праходзіла 108 вядучых нацыянальных інтэлігентаў. На Украіне колькасць тых, хто праходзіў па справе "Саюза вызвалення Украіны", дасягала 45 чалавек[1].

Адным са шляхоў уплыву Цэнтра на рэгіёны, прыцягнення іх да агульнага партыйна-дзяржаўнага рэчышча была жорстка праводзімая класавая палітыка. На практыцы яна мела надзвычай шмат праяўленняў, у тым ліку ў адносінах да нацыянальна-культурнай спадчыны. У гэтай сувязі

[1] *Нарысы гісторыі Беларусі.* Ч.2. С. 148, 153.

прыкметнымі з'яўляюцца словы, якія належаць аднаму з кіраўнікоў кампартыі Беларусі В.Г.Кнорыну. Яны яскрава ілюструюць класавыя падыходы савецкай улады да нацыянальнай гісторыі. У час свайго другога знаходжання на чале ЦК КП(б)Б у 1927—1928 гг. ён пісаў: "Мы так раскрытыкуем Смаляцічаў і Тураўскіх, што двух радкоў ім будзе шкада прысвяціць у нашай гісторыі, бо яны ідуць ад іншай лініі, а не ад лініі працоўных мас"[1]. Такія адносіны з боку партыйнага кіраўніцтва да дзеячаў нацыянальнай культуры былі характэрнымі не толькі для таго часу, калі гэта выказванне з'явілася, але і для наступных дзесяцігоддзяў.

Правядзенне жорсткай класавай лініі ў нацыянальна-культурным развіцці хутчэй і, магчыма, лягчэй за ўсё адбывалася ў Беларускай ССР. Тут нават можна было адмаўляцца ад сваіх гістарычных каранёў. Асноўнай прычынай гэтага з'яўлялася русіфікатарская палітыка ў Беларускім краі як царскіх улад, так і савецкага кіраўніцтва. Нягледзячы на прынцыповую розніцу паміж імі, агульная накіраванасць нацыянальнай палітыкі адносна Беларусі была блізкай. У выніку яе правядзення нацыянальная гістарычная свядомасць сярод беларусаў стала вельмі паніжанай, а нярэдка і зусім адсутнічала.

Гэта праяўлялася нават у першыя гады ўстанаўлення савецкай улады, асабліва на тых тэрыторыях, якія былі ўключаны ў 1919 г. у склад Расійскай Федэрацыі. У прыватнасці, у час перапісу насельніцтва, што адбыўся ў 1920 г., удзельная вага беларусаў у Гомельскім і Рэчыцкім паветах нечакана зменшылася адпаведна да 22 і 43 %, у той час як ранейшыя перапісы 1897 і 1917 гг. давалі лічбу ў межах 74—95 %[2]. Рэзкае зніжэнне колькасці тых, хто запісаў сябе ў 1920 г. беларусамі, тлумачыцца меркаваннямі, што яны, знаходзячыся не ў складзе БССР, могуць быць і іншай нацыянальнасці.

Цяга да Расіі ў пэўнай часткі беларускага грамадства асабліва выразна праяўлялася менавіта на ўсходнебеларускіх тэрыторыях, што з 1919 г. знаходзіліся ў складзе Расійскай Федэрацыі. Гэта адзначана ў матэрыялах камісій, якія працавалі тут у сярэдзіне 20-х гадоў у сувязі з вывучэннем пытання аб далучэнні дадзеных тэрыторый да БССР.

---

[1] *Кнорын В.* За культурную рэвалюцыю: Зб. артыкулаў. Мн., 1928. С.81.

[2] *Вялікі А.* "... По прочтении ... это письмо сжечь" // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1. С.35.

У іх канстатуецца, што ў гэтых мясцінах наглядаліся даволі моцныя прарасійскія настроі, асабліва сярод кіруючых партыйна-савецкіх работнікаў, а таксама часткі насельніцтва. У сакавіку 1926 г. кіраўніцтва Гомельскага губернскага камітэта партыі канстатавала, што з боку многіх работнікаў маюць месца фармальныя, а нярэдка і адмоўныя адносіны да нацыянальнай работы. У інфармацыі рабіўся вывад: у галіне беларускай дзейнасці сустракаюцца значна большыя цяжкасці, чым можна было меркаваць. Гэта адбывалася таму, што мела месца коснасць самога насельніцтва, якое часта лічыла сябе не беларусамі, нягледзячы на тое што па ўсіх прыкметах і па мове яно з'яўлялася беларускім[1].

Такое становішча знаходзіла праяўленне ў самых розных формах. Як сведчаць матэрыялы саюзных органаў, у 1926 г. у сувязі з намерам далучыць Гомельшчыну да БССР там адбываліся непажаданыя дзеянні. Шэраг адказных работнікаў, што займалі кіруючыя пасады ў губерні і горадзе і былі настроены супраць далучэння да БССР, праяўлялі "выключна гарачы патрыятызм" мясцовага значэння, які межаваў з парушэннем партыйнай лініі ў нацыянальнай палітыцы. На практыцы гэта выліваласяў выключэнні членаў камсамола з камсамольскіх арганізацый за спробы весці беларускую работу, у пагрозу прымяніць зброю да беспартыйнага настаўніка з боку работніка аддзела асветы за тое, што той адстойваў сваю думку аб неабходнасці павелічэння колькасці беларускіх школ, у забарону беларускаму тэатру, які гастраляваў на Гомельшчыне, пастаноўкі спектакля на беларускай мове. Была нават адменена лекцыя старшыні Інбелкульта У.М.Ігнатоўскага па гісторыі беларускай культуры і мастацтва. Наглядалася шмат іншых такіх праяў[2].

У верасні 1926 г. палітбюро ЦК УКП(б) стварыла камісію па абследаванню Гомельшчыны, якую даручана было ўзначаліць вядомаму партыйнаму дзеячу Я.Петэрсу. У пачатку кастрычніка камісія правяла некалькі пасяджэнняў, на якіх было вырашана абследаваць тыя месцы Гомельскага і Рэчыцкага паветаў адносна нацыянальнага складу насельніцтва, якія, згодна перапісу 1917 і 1920 гг., моцна разыходзіліся паміж сабою, а таксама на мяжы з савецкай Беларуссю і савецкай

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп. 85, спр. 3, арк. 2—3.

[2] *Там жа*, арк. 10.

Украінай. Вывучэнню падлягалі таксама тыя воласці, дзе спроба пераводу школ на беларускую мову закончылася няўдачай. Што датычыць методыкі працы, то камісія вырашыла не выкарыстоўваць для вывучэння пытання сходы насельніцтва, а толькі праводзіць гутаркі з нізавым актывам, сялянамі, наведваць беларускія і рускія школы, хаты-чытальні, іншыя культасветустановы[1].

У выніку праведзенай работы камісія зрабіла вывады па этнічнай характарыстыцы жыхароў шэрагу канкрэтных мясцін. Яны, у прыватнасці, зводзіліся да наступнага. Насельніцтва Уваравіцкай воласці ў асноўнай сваёй масе беларускае, размаўляе на простанароднай беларускай мове з вялікай прымессю рускіх слоў. У Чачэрскай воласці беларуская мова асабліва моцна русіфікавана. Пры даследаванні калектыву Добрушскай папяровай фабрыкі камісія ўстанавіла, што большасць рабочых складаюць мясцовыя сяляне, 60 % з якіх беларусы, што яны гавораць пераважна на рускай мове і што тут асабліва далёка зайшоў працэс абрусення. На запалкавай фабрыцы "Везувій" была звернута ўвага на тое, што 1300 рабочых выпісвалі 900 газет, сярод якіх не было ні адной беларускамоўнай. Агульныя вывады камісіі зводзіліся да наступнага: у абследаваных мясцінах пераважае простанародная беларуская мова з вялікай прымессю рускіх слоў і адсутнічае нацыянальная самасвядомасць. Большасць насельніцтва адмоўна адносіцца да палітыкі беларусізацыі, меншасць займае абыякавую пазіцыю. І толькі ў некаторых прадстаўнікоў насельніцтва адносіны станоўчыя[2].

У цэнтральнай Беларусі пазіцыі беларускага этнасу былі значна мацнейшымі, асабліва ў час ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі. Самааддана ішло змаганне за нацыянальнае выжыванне на заходнебеларускіх землях, якія ўваходзілі ў склад Польшчы.

Аднак абыякавыя адносіны да сваіх нацыянальных каранёў, што назіраліся ў значнай частцы беларусаў, нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці ці яе поўная адсутнасць рабілі беларускую нацыю вельмі падатлівай да расійскага ўплыву, а фактычна і ўплыву партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР. У адрозненне ад беларусаў іншыя нацыянальнасці — украінцы, на-

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 85, спр.3, арк. 12—36.

[2] Там жа, арк. 12—17.

роды Прыбалтыкі, Каўказа, Сярэдняй Азіі — маюць непараўнальна больш высокае пачуццё нацыянальнай годнасці і ў выніку ўздзеянне Цэнтра на іх было больш складаным і менш выніковым.

Дадзеная акалічнасць прыводзіла да таго, што ў фарміраванні і ажыццяўленні бальшавіцкай палітыкі таталітарнай накіраванасці ў рэгіёнах перш за ўсё мелася на ўвазе Беларуская ССР. Яна заўсёды разглядалася як важнае звяно гэтага працэсу.

У актыўным уцягненні БССР у арбіту бальшавіцкай таталітарнай сістэмы адметную ролю адыграла геапалітычнае становішча рэспублікі. Цэнтральным кіраўніцтвам Савецкага Саюза Беларусь фактычна разглядалася не толькі як стратэгічна важны калідор у Еўропу, але ёй адводзілася на працягу 20—30-х гадоў буферная роля паміж савецкай Расіяй і капіталістычнымі дзяржавамі Захаду. У гэтых адносінах для Масквы было вельмі важна трымаць дадзены рэгіён у належным падпарадкаванні. Больш надзейна гэта можна было зрабіць шляхам першачарговага распаўсюджвання таталітарных метадаў кіравання на Беларусі.

У тым, што рэспубліка стала важным звяном адпрацоўкі метадаў таталітарызму ў СССР, адыграла ролю і тая акалічнасць, што невялікія памеры Беларускай ССР, як і ўсёй Беларусі, у параўнанні з Савецкім Саюзам і нават з яго важнейшай часткай — Расійскай Федэрацыяй не дазвалялі беларускаму народу адыгрываць хоць адносна самастойную ролю ў вырашэнні агульнадзяржаўных спраў. Падпарадкаванасць Цэнтру была характэрна і для іншых саюзных рэспублік, аднак з-за вышэй адзначаных фактараў, звязаных з рознабаковай блізкасцю Беларускай ССР да Расійскай Федэрацыі і найбольш значнай залежнасцю яе ад саюзных органаў, рэспубліка рабілася асабліва васальнай. Па гэтай прычыне розныя бакі фарміравання і развіцця бальшавіцкай таталітарнай сістэмы знаходзілі праламленне менавіта тут.

Адным са сведчанняў гэтага з'яўляецца разгляд на камісіі партыйнай фракцыі прэзідыума Цэнтральнага выканаўчага камітэта Саюза ССР праекта Канстытуцыі Беларускай ССР. Камісія была створана менавіта з гэтай мэтай. На пасяджэнні 31 сакавіка 1927 г. пад старшынствам А.С.Енукідзе, дзе Беларускую ССР прадстаўляў сакратар ЦВК рэспублікі А.І.Хацкевіч, было зроблена 11 удакладненняў у тэкст дакумента. З улі-

кам таго што ўдалося дасягнуць пагадненні па ўсіх зробленых заўвагах і асноўныя палажэнні праекта ўжо былі абмеркаваны на сесіі ЦВК БССР і сярод працоўных рэспублікі, камісія прызнала магчымым вынесці дадзены праект Канстытуцыі на з'езд саветаў Беларускай ССР[1].

Кантроль за заканадаўчай дзейнасцю — адзін з важнейшых напрамкаў усталявання і развіцця таталітарнай сістэмы ў СССР. Уніфікаваныя законы, у першую чаргу канстытуцыі, а таксама іншыя нарматыўныя акты былі важным сродкам фарміравання і функцыяніравання цэнтралізаванай дзяржавы. Спецыфіка саюзных рэспублік, у тым ліку БССР, у іх абмяжоўвалася. Асноўная ўвага была звернута на заканадаўчую рэгламентацыю грамадскіх працэсаў.

Цэнтральныя ўлады пры правядзенні палітыкі, скіраванай на яшчэ большае прыцягненне да іх рэгіёнаў у першую чаргу ў выглядзе адміністрацыйна-палітычных адзінак — саюзных рэспублік, выкарыстоўвалі шмат іншых шляхоў — эканамічных, палітычных, сацыяльных, культурных, адміністрацыйных. Адным з важнейшых сярод іх з'яўлялася кадравая палітыка. У першую чаргу яна датычылася кіраўнікоў кампартый саюзных рэспублік. Гэтыя прызначэнні заўсёды, з першых гадоў існавання савецкай улады, былі выключнай прэрагатывай Цэнтра. Характэрна, што змены дадзенай катэгорыі кіраўнікоў адбываліся даволі часта. Што датычыць Беларускай ССР, то на працягу пачатковых 20 гадоў савецкай улады першыя сакратары ЦК кампартыі Беларусі замяняліся дзесяць разоў. Затым яны сталі працаваць больш працяглыя тэрміны. Паслядоўнасць гэтых змен у адносінах да канкрэтных асоб была наступнай:

А.Ф.Мяснікоў (снежань 1918 г. — сакавік 1920 г.)
В.Г.Кнорын (сакавік 1920 г. — май 1922 г.)
В.А.Багуцкі (май 1922 г. — люты 1924 г.)
А.М.Асаткін-Уладзімірскі (люты—верасень 1924 г.)
А.І.Крыніцкі (верасень 1924 г. — май 1927 г.)
В.Г.Кнорын (май 1927 г. — лістапад 1928 г.)
Я.Б.Гамарнік (лістапад 1928 г. — кастрычнік 1929 г.)
К.В.Гей (студзень 1930 г. — студзень 1932 г.)
М.Ф.Гікала (студзень 1932 г. — чэрвень 1937 г.)
В.Ф.Шаранговіч (чэрвень 1937 г. — чэрвень 1938 г.)
П.К.Панамарэнка (чэрвень 1938 г. — сакавік 1947 г.)

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 85, спр. 128, арк.. 7 — 8.

М.І.Гусараў (сакавік 1947 г. — май 1950 г.)
М.С.Патолічаў (ліпень 1950 г. — ліпень 1956 г.)
К.Т.Мазураў (ліпень 1956 г. — сакавік 1965 г.)
П.М.Машэраў (сакавік 1965 г. — кастрычнік 1980 г.)
Ц.Я.Кісялёў (кастрычнік 1980 г. — студзень 1983 г.)
М.М.Слюнькоў (студзень 1983 г. — люты 1987 г.)
М.Я.Сакалоў (люты 1987 г. — лістапад 1990 г.)
А.А.Малафееў (лістапад 1990 г. — жнівень 1991 г.).

Як вядома, першыя сакратары ЦК кампартый саюзных рэспублік фактычна з'яўляліся ў межах сваёй кампетэнцыі кіраўнікамі адпаведных рэгіёнаў. Тое, што ў міжваенны перыяд сярод прыведзеных асоб фактычна не было беларусаў (за выключэннем В.Ф.Шаранговіча, які ўзначальваў кампартыю Беларусі зусім невялікі прамежак часу, а затым быў рэпрэсіраваны), гаворыць аб скіраванасці нацыянальнай палітыкі цэнтральных партыйных органаў адносна Беларускай ССР. У пасляваенны час толькі з 1956 г., пасля XX з'езда партыі, першымі сакратарамі ЦК кампартыі Беларусі пачалі выбіраць ураджэнцаў рэспублікі. Асноўнай задачай гэтых, як і іншых кіраўнікоў БССР, з'яўлялася правядзенне той палітычнай лініі, якая дыктавалася Цэнтрам і была скіравана ў першую чаргу на ўсталяванне, а затым і ўзмацненне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы.

Усе першыя сакратары кампартыі Беларусі старанна выконвалі ўказанні цэнтральных партыйных органаў. Ды інакш і быць не магло. Таталітарная сістэма нават у стадыі свайго фарміравання не цярпела іншых падыходаў. Адметнай стараннасцю ў выкананні ўказанняў Цэнтра вызначаўся В.Г.Кнорын, які не выпадкова на працягу 20-х гадоў двойчы ўзначальваў кампартыю Беларусі. Здатным выканаўцам лініі Цэнтра быў А.І.Крыніцкі, асабліва па пытаннях правядзення нацыянальнай палітыкі і падрыхтоўкі будучай расправы з многімі прадстаўнікамі нацыянальнай інтэлігенцыі. Аднак асаблівая роля ў правядзенні палітыкі кіраўніцтва Савецкага Саюза належала К.В.Гею. Ён узначальваў рэспубліканскую партыйную арганізацыю ў пачатку 30-х гадоў на працягу двухгадовага перыяду. За гэты невялікі прамежак часу была праведзена судовая справа "Саюза вызвалення Беларусі", па якой былі рэпрэсіраваны вядомыя нацыянальныя інтэлігенты. У гэты тэрмін асабліва імкліва, з шырокім выкарыстаннем нацiскных метадаў вялася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Іменна пад кіраўніцтвам К.В.Гея бюро і сак-

ратарыятам ЦК КП(б)Б неаднаразова прымаліся паспешныя рашэнні аб тэрміновым заканчэнні калектывізацыі. Адначасова ў Маскву ішлі "пераможныя" рапарты. Яго дзеянні ў распаўсюджванні таталітарных метадаў кіраўніцтва ў Беларускай ССР асабліва значныя.

Іншыя кіраўнікі Беларускай ССР таксама ўносілі адпаведны ўклад у стварэнне і функцыяніраванне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Гэта заканамерна, паколькі яны з'яўляліся часткай агульнага дзяржаўнага механізма, які не дапускаў ніякіх адхіленняў ад афіцыйнай лініі. Жорсткая падпарадкаванасць цэнтральным партыйна-дзяржаўным органам з'яўляецца неад'емнай рысай любога аўтарытарнага праўлення. Савецкая краіна не была выключэннем.

Першай задачай гэтай адміністрацыйнай іерархіі было будаўніцтва новага грамадства на сацыялістычных пачатках, як яны тады ўяўляліся. Напорыстасць у дадзенай справе ва ўсёй дзяржаве, у тым ліку ў Беларускай ССР, была надзвычай вялікай. Вынікі ў галіне індустрыялізацыі і культурнага будаўніцтва з'яўляліся значнымі. Што датычыць сельскагаспадарчай вытворчасці, то пасля рэзкага спаду ў пачатку 30-х гадоў яна з вялікімі цяжкасцямі аднаўляла ранейшыя паказчыкі.

На агульнадзяржаўным фоне роля Беларускай ССР як важнага звяна бальшавіцкай таталітарнай сістэмы выглядае выразна, а нярэдка своеасаблівa.

РАЗДЗЕЛ 2

# ВЫКАРЫСТАННЕ ТАТАЛІТАРНЫХ МЕТАДАЎ КІРАВАННЯ НА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

## 1. У час грамадзянскай вайны і барацьбы з інтэрвентамі

Прыход да ўлады бальшавіцкай партыі ў кастрычніку 1917г. быў ажыццёўлены пад лозунгамі ўсталявання міру і перадачы зямлі тым, хто яе апрацоўваў, — сялянам. Для здзяйснення гэтых і іншых мэт уся ўлада перадавалася саветам. Змест лозунгаў быў прываблівым. За гады першай сусветнай вайны працоўныя моцна адчулі цяжар ваеннага ліхалецця, рэзкае зніжэнне жыццёвага ўзроўню, абвастрэнне сацыяльных адносін. Што датычыць зямлі, то гэта даўняе пытанне расійскай, у тым ліку беларускай рэчаіснасці. Яго вырашалі не толькі ў час рэформы 1861 г., але і сталыпінскіх пераўтварэнняў. Аднак яно так і засталося найбольш вострай праблемай тагачаснага жыцця. Вынясенне на першае месца лозунгаў усталявання міру і справядлівага вырашэння зямельнага пытання ў вялікай ступені дапамагло бальшавіцкай партыі пераможна здзейсніць Кастрычніцкую рэвалюцыю і ўсталяваць ва ўсіх рэгіёнах краіны, у тым ліку і на Беларусі, уладу рабочых і сялян.

Разам з тым з першых дзён існавання савецкая ўлада зарэкамендавала сябе як цвёрдая і бескампрамісная сіла, якая мае намер выкарыстоўваць для захавання рэвалюцыйных заваёў любыя сродкі, у тым ліку і самыя жорсткія. Гэтыя заявы рабіліся бальшавіцкімі кіраўнікамі розных узроўняў, уключаючы і тых, што займалі найбольш высокія пасады. Менавіта ад іх у першую чаргу зыходзілі ўказанні аб прымяненні рашучых мер, уключаючы расстрэлы, да тых, хто перашкаджаў ажыццяўленню рэвалюцыйных мерапрыемстваў.

Увогуле ў гэтым не было нічога нечаканага. Папярэдні вопыт сведчыў аб такіх падыходах. Дастаткова ўспомніць Французскую рэвалюцыю канца XVIII ст., Парыжскую камуну ці іншыя сацыяльныя ўзрушэнні. Ігнараванне альтэрнатыўных падыходаў, непрыняцце іншадумства, рашучае падаўленне супраціўлення, знішчэнне многага з таго, што было створана раней, станавіліся нормай гэтых радыкальных сацыяльных з'яў.

У тых умовах рэвалюцыйныя выступленні пачалі абсалютызавацца. Ім аддавалася яўная перавага ў параўнанні з рэфармацыйным шляхам развіцця, які ўсё больш лічыўся марудным, неэфектыўным, а таму і неперспектыўным. Рэвалюцыі называліся рухавікамі чалавечага прагрэсу, лакаматывамі гісторыі. З выхадам на авансцэну палітычнай барацьбы рабочага класа такія падыходы сталі яшчэ больш радыкальнымі. Яны былі ўзведзены ў ранг бясспрэчных.

Такія падыходы атрымалі найбольш поўнае адлюстраванне ў працах Маркса і Энгельса. Іх творы пранізвала думка: рабочаму класу ў барацьбе за ўладу і за яе ўтрыманне неабходна праяўляць цвёрдасць, якая ўжо дэманстравалася ў час папярэдніх рэвалюцый. Гэта палажэнне ператваралася ў патрабаванне, што без рэвалюцыйнага насілля нельга вырашыць задачы, якія паўсталі перад пралетарыятам.

Задача стварэння сацыялістычнага, а затым і камуністычнага грамадства таксама была надзвычай абсалютызаванай. Тое, што існавала толькі як тэорыя, без усялякай сур'ёзнай праверкі на практыцы падавалася як вяршыня развіцця чалавечага грамадства. Мэта павінна быць, аднак дзеля даволі невыразна акрэсленай будучыні моцна ганьбавалася тагачасная рэчаіснасць і тым больш мінулае. Гэта, у прыватнасці, было заключана ў шырока вядомым выразе Маркса, што з буржуазнай фармацыяй заканчваецца перадгісторыя чалавечага грамадства[1].

Вельмі многае заключана ў дадзеным кантэксце ў слове "перадгісторыя". Тут і пагардлівыя адносіны да мінулага і надзвычай вялікая вера ў тую будучыню, якая павінна быць створана на аснове распрацаванай тэорыі. Заканамерна, што рэзка адмоўнае стаўленне да мінулага цягнула за сабою адпаведныя адносіны да тых, хто яго ствараў і хто з'яўляўся нось-

[1] *Маркс К.* К критике политической экономии // *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд. Т.13. С.8.

бітам сучасных Марксу і Энгельсу рэалій жыцця. Так што гэты выраз Маркса, які мы раней называлі "вялікім прадбачаннем", пры больш глыбокай і патрабавальнай ацэнцы выступае як непавага да ўсёй папярэдняй гісторыі чалавецтва.

Разам з тым нельга не адзначыць, што ў вучэнні Маркса і Энгельса ўтрымліваўся грунтоўны аналіз буржуазнага грамадства, яго эканамічных адносін, сацыяльнай сферы, грамадска-палітычнага жыцця. Асабліва падрабязна аналізавалася эканамічная сістэма, яе дадатныя бакі і перш за ўсё супярэчнасці і антаганізмы. Гэта было зроблена ў мэтах выпрацоўкі эканамічнай мадэлі будучага сацыялістычнага і камуністычнага грамадства.

Такія адносіны да існуючага ладу жыцця, як і да папярэдніх набыткаў чалавецтва і да іх стваральнікаў, у многім былі пераняты бальшавіцкай партыяй. Разам з тым у працах Леніна былі зроблены новыя вывады ў прымяненні да больш высокага этапа развіцця капіталізму. Аднак адмоўныя адносіны да тых, хто быў не згодны з бальшавіцкай платформай, увесь час заставаліся цвёрдымі і нават жорсткімі. Асабліва рэльефна гэта выявілася пасля прыходу бальшавікоў да ўлады. Вядомы дэвіз: "Хто не з намі — той супраць нас" не пакідаў месца ў грамадстве тым, хто сумняваўся ці тым больш пярэчыў палітыцы бальшавікоў. Суровыя адносіны не толькі да праціўнікаў, але і да тых, хто быў паміж барыкадамі, з самага пачатку рабілі бальшавіцкую ўладу бескампраміснай, жорсткай, якая не ўспрымае ніякіх пярэчанняў.

Тон у гэтай справе задаваў кіраўнік партыі і савецкай дзяржавы — Ленін. Яго пісьмовая спадчына ўтрымлівае вялікую колькасць рэзкіх ацэнак праціўнікаў савецкай улады, патрабаванняў непрымірымай барацьбы з імі, цвёрдасці і рашучасці ў дасягненні пастаўленых мэт. Ва ўмовах грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі гэта ўспрымалася як зусім звычайны падыход. Аднак пазней, у прынцыпова новых абставінах, у час аднаўлення гаспадаркі і далейшага мірнага будаўніцтва, многія дзеячы партыі і дзяржавы разумелі гэта літаральна як кіраўніцтва да дзеяння без асаблівай карэкціроўкі на якасна новыя ўмовы жыцця.

Ілюстрацыяй да гэтага, у прыватнасці, можа быць ленінская характарыстыка інтэлігенцыі, дадзеная ў яго знакамітым артыкуле "Як арганізаваць спабор-

ніцтва?", напісаным у пачатку 1918 г. У ім, у прыватнасці, гаварылася: "Рабочыя і сяляне ніколькі не заражаны сентыментальнымі ілюзіямі паноў, інтэлігентаў, усіх гэтых наважызненскіх і іншых хлюпікаў, якія "крычалі" супраць капіталістаў да хрыпаты, "жэстыкулявалі" супраць іх, "грамілі" іх, з тым, каб расплакацца і весці сябе як пабітае шчаня, калі дайшло *да справы*, да рэалізацыі пагроз, да выканання на практыцы справы *зvяржэння* капіталістаў"[1]. Гэтыя словы ў многім прадвызначылі будучыя адносіны кіраўнікоў партыі і дзяржавы да інтэлігенцыі, нават у пэўнай ступені да М.Горкага, які ў канцы 1917 г. выдаваў газету "Новая жизнь".

Паплечнікі і вучні Леніна ў сваіх ацэнках сутнасці рэвалюцыйных падзей, вызначэнні метадаў і форм барацьбы за новае жыццё ішлі нярэдка далей свайго настаўніка ў рэзкасці і катэгарычнасці ацэнак. Характэрнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца словы Сталіна, напісаныя ім напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі: "Руская рэвалюцыя звергла нямала аўтарытэтаў. Яе магутнасць выяўляецца, паміж іншым, у тым, што яна не схілялася перад "гучнымі імёнамі", брала іх на службу ці адкідвала іх у небыццё, калі яны не хацелі ў яе вучыцца... Рэвалюцыя не ўмее ні шкадаваць, ні хаваць сваіх мерцвякоў..."[2]

Гэтыя марксісцка-ленінска-сталінскія падыходы да практыкі рэвалюцыйнай барацьбы і будаўніцтва новага грамадства ўтрымлівалі выразныя аўтарытарныя характарыстыкі. Яны з'явіліся падмуркам для трансфармацыі бальшавіцкай улады ў дыктатарскую, а затым і таталітарную сістэмы.

Дадзены працэс адбываўся як у Цэнтры, так і на месцах. Магчыма, найбольш яскравай праявай гэтага ў першыя месяцы існавання савецкай улады з'явіўся роспуск Устаноўчага сходу ў пачатку 1918 г. У напісаным Леніным праекце дэкрэта аб яго роспуску гаварылася: "Для сацыялістычнай рэвалюцыі неабходны не так званыя "агульнанародныя" ўстановы буржуазнага парламентарызму, а класавыя ўстановы працоўных і эксплуатуемых мас.

Развіццё рускай рэвалюцыі зжыло буржуазны парламентарызм у ходзе барацьбы і згодніцтва,

---

[1] *Ленин В.И.* Как организовать соревнование? // Полн. собр. соч. Т.35. С.197.

[2] Правда. 1917. 20 окт.

стварыўшы савецкую рэспубліку як форму дыктатуры пралетарыяту і бяднейшага сялянства.

Ні кроку назад"[1].

Аднак разгон Устаноўчага сходу не быў першым захадам бальшавікоў у барацьбе з парламенцкімі формамі праўлення. Яшчэ раней гэта было апрабіравана на месцах, у прыватнасці ў Беларусі, калі быў разагнаны Усебеларускі з'езд. На яго прыбылі 1872 дэлегаты, з якіх 1167 мелі права рашаючага голасу. Уся гэта вялікая колькасць прадстаўнікоў з месцаў дзялілася на дзве амаль роўныя часткі. Адна з іх падтрымлівала Вялікую беларускую раду, якая дабівалася абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і аддзялення яе ад савецкай Расіі. Другая частка дэлегатаў з'яўлялася прыхільнікамі Беларускага абласнога камітэта, што выступаў за захаванне Беларусі ў складзе Расіі. Тым не менш такія пазіцыі дэлегатаў з'езда прывялі да таго, што з мэтаю абароны савецкай улады ў вобласці і на фронце Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту 18 снежня 1917 г. сваім рашэннем распусціў з'езд і прапанаваў яго прэзідыуму пакінуць межы вобласці і фронту[2].

Разгон Усебеларускага з'езда, як і праз некалькі тыдняў роспуск Усерасійскага ўстаноўчага сходу, быў зроблены ў час трыумфальнага і адносна бяскроўнага шэсця савецкай улады па краіне, яшчэ да пачатку грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі, г.зн. ва ўмовах мірнага развіцця рэвалюцыі. Дадзенымі актамі была зроблена сур'ёзная заяўка не толькі на ўсталяванне дыктатуры пралетарыяту, але і на яе перарастанне ў аўтарытарнае праўленне. Такая лінія тым больш была пацверджана праз паўгода, калі пасля разгрому ў пачатку ліпеня 1918 г. узброенага выступлення левых эсэраў бальшавікі фактычна сталі здзяйсняць аднапартыйнае праўленне. Гэта быў шлях, які немінуча вёў да бескантрольнага і неабмежаванага адзінаўладдзя.

Адпаведна гэтаму напрамку кіравання грамадствам ствараліся органы савецкай улады. У цэлым яны адпавядалі рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры рабочых і сялян. Аднак асноўныя працоўныя класы краіны — рабочыя і сяляне — не былі падрыхтаваны да кіравання дзяржавай. Яны не мелі ні ад-

---

[1] *Ленин В.И.* Проект Декрета о роспуске Учредительного собрания // Полн.собр.соч. Т.35. С.232.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.53—54.

паведных ведаў, ні агульнай культуры, а тым больш культуры палітычнай, ні практычнага вопыту. Вялікай перашкодай у гэтых адносінах з'яўлялася непісьменнасць пераважнай большасці насельніцтва. У такіх умовах уладу, якую павінны былі ажыццяўляць рабочыя і сяляне, узялася выконваць бальшавіцкая партыя. Таму на практыцы ў новай сістэме кіравання грамадствам асноўная роля стала належаць не саветам рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, а надзвычайным органам — ваенным рэвалюцыйным камітэтам, камітэтам беднаты, рэвалюцыйным трыбуналам, надзвычайным камісіям, упаўнаважаным, камісарам і інш. Ужо з самага пачатку праўлення бальшавікоў шырокія пласты працоўных былі фактычна адхілены ад рэальнай улады, хаця ў розных дэкларацыях і заявах гэта шматразова сцвярджалася. Яны былі толькі выканаўцамі палітычнай волі кіраўнікоў партыі і дзяржавы.

Характэрная ў гэтых адносінах дзейнасць камітэтаў беднаты (камбедаў). Іх з'яўленне абумоўлена ўстанаўленнем бальшавіцкай уладай харчовай дыктатуры. Адпаведна дэкрэту Усерасійскага ЦВК і СНК РСФСР ад 9 мая 1918 г. "Аб прадастаўленні Наркамхарчу надзвычайных паўнамоцтваў па барацьбе з вясковай буржуазіяй, якая хавае хлебныя запасы і спекулюе імі", у краіне пачалі ствараца надзвычайныя органы — камбеды для таго, каб сілаю забіраць у сялянства, у першую чаргу ў яго заможнай часткі, хлеб без усялякага выкупу. Гэта рабілася згодна з пісьмом Леніна да рабочых Петраграда, напісаным 22 мая 1918 г., у якім ён заклікаў іх арганізаваць "вялікі "*крыжовы паход*" супраць парушальнікаў найстражэйшага дзяржаўнага парадку ў справе збору, падвозу і размеркавання хлеба..."[1]

Па ўсёй краіне партыйнымі органамі было створана мноства камбедаў і спецыяльных харчовых атрадаў, якія канфіскоўвалі ў сялянства нажыты нялёгкай працай хлеб. Дзейнасць гэтых органаў была даволі выніковай. Дастаткова сказаць, што харчовыя атрады, створаныя з рабочых, і камітэты беднаты Заходняй вобласці, куды ўваходзілі многія беларускія землі, нарыхтавалі восенню 1918 г. 32,8 млн пудоў збожжа[2].

Камітэты беднаты дзейнічалі на працягу ўсёй другой паловы 1918 г. Яны з'яўляліся часовымі і над-

---

[1] *Ленин В.И.* О голоде (письмо к питерским рабочим) // Полн. собр.соч. Т.36. С.361 — 362.

[2] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.112.

звычайнымі органамі. Адносіны да іх з боку сялянства былі складанымі. Некаторыя беднякі дапамагалі ў дзейнасці гэтых фарміраванняў, а заможныя гаспадары і серадднякі іх моцна ненавідзелі. Канфіскацыя хлеба ў сялян — першая буйнамаштабная акцыя ўлады бальшавікоў. Хоць яна была праведзена з мэтаю не дапусціць у краіне голаду, аднак спосабы, метады і формы яе ажыццяўлення з'яўляліся выключна адміністрацыйнымі, аўтарытарнымі.

Распаўсюджанай практыкай у працэсе ўсталявання новай улады з'яўлялася стварэнне рэвалюцыйных камітэтаў — рэўкомаў. Яны атрымалі шырокае распаўсюджанне. У прыватнасці, пасля адыходу войскаў кайзераўскай Германіі з тэрыторыі Беларусі ў канцы 1918 г. і ўступлення Чырвонай Арміі 1 студзеня 1919 г. быў створаны Навагрудскі павятовы рэвалюцыйны камітэт, да якога перайшла ўся ўлада на дадзенай тэрыторыі. Павятовыя саветы рабочых, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў, якія раней існавалі ў мястэчку Мір і ў горадзе Навагрудку, ліквідаваліся. На аснове загаду па Мінскай ваеннай акрузе ўсе пастановы мясцовага рэвалюцыйнага камітэта ці яго выканаўчага органа (выканкома) павінны былі змацоўвацца ў час ваеннага становішча подпісам павятовага ваеннага камісара. Калі гэтага подпісу не было, дакументы лічыліся несапраўднымі[1]. Для тагачасных абставін такі парадак можна лічыць апраўданым. Іншая справа, што нярэдка ён заставаўся і тады, калі надзвычайныя ўмовы знікалі. У большасці выпадкаў такая практыка работы з ваенных часоў пераходзіла і на мірную рэчаіснасць, трансфармавалася ў адпаведныя формы.

Разам з навядзеннем рэвалюцыйнага парадку, падаўленнем супраціўлення тых, хто перашкаджаў мерапрыемствам улады бальшавікоў, усталяваннем даволі жорсткага рэжыму павятовыя рэвалюцыйныя камітэты займаліся і стваральнымі справамі гаспадарчай, сацыяльнай і культурнай накіраванасці. У прыватнасці, 16 верасня 1920 г. Навагрудскі павятовы рэвалюцыйны камітэт выдаў загад № 40, у якім гаварылася, што ў горадзе Навагрудку калісьці жыў вядомы ўсяму свету вялікі польскі пісьменнік і паэт Адам Міцкевіч. Пасля яго застаўся дом, у якім ён жыў, бібліятэка і інш. Савецкая ўлада, якая з'яўляецца носьбітам культуры, памятае аб тых, хто на гэтай ніве працаваў, і памяць аб іх, увекавечаную іх

---

[1] Памяць. Навагрудскі раён. Мн., 1996. С.244.

працамі, зберагае. У сувязі з гэтым было загадана, каб дом, у якім жыў паэт, неадкладна вызваліць ад тых, хто там жыве, даць ім кватэры і перадаць будынак у падпарадкаванне павятоваму аддзелу народнай адукацыі. Аддзелу прадпісвалася неадкладна прыступіць да арганізацыі ў гэтым доме музея ці народнай бібліятэкі імя Міцкевіча. Акрамя таго, ставілася задача сабраць у павеце ўсе кнігі і іншыя помнікі, якія маюць дачыненне да жыцця і творчасці паэта, і перадаць іх музею ці бібліятэцы[1]. Такім чынам, у дзейнасці рэвалюцыйных камітэтаў былі і стваральныя бакі, звязаныя з наладжваннем гаспадарчага і культурнага жыцця і нават з захаваннем памяці аб мінулым.

Аднак асноўнай асаблівасцю гэтых і іншых органаў улады ў першыя гады праўлення бальшавікоў быў іх надзвычайны характар. Ва ўмовах грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі гэта яшчэ можна было б пэўным чынам абгрунтаваць. Аднак практыка дзейнасці надзвычайных органаў перыядычна выкарыстоўвалася пазней у мірных умовах, калі яна не магла мець ніякага апраўдання. Гэта яўныя прыкметы аўтарытарнага праўлення, якое мела тэндэнцыю перарастання ў таталітарнае.

Характэрнай асаблівасцю палітычнай дзейнасці вышэйшага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва краіны з'яўлялася тое, што сапраўдныя намеры нярэдка даводзілася да пэўнага часу маскіраваць, каб не страціць падтрымку тых ці іншых нацыянальных альбо сацыяльных груп насельніцтва. Яскрава гэта праявілася ў адносінах Цэнтра да нацыянальнага самавызначэння народаў, што пражывалі на ўскраінах Расіі. У поўнай ступені дадзеная акалічнасць адносілася і да Беларусі.

Аб'явіўшы права народаў на самавызначэнне аж да аддзялення, бальшавіцкая партыя тым не менш не спяшалася выконваць свае абяцанні. Фактычна толькі Фінляндыя, Польшча і Прыбалтыйскія краіны з-за адпаведных унутраных і знешнепалітычных абставін змаглі атрымаць незалежнасць. Што датычыць Беларусі, то вядомы адмоўныя адносіны бальшавікоў як у Цэнтры, так і на месцы да ідэі стварэння беларускай незалежнай дзяржавы. Аднак ва ўмовах акупацыі кайзераўскімі войскамі значнай часткі Беларусі, у тым ліку Мінска, яна была аб'яўлена Беларускай Народнай Рэспублікай, нягледзячы на тое што германскія акупанты ніколі не збіраліся ісці насустрач яе кіраўнікам у ажыццяўленні іх палітычных наме-

[1] Памяць. Навагрудскі раён. С. 249.

раў. Таму да рэальнага стварэння беларускай дзяржавы справа не дайшла. Тым не менш факт аб'яўлення 25 сакавіка 1918 г. БНР садзейнічаў стварэнню 1 студзеня 1919 г. Беларускай ССР. Як і іншыя савецкія рэспублікі, БССР была своеасаблівым дзяржаўным фарміраваннем, дзе асноўная ўлада належала Цэнтру, а мясцовыя органы былі яму моцна падпарадкаваны.

Пазіцыю бальшавіцкага кіраўніцтва ў першыя гады савецкай улады ў нацыянальным пытанні назней даволі адкрыта растлумачыў Сталін. 22 верасня 1922 г. ён пісаў Леніну: "За чатыры гады грамадзянскай вайны, калі мы з прычыны інтэрвенцыі вымушаны былі дэманстраваць лібералізм Масквы ў нацыянальным пытанні, мы паспелі выхаваць сярод камуністаў, самі таго не жадаючы, сапраўдных і паслядоўных сацыял-незалежнікаў... Маладое пакаленне камуністаў на ўскраінах гульню ў незалежнасць адмаўляецца разумець як гульню, настойліва прызнаючы словы аб незалежнасці за чыстую манету і таксама настойліва патрабуючы ад нас правядзення ў жыццё літары Канстытуцыі незалежных рэспублік"[1].

Аднак Цэнтру даводзілася лічыцца з сур'ёзнымі адносінамі маладога пакалення камуністаў на месцах да нацыянальнага пытання. Гэта з'явілася адной з важкіх падстаў для правядзення ў сярэдзіне 20-х гадоў палітыкі беларусізацыі, украінізацыі і інш.

Што датычыць першых гадоў існавання бальшавіцкай ўлады, перыяду грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі, то на месцах часамі праяўлялася радыкальнае імкненне да самавызначэння. Гэтыя дзеянні мелі месца і на Беларусі. Так, у сярэдзіне лістапада 1920 г. на непрацяглы час, усяго на чатыры дні, была аб'яўлена Койданаўская самастойная рэспубліка, што з'явілася спробай адстаяць незалежнасць часткі беларускай зямлі. Была прынята адозва да насельніцтва, у якой змяшчаўся заклік да змагання "за вольную Беларусь". Меркавалася наладзіць абарону мястэчка Койданава, ажыццявіць іншыя меры[2].

Больш маштабным і працяглым стала Слуцкае выступленне. Гэта быў складаны рух, які выліўся ва ўзброеную барацьбу і ў якім удзельнічалі ў адкрытай ці скрытай формах разнародныя палітычныя і

[1] Чырвоная змена. 1995. 9 лют.; Народная воля. 1977. 11 крас.

[2] Літаратура і мастацтва. 1994. 2 верас.

сацыяльныя групы пры перавазе рэвалюцыйна-дэмакратычных элементаў нацыянальнай скіраванасці. Галоўнай сілай з'яўляліся сяляне Слуцкага, Бабруйскага, іншых паветаў, а таксама некаторыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. У руху прымалі ўдзел ці аказвалі на яго ўплыў прыхільнікі Б.Савінкава, С.Булах-Булаховіча, арганізацыі "Зялёны дуб", Найвышэйшай рады, урада БНР.

Колькасць удзельнікаў выступлення вагалася ад 2—3 тыс. байцоў да 10—12 тыс. разам з рэзервам. Для гэтага руху характэрныя як арганізаваны, так і стыхійны пачаткі. Арганізаванай палітычнай сілай на падрыхтоўчым этапе з'яўляўся Беларускі нацыянальны камітэт Слуцка, які меў польскую арыентацыю. На развіццё падзей уплывалі таксама беларускія эсэры, што выступалі за незалежнасць Беларусі і падтрымлівалі ўрад БНР.

14—15 лістапада 1920 г. у Слуцку ў час другой польскай акупацыі горада адбыўся Першы беларускі з'езд Случчыны. На ім прысутнічала звыш 100 дэлегатаў. З'езд выбраў Раду Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі. Яна ўключала 17 чалавек на чале з беларускім эсэрам Б.Пракулевічам. Рада Случчыны 21 лістапада абвясціла дэкларацыю, якая заклікала змагацца за "незалежную Беларусь у яе этнаграфічных межах" і за інтарэсы беларускага сялянства. У канцы лістапада – пачатку снежня 1920 г. рада сфарміравала Першую Слуцкую брыгаду стральцоў БНР у складзе двух палкоў.

Баявыя дзеянні слуцкіх паўстанцаў вяліся супраць Чырвонай Арміі ў форме кароткачасовых баёў і асобных сутычак. Але сілы былі няроўныя, і ўжо ў першай палове снежня частка паўстанцаў вымушана была пайсці ў Польшчу, дзе іх раззброілі і інтэрніравалі польскія ўлады. Астатнія вялі барацьбу партызанскімі метадамі і пасля заключэння ў сакавіку 1921 г. Рыжскага міру.

Накіраванасць руху была ў першую чаргу антыкамуністычнай, у меншай ступені антысавецкай. Рух развіваўся пры падтрымцы польскіх кіруючых колаў, зацікаўленых у аслабленні ўплыву савецкай Расіі на Беларусь. Прычыны выступлення заключаліся ў незадавальненні сялянства палітыкай "ваеннага камунізму", гаротным становішчы народа, нацыянальным і сацыяльным прыгнёце з боку розных рэжымаў, якія часта мяняліся. Выступленне мела нацыянальна-

вызваленчую накіраванасць. Яно стала значнай падзеяй у гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху за незалежную беларускую рэспубліку.

Такім чынам, у першыя гады існавання бальшавіцкая ўлада ў сваёй дзейнасці па арганізацыі рэвалюцыйных пераўтварэнняў, барацьбы з замежнай інтэрвенцыяй і тымі, хто супрацьдзейнічаў ёй унутры краіны, шырока выкарыстоўвала надзвычайныя органы, аўтарытарныя формы і метады правядзення палітычнай лініі. Спецыфічныя ўмовы грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі патрабавалі цвёрдасці для дасягнення пастаўленых мэт. Аднак пры гэтым разганяліся ў Цэнтры і на месцах выбарныя органы, умацоўвалася аднапартыйнасць, практыкавалася палітычная гульня ў нацыянальным пытанні. Гэтымі і іншымі дзеяннямі закладваліся асновы таталітарнага праўлення.

## 2. Поспехі ў ажыццяўленні НЭПа і стаўка на таталітарызм – асноўная супярэчнасць 20-х гадоў

Прыняцце X з'ездам РКП(б) новай эканамічнай палітыкі было аператыўнай рэакцыяй кіраўніка партыі і дзяржавы Леніна на змяненне ўнутрыпалітычных абставін. Яны заключаліся ў распаўсюджанні незадавальнення бальшавіцкай уладай сярод працоўных, перш за ўсё сялян, у сувязі з харчовай развёрсткай і іншымі непапулярнымі мерамі. Значны размах набылі ўзброеныя сялянскія выступленні. Вялікі рэзананс мела паўстанне ў Кранштаце.

Замена харчовай развёрсткі харчовым падаткам, іншыя дзеянні дазволілі зняць вастрыню праблемы, хаця многія кіраўнікі розных узроўняў, радавыя партыйцы лічылі, што ўвядзенне НЭПа азначае здраду камуністычным ідэалам, здачу рэвалюцыйных заваёў. У першую чаргу яны бачылі гэта ў дапушчэнні ў гаспадарку прыватнага капіталу і ўласніка, у выкарыстанні арэнды зямлі, наёмнай працы, іншых мерапрыемстваў нэпаўскага характару.

Аднак менавіта новая эканамічная палітыка дазволіла ў кароткі тэрмін не толькі аднавіць разбураную першай сусветнай і грамадзянскай войнамі, замежнай ваеннай інтэрвенцыяй гаспадарку, але і перайсці да далейшага будаўніцтва новага жыцця на

аснове сацыялістычных прынцыпаў. Дастаткова сказаць, што на працягу 1924—1928 гг. у Беларускай ССР прадукцыя фабрык і заводаў вырасла ў 2,3 раза. Працэс аднаўлення прамысловасці рэспублікі быў завершаны ў 1926/27 гаспадарчым годзе. Найбольш дынамічна аднаўляліся і атрымалі далейшае развіццё такія галіны, як тарфяная, металаапрацоўчая, электратэхнічная. Інтэнсіўна ішло нарошчванне паказчыкаў металаапрацоўчых заводаў. Толькі на працягу 1922 — 1926 гг. яны павялічылі вытворчасць у пяць разоў. Гэта адбылося пераважна за кошт выпуску сельскагаспадарчых машын.

Аднаўленчы працэс у Беларускай ССР, у першую чаргу ў прамысловасці, адбываўся з дапамогай цэнтральных партыйных і дзяржаўных улад, а таксама савецкіх рэспублік. Гэта дапамога ішла ў выглядзе машын, абсталявання, а таксама сыравіны для перапрацоўкі на беларускіх прадпрыемствах. Разам з тым БССР уносіла значны ўклад у саюзныя фонды. У сярэдзіне 20-х гадоў з усяго аб'ёму даходаў, атрыманых у рэспубліцы, прыкладна палова накіроўвалася для агульнадзяржаўных мэт. Такі ўзаемны абмен матэрыяльнымі каштоўнасцямі, з аднаго боку — дапамога Беларускай ССР у аднаўленні гаспадаркі, а з другога — інтэнсіўнае выкачванне з яе матэрыяльных сродкаў, з'явіўся пачаткам фарміравання цесных эканамічных зносін, моцнай залежнасці рэспублікі ад Цэнтра.

Яшчэ больш паспяхова, чым у прамысловасці, адбывалася аднаўленне сельскай гаспадаркі. Фактычна ўжо ў 1925 г. пасяўныя плошчы, ураджайнасць і валавыя зборы сельскагаспадарчых культур дасягнулі даваеннага ўзроўню. Прычым больш значнымі былі вынікі ў жывёлагадоўчай галіне. Аднак меліся і немалыя цяжкасці. Складанай праблемай заставалася землеўпарадкаванне сялянскіх гаспадарак. Яны працягвалі драбіцца і колькасць іх расла ў выніку сямейных падзелаў. Гэта прывяло да таго, што паступова зменшылася забяспечанасць сялян зямлёю. У цэлым нізкай заставалася культура земляробства[1]. Але гэта былі складанасці звычайнага працэсу эвалюцыі аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

Справай забеспячэння сялян зямлёю актыўна займаліся партыйныя і савецкія органы. У прыватнасці,

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.88 — 90, 101.

у матэрыялах да справаздачы ЦК КП(б)Б на пленуме ў кастрычніку 1926 г. адзначалася, што пытанне аб малазямельных і беззямельных гаспадарках не вырашана канчаткова. Адбылося надзяленне зямлёю толькі каля паловы тых сялян, якія мелі ў ёй патрэбу. У сувязі з недахопам зямельных угоддзяў планавалася перасяліць да 115 тыс. сельскіх працаўнікоў з БССР у іншыя мясцовасці Савецкага Саюза. Работа ў гэтым напрамку вялася, але справу стрымліваў "абмежаваны каланізацыйны фонд у Сібіры". Тым не менш у 1925 г. з рэспублікі было перасялена 12 тыс. чалавек, а ў 1926 г. — 15 тыс. Пры гэтым перасяленцам даваліся значныя ільготы: на працягу трох гадоў за імі ўтрымлівалася зямля ў БССР, на пераезд і ўладкаванне на новым месцы яны атрымлівалі дзяржаўную пазыку ў памеры да 400 руб. на сям'ю[1].

Разам з гаспадарчымі пытаннямі партыйна-савецкія ўлады актыўна займаліся многім іншым, хаця з першага погляду здавалася, што некаторыя бакі жыцця іх не павінны так моцна цікавіць. Сведчаннем гэтага з'явілася, у прыватнасці, рэакцыя ў канцы 1925 г. калегіі Цэнтральнай кантрольнай камісіі КП(б)Б на матэрыял аб пасылцы сялян за мяжу для вывучэння справы пастаноўкі земляробства, які надрукавала газета "Звязда". Калегія ЦКК пастанавіла, што пытанне аб пасылцы сялян за мяжу мае палітычны характар і павінна быць вырашана не ў калегіі Наркамзема, а ў партыйным парадку. Увага кіраўніцтва Наркамзема была звернута на недапушчальнасць перадачы для змяшчэння ў друку тых рашэнняў, якія яшчэ не зацверджаны "вышэйшай інстанцыяй". Зыходзячы з дадзенага факту, калегія ЦКК кампартыі Беларусі вырашыла прасіць Саўнаркам рэспублікі даць адпаведныя ўказанні ўсім кіруючым установам аб тым, каб не змяшчаць у друку пытанні, якія маюць прынцыповы характар, да канчатковага іх рашэння вышэйшымі органамі ўлады[2].

Дадзеная пастанова — сведчанне нарастаючых аўтарытарных тэндэнцый у кіраўніцтве краінай, імкнення ўзяць пад партыйны кантроль нават гэты напрамак дзейнасці грамадства. Ва ўмовах адносна дэмакратычнай новай эканамічнай палітыкі гэта мела выразна акрэсленую супрацьлеглую накіраванасць, што,

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.64, арк.8.

[2] Звязда. 1925. 3 лістап.; НАРБ, ф.4, воп.21, спр.10, арк.91.

несумненна, з'яўлялася адной з насцярожлівых прыкмет тагачаснага жыцця.

На працягу 20-х гадоў значныя поспехі былі дасягнуты ў культурным будаўніцтве — школьным навучанні, ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, культурна-асветнай рабоце, выдавецкай справе, развіцці навукі, літаратуры, мастацтва. Не падлягае сумненню, што найбольш яскравай праявай культурнага і грамадска-палітычнага напрамкаў жыццядзейнасці грамадства БССР у час дзеяння новай эканамічнай палітыкі з'явілася правядзенне беларусізацыі. З аднаго боку, яна была сугучная характару НЭПа, а з другога — з'яўлялася вынікам (як адзначалася вышэй) палітычнай лініі вышэйшага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва краіны. Каб не дапусціць рэалізацыі ідэі нацыянальнай незалежнасці і крыху задаволіць імкненне мясцовых нацыянальных дзеячаў у гэтым пытанні, кіраўнікі партыі і дзяржавы вымушаны былі пайсці на ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, а таксама ўкраінізацыі і інш.

Такі напрамак дзейнасці не толькі з'яўляўся складанай часткай больш шырокіх падыходаў у нацыянальнай палітыцы, але і грунтаваўся на іх. Як адзначаў Сталін у выступленні на X з'ездзе РКП(б), сутнасць нацыянальнага пытання ў РСФСР заключаецца ў тым, каб знішчыць тую фактычную адсталасць (гаспадарчую, палітычную, культурную) некаторых нацый, якую яны атрымалі ў спадчыну ад мінулага, каб даць магчымасць адсталым народам дагнаць Цэнтральную Расію і ў дзяржаўных, і ў культурных і ў гаспадарчых адносінах[1].

Неабходна адзначыць, што ў Беларускай ССР падыход да палітыкі беларусізацыі быў спачатку грунтоўным, узважаным, адказным, усебаковым. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць рэзалюцыя пленума ЦК КП(б)Б, які адбыўся 25 — 29 студзеня 1925 г., па заслуханаму і абмеркаванаму дакладу "Чарговыя задачы КП(б)Б у нацыянальнай палітыцы". Рэзалюцыя раскрывала сутнасць нацыянальнага пытання ў БССР. Канстатавалася, што ў яго аснове ляжыць адсталасць рэспублікі ў гаспадарчай і культурнай галінах, а таксама тое, што нацыянальныя і сацыяльныя прыкметы з-за гістарычных умоў цесна перапляліся. У выніку мелі месца нацыяналістычныя з'явы, адасобленасць і варожасць, і, што асабліва важна, го-

[1] *Сталин И.* Соч. Т.5. С.39.

рад быў аддзелены ад вёскі значна рэльефней, чым у іншых раёнах краіны.

Асноўная цяжкасць пры ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі ў БССР, як указвалася ў рэзалюцыі, заключаецца ў нешматлікасці пралетарыяту, праз прадстаўнікоў якога нацыянальная палітыка магла б праводзіцца найбольш вытрымана і ўстойліва, пераадольваючы дробнабуржуазны ўплыў, тым больш што рост беларускай нацыянальнай культуры асабліва адстаў, калі параўноўваць яе з рускай ці польскай. Немагчыма вырашыць у БССР задачу змычкі рабочага класа з сялянствам і пашырэння ўплыву горада на вёску без надання выключнай увагі рабоце па развіццю беларускай культуры.

Такім чынам, канстатавалася ў рэзалюцыі, лозунг, які КП(б)Б павінна прыняць у культурнай рабоце, — гэта лозунг беларусізацыі. Пры раўнапраўі ўсіх нацыянальнасцей, абавязковасці з боку ўрада і партыі забяспечыць развіццё культуры кожнай з іх, умове прызнання дзяржаўнымі мовамі чатырох моў справа развіцця літаратуры, школы, усёй культуры на беларускай мове прызнаецца першай і асноўнай справай[1].

Рэзалюцыя засведчыла шырокі падыход да абгрунтавання палітыкі беларусізацыі. Яе неабходнасць вынікала як з задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, умацавання сувязей горада з вёскай, так і з палітычнага моманту, узняцця культуры карэннай нацыянальнасці. Усё гэта адпавядала зместу і накіраванасці новай эканамічнай палітыкі.

На працягу адносна невялікага адрэзку часу, у сярэдзіне 20-х гадоў, у Беларускай ССР былі дасягнуты несумненныя поспехі ў ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі. Беларуская мова пачала ўводзіцца ў дзяржаўных установах. Калі ў 1925 г. ёю валодала толькі 22 % работнікаў рэспубліканскага звяна і 36 — акружнога і раённага, то ў 1927 г. — адпаведна 80 і 70 %.

Актыўна распаўсюджвалася беларуская мова ў агульнаадукацыйнай, сярэднеспецыяльнай і вышэйшай школах. Так, у 1926/27 навучальным годзе 10 з 14 педагагічных тэхнікумаў працавалі на роднай мове. Значная ўвага надавалася "карэнізацыі кадраў", г.зн. павелічэнню ўдзельнай вагі асоб беларускай нацыянальнасці ў складзе кіруючых работнікаў партыйнага, савецкага, прафсаюзнага, камсамольскага апа-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.12, арк.3—4.

ратаў. Ужо ў 1927 г. у агульнай колькасці членаў мястэчковых саветаў беларусаў налічвалася 53,2 %[1]. Больш адметнае месца ў перыёдыцы займалі беларускамоўныя газеты і часопісы. Выданне літаратуры таксама ў значнай ступені ажыццяўлялася на мове карэннага насельніцтва. Усё гэта сведчыла аб тым, што ў правядзенні палітыкі беларусізацыі адбыліся прыкметныя зрухі.

Характару новай эканамічнай палітыкі ў першай палове 20-х гадоў у цэлым адпавядаў такі важны напрамак грамадска-палітычнага жыцця, як выбарчыя кампаніі саветаў. Удзел насельніцтва ў выбарах саветаў спачатку быў дастаткова дэмакратычным, без заарганізаванасці з боку партыйна-дзяржаўных органаў, якая, аднак, паступова нарастала. У 1924 г. у БССР у выбарах мясцовых саветаў прынялі ўдзел 35,57 % выбаршчыкаў. Характэрнай рысай гэтых выбараў былі значныя адхіленні ў розных мясцовасцях ад сярэдніх паказчыкаў. У 50 раёнах БССР у іх удзельнічала менш як 35 % выбаршчыкаў, а ў 17 — не больш за 15 %.

Дадзеная акалічнасць патрабавала правядзення паўторных выбараў у тых саветах (пераважна сельскіх), дзе адзначаўся слабы ўдзел насельніцтва ў галасаванні. Гэтыя выбары адбыліся ў лютым—сакавіку 1925 г. і ахапілі 737 саветаў з 1208. Што датычыць Гомельскай губерні, то тут яны прайшлі ва ўсіх сельскіх саветах. У час выбарчай кампаніі быў улічаны вопыт папярэдніх выбараў і ўзмоцнена агітацыйна-прапагандысцкая работа. Яе спалучэнне з поспехамі ў аднаўленні народнай гаспадаркі, перш за ўсё сельскагаспадарчай вытворчасці, прывяло да павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва. У сярэднім па Беларускай ССР у паўторных выбарах у сельскія саветы ўдзельнічалі 42,6% выбаршчыкаў. Значнай была актыўнасць у Гомельскай губерні, дзе ў галасаванні прынялі ўдзел 61,7% выбаршчыкаў[2].

Выбары ў 1926—1927 гг. прайшлі пры сярэдняй актыўнасці насельніцтва. На вёсцы яўка на выбарчыя ўчасткі складала 46,3 %. У параўнанні з папярэдняй выбарчай кампаніяй адзначаўся рост, але невялікі. Грамадскае жыццё ішло мерным крокам. Гэта натуральнае развіццё палітычных працэсаў было

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.121, 123.

[2] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.268—271.

ўстойлівым, пакуль яго не парушылі суб'ектыўныя падыходы вярхоўнага партыйнага і савецкага кіраўніцтва краіны. У канцы 20-х гадоў масіраваная ідэалагічная дзейнасць партыйных і савецкіх органаў, узмацненне наступлення на заможную частку горада і вёскі, асабліва ў сувязі з "хлебнымі" цяжкасцямі 1927 — 1928 гг., прывялі да большай палітычнай актывізацыі насельніцтва ў час выбараў у саветы. Ужо выбарчая кампанія 1929 г. праходзіла ва ўмовах наступлення на дэмакратычныя заваёвы, звязаныя з новай эканамічнай палітыкай. Больш адчувальнымі сталі адміністрацыйна-камандныя метады кіраўніцтва. Абвастрылася класавая барацьба, якая з'яўлялася не столькі вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця, колькі была інспірыравана сталінскім партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам. Дэмакратычныя падыходы да грамадска-палітычнай дзейнасці пачыналі ўсё больш падмяняцца адміністрацыйным націскам.

Гэта прывяло да нарошчвання актыўнасці насельніцтва ў выбарчай кампаніі саветаў. Яўка рабочых на выбары гарадскіх саветаў дасягнула 79,2%. У сельскай мясцовасці паказчык раўняўся 58,7 %. Гэта таксама з'яўлялася значным павелічэннем у параўнанні з папярэдняй выбарчай кампаніяй. У вёсцы зрух быў дасягнуты перш за ўсё за кошт значна больш актыўнага ўдзелу ў выбарах жанчын. Калі ў 1927 г. у іх прынялі ўдзел толькі 24,7 %, то ў 1929 г. гэты паказчык дасягнў 42,4 %[1]. Такім чынам, у канцы 20-х гадоў заарганізаванасць у выбарчых кампаніях саветаў значна ўзрасла. Гэта супярэчыла характару новай эканамічнай палітыкі і супала з мерамі па абмежаванню яе ўздзеяння на розныя сферы жыцця.

Аднак больш істотнай супярэчнасцю развіцця краіны, якая фарміравалася з пачатку 20-х гадоў, была неадпаведнасць паміж характарам новай эканамічнай палітыкі з яе рознымі сацыяльна-эканамічнымі ўкладамі і ўсё нарастаючым імкненнем бальшавіцкай партыі да адзінаўладдзя. Розныя ўклады ў гаспадарцы, зразумела, прадвызначалі шматпартыйнасць, чаго ніяк не хацелі дапусціць бальшавікі. Яны настойліва вялі справу да ліквідацыі іншых палітычных партый і плыняў. Гэта работа вялася як у агульнадзяржаўным маштабе, так і на месцах, у тым ліку ў БССР.

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.111 — 113.



5. Зак. 5022

Пасля "самаліквідацыі" ў сакавіку 1921 г. Бунда частка яго членаў улілася ў КП(б)Б. У чэрвені 1924 г. адбыўся самароспуск беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) – найбольш значнай і ўплывовай сярод рухаў нацыянальнай дэмакратыі ў рэспубліцы. У пачатку 1921 г. яна аб'ядноўвала звыш 20 тыс. чалавек, больш чым у чатыры разы пераўзыходзіла колькасны склад КП(б)Б, мела свае структуры, якія налічвалі 5 тыс. работнікаў, кантралявала дзейнасць маладзёжнай арганізацыі, у якую ўваходзіла да 10 тыс. чалавек.

Згодна з рашэннем цэнтральнага бюро кампартыі Беларусі, у пачатку лютага 1921 г. 860 актыўных дзеячаў БПС-Р былі арыштаваны. Над імі адбыўся шэраг палітычных судовых працэсаў. Гэта з'явілася рашаючым крокам да ўсталявання ў БССР аднапартыйнай сістэмы. Такія дзеянні, а таксама шырокая масава-палітычная работа бальшавіцкай улады сярод насельніцтва прывялі да змяншэння ўплыву беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў у масах, што стала прычынай роспуску іх партыі.

Аднак кампартыя Беларусі перажывала ў гэты час перыяд свайго станаўлення. Яна значна вырасла: калі ў пачатку 1922 г. у яе радах знаходзілася 4834 чалавекі, у тым ліку 2172 рабочых і 847 сялян, то на 1 студзеня 1929 г. яна налічвала 33 381 чалавека. Сярод іх рабочых было 19 864, сялян – 7 903[1].

Павелічэнне радоў кампартыі Беларусі не было спынена і партыйнай чысткай 1929 г. Як і ў 1924 г., яна праходзіла хоць і патрабавальна, але не так жорстка, як наступная чыстка ў 1933 г. Аб гэтым сведчаць яе вынікі. З КП(б)Б было выключана 3717 чалавек. Адначасова партыйныя ячэйкі папоўніліся больш чым на 10 тыс.чалавек[2].

Дзейнасць партыйных арганізацый у 20-я гады ў значнай ступені праходзіла ў кампаніях барацьбы з аб'яднаным трацкісцка-зіноўеўскім блокам, так званай правай апазіцыяй, іншымі палітычнымі плынямі. Гэта барацьба вялася ў цэнтральных партыйных органах, аднак аказвала ўплыў на мясцовыя партячэйкі. Асабліва закранула яна кампартыю Беларусі ў сувязі з арганізацыйнымі мерамі супраць кіраўнікоў

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. 1918—1978 гг. Мн., 1978. С.75.

[2] Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Мн., 1966. Ч.2. С.129.

так званага правага ўхілу — М.Бухарына, А.Рыкава, М.Томскага. У Беларусі іх погляды падзялялі нарком земляробства Прышчэпаў, а таксама Лабаноўскі, Ждановіч, Ярашчук, Кіслякоў, Смоліч і інш.

Па сутнасці іх падыходы з'яўляліся альтэрнатывай бальшавіцкай калектывізацыі. Шлях, што імі прапаноўваўся, быў больш дэмакратычны, гуманны, з непараўнальна лепшымі гаспадарчымі і палітычнымі перспектывамі. Ён прадугледжваў, у прыватнасці, выкарыстанне ў пэўных межах заможных сялянскіх гаспадарак. Але імкненне кампартыі да аўтарытарызму, які ігнараваў альтэрнатыўныя варыянты, прывяло да палітычнай і арганізацыйнай расправы з прыхільнікамі гэтага пункту гледжання. Дадзены акт адмоўна адбіўся і на грамадска-палітычным жыцці рэспублікі, як і ўсёй краіны. Ён быў адной з прэлюдый да масавых рэпрэсій другой паловы 30-х гадоў. Прычым калі працэсы над кіраўнікамі правага ўхілу ў краіне адбываліся іменна ў гэты час, то расправа над Прышчэпавым і яго прыхільнікамі пачалася значна раней, на мяжы 20—30-х гадоў. Гэта — адна з праяў таго, што Беларусь нярэдка разглядалася як месца адпрацоўкі бальшавіцкай таталітарнай сістэмы.

Нягледзячы на мірныя ўмовы развіцця краіны пасля грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі, асноўнай тэндэнцыяй унутрыпартыйнага жыцця было імкненне да моцнай кансалідацыі радоў і рашучага ўзмацнення ўплыву на ўсе бакі сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага развіцця. Значны імпульс у гэтых адносінах быў дадзены X з'ездам РКП(б), які прыняў рашэнні, скіраваныя на ўмацаванне адзінства партыі.

Гэтым была закладзена глыбокая супярэчнасць паміж адносна дэмакратычнай новай эканамічнай палітыкай, з аднаго боку, і тэндэнцыяй грамадска-палітычнага развіцця да аўтарытарных форм кіравання — з другога, што накладвала моцны адбітак на ўсё жыццё грамадства. У прыватнасці, гэта выражалася ў тым, што кампартыя імкнулася браць пад свой кантроль усе рычагі ўздзеяння на грамадскія працэсы. Аб гэтым выразна сведчыць выступленне члена цэнтральнага бюро КП(б)Б, старшыні ЦВК Беларускай ССР А.Р.Чарвякова на XII канферэнцыі (VII з'езд кампартыі Беларусі), якая адбылася 20 — 26 сакавіка 1923 г. У прамове сцвярджалася, што да-

статкова было вызначыцца ў асяроддзі павятовых арганізацый якой-небудзь хваравітай з'яве, як цэнтральнае бюро цвёрдаю рукою аперыравала гэтую арганізацыю, выкідваючы нягодных членаў і ствараючы тым самым моцную згуртаванасць у партыйных радах.

Аратар працягваў, што ён просіць паказаць хоць адзін выпадак, калі адказны таварыш не падпарадкаваўся б указанням партыі. Ён упэўнены, што такога таварыша яны выкінуць з партыйных радоў[1]. Няхай пакажуць яму хоць адно рашэнне Наркамзема і ЦВК ці Саўнаркома ў пытаннях зямельнай палітыкі, якое папярэдне не было б "пераварана" цэнтральным бюро ці прэзідыумам ЦБ ці партканферэнцыяй. Няма ніводнага такога выпадку. Пратаколы прэзідыума ЦВК ёсць дакладныя копіі пастаноў, якія выносяцца на прэзідыум цэнтральнага бюро. Пратаколы прэзідыума ЦБ механічна перапісваюцца і ператтвараюцца ў пратаколы прэзідыума ЦВК, паколькі прэзідыум ЦБ амаль усе пытанні савецкага будаўніцтва абмяркоўвае на сваім пасяджэнні з прынцыповага боку, а ў шмат якіх выпадках нават з боку іх практычнага выканання, не кажучы ўжо аб тым, што ў распараджэнні цэнтральнага бюро выключна знаходзяцца размеркаванне і пераразмеркаванне работнікаў. Без яго санкцыі ніякае пераразмеркаванне не адбываецца. Большае кіраўніцтва ў гэтай справе ажыццявіць цяжка. "Якое кіраўніцтва вы хочаце? — задаваў далей пытанне выступаючы і тут жа адказваў: — Стварыць у нетрах цэнтральнага бюро савецкі аддзел і даручыць яму кіраўніцтва савецкай работай". Такім аддзелам з'яўляецца прэзідыум ЦВК, які ўсю сваю работу ўзгадняе з цэнтральным бюро і складаецца з яго членаў[2]. Цяжка ўявіць больш аўтарытэтнае сведчанне кантролю бальшавіцкай партыі за дзейнасцю вышэйшага савецкага кіраўніцтва рэспублікі.

Маючы абсалютна поўную ўладу ў дзяржаве і бескантрольна ёю карыстаючыся, кіраўнікі камуністычнай партыі і савецкай краіны пастаянна ўдзялялі ўвагу ўмацаванню матэрыяльнай базы партыйных арганізацый. Пры гэтым сістэматычна партыйная каса папаўнялася з дзяржаўнага бюджэту. Так, 2 лютага 1928 г. палітбюро ЦК УКП(б) зацвердзіла датацыю да партбюджэту на 1927/28 гаспадарчы год у суме

[1] НАРБ, ф.4, воп.2, спр.21, арк.102—103.

[2] Там жа, арк.104.

53 млн руб. Аднак пры гэтым сакратарыяту было даручана ў будучым дабіцца далейшага скарачэння датацыі ад дзяржавы[1].

Як адбывалася гэта скарачэнне, бачна з рашэння палітбюро ЦК УКП(б), якое было прынята 15 снежня 1929 г. Згодна з ім зацвярджаўся бюджэт партыі на 1929/30 гаспадарчы год па расходах у суме 70 млн 771,7 тыс. руб., а па даходах – 18 млн 059,1 тыс. руб. У даходную частку павінны былі паступіць 200 тыс. руб. адлічэнняў ад даходаў выдавецтва цэнтральнага камітэта "Правда". Датацыя да партыйнага бюджэту была вызначана ў суме 52 млн 712,6 тыс. руб.[2] Такім чынам, датацыя амаль у тры разы пераўзыходзіла ўласны бюджэт партыі і амаль раўнялася датацыі папярэдняга года.

Супярэчнасцю прынцыповага характару паміж новай эканамічнай палітыкай і фарміруемай аўтарытарнай сістэмай сталі меры, скіраваныя на ўзмацненне карнай палітыкі. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляюцца дапаўненні Леніна да праекта ўступнага закону да крымінальнага кодэксу РСФСР. Яны былі напісаны кіраўніком бальшавіцкай дзяржавы ў сярэдзіне мая 1922 г. у сувязі з распрацоўкай народным камісарыятам юстыцыі гэтага дакумента. У прыватнасці, Ленін прапанаваў дапоўніць праект і прадугледзець "расстрэл за недазволенае вяртанне з-за мяжы". Далей у запісцы народнаму камісару юстыцыі Курскаму было рэкамендавана пашырыць прымяненне расстрэлу (з заменай высылкай за мяжу) да ўсіх відаў дзейнасці меншавікоў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў і т.п., а таксама знайсці фармуліроўку, якая паставіць гэтыя дзеянні ў сувязь з міжнароднай буржуазіяй і яе барацьбою з намі (подкупам друку і агентаў, падрыхтоўкай вайны і інш.)[3].

У наступнай запісцы наркому юстыцыі кіраўнік партыі і дзяржавы прапанаваў "адкрыта выставіць прынцыповае і палітычна праўдзівае (а не толькі юрыдычна-вузкае) палажэнне, якое матывуе *сутнасць* і *апраўданне* тэрору, яго неабходнасць, яго межы.

Суд павінен не ўстараніць тэрор; абяцаць гэта было б самаабманам ці абманам, а абгрунтаваць і ўзаконіць яго прынцыпова, яскрава, без фальшу і без прыкрас. Фармуляваць патрэбна як мага шырэй, так як толькі рэвалюцыйная правасвядомасць і рэвалю-

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.6, арк.19.

[2] Там жа, спр.8, арк.23.

[3] *Ленин В.И.* Полн. собр. соч. Т.45. С.189.

цыйнае сумленне паставяць умовы прымянення на справе, больш ці менш шырока"[1].

Пры гэтым Ленін прапаноўваў некалькі варыянтаў сваіх дапаўненняў да праекта закону аб крымінальным кодэксе РСФСР. Згодна з першым варыянтам, "прапаганда ці агітацыя, ці ўдзел у арганізацыі, ці садзейнічанне арганізацыям, дзеючым (прапаганда і агітацыя) у напрамку дапамогі той частцы міжнароднай буржуазіі, якая не прызнае раўнапраўя прыходзячай на змену капіталізму камуністычнай сістэмы ўласнасці і імкнецца да насільнага яе звяржэння ці шляхам інтэрвенцыі, ці блакады, ці шпіянажу, ці фінансавання прэсы і да т.пад. сродкамі,

карaецца вышэйшай мерай пакарання, з заменай у выпадку змякчаючых віну акалічнасцей пазбаўленнем волі ці высылкай за мяжу". Гэтыя прапановы былі ўлічаны ў раздзеле крымінальнага кодэксу "аб контррэвалюцыйных злачынствах"[2].

Дадзеныя і іншыя ленінскія палажэнні выкарыстоўваліся пры распрацоўцы мер пакарання тых, хто не падзяляў палітыку бальшавіцкай улады ці тым больш супрацьдзейнічаў ёй. Да гэтай праблемы вышэйшае партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва краіны звярталася перыядычна. Так, 22 лістапада 1923 г. палітбюро ЦК РКП(б) даручыла камісіі ў складзе Дзяржынскага, Крыленкі, Куйбышава, Калініна ў месячны тэрмін перагледзець савецкую карную палітыку, у прыватнасці пытанне аб прымяненні расстрэлу як вышэйшай меры пакарання. Аднак знойдзеныя дакументы не раскрываюць сутнасці ўнесеных прапаноў і прынятых рашэнняў[3].

У перыяд дзеяння новай эканамічнай палітыкі і на яе аснове адносна дэмакратычнага развіцця краіны на самым высокім узроўні прымаліся рашэнні, скіраваныя на ўзмацненне карных мер. Аб гэтым сведчаць пратаколы пасяджэнняў вышэйшага выканаўчага партыйнага органа — палітбюро ЦК УКП(б). Шэраг такіх рашэнняў з'явіўся ў 1926 г. Так, 29 красавіка палітбюро дало АДПУ права па-за судовага разбору па справе Воліна і непасрэдна звязаных з ім людзей. Пры гэтым АДПУ прапаноўвалася ў яго далейшай працы ўлічыць абмен думкамі, што адбыўся пры абмеркаванні дадзенага пытання[4].

---

[1] *Ленин В.И.* Полн. собр. соч. Т.45. С.190.

[2] Там жа. С.190, 549.

[3] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.1, арк.30.

[4] Там жа, спр.3, арк.55.

14 кастрычніка гэтага ж года ў пастанове палітбюро па справе Гадзіевых было вырашана прымяніць да галоўных віноўнікаў вышэйшую меру сацыяльнай абароны, г.зн. расстрэл, без усялякага памілавання. Пастанова таксама ўтрымлівала патрабаванне весці працэс у па-за судовым парадку і са змяшчэннем у газетах кароткага паведамлення. Каб усё гэта было здзейснена, вырашылі "... даць дырэктыву суду ..."[1] Такая ўстаноўка прадвызначала прыгавор і дала судоваму органу толькі права выказаць яго ў адпаведнай форме. Пры гэтым незалежнасць суда была поўнасцю праігнаравана.

Займалася палітбюро ЦК УКП(б) і пытаннямі, звязанымі з прымяненнем мер пакарання да членаў партыі. У прыватнасці, рашэннем ад 19 красавіка 1928 г. было вызначана забараніць арышт і высылку камуністаў. Разам з тым у выключных выпадках дапускаўся вобыск падазроных у антыпартыйных дзеяннях членаў партыі. Аднак гэта магло быць ажыццёўлена абавязкова з ведама і дазволу адпаведных партыйных органаў[2]. Прыняцце дадзенай пастановы было не выпадковым. Значыць, меліся адпаведныя факты беспадстаўных арыштаў членаў партыі. Аднак такія намеры ў гэты час яшчэ былі спынены.

Што датычыць непалітычных спраў, грамадзянскага ці нават крымінальнага зместу, то ў 20-х гадах судовая дзейнасць савецкай дзяржавы ў асноўным адпавядала ўраўнаважанай практыцы, калі абыходзіліся без прымянення надзвычайных мер. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць звесткі па Беларускай ССР аб працы судовых органаў. Па стану на пачатак 1926 г. у нарсудах рэспублікі знаходзіліся 9,2 тыс. грамадзянскіх спраў. За паўгода ў суды іх паступіла 45 тыс., было разгледжана 40,3 тыс. Аднак да 1 ліпеня 1926 г. колькасць неразгледжаных спраў узрасла амаль да 14,6 тыс.

Звяртае на сябе ўвагу даволі мяккі характар вынесеных прыгавораў па разгледжаных грамадзянскіх справах. Штрафы атрымалі 36 % усіх асуджаных, прымусовыя работы – 22,6, розныя тэрміны турэмнага зняволення – 22,4, былі пазбаўлены волі ўмоўна 16 %. Сацыяльны склад асуджаных быў наступным. Сяляне-беднякі складалі амаль палову – 49 %, серадня кі – 35,5, заможныя гаспадары – 1,5 %. Удзельная вага

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр. 4, арк. 3.

[2] Там жа, спр. 6, арк. 64.

рабочых раўнялася 5,5 %, служачых – 2,5 %. На дэкласаваныя элементы прыйшлося 6 %[1].

Нягледзячы на адносны дэмакратызм новай эканамічнай палітыкі, у 20-х гадах у практыку работы ўладных структур усё больш уваходзіў пільны нагляд за творчай і навуковай інтэлігенцыяй. Ініцыятыва пры гэтым зыходзіла ад вышэйшага кіраўніцтва. Каб трымаць пад кантролем намеры інтэлігенцыі, яе імкненне да аб'яднання ў творчыя саюзы, 12 чэрвеня 1922 г. ЦВК РСФСР выдаў указ "Аб парадку зацвярджэння і рэгулявання таварыстваў і саюзаў, якія не прадугледжваюць мэт атрымання прыбытку, і аб парадку нагляду за імі". Адпаведны дакумент у Беларускай ССР быў прыняты 13 кастрычніка гэтага ж года. У сувязі з дадзенымі пастановамі ранейшае свабоднае існаванне творчых саюзаў, суполак, гурткоў, таварыстваў пачынала рэгламентавацца. Іх трэба было рэгістраваць у наркамаце ўнутраных спраў рэспублікі. Усе матэрыялы, звязаныя з рэгістрацыяй, правяраліся ў сакрэтным аддзеле ДПУ Беларусі.

Устаноўлены парадак быў прыменены, калі група беларускіх літаратараў, згодна з пастановай арганізацыйнага сходу, накіравала дакументы з просьбай зацвердзіць таварыства пад назвай "ВІР". Заяву падпісаў І.Луцэвіч (Янка Купала), З.Жылуновіч (Цішка Гартны), І.Пятровіч (Янка Нёманскі), М.Кудзелька (М.Чарот), іншыя літаратары, усяго 11 чалавек. Сярод прадстаўленых дакументаў быў грунтоўна распрацаваны статут. Усё гэта адпаведна правяралася ў першую чаргу з мэтай высвятлення "палітычных фізіяномій заснавальнікаў". У адпаведных матэрыялах Янка Купала, у прыватнасці, характарызаваўся як "беларускі пісьменнік-шавініст". Аднак самай вялікай крамолай з'яўлялася тое, што сярод заснавальнікаў былі два члены кампартыі — З.Жылуновіч і М.Кудзелька. У выніку дадзеная заява беларускіх літаратараў так і не была задаволена, у стварэнні таварыства ім адмовілі[2].

Нягледзячы на гэта, намаганні ў дадзеным напрамку працягваліся. У сувязі з тым што ў краіне дзейнічала новая эканамічная палітыка і пачала

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.64, арк.75.

[2] *Гесь А.* "ВІР", які так і не завіраваў //Літаратура і мастацтва. 1996. 27 снеж.

ажыццяўляцца беларусізацыя, гэтыя намаганні прынеслі станоўчыя вынікі. У 1924 г. у рэспубліцы ўзнікла ўсебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк". У 1926 г. частка літаратараў выйшла з яго і стварыла літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша". У наступным годзе пісьменнікі пераважна старэйшага і сярэдняга пакаленняў сфарміравалі літаратурнае аб'яднанне "Полымя". Яшчэ пазней, у 1928 г., была створана беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў — БелАПП. Яна ўзнікла ў першую чаргу па ініцыятыве партыйных органаў з мэтаю падтрымкі літаратарамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Многія прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі Беларусі займалі актыўную пазіцыю ў шмат якіх пытаннях грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Перш за ўсё іх цікавіў суверэнітэт Беларускай ССР у складзе Савецкага Саюза. У прыватнасці, аб гэтым ішла гаворка ў "мяцежным лісце" першаму сакратару ЦК КП(б)Б А.Крыніцкаму, які быў накіраваны 12 кастрычніка 1925 г. беларускімі пісьменнікамі А.Аджгірэем, А.Александровічам, М.Зарэцкім. Гэта пісьмо з'явілася ў сувязі з дакладам Крыніцкага на сходзе членаў бюро ячэек Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі, які быў зроблены 18 верасня 1925 г. Дакладчыка асабліва непакоіў уплыў дробнабуржуазнай інтэлігенцыі, які ва ўмовах Беларусі быў абвешчаны "найбольш небяспечным".

Аўтары пісьма ўстрывожыліся ў сувязі з разуменнем імі суверэннасці Беларусі. Гэта трывога была выклікана тым, што, згодна яго ўяўленням, БССР з'ўлялася не самастойнай дзяржавай, як РСФСР, а самастойнай дзяржавай у двукоссі. Перш чым пісаць аб гэтым, заўважалі аўтары, варта паставіць пытанне аб скасаванні адпаведных артыкулаў і раздзелаў саюзнай Канстытуцыі.

Дадзенае пісьмо выклікала значны рэзананс у кіруючых колах рэспублікі. Яно фігуравала на пленуме ЦК КП(б)Б, які пачаўся 15 кастрычніка 1925 г. У справаздачы цэнтральнага камітэта IX з'езду кампартыі Беларусі, які працаваў 8 — 12 снежня 1925 г., адзначалася, што аўтарам пісьма растлумачылі афіцыйны пункт гледжання на ўзнятае імі пытанне. Была праведзена адпаведная работа ў пісьменніцкіх арганізацыях. Адносна ўсебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк" было прынята адпаведнае рашэнне. У выніку яго першы з'езд падтрымаў палітыку ЦК КП(б)Б і заклеймаваў "тую невялікую групу беларускай інтэлігенцыі, якая вядзе барацьбу



6. Зак. 5022

супраць дыктатуры пралетарыяту і імкнецца павесці працоўныя масы Беларусі па нацыянальна-дэмакратычнаму шляху"[1].

У наступны час работа літаратараў, як і наогул інтэлігенцыі, а таксама нацыянальнае пытанне ў цэлым перыядычна абмяркоўваліся на пленумах ЦК КП(б)Б. Яны былі важным напрамкам у рашэннях з'ездаў кампартыі Беларусі. Партыйная лінія ў адносінах да інтэлігенцыі зводзілася да таго, каб не столькі прыцягваць яе да партыі, колькі "дыферэнцыраваць і проціпастаўляць адну частку інтэлігенцыі другой"[2].

Супрацьпастаўленне — характэрная рыса палітыкі бальшавіцкай партыі ў адносінах да інтэлігенцыі. Самае радыкальнае стаўленне было да тых яе прадстаўнікоў, якія ішлі па шляху змагання з савецкай уладай. У Беларускай ССР у 20-х гадах гэта былі, у прыватнасці, лістападаўцы — члены невялікай арганізацыі, якой кіраваў настаўнік, удзельнік Слуцкага паўстання 1920 г., сябра К.Міцкевіча (Я.Коласа) Г.Лістапад. Нелегальная антысавецкая група лістападаўцаў была створана ў канцы 1924 г. у Слуцку. Яна выдавала беларускі часопіс "Наша слова".

Выяўленне органамі АДПУ ў 1925 г. дадзенай групы моцна ўстрывожыла вышэйшае партыйнае кіраўніцтва. Гэта пытанне стала прадметам абмеркавання на пасяджэнні палітбюро ЦК УКП(б) 28 студзеня 1926 г. Было вырашана весці справу да судовага працэсу над дадзенай "падпольнай контррэвалюцыйнай арганізацыяй". Аднак гэты працэс павінен праходзіць без палітычнага шуму, справу слухаць не ў вышэйшым судзе Беларусі, а ў агульным парадку, у акруговым судзе, па падсуднасці. Вышэйшы партыйны выканаўчы орган таксама вырашыў, каб палітычнае абвінавачванне было засяроджана на наступных момантах:

а) сувязь абвінавачанага Лістапада з польскай дыфензівай і яго контррэвалюцыйнае мінулае;

б) антысеміцкі характар групы;

в) імкненні групы раскалоць саюз рабочых і сялян;

г) планы групы прымеркаваць узброенае паўстанне іменна да моманту магчымай у будучым вайны;

д) роля інтэлігенцыі і ў прыватнасці Міцкевіча.

---

[1] *Платонаў Р.* Мяцежны ліст //Чырвоная змена. 1995. 9 лют.

[2] Там жа.

Таксама было прынята рашэнне, каб прыгавор з-за маладосці членаў групы і іх нявопытнасці не перавышаў трох — пяці гадоў турмы.

Пастанова палітбюро была выканана судом Беларускай ССР. 5 сакавіка 1926 г. пачаўся двухтыднёвы працэс над удзельнікамі групы. Ён праходзіў у доме работнікаў асветы. На лаве падсудных знаходзіліся шэсць чалавек: Г.Лістапад, М.Дземідовіч, Т.Курбыка, М.Казак, М.Макарэня, Н.Мяцельскі. У перапоўненай зале былі людзі, якіх дапусцілі на працэс па спецыяльных білетах. Усе ўдзельнікі групы Лістапада атрымалі тэрміны турэмнага зняволення ў межах, вызначаных палітбюро ЦК УКП(б)[1].

Супрацьстаянне кіраўніцтва бальшавіцкай кампартыі і творчай інтэлігенцыі мела месца не толькі ў БССР, але і на саюзным узроўні. Тут таксама рабіліся захады, каб кантраляваць абставіны, быць дасведчаным у сувязі з правядзеннем розных мерапрыемстваў. У прыватнасці, 3 сакавіка 1927 г. на закрытым пасяджэнні палітбюро ЦК УКП(б) разгледзела пытанне "Аб шэсці пісьменнікаў да помніка Гогалю". У выніку абмеркавання адпаведным работнікам было зроблена даручэнне "забяспечыць наш уплыў у кіруючым ядры арганізуемага пісьменнікамі шэсця і выступленне нашых аратараў"[2].

Нагляд ажыццяўляўся не толькі ўнутры краіны, але і за яе межамі. Адным са сведчанняў гэтага з'явілася пастанова палітбюро ад 28 лютага 1927 г. Пасля абмеркавання пытання "Аб тыдні сустрэчы рускіх вучоных у Берліне" было вырашана даручыць АДПУ ўстанавіць строгі нагляд за паводзінамі вучоных у Германіі[3]. Гэтыя факты сведчаць аб усталяванні ў краіне сачэння за прадстаўнікамі інтэлігенцыі, імкненні пранікнуць у іх арганізацыі з тым, каб кантраляваць не толькі дзейнасць, але і намеры найбольш вядомых прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі. Гэта адпавядала імкненню кіраўнікоў кампартыі і дзяржавы ўсталяваць аўтарытарныя, а затым і таталітарныя метады кіраўніцтва грамадствам. Іх супярэчанне характару новай эканамічнай палітыкі ў разлік не прымалася. Палітычны бок у развіцці краіны ўсё больш пераважаў.

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.3, арк.18; *Крапивин С.* Последние непуганые люди // Народная газета. 1997. 5—7 крас.

[2] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.4, арк.74.

[3] Там жа, арк.91.

Істотнай супярэчнасцю ў жыцці дзяржавы і народа з'яўлялася барацьба бальшавіцкай улады з царквою, якая татальна рабавалася. Да канца 20-х гадоў было канфіскавана 827,5 тыс. дзесяцін манастырскай зямлі з усім жывым і мёртвым інвентаром. Уся гэта маёмасць перайшла ў распараджэнне валасных зямельных камітэтаў і павятовых саветаў сялянскіх дэпутатаў. Разам з гэтым былі нацыяналізаваны 84 манастырскія заводы, 704 гасцініцы і двары, 1112 даходных дамоў, 426 малочных фермаў, 602 жывёльныя двары, 311 пасек. Па прыблізных падліках, толькі ў 1920 г. агульная сума канфіскаваных царкоўных грашовых капіталаў і фондаў склала 7 млрд 150 млн руб. Гэта сума адносіцца да ўсяго СССР, за выключэннем Украіны, Каўказа і Сібіры[1]. Ва ўмовах шырокага распаўсюджання ў народзе рэлігійных вераванняў гэтыя акцыі ўносілі ў жыццё грамадства трывогу і глыбокія супярэчанні паміж прыхільнікамі і праціўнікамі іх правядзення.

Рэквізіцыя манастырскай і царкоўнай маёмасці з'яўлялася шырокамаштабнай кампаніяй. Разгорталася яна паўсюдна, у тым ліку ў Беларускай ССР. Як заявіў Багуцкі ў дакладзе на 12-й канферэнцыі (VII з'езд) КП(б)Б, якая адбылася 20 — 26 сакавіка 1923 г., адной з важнейшых кампаній была канфіскацыя царкоўных каштоўнасцей. Партыя прыняла ў ёй "самы дзейсны і руплівы ўдзел". У гэты час у Паволжы быў голад, трэба было спяшацца з дапамогай. Мела месца супрацьдзеянне канфіскацыі каштоўнасцей. Таму ў БССР прайшлі тры працэсы над служыцелямі культу — ксяндзамі, папамі, равінамі[2]. Голад, канешне, трэба было энергічна пераадольваць і царква не была б у баку ад гэтых намаганняў. Аднак усё вырашалася жорсткімі, непапулярнымі, адміністрацыйна-каманднымі мерамі.

Найбольш паказальным і трагічным прыкладам праследавання служыцеляў царквы ў Беларускай ССР у 20-х гадах з'явіўся лёс мітрапаліта Мельхісэдэка. Ён рабіў усё магчымае, каб захаваць у народзе хрысціянскую веру, спалучыць інтарэсы царквы з ідэямі беларускага нацыянальнага адраджэння. Па яго ініцыятыве 18 жніўня 1922 г. была абвешчана Беларуская аўтаномная царква. Ён выступаў за ўвядзенне беларускай мовы ў царкоўны ўжытак, што трак-

---

[1] *Урублеўскі А.* Як рабавалі царкву // Чырвоная змена. 1994. 13 верас.

[2] НАРБ, ф.4, воп.2, спр.21, арк.21.

тавалася як контррэвалюцыйнае дзеянне. Па усіх гэтых фактах вялося следства, якое ў пачатку студзеня 1925 г. было закончана, і справа перададзена ў суд. Мітрапаліт Мельхісэдэк, яго паплечнікі Л.Васюкевіч, А.Касцючэнка, А.Кіркевіч, Е.Сабіла былі абвінавачаны ў масавым утойванні ў 1922 г. царкоўных каштоўнасцей, раскраданні маёмасці, контррэвалюцыйнай прапагандзе, атрыманні і распаўсюджанні замежнай літаратуры. У выніку мітрапаліт быў прыгавораны да трох гадоў пазбаўлення волі, яго паплечнікі таксама атрымалі па аднаму-два гады ўмоўнага асуджэння. Мітрапаліт Мельхісэдэк раптоўна памёр у Маскве 17 мая 1931 г. Па некаторых меркаваннях, ён быў атручаны[1].

Супрацьстаянне афіцыйных улад і царквы — частка гісторыі многіх дзяржаў і народаў. Аднак бальшавіцкая ўлада ў гэтай справе пайшла значна далей. Яна стала на шлях знішчэння як служыцеляў царквы, так і яе матэрыяльных асноў, увядзення татальнага атэізму. Асабліва ўзмацнілася гэта наступленне ў 30-я гады. Тое, што веру не ўдалося поўнасцю вынішчыць са свядомасці людзей, сведчыць аб яе надзвычай глыбокіх каранях.

Узмацненне насуперак характару новай эканамічнай палітыкі аўтарытарных тэндэнцый у грамадска-палітычным развіцці краіны знаходзіла адлюстраванне не толькі ва ўнутраным жыцці, але і ў знешнепалітычнай дзейнасці. Красамоўным сведчаннем у гэтых адносінах з'яўляецца пратакол пасяджэння камісіі палітбюро ЦК УКП(б) па разгляду справаздачы і сметы сакрэтных расходаў УЦСПС па міжнароднай рабоце. Гэты пратакол быў зацверджаны палітбюро 10 сакавіка 1927 г. У пастанове адзначалася:

1) прадстаўленую т.Томскім справаздачу зробленых ім сакрэтных расходаў на суму 35 565 амерыканскіх долараў зацвердзіць;

2) сметы сакрэтных расходаў УЦСПС па міжнароднай рабоце на 6 месяцаў (з 1 сакавіка па 1 верасня 1927 г.) зацвердзіць у суме 36 тыс. амерыканскіх долараў;

3) дазволіць т.Томскаму знішчыць апраўдальныя дакументы па расходах, зробленых да 1 мая 1926 г.[2]

Аб асцярожнасці вышэйшага бальшавіцкага кіраўніцтва ў знешнепалітычных справах, імкненні

---

[1] *Працька Т.* Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну. Мн., 1996. С.4, 54, 56, 61.

[2] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 162, спр. 4, арк. 79.

замесці сляды, павысіць сакрэтнасць сваёй дзейнасці сведчыць таксама пастанова палітбюро ЦК УКП(б) па пытанню аб Камінтэрне і савецкай уладзе. Пасля заслухоўвання 23 красавіка 1928 г. даклада Сталіна было вырашана паслаць усім кіраўнікам савецкіх прадстаўніцтваў за мяжой дырэктыву аб найстражэйшым правядзенні прынцыпу неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы адпаведных краін. Каб стварыць уражанне незалежнасці Камінтэрна ад савецкіх кіраўнікоў, членам палітбюро (за выключэннем Бухарына) на пэўны перыяд забараняліся адкрытыя выступленні ў афіцыйных установах Камуністычнага Інтэрнацыянала. Было прапанавана праводзіць кіраўніцтва камінтэрнаўскай работай ва ўнутраным парадку, праз дэлегацыю УКП(б) і інш. Як гаварылася ў рашэнні, для таго каб не даць ворагам лішняй падставы сцвярджаць аб перапляценні савецкай улады з Камінтэрнам, неабходна зняць даклад Рыкава аб СССР на VI кангрэсе і даручыць яго каму-небудзь іншаму, не з ліку членаў Саўнаркома. Пастанова таксама ўтрымлівала даручэнне Бухарыну і Пятніцкаму распрацаваць пытанне аб выдачы грошай секцыям Камуністычнага Інтэрнацыянала не з Масквы і не праз рускіх, а з Берліна (Захбюро) і Іркуцка (Усходбюро), абавязкова праз замежных таварышаў. Камісіі ў складзе прадстаўнікоў палітсакратарыята выканаўчага камітэта Камуністычнага Інтэрнацыянала, ЦК і ЦКК УКП(б) даручалася праверыць склад сакрэтных супрацоўнікаў апарату выканкома Камінтэрна[1]. Гэты дакумент у многім раскрывае характар узаемаадносін вышэйшага бальшавіцкага кіраўніцтва з Камінтэрнам.

Такім чынам вынікае, што час дзеяння новай эканамічнай палітыкі быў плённым для СССР, у тым ліку савецкай Беларусі. Аднаўленне эканомікі і яе далейшае развіццё спалучаліся з поспехамі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Аднак у грамадска-палітычным жыцці нарасталі аўтарытарныя тэндэнцыі. Яны ўсё больш бралі верх і занялі ў канцы 20-х гадоў дамінуючае становішча. Асноўная супярэчнасць гэтага перыяду паміж НЭПам і імкненнем бальшавікоў да таталітарнага праўлення была вырашана на карысць апошняга.

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.6, арк.70.

**РАЗДЗЕЛ 3**

# УКАРАНЕННЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ ТАТАЛІТАРНАЙ СІСТЭМЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР У ЧАС БУДАЎНІЦТВА НОВАГА ГРАМАДСТВА

## 1. Камандныя метады ў эканоміцы: дасягненні і пралікі

Вопыт 20-х гадоў па аднаўленню і далейшаму развіццю эканомікі сведчыў, што на аснове новай эканамічнай палітыкі можна паспяхова рухацца далей. Аднак імкненне вярхоўнага кіраўніцтва партыі і дзяржавы да аўтарытарных метадаў кіравання грамадствам не пакідала месца апрабаваным нэпаўскім падыходам.

Гэта пачало праяўляцца дастаткова рана. Ужо ў сярэдзіне 20-х гадоў фактычна пачалося наступленне на прыватны капітал у прамысловасці, які займаў у ёй значныя пазіцыі. У Беларускай ССР у 1926 г. налічвалася звыш 60 тыс. дробных прамысловых прадпрыемстваў, на якіх было занята больш за 100 тыс. чалавек. Але падатковы націск на прыватныя прадпрыемствы ўзрастаў. 8 верасня 1926 г. СНК СССР пастанавіў максімальна ўзмацніць абкладанне прыватнага капіталу, перайсці да адзяржаўлення дробнай вытворчасці і гандлю[1]. Гэта азначала наступленне на новую эканамічную палітыку.

Новы стыль кіравання развіццём эканомікі асабліва яскрава праявіўся ў абыходжанні вярхоўнага эшалона ўлады з першым пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі СССР, які быў даволі грунтоўна падрыхтаваны з удзелам практыкаў і лепшых навуковых сіл краіны. Яго разгледзелі і прынялі ў красавіку-маі 1929 г. высокія партыйныя і дзяржаўныя органы — 16-я канферэнцыя УКП(б) і 5-ы з’езд Саветаў Саюза ССР. Валявыя змяненні важнейшых паказчыкаў у бок іх радыкальнага павелічэння,

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.87.

зробленыя Сталіным, — характэрная рыса такіх падыходаў. Гэта – яркае сведчанне аўтарытарных метадаў кіравання.

Што датычыць індустрыялізацыі, то такі падыход фактычна быў падтрыманы большасцю партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў і нават асноўнай часткай народа. Многія разумелі, што неабходна паскоранае прамысловае развіццё і што яго дыктуе складанае міжнароднае становішча. Ажыццяўленне індустрыялізацыі ў першую чаргу за кошт сялянства шмат кім з кіраўнікоў і рабочых у разлік не прымалася, а сяляне пра гэта амаль не ведалі.

Неабходнасць індустрыялізацыі была відавочнай, таму што па аб'ёму прамысловай прадукцыі на душу насельніцтва ў другой палове 20-х гадоў Савецкі Саюз адставаў ад развітых капіталістычных краін у 5—10 разоў. Яшчэ горшымі былі гэтыя суадносіны ў БССР. Таму неабходна было зрабіць гераічныя намаганні, каб ператварыць дзяржаву ў эканамічна незалежную. А гэта ёй магло забяспечыць толькі інтэнсіўнае індустрыяльнае развіццё.

Аднак вялікія цяжкасці меліся з накапленнем сродкаў для індустрыялізацыі. Акрамя шырока вядомых крыніц, якія грунтоўна адлюстраваны ў савецкай, у тым ліку беларускай гістарычнай літаратуры, меліся і малавядомыя, што здабываліся толькі адміністрацыйна-каманднымі, аўтарытарнымі, бальшавіцкімі метадамі. У прыватнасці, 17 сакавіка 1930 г. палітбюро ЦК УКП(б) прыняло сакрэтную пастанову, згодна з якой працягваўся тэрмін работы АДПУ па збору валюты да 1 красавіка гэтага ж года з тым, каб сабраць не менш 2,5 млн валютных рублёў[1]. Вядома, што гэтыя сродкі здабываліся шляхам канфіскацыі каштоўнасцей у рэпрэсіраваных заможных сялян, духавенства, іншых груп насельніцтва.

Кампаніі па збору валюты праводзіліся рэгулярна. Актыўна яны вяліся і ў БССР. Толькі за 20 дзён снежня 1931 г. эканамічным аддзелам паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па БССР было канфіскавана амаль 136 тыс. долараў ЗША, золата царскай чаканкі на суму ў 210 тыс. залатых рублёў, шмат іншых каштоўнасцей[2]. Архіўныя дакументы сведчаць, што гэта крыніца фінансавання індустрыяльнага станаўлення

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.8, арк.120.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.250, арк.175.

дзяржавы была істотнай, і карныя органы ўносілі свой уклад у ажыццяўленне планаў прамысловага развіцця.

З улікам спецыфікі эканамічнага становішча БССР заданнямі прадугледжвалася, што развіццё прамысловасці тут будзе ажыццяўляцца пераважна на базе мясцовых рэсурсаў. У першую чаргу гэта былі харчовая, тэкстыльная, гарбарная галіны. Вядучае месца павінна была заняць перапрацоўка прадукцыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Ужо ў 1927/28 гаспадарчым годзе на яе долю прыходзілася больш за палову прамысловых вырабаў. Разам з тым развівалася энергетычная, паліўная (у першую чаргу тарфяная), машынабудаўнічая, тэкстыльная і іншыя галіны.

Самаадданая праца беларускага народа, а таксама дапамога саюзнага ўрада, савецкіх рэспублік садзейнічалі даволі актыўнаму прамысловаму будаўніцтву. Ужо на працягу першай пяцігодкі (1928—1932) у БССР было пабудавана 78 буйных і 480 дробных і сярэдніх прадпрыемстваў. Сярод іх найбольш значныя ў рэспубліцы БелДРЭС, Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, швейныя фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі" (Віцебск), імя Камінтэрна (Гомель), Віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка і інш.

Аднак закладзенае ў планы забяганне наперад было такім, што нават значныя тэмпы індустрыяльнага развіцця не дазволілі рэспубліцы выканаць заданні пяцігодкі. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 2,7 раза, у той час як планам прадугледжваўся рост у 3,7 раза[1]. У рабоце прамысловасці было шмат пралікаў і цяжкасцей. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, прымаемыя рашэнні. Як адзначалася 4 кастрычніка 1933 г. у пастанове бюро ЦК і прэзідыума ЦКК КП(б)Б "Аб становішчы Бабруйскай партыйнай арганізацыі", у прамысловым развіцці горада меліся сістэматычныя прарывы ў выкананні прамфінплана як па якасных, так і па колькасных паказчыках. Асабліва гэта датычылася дрэваапрацоўчага камбіната[2].

СНК БССР і ЦК КП(б)Б вымушаны былі адзначыць істотныя недахопы ў рабоце мукамольнай і кру-

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.156—157.

[2] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.118, арк.9.

пяной прамысловасці. У пастанове ад 10 кастрычніка 1933 г. канстатавалася, што гадавая вытворчая праграма адпаведнымі прадпрыемствамі выконваецца яўна нездавальняюча. План першага паўгоддзя забяспечаны толькі на 81,3 %[1].

Аднак найбольш трывожыла тое, што ўзнікалі значныя цяжкасці з энергазабеспячэннем прамысловых прадпрыемстваў. Так, Мінская электрастанцыя сістэматычна дапускала перабоі ў падачы энергіі заводам, фабрыкам, камунальнай гаспадарцы горада. СНК БССР і ЦК КП(б)Б у пастанове ад 30 лістапада 1933 г. "Аб рабоце Мінскай электрастанцыі" вызначылі меры па паляпшэнню становішча[2].

Дадзеная серыя рашэнняў на працягу кароткага тэрміну сведчыць аб напружаным становішчы ў прамысловым развіцці Беларускай ССР і аб рэагаванні партыйна-дзяржаўных органаў з мэтай палепшыць стан спраў.

Да таго ж ажыццяўленне індустрыялізацыі адбывалася на строга уніфікаванай аснове. Ужо ў пачатку 30-х гадоў канчаткова былі вынішчаны аднаасобная вытворчасць і прыватны капітал. Дзяржаўная ўласнасць у прамысловасці стала дамінуючай. Высокай цэнтралізацыі дасягнула кіраўніцтва прамысловым будаўніцтвам. Гэта адпавядала бальшавіцкай палітычнай сістэме, якая стваралася.

Істотным напрамкам ва ўкараненні таталітарных метадаў у эканоміку стала шырокае выкарыстанне фактычна дарэмнай працы палітзняволеных, у першую чаргу высланых заможных сялян, для ўзвядзення важных прамысловых аб'ектаў у аддаленых рэгіёнах дзяржавы. Гэта галіна савецкай эканомікі існавала ў сістэме карных органаў. Сакрэтным рашэннем палітбюро ЦК УКП(б) ад 23 кастрычніка 1932 г. былі вызначаны асноўныя аб'екты гэтай лагернай індустрыі:

заканчэнне работ на Белмарбудаўніцтве;
узвядзенне канала Волга — Масква;
пракладка Байкала-Амурскай магістралі;
асваенне Калымы;
работы на Ухце і Пячоры;
нарыхтоўка дроў для Ленінграда і Масквы[3].

---

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 3, спр.120, арк.146.

[2] Там жа, спр.126, арк.150.

[3] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.13, арк. 132.

У сувязі з пашырэннем рэпрэсій маштабы прымянення працы палітзняволеных узрасталі.

Значныя намаганні рабіліся ўладамі для павышэння тэмпаў прамысловага развіцця ў гады другой і трэцяй пяцігодак. Толькі на працягу 1932 — 1937 гг. аб'ём прамысловай прадукцыі ў БССР павялічыўся амаль у 1,9 раза. У лік дзеючых уступілі такія прадпрыемствы, як другая чарга БелДРЭС, Магілёўскі аўтарамонтны завод, Крычаўскі цэментны завод, Гомельскі завод шкляных вырабаў, Аршанскі ільнокамбінат і інш. Валавая прадукцыя прамысловасці ўсходніх абласцей БССР у 1940 г. перавысіла ўзровень 1913 г. у 23 разы[1].

Неабходна прызнаць, што мацнеючая бальшавіцкая таталітарная сістэма шляхам "закручвання гаек", напорыстай агітацыйнай работай, прапагандай сацыялістычных ідэалаў і іншымі прыёмамі змагла выклікаць дастаткова высокі працоўны энтузіязм народа, у першую чаргу рабочага класа. У яго асяроддзі шырылася сацыялістычнае спаборніцтва, якое прымала розныя формы — ударніцтва, гаспадарча-разліковыя брыгады, сустрэчнае планаванне, грамадскі буксір і інш. Вяршыняй дадзенага руху з'явіліся стаханаўскія метады працы. Аднак ва ўсім гэтым мелася мноства негатыўных з'яў, кампанейшчыны, фармалізму, паказухі, прыпісак у паказчыках і г.д.

Нягледзячы на поспехі ў прамысловым развіцці, яго тэмпы ў Беларускай ССР былі ніжэйшыя, чым саюзныя. Гэта прывяло да таго, што ўдзельная вага рэспубліканскай прамысловасці ў саюзнай паменшылася толькі на працягу 1932 — 1937 гг. з 2 да 1,88 %. У розных галінах індустрыі было шмат нявырашаных задач. Так, магутнасць электрастанцый рэспублікі за 1932—1937 гг. вырасла на 41 %, але па стану на пачатак 1940 г. забеспячэнне электраэнергіяй заставалася самым слабым месцам у гаспадарцы рэспублікі. Такая ацэнка была дадзена ЦК КП(б)Б у пастанове, прынятай 3 — 4 студзеня 1940 г. Толькі па гарадах Беларускай ССР дэфіцыт электраэнергіі складаў 25 тыс.кВт. У выніку гэтага прамысловасць працавала з перабоямі і прыносіла нярэдка страты. Асабліва востра стаяла пытанне электразабеспячэння сталіцы рэспублікі — Мінска, жыхары якога задавальняліся электраэнергіяй толькі на 25 — 40 %[2].

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.157.

[2] НАРБ, ф. 4, воп. 3, спр.875, арк.73.

Важнейшай асаблівасцю кіравання развіццём індустрыі ва ўмовах таталітарнай сістэмы з'яўлялася ігнараванне эканамічных стымулаў у працы і ўсё большая стаўка на адміністрацыйна-камандныя метады. Вынікам гэтага стала, у прыватнасці, распаўсюджванне нерытмічнай работы фабрык і заводаў. Шмат для якіх прадпрыемстваў была характэрна штурмаўшчына. Многія галіны прамысловасці, у першую чаргу тарфяная, шкляная, мяса-малочная, дапускалі недавыкананне планавых заданняў. Для ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва работай прамысловасці і транспарту ў БССР у канцы 1940 г. было прынята рашэнне аб увядзенні пасады сакратара па прамысловасці і транспарту ў некаторых абласных і гарадскіх камітэтах КП(б)Б і аб стварэнні прамысловых аддзелаў у гарадскіх і шэрагу раённых камітэтаў партыі. У пачатку 1941 г. пры прамысловых наркаматах пачалі ствараццa тэхнічныя саветы пад кіраўніцтвам адпаведных работнікаў. У функцыі гэтых саветаў уваходзіў разгляд асноўных пытанняў тэхнічнага развіцця і рацыяналізацыі вытворчасці, рэканструкцыі прадпрыемстваў, укаранення новых тэхналогій, вытворчай экспертызы тэхнічных праектаў і інш.[1] Аднак вайна спыніла гэту работу.

Пастаянны і ўсёахопны кантроль з боку партыйных і савецкіх органаў за развіццём прамысловасці дапаўняўся пільным наглядам карных органаў. Яны цікавіліся перш за ўсё палітычным бокам спраў: надзейнасцю кіраўнікоў, настроем рабочых, інжынераў, тэхнікаў і інш. Для гэтай мэты эканамічны аддзел органаў АДПУ—НКУС меў шырокую сетку паведамляльнікаў. У красавіку 1936 г. у БССР іх налічвалася 1326, у тым ліку на БелДРЭС — 7, Аршанскай ільночасальнай фабрыцы — 5 і г. д.[2]

Атрыманую інфармацыю аналізавалі, абагульнялі і накіроўвалі партыйным і дзяржаўным органам для прыняцця адпаведных мер. У сувязі з узмацненнем бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, асабліва ў яе сталінскім варыянце, значэнне гэтай інфармацыі ўзрастала.

Намаганні органаў савецкай улады прывялі да таго, што на працягу 30-х гадоў БССР зрабіла значны крок наперад у прамысловым развіцці. За гады

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.1085, арк.10 — 11; спр.1124, арк.6 — 7.

[2] *Протько Т.* Удушение экономики //Круг. 1996. № 2. С. 12.

трох даваенных пяцігодак у рэспубліцы была фактычна створана новая матэрыяльна-тэхнічная база, пабудавана звыш 1000 прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку каля 400 буйных. Вялікую дапамогу ў гэтым аказалі цэнтральныя ўлады, а таксама саюзныя рэспублікі. У той жа час і БССР уносіла свой адметны ўклад у агульнасаюзнае прамысловае будаўніцтва. Дакументальныя матэрыялы сведчаць, што матэрыяльныя і фінансавыя паступленні з БССР нярэдка перавышалі памеры той дапамогі, якая аказвалася рэспубліцы.

Адным з вынікаў прамысловага развіцця стаў рост рабочага класа рэспублікі. У 1940 г. яго колькасць дасягнула амаль 277 тыс. чалавек, а ўдзельная вага ў складзе дарослага насельніцтва перавысіла 20 %. Гэта адпавядала палітыцы ўзвышэння рабочага класа як вядучай сілы грамадства. Такім чынам, бальшавіцкая таталітарная сістэма, якая прыкрывалася такой яго роллю, умацоўвала свае пазіцыі. З гэтай мэтай прамысловасць фарміравалася выключна як дзяржаўная галіна гаспадаркі. На яе аснове былі ліквідаваны дробныя прадпрымальнікі, гандляры, рамеснікі. Выключная падпарадкаванасць Цэнтру, жорсткае рэгуляванне паставак і размеркавання вырабаў павінны былі рабіць і рабілі савецкую дзяржаву высокацэнтралізаванай.

Да таго ж характар прамысловага развіцця мэтанакіравана станавіўся такім, каб як мага больш задзейнічаць розныя рэгіёны ўзаемнымі абавязацельствамі па пастаўках сыравіны, камплектавальных дэталей, гатовай прадукцыі. Акрамя таго, што дадзеная акалічнасць пэўным чынам абумоўлівалася эканамічнай мэтазгоднасцю, тут мелася на ўвазе і палітычная мэта: як мага цясней прывязаць розныя рэгіёны краіны да Цэнтра і адзін да аднаго, павысіць цэнтралізацыю і інтэрнацыяналізацыю эканамічнага, а разам з ім і грамадска-палітычнага жыцця.

У гэтых адносінах выключная роля надавалася развіццю транспарту, у першую чаргу чыгуначнага. Даволі разгалінаваная сетка чыгункі, што засталася бальшавікам ад царскай Расіі, выкарыстоўвалася імі ў поўнай меры. Чыгункі неслі асноўную нагрузку па забеспячэнню эканамічных сувязей паміж рэгіёнамі дзяржавы. Яны былі не толькі жыццёва важнымі артэрыямі развіцця эканомікі, але дапамагалі цэнтралізацыі краіны ў інтарэсах таталітарнай сістэмы кіравання.

Аднак дадзены працэс быў бы не ўсеагульным, калі б да яго не была далучана вёска з яе жыхарамі, якія складалі ў той час асноўную частку насельніцтва. Гэты бок савецкага будаўніцтва меўся на ўвазе Леніным з першых дзён існавання ўлады бальшавікоў, калі пад яго кіраўніцтвам ажыццяўлялася падтрымка першых калектыўных гаспадарак. На працягу 20-х гадоў іх эвалюцыя была запаволенай: новая эканамічная палітыка не садзейнічала развіццю дадзенай формы гаспадарання. Абставіны змяніліся ў 1929 г. — “годзе вялікага пералому”, у сувязі з рэзкім адыходам сталінскага кіраўніцтва ад НЭПа і пераходам да калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў масавым маштабе. У час яе ажыццяўлення пераважалі націскныя метады работы, характэрныя для часоў, калі Сталін вырашыў “адкінуць да д'ябла” новую эканамічную палітыку, якая дазволіла вывесці краіну з пасляваеннай разрухі і галечы, дасягнуць значных поспехаў у эканамічным развіцці. Гэта быў прамалінейны і круты паварот, які не ўлічваў ні аб'ектыўных законаў эканамічнага развіцця, ні асаблівасцей вёскі.

Паўсюдна ў дзяржаве ажыццяўленне палітыкі масавай калектывізацыі фактычна пачалося ўжо з сярэдзіны 1929 г. Калі на 1 чэрвеня ў БССР у калектыўных гаспадарках знаходзілася 12,9 тыс. сялянскіх двароў, то да канца лістапада таго ж года — 77,7 тыс. За гэты час узровень калектывізацыі павысіўся з 1,4 да 9,8 %, г.зн. у 7 разоў. Акрамя таго, у рэспубліцы налічвалася 227 саўгасаў.

Нарошчванне тэмпаў калектывізацыі асабліва ўзмацнілася ў снежні 1929 г. У выніку колькасць сялянскіх гаспадарак у БССР, якія апынуліся ў калгасах на пачатак 1930 г., была даведзена да 165,3 тыс., а працэнт калектывізацыі ўзняўся да 20,9. На працягу месяца паказчыкі павялічыліся больш чым у два разы. Гэта азначае, што быў зроблены пераход да фарсіравання дадзенага складанага сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага працэсу. Фактычна былі дасягнуты паказчыкі, прадугледжаныя першым пяцігадовым планам на канец пяцігодкі. Такая ж тэндэнцыя наглядалася ў многіх іншых рэгіёнах СССР.

Аднак таталітарнай сістэме, якая набірала моц, гэтага было мала. Пастанова ЦК УКП(б) ад 5 студзеня 1930 г. “Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву” арыентава-

ла на далейшае павелічэнне тэмпаў. Не лішне нагадаць, што ў аснову пастановы была пакладзена прамова Сталіна на канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў 27 снежня 1929 г. На месцах, у тым ліку ў БССР, партыйна-дзяржаўныя органы, не ўлічваючы канкрэтныя ўмовы, настойліва імкнуліся як мага паскорыць дадзены працэс. Ужо на студзеньскім (1930 г.) пленуме ЦК КП(б)Б было прынята рашэнне завяршыць калектывізацыю ўсіх бядняцка-сялянскіх гаспадарак да канца 1931 г. Але ў лютым 1930 г. бюро ЦК кампартыі Беларусі пайшло яшчэ далей: яно вырашыла калектывізаваць да веснавой сяўбы гэтага года 75 — 80 % сялянскіх гаспадарак. Займаючыся палітычным пражэкцёрствам, ЦК КП(б)Б адправіў 10 лютага 1930 г. у ЦК УКП(б) дакладную запіску з прапановаю прызнаць БССР рэспублікай суцэльнай калектывізацыі[1].

Каб матываваць гэты свой крок, ЦК КП(б)Б адзначаў, што ўжо к таму часу ў 30 раёнах са 100 узровень калектывізацыі перавысіў 86 %. Пры гэтым сем раёнаў былі калектывізаваны поўнасцю. Выніковыя даныя за некалькі мінулых месяцаў, як адзначалася ў дакладной запісцы, гавораць аб нябачаным размаху калгаснага руху. Гэты аграмадны рост калектывізацыі ў БССР дае поўную ўпэўненасць і падставы меркаваць, што да вясны 1930 г. індывідуальныя гаспадаркі бядняцка-серадняцкіх мас Беларусі будуць абагульнены на 75 — 80 % і што да канца 1930 г. рэспубліка будзе поўнасцю калектывізавана. Зыходзячы з існуючага тэмпу калектывізацыі і з таго становішча, што БССР з'яўляецца рэспублікай, якая мяжуе з капіталістычнымі краінамі, ЦК КП(б)Б прасіў ЦК УКП(б) аб тым, каб БССР была ўключана ў лік раёнаў поўнага абагульнення сельскай гаспадаркі[2].

Першыя месяцы 1930 г. можна расцэньваць як апагей намаганняў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, якая знаходзілася на стадыі фарміравання, у прымяненні насілля над сялянамі з мэтай прыцягнення іх у калгасы. Жорсткі адміністрацыйны націск, што знаходзіў адлюстраванне на практыцы ў адпаведнасці з дадзенай палітычнай лініяй, прывёў да вялікага нарошчвання тэмпаў калектывізацыі. Па стану на 1 сакавіка 1930 г. у БССР у калгасах налічвалася 457,5 тыс. сялянскіх гаспадарак. Яны складалі 58 % ад іх агульнай колькасці. Гэта самыя высокія паказчыкі па рэспубліцы ў гады першай пяцігодкі. Характэрна,

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.192, арк.217.

[2] Там жа.

што ў розных мясцовасцях рэспублікі ход калектывізацыі значна адрозніваўся. Гэта з'яўлялася вынікам больш рэальнага падыходу да вырашэння дадзенай праблемы некаторымі мясцовымі партыйна-дзяржаўнымі органамі.

Абагульненне сельскагаспадарчай вытворчасці суправаджалася рэзкай актывізацыяй барацьбы з заможнымі сялянамі, так званымі кулакамі. На справе гэта вылілася ў палітыку раскулачвання. У яе аснове ляжаў яскрава выражаны класавы падыход. Прынятыя супраць кулацтва меры былі вельмі жорсткія. Яны не толькі не дыктаваліся неабходнасцю, але і супярэчылі здароваму сэнсу, нават разуменню гэтай справы Леніным, які ў канцы свайго жыцця пісаў аб тым, "*як* кааперавацъ, *як* "абмяжоўваць" кулакоў, не прыпыняючы рост вытворчых сіл"[1].

Гэта думка Леніна была поўнасцю адкінута вышэйшымі партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі СССР. Нават у канцы 1930 г., калі сотні тысяч заможных сялян ужо былі высланы ў аддаленыя раёны краіны, на месцы з Масквы працягвалі дасылацца дырэктывы з патрабаваннем раскулачвання ўсё новых і новых гаспадарак. Так, 16 лістапада 1930 г. Сталін накіраваў кіраўнікам БССР Гею і Галадзеду тэлеграму, у якой гаварылася: ЦК адзначае, што выяўленне кулацкіх гаспадарак і спагнанне з іх узносаў нават па абавязковых плацяжах ідзе нездавальняюча. Па СССР выяўлена для індывідуальнага абкладання ўсяго 0,6 % гаспадарак ад іх агульнай колькасці супраць 2,8 % у мінулым годзе. ЦК лічыць, гаварылася далей у тэлеграме, што акрамя недастатковага і абсалютна нецярпімага аслаблення падатковага націску на кулацкія элементы адмоўную ролю ў гэтай справе адыграў яшчэ той факт, што кулацкія элементы здолелі пераўзброіцца і замаскіраваць свае гаспадаркі[2].

Такія патрабаванні ішлі нягледзячы на тое, што ў Беларускай ССР удзельная вага сялянскіх гаспадарак для раскулачвання была і без таго высокай. У дырэктыве ўсім акружным і раённым камітэтам партыі, разасланай 6 лютага 1930 г., першы сакратар ЦК КП(б)Б Гей запатрабаваў, каб агульная колькасць гаспадарак усіх катэгорый кулакоў склала ў сярэднім па БССР 3 — 3,5 %[3].

---

[1] *Ленін У.І.* Творы. Т.45. С.47.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.231, арк.132 — 133.

[3] Там жа, спр.192, арк.206.

Адміністрацыйна-бюракратычны шлях вызначэння колькасці гаспадарак для раскулачвання, ужо не кажучы аб заганнасці самой гэтай палітычнай лініі, як і іншыя захады па фарсіраванаму пераводу сельскагаспадарчай вытворчасці на калектыўны шлях развіцця, сведчыў аб тым, што бальшавіцкія таталітарныя метады кіравання грамадствам апрацоўваліся ў першую чаргу і ў масавым маштабе менавіта ў сельскай мясцовасці. Іменна вёска і яе жыхары, асабліва найбольш гаспадарлівыя, адчулі на сабе ўздзеянне сістэмы, якую стваралі вярхоўныя кіраўнікі краіны.

Намаганні выканаўцаў лініі Цэнтра ў БССР прывялі да таго, што толькі да канца мая 1930 г. у рэспубліцы было раскулачана 15629 гаспадарак. Іх маёмасць перадавалася ў непадзельныя фонды калгасаў. Ужо ў гэты час усё больш яскрава праяўлялася тэндэнцыя пашыранага падыходу да раскулачвання, што закранала і сераднякоў.

Істотнай негатыўнай з'явай прымусовай калектывізацыі сталі масавае забойства і продаж хатняй жывёлы. Гэта з'явілася не столькі вынікам кулацкай агітацыі, як падавала дадзеную справу афіцыйная прапаганда, колькі рэакцыяй сялянства на неймавернае фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі. Значнае скарачэнне пагалоўя доўгі час уплывала на стан жывёлагадоўлі.

Моцны націск на вёску не мог не прывесці да масавых выхадаў сялян з калгасаў, што адбыліся вясною 1930 г. На працягу сакавіка — мая ў БССР з калгасаў выйшла 370,3 тыс. сялянскіх гаспадарак, а працэнт калектывізацыі знізіўся з 58 да 11,1[1]. Гэта быў самы нізкі ўзровень калектывізацыі з таго часу, як яе зрабілі масавай і прымусовай. Выхады сялян з калгасаў назіраліся і ў наступныя гады, хаця і не ў такіх вялікіх памерах.

Метадычная націскная работа органаў партыйна-дзяржаўнай улады разам з прымяненнем эканамічнага ўціску на аднаасобныя гаспадаркі і масіраванай агітацыйна-прапагандысцкай работай вялі да павышэння паказчыкаў калектывізацыі. На пачатак 1932 г. у БССР зноў звыш 383 тыс. сялянскіх гаспадарак былі ў калгасах, г.зн. 50,6 % ад іх агульнай колькасці. Праз год гэты паказчык знізіўся да 43,7 %[2].

[1] Победа колхозного строя в Белорусской ССР. Мн., 1981. С.201.

[2] Там жа.

Праводзячы жорсткую палітыку на нарошчванне тэмпаў калектывізацыі, кіраўнікі мацнеўшай бальшавіцкай таталітарнай сістэмы разумелі, што калі яе тэмпы не будуць дапаўняцца працай па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, то захаваць з такой цяжкасцю створаны калгасны лад будзе немагчыма. Таму партыйна-дзяржаўнымі органамі ўсё большая ўвага надавалася гэтаму напрамку дзейнасці. Прыярытэтнае месца тут займала механізацыя калгаснай вытворчасці, што ажыццяўлялася праз машынна-трактарныя станцыі. У БССР першая з іх – Койданаўская — узнікла ў 1929 г. У канцы 1932 г. у рэспубліцы налічвалася 57 МТС. Яны мелі каля 1,5 тыс. трактароў, іншую тэхніку.

Неабходна было выпрацаваць унутраную структуру сельгасарцелей. Ужо ў пачатку 30-х гадоў асноўнай вытворчай ячэйкай у калгасах стала брыгада. Пачалося іх актыўная стварэнне. Удасканальвалася аплата працы. У яе аснову быў пакладзены працадзень як эквівалент паміж колькасцю зробленай работы і заробкам. Уводзілася здзельшчына, якая з'яўлялася ў той час прагрэсіўнай формай аплаты.

Аднак у процістаянні з сялянствам бальшавіцкая сістэма не спадзявалася толькі на свае ўладныя структуры на вёсцы. Значныя маштабы ў час масавай калектывізацыі набылі мабілізацыя камуністаў, камсамольцаў, беспартыйных з гарадоў і накіраванне іх на часовую ці пастаянную работу ў сельскую мясцовасць. Найбольш буйной акцыяй у гэтых адносінах была пасылка ў калгасы і саўгасы рабочых-дваццаціпяцітысячнікаў. 612 з іх былі накіраваны ў БССР, у тым ліку 99 прадстаўнікоў завода "Чырвонае Сармава" з Ніжняга Ноўгарада[1].

Аднак усе гэтыя і іншыя меры не маглі выратаваць становішча, у якое трапіла краіна, у тым ліку БССР, у пачатку 30-х гадоў. Той урон, які быў нанесены сельскагаспадарчай вытворчасці ў выніку гвалтоўнай калектывізацыі і ўкаранення на вёсцы бальшавіцкіх таталітарных метадаў кіраўніцтва, аказаўся вельмі цяжкім. Зніжэнне паказчыкаў у гэтай галіне было вялікім, што моцна ўскладніла праблему забеспячэння насельніцтва харчаваннем, у першую чаргу хлебам.

З самага пачатку 30-х гадоў становішча спраў у гэтай сферы сістэматычна і даволі часта разглядала-

[1] НАРБ, ф.4, воп.7, спр.224, арк.103 — 110.

ся на самым высокім партыйным і дзяржаўным узроўні. Прымаліся адпаведныя рашэнні, пераважна сакрэтнага характару. У прыватнасці, 10 лістапада 1930 г. палітбюро ЦК УКП(б) заслухала пытанне аб хлебе. Было вырашана скараціць на лістапад і снежань план вывазу збожжа за мяжу на 800 тыс. т і давесці яго да 1 млн 200 тыс. т. Быў таксама вызначаны рэзерв харчовага зерня для ўнутранага выкарыстання ў 150 млн пудоў, а мабілізацыйны фонд — у 50 млн пудоў. У сувязі з цяжкім становішчам на хлебным фронце наркамгандлю прапанавалі ўнесці на разгляд палітбюро новы план і змененыя нормы расходавання хлеба ўнутры краіны[1]. Зразумела, што перагляд нормаў рабіўся ў бок іх змяншэння.

Нарастаючая цэнтралізацыя кіравання эканомікай выразна праявілася ў размеркаванні збожжавых рэсурсаў. Гэта было выклікана іх моцна абмежаванымі памерамі. Фактычна ўсе пытанні ў гэтых адносінах вырашаліся ў Цэнтры, у тым ліку і дапамога рэгіёнам. Так, 18 чэрвеня 1931 г. палітбюро ЦК УКП(б) дазволіла адпусціць дадаткова 400 тыс. пудоў хлеба для паляпшэння спраў у забеспячэнні пагранічных раёнаў БССР[2].

Нярэдка рашэнні прымаліся па зусім нязначных партыях збожжа, што сведчыла аб крайне абмежаваных магчымасцях дзяржавы ў гэтых адносінах. 3 мая 1932 г. вышэйшы выканаўчы партыйны орган — палітбюро ЦК УКП(б) — дазволіў СНК Беларускай ССР выкарыстаць на насенне 500 т ячменю і 530 т грэчкі з цэнтралізаваных рэсурсаў унутры рэспублікі. Аднак у просьбе адносна выкарыстання аўса было адмоўлена[3]. 11 верасня 1932 г. палітбюро ЦК УКП(б) вырашыла адпусціць Беларускай ССР для высеву 1 тыс. т жыта ў якасці насеннай пазыкі з вяртаннем натурай восенню 1933 г., а таксама 1 тыс. т для абмену на яравыя культуры[4]. Такая нязначная дапамога, пасля таго як з месцаў у выглядзе розных падаткаў забіраўся амаль увесь ураджай, не магла хоць колькі-небудзь істотна палепшыць становішча.

Укараненне бальшавіцкіх камандных метадаў у сельскагаспадарчую вытворчасць разам з паскоранай калектывізацыяй і ў выніку гэтага востры недахоп харчавання стварылі асабліва цяжкае становіш-

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.9, арк.70.

[2] Там жа, спр.10, арк.94.

[3] Там жа, спр.12, арк.116.

[4] Там жа, спр.13, арк.101.

ча ў асноўных збожжавых рэгіёнах краіны, у першую чаргу ў Украінскай ССР. У канцы красавіка 1932 г. на працягу аднаго тыдня становішча на Украіне двойчы разглядала палітбюро ЦК УКП(б), хаця ў кароткіх пастановах страшнае слова "голад" не фігуравала. На пасяджэнні 23 красавіка па тэлеграме кіраўніка кампартыі Украіны Чубара было прынята рашэнне: маючы на ўвазе, што цяжкасці з хлебазабеспячэннем на Украіне ў асноўным з'яўляюцца вынікам крайне слабага паступлення гарцавага збору, які павінен быў даць па плану ў красавіку месяцы 100 тыс. т, абавязаць ЦК КП(б)У прыняць усе меры да максімальнага ўзмацнення гарцавага збору з неадкладным вывазам яго на пристанцыйныя пункты[1].

Такім чынам, меркавалася выйсці з трагічнага становішча за кошт унутраных украінскіх рэсурсаў, якія і без таго былі вычарпаны. І толькі з улікам выключнай складанасці абставін на гэтым жа пасяджэнні было вырашана: у якасці крайняй меры разбраніраваць для патрэб забеспячэння Украіны ў красавіку 25 тыс. т хлеба[2].

Аднак гэтага аказалася зусім недастаткова. Таму пастановай ад 29 красавіка 1932 г. палітбюро прапанавала наркамату знешняга гандлю вярнуць з партоў у распараджэнне камітэта нарыхтовак 15 тыс. т кукурузы і 2 тыс. т пшаніцы для забеспячэння насельніцтва Украінскай ССР. Акрамя таго, было вырашана завезці сюды з Цэнтральнай чарназёмнай вобласці 4 млн пудоў збожжа, скарапіўшы адпаведна завоз хлеба ва ўсходнія раёны. Быў таксама спынены вываз хлеба з Украіны ў Закаўказзе[3].

Праз некалькі месяцаў, 17 жніўня 1932 г. палітбюро ЦК УКП(б) прыняло прапанову Сталіна аб скарачэнні плана хлебанарыхтовак на Украіне на 40 млн пудоў у парадку выключэння для асабліва пацярпеўшых раёнаў. Пры гэтым мелася на ўвазе з калгасаў гэтых раёнаў зняць палову плана, з аднаасобных гаспадарак — трэцюю частку[4].

Аднак гэтыя і іншыя меры аказаліся недастатковымі і вельмі запозненымі. Цяпер вядома, якія шырокія памеры набыў голад на Украіне, забраўшы жыцці многіх соцень тысяч яе жыхароў. Не абышоў

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.12, арк.109.

[2] Там жа.

[3] Там жа, арк.115—116.

[4] Там жа, спр.13, арк.76.

ён і Беларускую ССР, асабліва яе паўднёвую частку. У Ельскім раёне ім былі ахоплены тры сельскія саветы, у Нараўлянскім — шэсць, якія налічвалі да 500 гаспадарак. Галадалі як калгаснікі, так і аднаасобнікі. Шмат было памёршых ад знясілення. Да сярэдзіны чэрвеня 1933 г. у Ельскім раёне памерлі па гэтай прычыне 70 чалавек, у Нараўлянскім — 60. Нямала сялян ляжалі апухлымі, іх колькасць у абодвух раёнах дасягала 230 чалавек.

З 93 калгасаў Гомельскага раёна ў 45 адсутнічалі прадукты харчавання як у калектыўных гаспадарках, так і ў калгаснікаў. Толькі ў трох калгасах ад голаду памерлі 9 чалавек. Голад закрануў і цэнтральную частку БССР. Ён адзначаўся ў некаторых калгасах Пухавіцкага і Мінскага раёнаў, у іншых месцах. У сельгасарцелі "Перамога" Астрашыцка-Гарадоцкага сельсавета, што пад Мінскам, апухлі ад голаду калгаснікі С. С. Касоўскі, П.С. Янашчук, В.І. Яркевіч і інш. Жыхарам мясцовасцей, ахопленых голадам, аказвалася дапамога, у першую чаргу мукой. Хворых клалі ў шпіталі[1].

Голад быў абумоўлены не толькі значным спадам прадукцыйнасці сельскагаспадарчай вытворчасці ў перыяд масавай і прымусовай калектывізацыі, але і жорсткай нарыхтоўчай палітыкай, што праводзілася сталінскім кіраўніцтвам. К гэтаму часу адносіцца пераход ад кантрактнай сістэмы нарыхтовак прадуктаў да іх абавязковых паставак. Менавіта ў гэты час была ўзмоцнена падатковая сістэма.

Партыйныя і дзяржаўныя органы, уся мацнеючая бальшавіцкая таталітарная сістэма бачылі выйсце са складанага становішча з забеспячэннем насельніцтва харчаваннем ва ўвядзенні жорсткіх абмежаванняў у многіх сферах дзейнасці. Характэрная ў гэтых адносінах пастанова СНК БССР "Аб закрыцці мельніц і забароне памолу ў байкатаваных сельскіх саветах і раёнах", прынятая 25 снежня 1932 г. У ёй з мэтай рашучага стымулявання ў выкананні плана хлебанарыхтовак, барацьбы з кулаком, спекулянтам і перакупшчыкам хлеба прызнавалася неабходным ва ўсіх раёнах, сельсаветах і асобных населеных пунктах, занесеных на чорную дошку за невыкананне

[1] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.103, арк.76 — 79; воп.21, спр. 467, арк.145; Спадчына. 1990. №4. С.69.

плана хлебанарыхтовак, закрыць усе мельніцы і забараніць РВК і сельскім саветам выдаваць даведкі на права памолу як калгасам, так і аднаасобнікам. Савецкім арганізацыям з удзелам міліцыі прадпісвалася павесці рашучую барацьбу з тайным памолам збожжа. У сувязі з масавым прымяненнем ручных жорнаў для памолу зерня пастанова патрабавала іх апячатвання, а пры спробе выкарыстання – канфіскацыі[1].

Адной з асноўных задач савецкай улады на вёсцы было максімальнае выкачванне з яе харчовых рэсурсаў. Гэта работа не спынялася і ў час голаду ў шэрагу раёнаў БССР. Стаўка рабілася выключна на націскныя метады. У прыватнасці, 2 лютага 1932 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б вырашыў пасляць спецыяльныя брыгады па праверцы паступлення памольнага збору ў найбольш адстаючыя раёны. Сярод іх былі Лагойскі, Бабруйскі, Віцебскі і іншыя – усяго 9. У кожны з раёнаў накіроўвалася па 11 чалавек на чале з брыгадзірам[2].

Жорсткае адміністрацыйна-каманднае ўздзеянне ў сувязі са складанымі абставінамі з забеспячэннем насельніцтва харчаваннем не магло абысціся без удзелу карных органаў. Выкарыстоўваючы агентурныя матэрыялы, яны актыўна ўмешваліся ў сітуацыю. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць пісьмо паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па БССР кіраўніку кампартыі Беларусі Гікала, накіраванае 1 студзеня 1933 г. У пісьме быў зроблены аналіз плана забеспячэння насельніцтва БССР харчаваннем у першым квартале 1933 г. Аўтары плана абвінавачваліся ў "гніла-ліберальных" адносінах да забеспячэння працоўных і ў ігнараванні палітычнага боку справы. Было прапанавана ачысціць спісы "ад антысавецкіх, тых, хто прымазаўся, і чужых элементаў"[3]. Такім чынам, фактычна спісы на атрыманне прадуктаў прапаноўвалася складаць зыходзячы з класавага прынцыпу. Наогул такі падыход у многім быў вызначальным пры паўсюдным выкарыстанні камандных падыходаў для вырашэння эканамічных праблем.

Адным з найбольш характэрных напрамкаў укаранення бальшавіцкіх таталітарных метадаў у эканамічную сферу былі меры па захаванню сацыялістычнай уласнасці. Яны пачалі праводзіцца на асно-

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 341, арк. 13.

[2] Там жа, спр.302, арк.232.

[3] Там жа, спр.363, арк.89—90.

ве прынятай 7 жніўня 1932 г. ЦВК і СНК СССР пастановы "Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці". Тэкст гэтага дакумента быў уласнаручна напісаны Сталіным. У ім, у прыватнасці, адзначалася, што "людзі, якія квапяцца на грамадскую маёмасць, павінны быць разгледжаны як ворагі народа". Зыходзячы з гэтай устаноўкі пастанова патрабавала "прымяняць у якасці меры судовай рэпрэсіі за крадзеж калгаснай і кааператыўнай маёмасці вышэйшую меру сацыяльнай абароны — расстрэл з канфіскацыяй усёй маёмасці і з заменай пры змякчаючых акалічнасцях пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй 10 гадоў з канфіскацыяй усёй маёмасці". Гэты фанатычны дакумент, які атрымаў у народзе назву "закон пяці каласкоў", прадпісваў партыйным і савецкім уладам "не прымяняць амністыі да злачынцаў, асуджаных па справах аб крадзяжы калгаснай і кааператыўнай маёмасці"[1].

Характэрна, што акрамя гэтага закону, прынятага ЦВК і СНК СССР, палітбюро ЦК УКП(б) зацвердзіла 16 верасня 1932 г. інструкцыю па яго прымяненню. Згодна з ёю, прыгаворы да вышэйшай меры пакарання па справах, прадугледжаных дадзеным дэкрэтам (так у дакуменце. — *М.К.*), уступаюць у сілу адразу пасля іх зацвярджэння адпаведна Вярхоўным Судом СССР, вярхоўнымі судамі саюзных рэспублік ці калегіяй АДПУ. Зацвярджэнне павінна было рабіцца не пазней, чым праз 48 гадзін з часу атрымання справы. Устанаўлівалася, што смяротныя прыгаворы прыводзяцца ў выкананне неадкладна пасля атрымання паведамлення аб іх зацвярджэнні. Згодна з дадзенай інструкцыяй, спынялася друкаванне ў газетах справаздач аб судовых пасяджэннях па справах аб крадзяжах сацыялістычнай маёмасці і паведамленняў аб вынесеных прыгаворах[2].

На падставе прынятай пастановы і інструкцыі да яе толькі ў 1932 г. у СССР было асуджана каля 55 тыс. чалавек, з іх звыш 2,1 тыс. — да вышэйшай меры пакарання. Прыкладна 1 тыс. прыгавораў была выканана[3]. У Беларускай ССР у 1933 г. за крадзеж сацыялістычнай уласнасці было асуджана 23,5 тыс. чалавек, у 1934 г. — 15,3 тыс., у 1935 г. — 7,6 тыс. Найболь-

---

[1] Коллективизация сельского хозяйства. Важнейшие постановления Коммунистической партии и Советского правительства. 1927 — 1935 гг. М., 1957. С.423.

[2] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.13, арк.99 — 100.

[3] Правда. 1988. 16 сент.

шых памераў раскраданне грамадскай маёмасці дасягала ў калгасах. З больш чым 3 тыс. чалавек, асуджаных у рэспубліцы па гэтай прычыне ў першай палове 1936 г., прадстаўнікі калгасаў склалі 41,1 %, дзяржаўных устаноў – 26,5, кааперацыі і гандлю – 18,8, прамысловасці і будаўніцтва – 9,6 %[1].

Нягледзячы на масіраваны націск бальшавіцкай таталітарнай сістэмы на сялянства, яе пазіцыі ў яго асяроддзі былі недастаткова моцнымі. Складаныя палітычныя абставіны на вёсцы прывялі да стварэння палітычных аддзелаў машынна-трактарных станцый. Гэта рабілася ў адпаведнасці з рашэннем студзеньскага (1933 г.) аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК УКП(б). У БССР былі арганізаваны 72 палітаддзелы, якія з'яўляліся па сутнасці надзвычайнымі партыйнымі органамі. Разам з пазітыўнай работай па падбору і расстаноўцы кадраў яны праводзілі жорсткую класавую лінію, і метады іх працы пераважна былі націскнымі. Палітаддзелы МТС праіснавалі да канца 1934 г.

Ва ўсёй гэтай рабоце пастаянна мелася на ўвазе павышэнне паказчыкаў калектывізацыі. Ужо к канцу 1934 г. яе працэнт узняўся да 72,6. Было абагульнена 4/5 пасяўных плошчаў. Калектывізацыя ў БССР была ў асноўным закончана. Аднак гэта работа працягвалася. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ва ўсходніх абласцях рэспублікі ступень абагуленых сялянскіх гаспадарак дасягнула 93,4 %, а па пасяўной плошчы – 96,2 %[2]. У гэты час у рэспубліцы працавалі 132 саўгасы.

Разам з нарошчваннем паказчыкаў калектывізацыі актывізавалася праца па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню сельгасарцелей. Адбываўся іх пераход на новы, прыкладны статут, які прыняў Другі ўсесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў у 1935 г. Калгасам выдаваліся акты на вечнае карыстанне зямлёю. Гэтыя мерапрыемствы былі моцна заарганізаваны і ператварыліся ў шумныя прапагандысцкія кампаніі.

Вынікам недаверу сталінскага кіраўніцтва да сялянства, яго імкнення да яшчэ больш цэнтралізаванага кіравання ім было перасяленне, асабліва на працягу 1939—1940 гг., звыш 160 тыс. хутарскіх гаспадарак Беларускай ССР у калгасныя цэнтры. З мэ-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1113, арк.15.

[2] Беларускі дзяржаўны архіў (далей – БДА), ф.48, воп.9, спр.2, арк.145; НАРБ, ф.4, воп.28, спр.64, арк.65; спр.229, арк.1.

тай павышэння актыўнасці калгаснікаў у грамадскай вытворчасці ўстанаўліваўся мінімум працадзён, якія патрэбна было выпрацаваць на працягу года. У БССР іх колькасць раўнялася 80. Гэта была тыповая для бальшавіцкай таталітарнай сістэмы прымусовая мера з выкарыстаннем пазаэканамічных метадаў стымулявання працоўнай дзейнасці.

Пашыралася сетка МТС. У 1940 г. ва ўсходніх раёнах рэспублікі іх налічвалася 236. Трактарны парк дасягаў 9,7 тыс. машын. Павялічылася колькасць іншай тэхнікі. Аднак узровень механізацыі сельскагаспадарчых работ быў невысокім. Жывёлагадоўлю механізацыя амаль не закранула. Пэўныя дасягненні меліся ў падрыхтоўцы механізатарскіх і масавых калгасных кадраў, але змены кіраўнікоў грамадскай вытворчасці адбываліся вельмі часта, адміністрацыйныя метады тут панавалі.

Укараненне камандных падыходаў у сельскагаспадарчую вытворчасць не магло не адбіцца на выніках працы. Нізкімі заставаліся вытворчыя паказчыкі як у раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі. Фактычна да канца 30-х гадоў вытворчасць у сельскай гаспадарцы БССР, як і ўсёй краіны, не прасунулася наперад. У асноўным былі толькі адноўлены паказчыкі дакалгаснай вёскі. Адпаведным было і матэрыяльнае становішча сялян. Аплата працы ў грамадскім сектары заставалася вельмі нізкай. Важную ролю ў гэтых адносінах выконвалі прысядзібныя ўчасткі, памеры якіх улады старанна абмяжоўвалі: яны баяліся ўзнаўлення прыватнаўласніцкіх настрояў у сялян.

Дзейнасць бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў сельскагаспадарчай вытворчасці асабліва яскрава паказала накіраванасць дадзенай формы праўлення. Яе сутнасцю было імкненне да грубага адміністравання і насілля над сялянствам. Палітычныя разлікі тут, несумненна, узялі верх над эканамічнай мэтазгоднасцю. Сумныя вынікі такіх падыходаў мы адчувалі многія дзесяцігоддзі, адчуваем і сёння.

Шырокае выкарыстанне камандных метадаў у эканоміцы — у прамысловай вытворчасці і сельскай гаспадарцы — з'явілася адным з галоўных напрамкаў функцыяніравання таталітарнай сістэмы ў СССР. У выніку ў эканамічнай сферы была ўстаноўлена фактычна адна — сацыялістычная дзяржаўна-кааператыўная ўласнасць. Яна з'явілася асновай бальшавіцкіх метадаў кіравання грамадствам.



7. Зак. 5022

## 2. Адміністраванне ў сацыяльнай сферы

Усё больш мацнеючыя камандныя метады ў рабоце па развіццю эканомікі не маглі не спалучацца з адміністраваннем у сацыяльнай сферы. Гэта – два бакі аднаго працэсу. Стан сацыяльнай сферы заўсёды непасрэдна залежыць ад ступені развіцця розных галін эканамічнага жыцця. Гэта датычыць як зместу дадзеных напрамкаў дзейнасці, так і метадаў ажыццяўлення палітыкі па дасягненню пастаўленых мэт пэўнымі грамадскімі сістэмамі.

Ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі развіццё сацыяльнай сферы адбывалася ў асноўным звычайным шляхам, характэрным для шматукладнай эканомікі. Яна дазваляла і ў горадзе і на вёсцы мець даволі разгалінаваную сацыяльную сетку. У многім яе дзейнасць ажыццяўлялася на аснове і ў межах розных форм кааперацыі і мела пераважна рыначную накіраванасць.

Па меры фарміравання бальшавіцкая таталітарная сістэма ўсё больш брала пад кантроль сацыяльную сферу. У сувязі з наступленнем на асноўныя складаныя часткі новай эканамічнай палітыкі – кааперацыю, рыначныя адносіны, свабодны гандаль і іншыя – сацыяльная сфера страчвала нэпаўскі характар і станавілася ў руках партыйна-дзяржаўных улад рычагом уздзеяння на працоўныя калектывы і на кожнага работніка паасобку. Спачатку гэта больш адчувалася ў горадзе і менш на вёсцы.

Актыўнае наступленне на сацыяльную сферу нэпаўскага напрамку пачалося ў час "хлебнага" крызісу 1927 — 1928 гг. Яго даволі востры характар сведчыў аб значнай супярэчнасці паміж адміністрацыйна-каманднай сістэмай, якая перарастала ў таталітарныя формы кіравання, і нарыхтоўкамі сельскагаспадарчай прадукцыі на аснове новай эканамічнай палітыкі. Аб гэтым пераканаўча сведчыў той факт, што хлеб у краіне, у тым ліку ў Беларускай ССР, увогуле быў. Сяляне, у першую чаргу заможныя, не спяшаліся прадаваць яго дзяржаве з-за надзвычай нізкіх закупачных цэн.

Гэта значна абвастрыла палітычныя абставіны як у горадзе, так і на вёсцы, аб чым, у прыватнасці, сведчыць пісьмо Віцебскага акружнога камітэта кампартыі Беларусі ў ЦК КП(б)Б, якое было накіравана 17

мая 1928 г. У ім адзначалася, што цяжкі стан хлебнага рынку акругі, які адчуваўся ўсю зіму, за апошні час моцна абвастрыўся і становіцца пагражальным. Калі ў апошні перыяд кіраўнікі акругі з цяжкасцю, але выходзілі са становішча, то ў маі па ўжо скарочанаму больш чым напалову ў параўнанні з зімнімі месяцамі завозу хлеба да сярэдзіны месяца нічога не атрымана. Згодна з планам у акругу павінна было паступіць у гэтым месяцы жытнёвай прадукцыі 100 вагонаў, пшанічнай – 47. У параўнанні з лютым і сакавіком 1928 г. гэта складала 46 і 41 % адпаведна. Выдача рабочым і іншым пайшчыкам цэнтральнага рабочага каапераратыва мукі для хлеба была спынена ў сувязі з яе адсутнасцю. Кіраўніцтва акругі зусім не разлічвала на нарыхтоўку хлеба на месцы, таму што наступіла вясенняя бясхлебіца ў вёсках, і сяляне ў масавым парадку накіраваліся ў горад, каб купіць печаны хлеб. Каля хлебных магазінаў чэргі сталі даходзіць да паўтысячы чалавек. У насельніцтва, як канстатавалі кіраўнікі акругі, стварався непажаданы настрой. Дакументальныя матэрыялы сведчаць, што ў сувязі з такім становішчам уладамі прымаліся захады і некаторая дапамога аказвалася[1].

"Хлебны" крызіс прымусіў бальшавіцкую ўладу ўвесці ў 1928/29 гаспадарчым годзе картачную сістэму на размеркаванне асноўных харчовых і прамысловых тавараў. Закрануўшы праз пяць гадоў пытанне аб мэтазгоднасці дадзенай меры ў сувязі з яе адменай, лістападаўскі (1934 г.) пленум ЦК УКП(б) адзначыў: увядзенне картачнай сістэмы на хлеб і іншыя прадукты было не толькі неабходным, але і з'яўлялася на працягу апошніх гадоў важнейшай умовай паляпшэння ў забеспячэнні рабочых. Толькі дзякуючы гэтай сістэме дзяржава пры абмежаванасці сваіх рэсурсаў змагла поўнасцю забяспечыць гарады і прамысловыя раёны, а таксама ў першую чаргу найбольш важныя цэнтры і ўдарнікаў вытворчасці па цвёрдых дзяржаўных цэнах[2].

Значным дасягненнем у сацыяльнай сферы ва ўсе савецкія часы лічылася пераадоленне беспрацоўя. І ў БССР гэта з'ява на працягу 20-х гадоў пастунова была

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.142, арк.279.

[2] КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1971. Т.5. С.195.

ліквідавана. Калі ў 1927/28 гаспадарчым годзе ў рэспубліцы налічвалася звыш 50 тыс. беспрацоўных, то ў 1930 г. іх амаль не было. Кіраўнікі мацнеючай бальшавіцкай таталітарнай сістэмы розных узроўняў шырока рэкламавалі гэта як вялікае дасягненне ў сацыялістычным будаўніцтве. З аднаго боку, гэта так. Мець гарантаваную работу сапраўды важна для кожнага працоўнага чалавека. Аднак, з другога боку, не ўлічвалася, што на практыцы поўная гарантыя работы не можа адмоўна не ўплываць на адносіны да яе працоўных. Гэта тым больш характэрна для грамадства, якое не поўнасцю прайшло школу капіталістычнай вытворчасці і капіталістычных адносін. Нязначнае беспрацоўе ў краінах з эканомікай рыначнай накіраванасці заўсёды з'яўлялася (і працягвае з'яўляцца) важным стымулам добрасумленных адносін да працы, рычагом павышэння яе эфектыўнасці. Гэты важны эканамічны фактар быў поўнасцю адкінуты бальшавіцкай таталітарнай сістэмай яшчэ на ранняй стадыі яе фарміравання. Асноўная ўвага надавалася пазаэканамічнаму стымуляванню працоўнай дзейнасці. У будучым гэта адмоўна адбілася на адносінах працоўных да сваіх вытворчых абавязкаў, зніжала эканамічныя паказчыкі.

Дадзеныя абставіны не маглі не аказваць уздзеяння на стан сацыяльнай сферы. Нягледзячы на старанні партыйна-дзяржаўнай улады павысіць матэрыяльны ўзровень жыцця працоўных, у першую чаргу рабочага класа як вядучай сілы грамадства, гэта справа рухалася з вялікімі цяжкасцямі і частымі зніжэннямі паказчыкаў. Хаця на працягу 1928 — 1932 гг. намінальная заработная плата рабочых павялічылася ў БССР больш чым у два разы, аднак яе рэальная вартасць знізілася. Рэгуляванне рабочага забеспячэння шляхам выкарыстання картачнай сістэмы прывяло да абмежавання ва ўжыванні харчовых і прамысловых тавараў. Істотна зменшылася ў гэты час і пакупная здольнасць савецкага рубля.

Аднак асноўным фактарам рэзкага зніжэння жыццёвага ўзроўню народа і нават шырокамаштабнага голаду ў краіне ў пачатку 30-х гадоў з'явіўся моцны спад прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі ў сувязі з яе паскораным і масіраваным пераводам на сацыялістычны шлях развіцця. Такая палітыка, праведзеная пераважна адміністрацыйнымі, каманднымі метадамі, не толькі абярнулася вялікімі выпрабаван-

нямі для народа, але і засведчыла таталітарны характар бальшавіцкай сістэмы кіравання грамадствам.

Адной з важнейшых яе асаблівасцей была вельмі высокая цэнтралізацыя ў вырашэнні розных пытанняў, у тым ліку ў сацыяльнай сферы. У прыватнасці, кіраўнікі з месцаў пастаянна апелявалі да Цэнтра і прасілі дапамогі. Інакш і быць не магло, таму што ўсе рэсурсы былі строга цэнтралізаваны. Ішлі такія просьбы і з Беларускай ССР. Так, 15 лютага 1932 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б Гікала накіраваў у ЦК УКП(б) пісьмо, у якім гаварылася, што апошняе распараджэнне Наркамата забеспячэння СССР аб скарачэнні фондаў на хлеб і цукар на першы квартал ставіць у вельмі цяжкае становішча забеспячэнне рабочых у Беларускай ССР. А яно і без таго знаходзіцца ў напружаным стане. З-за абмежаванасці хлебных фондаў рэспубліка вымушана пайсці на значнае скарачэнне ў задавальненні патрэб раёнаў, якім адпушчана толькі 30% хлеба. Пры гэтым значная частка працоўных абсалютна не ўзята на забеспячэнне. Гэта дробныя прадпрымальнікі, служачыя куставых, прамысловых, інвалідных арцелей і інш.[1]

Аднак у цэнтральных маскоўскіх улад былі вельмі абмежаваныя магчымасці, каб выправіць становішча на месцах, якое рабілася ўсё больш пагражальным. Часамі справа даходзіла да адкрытых выступленняў. 7 — 8 красавіка 1932 г. у Барысаве група жанчын пры актыўным удзеле прадстаўнікоў іншых груп насельніцтва разграміла хлебную краму. У гэты ж час у Нова-Барысаве былі разграблены дзве падводы з хлебам. Прычыны дадзеных дзеянняў заключаліся ў напружаным харчовым становішчы. Органы АДПУ арыштавалі дзесяткі ўдзельнікаў гэтых акцый і пры вобыску знайшлі ў іх дамах ад 5 да 40 пудоў жытняй мукі, белага хлеба, па 3 — 4 пуды сала, іншыя прадукты. Яны меліся ў 16 чалавек з 54 арыштаваных[2].

Нягледзячы на меры, якія прымаліся, становішча з вырашэннем асноўнага сацыяльнага пытання — забеспячэння людзей харчаваннем — абвастрылася. У Цэнтры і на месцах партыйныя і савецкія кіраўнікі бачылі выйсце ў далейшым узмацненні націскных метадаў як на сялянства, так і на дзяржаўны апарат. Асабліва становішча ўскладнілася ў канцы 1932 г. і ў першыя месяцы 1933 г. У гэты час яно фактычна пе-

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.322, арк.66 — 67.

[2] Там жа, арк.26—30.

рарасло ў надзвычайнае. Важная роля ў яго пераадоленні адводзілася апаратыўнай «тройцы» па нарыхтоўках пры ЦК КП(б)Б, якую ўзначальваў кіраўнік кампартыі Беларусі ў гэты час Гікала. У яе склад уваходзілі намеснік старшыні СНК БССР Лычоў і паўнамоцны прадстаўнік АДПУ ў рэспубліцы Закоўскі. Сакратаром гэтага надзвычайнага органа з'яўляўся Пасэ. "Тройка" пачала дзейнічаць 20 снежня 1932 г. Яе пасяджэнні праходзілі часта, нярэдка амаль кожны дзень. Дастаткова сказаць, што да 17 студзеня 1933 г. "тройка" правяла 16 пасяджэнняў. Яна разглядала даволі шырокае кола пытанняў, якія былі звязаны з нарыхтоўкамі сельгаспрадукцыі. У прыватнасці, на адным з пасяджэнняў аналізавалася дзейнасць некаторых судовых работнікаў, што разглядалі справы аб крадзяжы хлеба, спекуляцыі і г.д. Было адзначана, што шэраг следчых судовага апарату і народных суддзяў БССР дапускаюць вынясенне выключна мяккіх, ліберальных прыгавораў у адносінах да раскрадальнікаў хлеба. Гэта з'яўляецца, як канстатавала апаратыўная "тройка" ў адпаведным рашэнні, прамой супярэчнасцю існуючым пастановам урадаў СССР і БССР аб барацьбе за захаванне сацыялістычнай маёмасці і ўстанаўленне сапраўднай рэвалюцыйнай законнасці, што абараняе інтарэсы пралетарскай дзяржавы і сацыялістычнай уласнасці. Кіруючыся такімі падыходамі, "тройка" звольніла з работы пяць народных суддзяў з Касцюковіцкага, Рагачоўскага раёнаў і горада Мінска. Усе яны былі прыцягнуты да судовай адказнасці[1].

У адной з пастаноў апаратыўнай "тройкі" прадугледжвалася прыняцце самых жорсткіх мер пакарання да калгасаў і саўгасаў, якія не выконвалі заданняў дзяржавы па здачы сваёй таварнай прадукцыі. У адносінах да раёнаў, што адставалі ў нарыхтоўках, практыкавалася спыненне водпуску тавараў, а таксама забарона калгаснага гандлю. Разам з тым у прынятым закрытым пункце адной з пастаноў "тройка" вымушана была канстатаваць, што, нягледзячы на шэраг сур'ёзных рашэнняў партыі і ўрада як СССР, так і БССР аб узмацненні рэпрэсіўных мерапрыемстваў у адносінах да злосных раскрадальнікаў сацыялістычнай маёмасці, неабходнага пералому ў рабоце судова-следчага апарату няма[2].

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.338, арк.2.

[2] Там жа, арк.3, 4, 8.

Аператыўная "тройка" па нарыхтоўках пры ЦК КП(б)Б займалася не толькі аналізам дзейнасці судовых органаў, але і непасрэдна членаў партыі. Пытанне, якое было разгледжана 21 снежня 1932 г., фармулявалася наступным чынам: "Аб мерах у адносінах да выключаных з партыі ў сувязі з супраціўленнем справе нарыхтовак". У прынятай пастанове, у прыватнасці, адзначалася: "Лічыць неабходным выключаных з партыі за злосны сабатаж і супраціўленне нарыхтоўкам пастановай урада выслаць за межы БССР як здраднікаў партыі і рабочага класа"[1]. Дакументы не раскрываюць, ці было гэта зроблена.

Разам з жорсткімі патрабаваннямі да членаў партыі, суддзяў, іншых работнікаў у справе нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі створаная "тройка" займалася і непасрэдна пытаннямі, звязанымі з арганізацыяй гэтай работы. Так, 25 снежня 1932 г. у парадак дня пасяджэння быў унесены пункт "Аб закрыцці млыноў і забароне памолу ў байкатаваных сельскіх саветах і раёнах". Было, у прыватнасці, вырашана выбраць тры-чатыры найбольш злосных факты раскрадання памольнага збору з тым, каб не пазней, як праз дзень, апублікаваць прыгаворы аб вышэйшай меры пакарання вінаватых[2].

Да жорсткіх мер "тройка" па нарыхтоўках пры ЦК КП(б)Б звярталася неаднаразова. Напрыклад, 7 студзеня 1933 г. было разгледжана пытанне "Аб мерапрыемствах у сувязі з наяўнасцю дэмабілізацыйных настрояў у раёнах і сярод работнікаў, камандзіраваных на сельскагаспадарчыя нарыхтоўкі". У прынятым рашэнні, у прыватнасці, адзначалася, што, нягледзячы на шэраг катэгарычных папярэджанняў ЦК, у некаторых раёнах працягваюцца дэмабілізацыйныя настроі. Асобныя райкомы КП(б)Б лічаць, што выкананне плана па хлебанарыхтоўках не абавязвае да захавання баявых тэмпаў у нарыхтоўках бульбы, сена, саломы і інш. Упаўнаважаныя ЦК па нарыхтоўках часта самавольна вяртаюцца з раёнаў. У шэрагу выпадкаў яны дэзерціруюць і дэмабілізуюць гэтым самым раённыя партыйныя арганізацыі. Пастанова патрабавала прымаць да гэтай катэгорыі работнікаў адпаведныя меры[3].

[1] НАРБ, ф.4, воп. 21, спр. 339, арк. 4.

[2] Там жа, арк.3.

[3] Там жа, спр.495, арк.15.

13 студзеня 1933 г. дадзеная "тройка" правяла адно са сваіх пасяджэнняў, дзе разгледзела пытанне аб становішчы з нарыхтоўкамі ільну і бульбы ў васьмі раёнах – Жлобінскім, Рэчыцкім, Пухавіцкім і інш. Па кожнаму ці па некалькі раёнах прымалася асобная пастанова. Многія кіраўнікі былі зняты з працы і прыцягнуты да партыйнай адказнасці. Спагнанні панеслі і ўпаўнаважаныя ЦК КП(б)Б па нарыхтоўках[1]. Як бачна, характар рашэнняў "тройкі" шмат у чым насіў надзвычайны характар.

Некаторыя з пастаноў аператыўнай "тройкі" па нарыхтоўках пры ЦК КП(б)Б у далейшым атрымалі сваё развіццё. У прыватнасці, забарона на гандаль хлебам у некаторых раёнах была распаўсюджана на ўсю рэспубліку. Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 28 ліпеня 1933 г. патрабавала: у адпаведнасці з рашэннем СНК СССР і ЦК УКП(б) ад 20 чэрвеня 1933 г. "Аб абавязковых пастаўках збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі з ураджаю 1933 г. на падставе закону ад 19 студзеня 1933 г." спыніць з 1 жніўня 1933 г. калгасны і індывідуальна-сялянскі гандаль хлебам[2].

Адной з праяў катастрафічнага становішча спраў у сацыяльнай сферы ў гэты час было распаўсюджанне жабрацтва. Яно ўзнікла як вынік правядзення ў жыццё палітыкі калектывізацыі, раскулачвання заможнага, а нярэдка і сярэдняга сялянства. Аб жабрацтве, у прыватнасці, сведчыць пісьмо, якое было накіравана 30 чэрвеня 1933 г. кіраўнікам Беларускай ССР Гікала, Шаранговічу, Галадзеду ад сакратара Жлобінскага РК КП(б)Б Плешакова і старшыні РВК Тамашэўскага. У ім гаварылася, што ў раёне налічваецца 216 гаспадарак з 885 едакамі, якія атрымалі адміністрацыйна-судовае спагнанне з боку органаў АДПУ і суда з канфіскацыяй іх маёмасці. Гэтыя сем'і ў сваёй пераважнай большасці знаходзяцца ў раёне і жывуць за кошт жабрацтва, вандруючы па хатах, што выклікае непажаданы настрой у працоўных аднаасобнікаў і нават калгаснікаў. У сувязі з гэтым кіраўнікі раёна ставілі пытанне аб вяртанні гэтым сем'ям часткі пасеваў, якія раней ім належалі, а таксама аб выдзяленні зямлі з запасных фондаў і горшых будынкаў, каб спыніць жабрацкае

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.302, арк.254 — 255.

[2] Там жа, воп.3, спр.107, арк.22.

існаванне гэтых людзей [1]. Ёсць падставы меркаваць, што такое становішча было не толькі ў Жлобінскім, але і ў іншых раёнах БССР.

Цяжкі стан эканомікі і сацыяльнай сферы ў пачатку 30-х гадоў прывёў не толькі да абвастрэння грамадска-палітычнага становішча, значнага скарачэння дзяржаўных нормаў водпуску прадуктаў харчавання, але і да істотнага зніжэння іх якасці. Гэта нават прадугледжвалася на самым высокім партыйна-дзяржаўным узроўні. Разглядаючы 25 мая 1932 г. пытанне "Аб хлебафуражным балансе", палітбюро ЦК УКП(б) зацвердзіла план выкарыстання харчовага хлеба — пшаніцы, жыта і пэўнай колькасці прымесяў [2]. Пастанова, аднак, не канкрэтызавала, якія прымесі меліся на ўвазе і ў якіх прапорцыях яны павінны былі дабаўляцца ў хлебныя вырабы.

Вялікія цяжкасці ў дзяржаўным забеспячэнні рабочых, служачых, сялян, інтэлігенцыі прадуктамі харчавання вымусілі партыйна-дзяржаўныя органы прымаць тэрміновыя захады для павелічэння іх вытворчасці. У прыватнасці, было вырашана пайсці на стварэнне дапаможных гаспадарак пры сталовых фабрык і заводаў. Пачалі ўзнікаць цэнтральныя і закрытыя рабочыя кааператывы (ЦРК, ЗРК), аддзелы рабочага забеспячэння (АРЗ). Яны займаліся нарыхтоўкай і продажам прадуктаў харчавання насельніцтву гарадоў, у першую чаргу рабочым. У канцы 1933 г. у БССР ужо налічвалася 108 ЦРК і 98 АРЗ. ЗРК меліся на 105 буйнейшых прадпрыемствах рэспублікі і на пачатак 1934 г. ахаплівалі больш за 100 тыс. рабочых і служачых.

Пачалося надзяленне гарадскіх сем'яў індывідуальнымі ўчасткамі зямлі, што ўвогуле супярэчыла курсу на стварэнне адзінай, фактычна дзяржаўнай формы ўласнасці. Тым не менш у 1934 г. каля 60 тыс. сем'яў у гарадах БССР атрымалі індывідуальныя зямельныя надзелы. Гэта склала 22% агульнай колькасці сем'яў рабочых у прамысловых гарадах рэспублікі[3].

Паступова, з вялікімі цяжкасцямі сельскагаспадарчая вытворчасць выходзіла з глыбокага крызісу і найперш за кошт максімальнага выкачвання харчовых рэсурсаў з калгасна-саўгаснай вёскі. Урэшце было

[1] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.105, арк.46.

[2] РЦЗВДНГ, ф17, воп.162, спр.12, арк.153.

[3] История рабочего класса Белорусской ССР. Мн.,1985. Т.2. С.356 — 358.



8. Зак. 5022

дасягнута такое становішча, што дазволіла адмяніць картачную сістэму. З 1 студзеня 1935 г. сталі прадавацца без картак хлеб, мука, крупы, а з кастрычніка — іншыя віды харчавання. Нарміраванае размеркаванне прамысловых тавараў было спынена з 1 студзеня 1936 г. Гэтыя меры спрыялі некатораму павышэнню ўзроўню жыцця гарадскога насельніцтва, аднак рэальныя даходы на аднаго рабочага ў БССР у 1937 г. перавысілі ўзровень 1926/27 гаспадарчага года толькі на 20 %[1].

Жыхары сельскай мясцовасці ў значнай ступені самастойна павінны былі вырашаць праблему харчавання. У калгаснікаў і рабочых саўгасаў вялікую ролю адыгрывалі прысядзібныя ўчасткі. Яны хоць і былі моцна абмежаваныя ў памерах, аднак фактычна напалову забяспечвалі сваіх гаспадароў асноўнымі прадуктамі харчавання. Да таго ж іх уладальнікі і асабліва аднаасобныя сяляне плацілі дзяржаве высокія падаткі. Пад цяжарам падатковага прэса сельскія жыхары Беларускай ССР у першай палове 30-х гадоў існавалі на мяжы выжывання. У шэрагу мясцовасцей, як адзначалася вышэй, быў голад. Яго пераадоленне запатрабавала значных намаганняў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы.

Змяншэнне вастрыні харчовай праблемы, несумненна, было важнейшай задачай партыйных і дзяржаўных органаў у сацыяльнай сферы ў першай палове 30-х гадоў. Аднак адначасова яны вымушаны былі займацца і іншымі неадкладнымі справамі, у прыватнасці пераадоленнем эпідэмій сярод насельніцтва, што атрымалі значнае распаўсюджанне, нягледзячы на тую ўвагу, якая ўвогуле надавалася развіццю сістэмы аховы здароўя. У выніку зробленых намаганняў на гэтым напрамку меліся пэўныя дасягненні. Дастаткова сказаць, што колькасць ложкаў у стацыянарных лячэбных установах у Беларускай ССР павялічылася на працягу 1933—1937 гг. з 8,6 да 14,4 тыс. Удвая ўзрасла сетка рэнтгенаўскіх кабінетаў і клінічных лабараторый.

Паляпшэнне ўмоў медыцынскага абслугоўвання насельніцтва перш за ўсё датычылася жыхароў горада. На прамысловых прадпрыемствах рэспублікі колькасць урачэбных і фельчарскіх пунктаў павялічылася са 185 у 1932 г. да 282 у 1937 г. Павышаная ўвага надавалася ахове здароўя жанчын і дзяцей. Для за-

[1] История рабочего класса Белорусской ССР. Т.2. С.359.

беспячэння дзейнасці сеткі лячэбных устаноў патрэбна была адпаведная колькасць медыцынскіх работнікаў. Іх падрыхтоўка пашыралася. У 1937 г. у БССР працавалі каля 3 тыс. урачоў і амаль 7 тыс. работнікаў сярэдняга медыцынскага ўзроўню[1].

Аднак існуючай сеткі аховы здароўя было недастаткова, каб забяспечыць неабходнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва рэспублікі. Да таго ж патрэбны былі і адпаведныя санітарныя ўмовы для яго пражывання. Іх стварэнне як для гарадскіх, так і для сельскіх жыхароў у многім было нездавальняючым. Нават у Мінску па стану на канец 1931 г. больш за палову будынкаў з'яўляліся драўлянымі і ў значнай ступені старымі. Да таго ж сталіца рэспублікі нездавальняюча забяспечвалася вадою: на душу насельніцтва на працягу сутак прыходзілася ўсяго 35 літраў вады, якая падавалася па гарадскім водаправодзе. Каналізацыяй было ахоплена толькі каля 10% кватэр. У выніку горад увесь час знаходзіўся ў антысанітарным стане.

З цяжкасцю ажыццяўляліся ўнутрыгарадскія зносіны. У Мінску з агульнай працягласцю вуліц у 201 км было замошчана камянямі толькі 77 км. Вуліц і тратуараў удасканаленага тыпу ў гэты час тут не было. З дзевяці мастоў праз раку Свіслач восем з'яўляліся драўлянымі і ўзведзенымі каля 10 гадоў таму назад. Пабудаваная ў 1929 г. трамвайная лінія працягласцю 10 км не задавальняла патрэбы жыхароў горада. На ёй маглі курсіраваць толькі 20 вагонаў, што меліся ў трамвайнай гаспадарцы. У гэты час горад не меў ніводнага аўтобуса для ажыццяўлення ўнутрыгарадскіх перавозак[2]. Не лепшым было становішча і ў іншых гарадах БССР. У многім нездавальняючымі з'яўляліся санітарныя ўмовы ў сельскай мясцовасці.

Да таго ж такі санітарны стан населеных пунктаў БССР дапоўніўся ў 1931 г. стыхійным бедствам — разбуральнай паводкай у час вясенняга таяння снегу. На Заходняй Дзвіне, напрыклад, вада паднімалася на 13 — 14 м вышэй за ардынар. У выніку было знесена 35 мастоў саюзнага і 515 мастоў рэспубліканскага і раённага значэння, разбураны многія грэблі і дамбы. Ад наваднення пацярпелі больш за 50 раёнаў рэспублікі з 98. Аказаліся затопленымі 567 населеных пунктаў, былі знесены ці

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Мн.,1973. Т.3. С.575 — 578.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.233, арк.12.

пашкоджаны каля 14 тыс. двароў. Больш за 55 тыс. чалавек пацярпелі ад гэтага бедства, а 112 загінулі. Гаспадарцы і жыхарам рэспублікі быў нанесены вялікі матэрыяльны ўрон. Па папярэдніх звестках, страты склалі каля 20 млн руб., у тым ліку па прамысловасці — 6 млн, дарожнаму будаўніцтву — 3 млн, сельскай і камунальнай гаспадарцы — 2 млн. Амаль палову ад агульнай сумы — 8 млн руб. — склалі матэрыяльныя страты насельніцтва[1].

Разбуральная паводка 1931 г., несумненна, садзейнічала пашырэнню інфекцыйных захворванняў. Аб гэтым сведчаць дакументальныя даныя, у прыватнасці па гораду Віцебску. Тут наглядалася хранічнае распаўсюджанне сярод жыхароў брушнатыфознай інфекцыі. У 1929 г. было выяўлена 500 такіх выпадкаў, у 1930 г. — 860, а ў 1931 г. — 1663. Пазней гэта захворванне крыху пайшло на спад. У 1932 г. быў зарэгістраваны 1431 выпадак. Асноўнымі прычынамі гэтай цяжкай хваробы для жыхароў Віцебска былі забруджванне водаправода, неналежны стан каналізацыі і інш. У першую чаргу хварэлі дзеці. Яны склалі (ва ўзросце да 16 гадоў) 52 % ад усіх хворых[2].

Праца па пераадоленню інфекцыйных захворванняў вялася па ўсёй Беларускай ССР. Аднак яна праходзіла складана. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць дакладная запіска рэспубліканскага наркамата аховы здароўя 21 сакавіка 1933 г. у сакратарыят ЦК КП(б)Б. На яе аснове было прынята рашэнне, якое абавязвала наркамат аховы здароўя арганізаваць больш рашучую барацьбу з эпідэмічнымі захворваннямі шляхам пасылкі брыгад з медыцынскага персаналу ў раёны, дзе мелі месца захворванні на сыпны тыф і інш. Пры гэтым патрабавалася ў першую чаргу абслугоўваць чыгуначныя пункты. З улікам таго, што вясенні час асабліва спрыяў з'яўленню эпідэмічных захворванняў, наркамату аховы здароўя рэспублікі было прапанавана арганізаваць шырокае правядзенне масавых прафілактычных санітарных мерапрыемстваў. Кіраўніцтву тых раёнаў, дзе ў найбольшай ступені праявіліся эпідэмічныя захворванні, належала вызваліць кіраўнікоў райздраўаддзелаў, другіх работнікаў ад іншых спраў. З пастановы вынікала, што эпідэмічныя захворванні атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў Віцебскім, Гомельскім,

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр. 233, арк. 83.

[2] Там жа, воп.3, спр.125, арк.375.

Магілёўскім, Аршанскім, Полацкім, Слуцкім, Жлобінскім і іншых раёнах[1].

Становішча было настолькі няпростым, што ўлады вымушаны былі пайсці на стварэнне ўрадавай камісіі па барацьбе з тыфам. Згодна з яе звесткамі, на 27 студзеня 1934 г. па Гомелю (разам з Навабеліцкім раёнам) было шпіталізавана 157 хворых на тыф. Да гэтага часу пачынаючы з 1 снежня 1933 г. курс лячэння прайшлі 347 чалавек. Аднак 20 чалавек памерла. У горадзе вяліся значныя работы па прафілактыцы небяспечнага захворвання. У прыватнасці, да 1 снежня 1933 г. каля 80 тыс. чалавек было абследавана на вашывасць. Амаль 20 тыс. прайшлі санпрапускнікі. У месцах з асабліва высокім узроўнем захворвання зрабілі 800 дэзінфекцый. На працягу менш чым двух месяцаў, у канцы 1933 — пачатку 1934 г. каля 50 тыс. чалавек былі прапушчаны праз лазні. Асабліва маштабныя проціэпідэмічныя мерапрыемствы праводзіліся ў Віцебску. З пачатку эпідэміі да канца лютага 1934 г. каля 217 тыс. чалавек тут атрымалі супрацьтыфозныя прышчэпкі[2].

Нездавальняючым было становішча па захворваннях, асабліва на сыпны і брушны тыф, і ў цэлым па БССР. Паводле даных на снежань 1933 г., у рэспубліцы на сыпны тыф хварэла 1747, брушны тыф — 728 чалавек. У лютым 1934 г. колькасць хворых на сыпны тыф павялічылася да 2099 чалавек, але ў гэты час захворванні на брушны тыф пайшлі на спад.

Акрамя гэтых небяспечных хвароб распаўсюджваліся і іншыя. У канцы 1934 г. у рэспубліцы каля 1000 чалавек хварэлі на шкарлятыну, больш чым 900 на дыфтэрыю, каля 150 на дызентэрыю, амаль 100 на малярыю і больш чым 2100, пераважна дзяцей, пакутвалі ад адзёру[3].

Вынікі распрацоўкі статыстычных звестак аб эпідэмічных захворваннях сведчылі аб тым, што да сярэдзіны 30-х гадоў павялічылася смяротнасць ад розных хвароб у сельскай мясцовасці рэспублікі. Прычынай лятальнага канца больш за ўсё быў адзёр. У Бялыніцкім раёне ад яго памерлі 44, у Слуцкім — 43, Краснапольскім — 38, Рэчыцкім — 35 чалавек. У некаторых мясцовасцях жыхары аказаліся асабліва

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.302, арк.3.

[2] Там жа, спр.677, арк.10, 27,28.

[3] Там жа, воп.21, спр.818, арк.26, 28, 32.

схільнымі да эпідэмічных захворванняў. У вёсках Заспенскага сельскага савета Рэчыцкага раёна за непрацяглы час здарылася асабліва шмат трагедый. Тут адзёр пачаў актыўна распаўсюджвацца з пачатку 1933 г., а ў лютым і сакавіку ў вёсках Луначарскай, Лівіці, Іванішчы, Заспа ўсе дзеці перахварэлі на адзёр. Аднак 40 з іх памерла. Разам з гэтай хваробай значную смяротнасць таксама давала дызентэрыя, іншыя эпідэмічныя захворванні[1].

Партыйныя і дзяржаўныя ўлады, органы аховы здароўя прымалі захады па пераадоленню інфекцыйных захворванняў. У выніку з пачатку другой паловы 30-х гадоў іх узровень пачаў зніжацца. Аднак шмат у чым трагічныя вынікі папярэдніх гадоў сведчылі аб нездавальняючым санітарным стане, у якім знаходзілася насельніцтва БССР, і аб недастатковай дзейнасці сістэмы аховы здароўя. Гэты напрамак сацыяльнай сферы патрабаваў істотных фінансавых асігнаванняў і паляпшэння работы ўсіх медыцынскіх устаноў.

Ва ўмовах бальшавіцкай улады значную ролю ў сацыяльным забеспячэнні рабочых, іншых жыхароў гарадоў выконвалі грамадскія фонды спажывання. Гэта — сацыялістычны метад размеркавання, у аснове якога заўсёды знаходзіўся ўраўняльны падыход. Пры гэтым вынікі працы рабочых, іх уклад у развіццё вытворчасці браліся пад увагу далёка не заўсёды. Імкненне забяспечыць усіх членаў грамадства ў больш-менш аднолькавых памерах, з аднаго боку, стварала ўражанне сацыяльнай справядлівасці, а з другога — не дазваляла стымуляваць працоўную дзейнасць з дапамогай эканамічных метадаў, якія заўсёды з'яўляліся найбольш эфектыўнымі.

У 1934 г. расходы на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы з грамадскіх фондаў складалі больш чым трэцюю частку заработнай платы рабочых. Развівалася таксама сацыяльнае страхаванне. У практыку ўваходзілі выплаты па часовай непрацаздольнасці. Пашыралася сетка ўстаноў адпачынку і лячэння. Усё больш значная ўвага надавалася вырашэнню жыллёвай праблемы. Толькі мясцовымі саветамі і жыллёвай кааперацыяй у БССР на працягу 1933—1937 гг. было здадзена ў эксплуатацыю 105,7 тыс. кв. м жылля. Дзесяткі тысяч кватэр падключылі да электра- і радыёсетак. Аднак планы жыллёвага

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.818, арк. 176 — 177.

будаўніцтва хранічна недавыконваліся[1]. Жыллёвы крызіс пераадолець не ўдалося.

Развіваўся гарадскі транспарт. Удасканальвалася сетка бытавога абслугоўвання рабочых і служачых. Гарады і гарадскія пасёлкі паступова добраўпарадкаваліся. Усё гэта рабілася ў інтарэсах гарадскога насельніцтва, перш за ўсё рабочага класа, але ён складаў у той час невялікую частку жыхароў рэспублікі — каля 22%[2]. Асноўная колькасць насельніцтва БССР пражывала ў сельскай мясцовасці. Аднак адносіны мацнеючай бальшавіцкай сістэмы да сацыяльнай сферы на вёсцы былі зусім іншыя. У многім яны вызначаліся абыякавасцю. Сельскае насельніцтва ў асноўным было пакінута на волю лёсу, хаця дэкларатыўныя заявы кіраўніцтвам камуністычнай партыі і савецкай улады рабіліся нярэдка.

Гэта стала зразумелым ужо ў пачатку ажыццяўлення масавай калектывізацыі, асабліва ў сувязі з жорсткім наступленнем на заможную частку сялянства. Сведчаннем таму, у прыватнасці, з'яўляецца рэзалюцыя пленума ЦК УКП(б), які праходзіў у лістападзе 1929 г., "Аб выніках і далейшых задачах калгаснага будаўніцтва". У ёй адзначалася, што пачынаецца новы гістарычны этап сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі на шляхах умацавання вытворчай змычкі пралетарскай дзяржавы з асноўнымі бядняцка-серадняцкімі масамі вёскі[3]. Рэзалюцыя фактычна выключала заможную частку сялянства з ліку тых, з кім дзяржава збіралася ўмацоўваць змычку. Наступленне на яе ўяўляла сабой поўнае ігнараванне правоў чалавека. Ні аб якой сацыяльнай абароненасці дадзенай катэгорыі сельскага насельніцтва ў тых умовах гаварыць не даводзілася. Уся палітыка наступлення на заможных сялян была антынароднай. Нават тая канфіскацыя іх маёмасці ў час раскулачвання, да 25 % якой перадавалася беднякам за іх даносы і ўдзел у гэтых акцыях, з'яўлялася справай не толькі антычалавечнай, але і антысацыяльнай.

Пра гэта таксама сведчыць максімальнае выкачванне з заможных сельскіх двароў матэрыяльных рэсурсаў, у першую чаргу збожжа. Яскравым праяўленнем ажыццяўлення дадзенай палітыкі ў БССР

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.579 — 580.

[2] История рабочего класса Белорусской ССР. Т.2. С.333.

[3] КПСС в резолюциях... Т.4. С.347.

з'явілася пастанова бюро ЦК кампартыі Беларусі ад 18 жніўня 1931 г. "Аб цвёрдых заданнях для кулацка-заможных гаспадарак". Ёю прадугледжвалася, што цвёрдыя заданні павінны даваццa ўсім кулацкім гаспадаркам у індывідуальным парадку. Акрамя таго, гэтыя заданні павінны былі распаўсюджвацца на тыя гаспадаркі, якія па фармальных прыкметах хаця і не падыходзілі пад індывідуальнае абкладанне, але валодалі такімі сродкамі вытворчасці і такімі лішкамі сельскагаспадарчай прадукцыі, што ставіла іх бліжэй да кулацкіх гаспадарак, чым да серадняцкіх[1].

Хаця гэта пастанова і папярэджвала супраць усялякага роду перагібаў у адносінах да серадна́коў, аднак рэкамендавала ўстанавіць па рэспубліцы сярэднюю ўдзельную вагу заможных гаспадарак для абкладання іх цвёрдымі заданнямі ад 2 да 6 % ад агульнага ліку сялянскіх двароў[2]. Такая ўстаноўка з'явілася падставай для значнага пашырэння колькасці сялянскіх двароў, якія абкладваліся дадатковымі заданнямі. У сукупнасці з іншымі рашэннямі такога зместу іх выкананне прывяло да інтэнсіўнага выкачвання з вёскі матэрыяльных рэсурсаў, у першую чаргу ў выглядзе прадукцыі збожжавых культур.

У гэтай сувязі нельга не звярнуць увагу на тую дырэктыву, якая 7 снежня 1932 г. была дадзена ад імя Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) за подпісам Сталіна членам і кандыдатам у члены ЦК і ЦКК УКП(б), сакратарам абласных, краявых, нацыянальных камітэтаў партыі, сакратарам райкомаў і старшыням райвыканкомаў, членам-партыйцам калегіі наркамзема СССР. У ёй указвалася, што рассылаюцца следчыя матэрыялы па сабатажу хлебанарыхтовак у Арэхаўскім раёне Украіны, якія былі дасланы ў ЦК УКП(б) старшынёю АДПУ па Украінскай ССР Радэнсам. Паколькі дадзеныя матэрыялы з'яўляліся характэрнымі для значнай часткі рэгіёнаў Савецкага Саюза, то, на думку генеральнага сакратара, на іх неабходна звярнуць асаблівую ўвагу. Перш за ўсё таму, што яны лішні раз паказвалі: арганізатарамі сабатажу з'яўляюцца ў большасці выпадкаў "камуністы" (двукоссе ў дакуменце. — *М. К.*), г. зн.

[1] НАРБ, ф.4, воп.3,спр.42, ч.2, арк.505.

[2] Там жа.

людзі, якія маюць у кішэні партыйны білет, але даўно ўжо перарадзіліся і парвалі на справе з партыяй. Гэта тыя самыя абманшчыкі партыі і жулікі, якія пamастацку праводзяць уласную палітыку пад сцягам сваёй "згоды" з генеральнай лініяй партыі[1].

У дадзенай дырэктыве прыведзена шмат вытрымак з працы Леніна "Як арганізаваць спаборніцтва?" Іх накіраванасць — ніякай літасці, вайна жулікам, дармаедам, хуліганам і г.д. Паколькі вораг з партбілетам у кішэні, як указвалася ў дакуменце, павінен быць пакараны больш строга, чым вораг без партбілета, то неабходна людзей тыпу Галавіна (былы сакратар Арэхаўскага райкома партыі), Паламарчука (былы старшыня райвыканкома) і іншых тут жа арыштаваць і ўзнагародзіць іх па заслугах, г. зн. даць ім ад 5 да 10 гадоў турэмнага зняволення кожнаму. Так заканчвалася дырэктыва генеральнага сакратара ЦК УКП(б), якая была падрыхтавана на аснове допытаў некаторых службовых асоб з Арэхаўскага раёна — старшынь дзвюх камун, загадчыка машынна-трактарнай станцыі, кіраўніка раённай канторы "Свінаводкалгассаюза" і рэферэнта-планавіка райвыканкома.

Гэтыя службовыя асобы паказалі, быццам кіраўнікі раёна і іншыя абвінавачаныя гаварылі, што планы здачы сельгаспрадукцыі, даведзеныя раёну, нерэальныя, што яны могуць быць выкананы толькі на 65 %[2].

Такі падыход з боку вышэйшага партыйнага кіраўніка ствараў у краіне, у тым ліку ў БССР, адпаведныя маральна-псіхалагічныя абставіны, скіраваныя на максімальнае выкачванне з вёскі сельскагаспадарчых рэсурсаў. У дадзеных умовах ні аб якой сацыяльнай абароненасці сельскіх жыхароў гаварыць не даводзіцца. Гэта было самавольства, абсалютная безадказнасць у дзеяннях кіраўніка дзяржавы з аднапартыйнай, бальшавіцкай таталітарнай сістэмай.

Калі ўлічыць, што выплаты на працадні ў калгасах заставаліся крайне нізкімі, то можна ўявіць, у якім адчайным становішчы знаходзілася сацыяльнае забеспячэнне сельскіх жыхароў, у першую чаргу калгаснікаў, у пачатку і сярэдзіне 30-х гадоў. Дастаткова сказаць, што ў 1933 г. у Беларускай ССР у сярэднім было выдадзена на адзін працадзень 1,57 кг збожжа і 11 кап. грашыма. Ва неўраджайным 1936 г.

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.85, спр.379, арк.1.

[2] Там жа, арк.2 — 4.

гэты паказчык па збожжавых знізіўся да 0,69 кг, а па грошах узрос да 0,29 руб. Колькасць калгасаў, якія выдалі на працадні да 1 кг збожжавых культур, у 1933 г. складала 24,6 %. У 1936 г. удзельная вага такіх калектыўных гаспадарак дасягнула 80,2 %[1]. Становішча ў БССР некалькі палепшылася ў канцы 30-х гадоў, якія былі адносна ўраджайнымі.

У той жа час у калгасах і саўгасах праводзілася некаторая работа па стварэнню пэўнай інфраструктуры сацыяльнай накіраванасці. Гэта ў першую чаргу звязана з адкрыццём адпаведных устаноў. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў сельскай мясцовасці рэспублікі працавала каля 8 тыс. медыцынскіх пунктаў і амбулаторый, больш за 700 участкаў. Фарміравалася сетка дзіцячых устаноў. У 1937 г. у калгасах БССР налічвалася 1300 пастаянных ясляў. Вясною 1940 г. калектыўныя гаспадаркі мелі больш за 1700 лазняў. Наяўнасць гэтых і іншых аб'ектаў дазваляе гаварыць аб першых кроках па развіццю сацыяльнай сферы на вёсцы.

Зыходзячы ў першую чаргу з агульнасаюзных інтарэсаў партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі Беларускай ССР лічылі, што ў сельскай мясцовасці пражывае занадта шмат людзей і, клапоцячыся аб засяленні іншых рэгіёнаў Савецкага Саюза, мелі намер зрабіць адпаведнае перасяленне. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць прынятая 14 чэрвеня 1940 г. пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б "Аб плане сельскагаспадарчага перасялення ў 1940 годзе з Беларускай ССР у шматзямельныя раёны СССР"[2]. Аднак работа па яе выкананню не прынесла істотных змен ні ў стан сацыяльнай сферы рэспублікі, ні ў іншыя бакі жыцця, а далейшае ажыццяўленне пастановы было перарвана Вялікай Айчыннай вайной.

Такім чынам, з усталяваннем бальшавіцкай таталітарнай сістэмы пачалося адкрытае адміністраванне ў сацыяльнай сферы як у адносінах да гарадскога, так і да сельскага насельніцтва. Асабліва безабароннымі ў гэтым сэнсе аказаліся больш гаспадарлівыя, а значыць, больш заможныя вясковыя жыхары. Правядзенне індустрыялізацыі перш за ўсё за кошт сялянства рабіла вёску падпарадкаванай гораду і ў сацыяльных адносінах.

Пэўныя зрухі ў развіцці сацыяльнай сферы былі дасягнуты вялікімі намаганнямі ўлады і народа. У

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.28, спр.64, арк.66, 126, 127.

[2] Там жа, спр.397, арк.17 — 19.

выніку жыццёвы ўзровень як жыхароў горада, так і вёскі заставаўся нізкім. Пабудова новага грамадства патрабавала вялікіх ахвяр, і яны былі прынесены беларускім народам, як і іншымі народамі СССР, у поўнай меры.

## 3. Дыктат у грамадска-палітычным жыцці

У адрозненне ад сацыяльна-эканамічнай сферы, дзе ўздзеянне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ўсталёўвалася пастулова, па меры таго як укараняліся сацыялістычныя формы гаспадарання, грамадска-палітычнае жыццё ў дзяржаве бальшавікі бралі пад свой кантроль з першых дзён усталявання сваёй улады. Як адзначалася вышэй, у пачатку 1918 г. яны разагналі Усерасійскі ўстаноўчы сход, праз паўгода фактычна пачаўся пераход да аднапартыйнасці ў выніку разгрому выступлення левых эсэраў.

Такія дзеянні цэнтральных улад дапаўняліся адпаведнымі мерамі на месцах. У канцы 1917 г. быў разагнаны Усебеларускі з'езд, у рабоце якога ўдзельнічала звыш паўтары тысячы ўсенародна абраных дэлегатаў. Рашуча і бескампрамісна вялася барацьба з усялякімі праявамі іншадумства, а тым больш канкрэтнымі дзеяннямі, што не супадалі з інтарэсамі бальшавіцкай улады. Насілле станавілася звычайнай з'явай. У гэтых умовах апазіцыйныя сілы ўсё больш страчвалі свае дасягненні і ўплыў у грамадстве.

Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і рухі, якія дзейнічалі на Беларусі, былі аслаблены выдзяленнем з іх розных плыняў. Нямала прадстаўнікоў нацыянал-дэмакратыі пераходзілі на платформу кампартыі і савецкай улады. Да гэтага іх схілялі ажыццяўленне НЭПа, дзяржаўнае і нацыянальна-культурнае будаўніцтва, якое выяўлялася ў першую чаргу ў вяртанні БССР усходнебеларускіх тэрыторый і правядзенні палітыкі беларусізацыі.

Дэмакратычныя праявы ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці ў канцы 20-х гадоў сталі ўсё больш змяншацца і нават знікаць пад уздзеяннем новага курсу партыйна-дзяржаўных улад. Дэмакратычныя тэндэнцыі ім былі непатрэбныя, больш таго, яны супярэчылі дыктатарскім, а затым і

таталітарным імкненням вярхоўнага кіраўніцтва партыі і дзяржавы. Жорсткая рэгламентацыя ўсіх бакоў жыцця станавілася нормай палітычных рашэнняў і практычных дзеянняў.

Дыктат у грамадска-палітычнай сферы ў першую чаргу здзяйсняўся праз камуністычную партыю. У 30-я гады ў ёй адбываліся складаныя працэсы, абумоўленыя адносінамі вышэйшага партыйнага кіраўніцтва на чале са Сталіным да ніжэйшых партыйных органаў і радавых камуністаў. Гэтыя адносіны характарызаваліся ўсё ўзрастаючым недаверам да партыйных камітэтаў і пярвічных партыйных арганізацый, ігнараваннем партыйнай дэмакратыі, увядзеннем жорсткай рэгламентацыі на ўсю дзейнасць партыі.

Такія падыходы ў поўнай меры ўжо праявіліся ў час партыйнай чысткі 1933 г. У выніку колькасць членаў партыйных арганізацый значна зменшылася. Калі па стану на 1 студзеня 1933 г. кампартыя Беларусі налічвала 65 040 чалавек, і гэта была самая вялікая колькасць на працягу ўсіх 30-х гадоў, дык праз год, на 1 студзеня 1934 г., у яе ўваходзіла 37 909 камуністаў. Астатнія былі вычышчаны. У час гэтай кампаніі з партыі выключылі нямала добрасумленных, але недастаткова актыўных людзей, а пасіўнасць у той час разглядалася як істотны недахоп і давала падставу для выключэння з партыйных радоў.

Нягледзячы на значнае зніжэнне колькасці камуністаў у выніку гэтай чысткі, у 1935 г. быў праведзены абмен партыйных дакументаў. Гэта кампанія шмат у чым нагадвала новую чыстку. Колькасны склад партыйных арганізацый зноў значна скараціўся. На пачатак 1936 г. у кампартыі Беларусі налічвалася 31 937 чалавек[1].

Але найбольш трагічным у міжваеннай гісторыі партыйнай арганізацыі, усяго беларускага народа, як і іншых народаў краіны, быў 1937 г. — год самых злавесных праяў сталінскага таталітарызму. Склад партыйных арганізацый зменшыўся ў Беларускай ССР яшчэ на 2225 чалавек і дасягнуў разам з прынятымі 31 603 камуністаў[2]. Гэта самая малая колькасць членаў КП(б)Б за ўсе 30-я гады. Шмат было рэпрэсіравана тых, каго выключылі з партыі раней.

Менавіта ў гэты час адбыўся сумна вядомы

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. 1918 — 1978. Мн., 1978. С.75.

[2] Там жа.

ліпеньскі (1937 г.) пленум ЦК КП(б)Б, на якім верхаводзілі Малянкоў і Якаўлеў, што прыбылі з Масквы. Яны ўчынілі сапраўдную экзекуцыю над кіраўніцтвам рэспублікі, многімі партыйнымі камітэтамі, радавымі камуністамі і беспартыйнымі. Даведзены да адчаю скончыў жыццё самагубствам найбольш аўтарытэтны з кіраўнікоў рэспублікі старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў. Быў арыштаваны старшыня Саўнаркома рэспублікі М. М. Галадзед, які таксама загінуў у выніку самагубства, рэпрэсіраваны першы сакратар ЦК КП(б)Б М.Ф. Гікала і многія іншыя. Была арыштавана і рэпрэсіравана абсалютная большасць першых сакратароў райкомаў партыі, многія сотні прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі. Загінулі прэзідэнт АН БССР П. В. Горын, пісьменнік і дзяржаўны дзеяч, першы старшыня Часовага ўрада БССР З.Жылуновіч (Цішка Гартны), пісьменнік М.Кудзелька (М. Чарот) і інш. У выніку інтэлектуальны ўзровень беларускага народа, як і іншых народаў краіны, значна знізіўся. Гэта датычыць і вытворчага патэнцыялу ў сувязі з рэпрэсіямі тысяч сялян, рабочых, тэхнікаў, інжынераў.

Толькі пасля студзеньскага (1938 г.) пленума ЦК УКП(б), які разгледзеў пытанне "Аб памылках партарганізацый пры выключэнні камуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з УКП(б), мерах па пераадоленню гэтых недахопаў", размах рэпрэсій паменшыўся і пачалася ўзмоцненая кампанія па росту колькасці камуністаў. На 1 студзеня 1941 г. КП(б)Б налічвала 72 177 членаў[1].

Найбольш яскравым сведчаннем нарастання дыктату ў грамадска-палітычным жыцці,ператварэння яго ў афіцыйнае татальнае адзінадумства з'явіўся працэс далейшага павышэння ўдзелу працоўных у выбарах мясцовых, а потым, пасля прыняцця Канстытуцыі 1936 г., і вярхоўных саветаў Саюза ССР і Беларускай ССР.

Складанай была выбарчая кампанія саветаў у 1931 г., што звязана ў першую чаргу з вялікімі цяжкасцямі ў правядзенні палітыкі калектывізацыі і з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваннем арцелей. Характэрна, што ўплыў партыйных і савецкіх арганізацый на насельніцтва ў гэты час знізіўся, давер да іх палітыкі нярэдка змяняўся сумненнямі, а ў часткі насельніцтва

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. 1918 — 1978. С.75 — 76.

і недаверам. Гэта знаходзіла праяўленне і ў канкрэтных дзеяннях. У Копыльскім раёне, напрыклад, было сарвана 50 перадвыбарных сходаў. Паменшылася колькасць сялян, якія прынялі ўдзел у выбарах саветаў, з 59,5 % у выбарчую кампанію 1929 г да 56,5 %. Не быў абраны кожны трэці кандыдат, рэкамендаваны партыйнымі арганізацыямі і групамі беднаты [1].

Аднак у выніку масіраванай прапагандысцкай работы і прымянення націскных метадаў у цэлым удалося дабіцца павышэння актыўнасці насельніцтва на выбарах. Удзел выбаршчыкаў у галасаванні па гарадах і вёсках БССР дасягнуў 66,3 %.

Асабліва вялікае значэнне надавалася выбарам у саветы, якія праходзілі ў канцы 1934 г. Пасля XVII з'езда УКП(б), дзе была зроблена нясмелая спроба змясціць Сталіна з пасады генеральнага сакратара ЦК партыі, вярхоўнаму кіраўніцтву патрэбны былі як мага лепшыя вынікі. Таму ў краіне, у тым ліку ў БССР, вялася надзвычай актыўная прапагандысцкая работа. У раёны накіроўваліся шматлікія прадстаўнікі партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх органаў. Паўсюдна праводзіліся лекцыі, гутаркі, вечары, мэтай якіх было заклікаць да ўсеагульнага ўдзелу ў выбарах. Кіраўнікі гарадскіх і сельскіх саветаў рабілі справаздачы аб сваёй дзейнасці. Ужо на гэтых сходах было дасягнута высокае прадстаўніцтва выбаршчыкаў. Былі прыняты меры, каб значна зменшыць колькасць тых, хто быў пазбаўлены выбарчых правоў. У Беларускай ССР іх удзельная вага ў складзе выбаршчыкаў знізілася з 7,3 % у 1931 г. да 3,3 %. Усё гэта прывяло да таго, што выбары мясцовых саветаў у канцы 1934 г. прайшлі пры шырокім удзеле насельніцтва. Агульны паказчык па БССР дасягнуў у сярэднім 92,3 %[2].

Значыць, менавіта ў 1934 г. быў зроблены рашаючы крок на шляху да стварэння сталінскага "аднадушша" ў вырашэнні грамадска-палітычных спраў. Яўка на выбары стала вельмі высокай. Яна не столькі адлюстроўвала адносіны гарадскога і сельскага насельніцтва да палітыкі партыйна-дзяржаўных улад, колькі іх здольнасць мабілізаваць народ на выказванне адносін да сябе.

Працэс усеагульнага ўдзелу ў галасаванні быў закончаны ў час выбарчых кампаній, што праходзілі

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.625 — 626.

[2] Там жа.

на аснове новых Канстытуцый СССР і БССР. У час выбараў у Вярхоўны Савет СССР, якія адбыліся 12 снежня 1937 г., па рэспубліцы на выбарчыя ўчасткі з'явіліся 97,4 % выбаршчыкаў. З іх 98,7 % аддалі свае галасы за кандыдатаў у Савет Саюза Вярхоўнага Савета СССР і 98,3 % — у Савет Нацыянальнасцей.

Прыкладна на такім жа ўзроўні заставалася выбарчая актыўнасць насельніцтва і ў час выбараў у рэспубліканскія заканадаўчыя органы. На выбарах у Вярхоўны Савет БССР, якія адбыліся 26 чэрвеня 1938 г., удзельнічала 99,65 % выбаршчыкаў. З іх аддалі свае галасы за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных 99,19 %. Амаль такія ж паказчыкі былі і на выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў працоўных, што адбыліся ў Беларускай ССР 24 снежня 1939 г.[1]

Дасягнутыя паказчыкі ўдзелу ў выбарчых кампаніях і практычна ўсеагульнае аднадушша ў выказванні сваіх думак шляхам тайнага галасавання — вынік нарастаючага дыктату ў грамадска-палітычным жыцці. Фактычна гэта быў татальны кантроль партыйна-дзяржаўных структур і карных органаў не толькі за ўдзелам грамадзян у выбарчых кампаніях, але і за выказваннем імі шляхам так званага тайнага галасавання сваіх адносін да афіцыйна прапанаваных кандыдатур. У гэтым бальшавіцкая таталітарная сістэма праявілася адным са сваіх выразных бакоў.

Аднак, як адзначалася вышэй, саветы ўсіх узроўняў, выбары ў якія праходзілі з усё ўзрастаючым адзінадушшам, не мелі рэальнай улады. Яны былі падпарадкаваны выканаўчым органам, работнікі якіх не столькі выбіраліся, колькі прызначаліся зверху. Да таго ж дзейнасць саветаў была моцна падуладная адпаведным партыйным камітэтам. Усе прызначэнні маглі ажыццяўляцца толькі з іх дазволу, а мерапрыемствы, што праводзіліся, таксама былі пад іх кантролем.

Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць практыка арганізацыі і правядзення XI Усебеларускага з'езда саветаў, які адбыўся 14 — 22 студзеня 1935 г. З мэтай яго падрыхтоўкі была створана паліткамісія ЦК КП(б)Б па кіраўніцтву з'ездам. У яе ўвайшлі 13 ча-

[1] Советская Белоруссия. 1938. 29 июня; 25 июля; РЦЗВДНГ, ф.17, воп.21, спр.443, арк. 51 — 52.

лавек. Камісію даручылі ўзначаліць старшыні ЦВК БССР А. Р. Чарвякову. У яе склад увайшлі першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікала, старшыня Саўнаркома БССР М. М. Галадзед, другі сакратар ЦК КП(б) Б Д.І.Валковіч, іншыя партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі рэспубліканскага звяна. Камісія правяла тры пасяджэнні, у час якіх разгледзела і зацвердзіла парадак дня з'езда, змест дакладаў, праекты рэзалюцый, будучы склад ЦВК БССР. Разглядаўся таксама склад ганаровага прэзідыума, кіруючых органаў з'езда, прывітальныя тэлеграмы як у адрас з'езда, так і ад яго, палітработа з дэлегатамі і інш.[1]

Такая ўсебаковая і канкрэтная падрыхтоўка з'езда спецыяльна створанай паліткамісіяй ЦК КП(б)Б фактычна прадвызначыла яго работу і характар рашэнняў. Прыкладна так рыхтаваліся адпаведнымі партыйнымі камітэтамі выбары саветаў і на іншых узроўнях, а таксама праводзімыя імі мерапрыемствы. Усё гэта сведчыць аб дасягненні бальшавіцкай партыяй поўнага манапалізму ў справе кіраўніцтва саветамі, якія фактычна выконвалі падпарадкаваную ролю, хаця і лічылася, што ўлада належыць ім, а праз іх — усяму народу.

Пад пільным кантролем партыйных органаў працавалі розныя грамадскія фарміраванні саветаў — камісіі, секцыі, дэпутацкія групы. У іх рабоце ўдзельнічалі многія працоўныя, хаця ў шмат якіх адносінах фармальна. Тым не менш вакол кіруючых органаў мясцовых саветаў фарміраваўся значны актыў. Дастаткова сказаць, што ў сярэдзіне 1935 г. колькасць актывістаў толькі сельскіх саветаў Беларускай ССР дасягала 165 тыс. чалавек [2].

Пэўная роля ў грамадска-палітычным жыцці гарадоў належала прафсаюзным арганізацыям. Калі па стану на 1 кастрычніка 1932 г. яны налічвалі ў БССР каля 357 тыс. чалавек, то да лістапада 1940 г. — амаль 650 тыс. Разам з мерамі па актывізацыі работы прафсаюзаў у напрамку падтрымкі бальшавіцкай таталітарнай сістэмы партыйна-дзяржаўныя ўлады імкнуліся раз'яднаць рабочых розных спецыяльнасцей. Хоць гэта маскіравалася, але менавіта з дадзенай мэтай у верасні 1934 г. IV пленум УЦСПС прыняў рашэнне аб разбуйненні прафсаюзаў. На яго ас-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.682, арк.1 — 16.
[2] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.627.

нове ў БССР замест 27 прафесійных саюзаў было створана 76.

Важнае значэнне надавалася дзейнасці камсамола. Яго рады пашыраліся як у горадзе, так і на вёсцы. Да пачатку 1941 г. у рэспубліцы налічвалася 263 тыс. юнакоў і дзяўчат, якія ўваходзілі ў склад рэспубліканскай камсамольскай арганізацыі[1]. Яе дзейнасць, як і работа прафсаюзаў, а таксама іншых грамадскіх арганізацый, была моцна рэгламентавана. Фактычна адбылося іх адзяржаўленне.

Кантроль за грамадскімі фарміраваннямі, нават далёка не першымі па значэнню, быў усеагульным і пільным. Прыкладам гэтага, у прыватнасці, можа служыць пісьмо паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па БССР у ЦК КП(б)Б, накіраванае 26 чэрвеня 1932 г. У ім адзначалася, што ў канцы папярэдняга года масавым аддзелам ЦК КП(б)Б была заслухана інфармацыя аб стане беларускай арганізацыі таварыства сяброў радыё. У сувязі з гэтым у 38 раёнах праведзены раённыя канферэнцыі. Амаль на ўсіх фабрыках, заводах, ва ўстановах арганізаваны ячэйкі таварыства. У студзені 1932 г. адбыўся I Усебеларускі з'езд беларускага аддзялення таварыства сяброў радыё, выбраны кіруючыя органы. Аднак з таго часу прэзідыум таварыства ні разу не збіраўся. Ніякая работа не вядзецца. Мясцовыя ячэйкі развальліся, членскія ўзносы не збіраюцца. Сродкі, якія выдзеліў Саўнарком БССР, пайшлі на зарплату апарату таварыства. АДПУ прапаноўваў прыняць дзейсныя меры ў адносінах да членаў партыі, якія давялі работу таварыства да поўнага развалу.

Пасля такога данясення ЦК КП(б)Б вырашыў тэрмінова сабраць кіруючых работнікаў таварыства, грунтоўна высветліць прычыны развалу яго работы, устанавіць вінаватых і разгледзець гэта пытанне на пасяджэнні сакратарыята ЦК. Работай таварыства заняліся органы ЦКК — РСІ Беларускай ССР[2]. Дадзены факт сведчыць аб тым, што ў сістэме масіраванай агітацыйна-прапагандысцкай работы выкарыстоўваліся ўсе рычагі, у тым ліку, здавалася б, другарадныя грамадскія арганізацыі.

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.619 — 620; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.198.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.302, арк.559 — 560.

Разлік быў простым: такая ўсебаковая апрацоўка свядомасці грамадзян павінна была прынесці (трэба прызнаць, і прыносіла) жаданыя партыйным уладам вынікі.

Значнай эфектыўнасцю вызначалася дзейнасць спартыўных арганізацый, асабліва ваенізаванай накіраванасці. Падрыхтоўка лётчыкаў, парашутыстаў, іншых ваенных спецыялістаў дасягнула ў 30-я гады вялікага размаху. Асаблівае значэнне гэтай рабоце надавалася ў БССР як у прыгранічнай рэспубліцы.

Прыгранічныя рэгіёны дзяржавы заўсёды былі ў цэнтры павышанай увагі цэнтральных улад. У прыватнасці, 11 сакавіка 1930 г. палітбюро ЦК УКП(б) прыняло пастанову "Аб Украіне і Беларусі". У ёй адзначалася: па тых даных, якія маюцца ў цэнтральнага кіраўніцтва, ёсць падставы меркаваць, што ў выпадку сур'ёзных кулацка-сялянскіх выступленняў на тэрыторыі Правабярэжнай Украіны і на Беларусі (асабліва ў сувязі з будучым высяленнем з прыгранічных раёнаў польска-кулацкіх контррэвалюцыйных і шпіёнскіх элементаў) польскі ўрад можа пайсці на ўмяшальніцтва (так у дакуменце. — *М.К.*). Каб пазбегнуць гэтага, ЦК палічыў неабходным даць цэнтральным камітэтам кампартый Украіны і Беларусі, а таксама адпаведным органам АДПУ наступныя дырэктывы:

засяродзіць увагу як у палітычнай рабоце, так і ў ваенна-чэкісцкай падрыхтоўцы на тым, каб не былі дапушчаны ніякія выступленні антысавецкага характару ў прыгранічных акругах Украіны і Беларусі;

у тыднёвы тэрмін перакінуць у прыгранічныя акругі дастатковую колькасць вопытных партыйных работнікаў з іншых акруг у дапамогу мясцовым арганізацыям;

за гэты ж час колькасна і якасна ўзмацніць у прыгранічных акругах аператыўны склад і манеўровыя вайсковыя групы АДПУ за кошт іншых рэзерваў;

аперацыю арышту і высылкі кулацка-польскіх контррэвалюцыйных элементаў падрыхтаваць з усёй скрупулёзнасцю і правесці ў максімальна кароткі тэрмін, арганізавана і без шуму;

асноўная задача — папярэдзіць любыя масавыя выступленні ў пагранічных акругах[1].

Дадзеная пастанова расцэньвалася як асабліва

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.8, арк.114.

сакрэтная і з ёю знаёмілася абмежаваная колькасць асоб як у Цэнтры, так і сярод членаў ЦК кампартый Украіны і Беларусі. І гэта не выпадкова. Дадзены дакумент быў прыняты ў разгар масавай калектывізацыі і моцнага абвастрэння палітычнага становішча ў краіне. Таму трывога вышэйшага выканаўчага органа была не беспадстаўнай. Звяртае на сябе ўвагу тое, што адзначаныя ў пастанове мерапрыемствы павінны былі праводзіцца з тым разлікам, каб не выклікаць кампаній пратэсту. Гэтага асабліва баяліся цэнтральныя ўлады, таму што любое больш-менш значнае выступленне магло з'явіцца той іскрынкаю, з якой, не выключана, разгарэлася б полымя.

Для ўзмацнення партыйна-дзяржаўнага палітычнага ўплыву ў прыгранічных раёнах пастаянна звярталася ўвага на іх кадравае забеспячэнне, у тым ліку на якасны склад настаўнікаў. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць пісьмо першага сакратара ЦК КП(б)Б Гея ў цэнтральныя партыйныя органы ў Маскве, накіраванае 27 снежня 1931 г. У ім канстатуецца факт павышэння на працягу апошняга года ўдзельнай вагі камуністаў і камсамольцаў сярод настаўнікаў. Аднак кіраўніка беларускай партыйнай арганізацыі непакоіла тое, што шмат хто з настаўнікаў з'яўляецца "ідэалагічна чужым элементам" і што гэта частка настаўніцтва "працягвае заставацца ўсё яшчэ значнай". Паводле яго звестак, па некаторых раёнах падлягала "изъятию" да 20 чалавек. Адначасова выказвалася просьба аб прысылцы ў гэтыя мясціны больш надзейных кадраў настаўнікаў[1]. Недавер партыйна-савецкай улады да значнай часткі настаўніцтва, як і наогул да інтэлігенцыі, быў характэрным не толькі для гэтага, але і для больш позняга часу.

Насцярожанасць у грамадска-палітычным жыцці — характэрная рыса рашэнняў мясцовых і цэнтральных улад. Адным з прыкладаў гэтага з'яўляецца сакрэтная пастанова палітбюро ЦК УКП(б), прынятая 10 верасня 1932 г. У адпаведнасці з ёю абмяжоўваліся сустрэчы вызваленых з польскіх турмаў камуністаў з кіраўнікамі і грамадскасцю прыгранічных мясцін.

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.233, арк.9.

Дакумент прадугледжваў, што ў сустрэчах не могуць удзельнічаць прадстаўнікі савецкіх органаў і Чырвонай Арміі. У Негарэлым, а таксама ў Дзяржынску (Койданаве) сустрэчы абмяжоўваліся ўдзелам невялікіх дэлегацый рабочых, іншых арганізацый без правядзення мітынгаў і без прывітальных прамоў. Прадугледжвалася, што на вакзале ў Мінску колькасць тых, хто сустракаў, не павінна перавышаць 100 — 150 чалавек. З мэтаю недапушчэння дэманстрацый тут не павінна быць прывітальных прамоў. Пастанова прадпісвала, што ўрачыстыя пасяджэнні могуць склікацца толькі ад імя Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам і прафсаюзаў. Газетам забаранялася друкаваць тэксты прамоў, якія могуць прагучаць на гэтых пасяджэннях. Выступленні польскіх камуністаў у час сустрэч не павінны друкавацца, як не павінна быць і падрабязных інфармацый пра ўсё гэта ў мінскім друку[1].

Такая перасцярога ад пашыраных кантактаў з братамі па зброі — камуністамі, якія вызваляліся з польскіх турмаў і пераязджалі ў СССР, каб атрымаць тут палітычнае прыстанішча, красамоўна характарызуе савецкія парадкі ў іх сталінскай інтэрпрэтацыі як фактычна закрытае грамадства. У прыведзенай пастанове прасочваецца недавер як да замежных партыйных калег, так і да сваіх жыхароў і нават прадстаўнікоў савецкіх органаў, а таксама Чырвонай Арміі. Наогул гэта характэрная рыса таталітарнай бальшавіцкай сістэмы, асабліва ў часы сталінскага праўлення.

Тая акалічнасць, што БССР з'яўлялася прыгранічнай рэспублікай, накладвала адбітак літаральна на ўсе бакі грамадска-палітычнага жыцця. У прыватнасці, член палітбюро ЦК УКП(б), старшыня камісіі партыйнага кантролю пры ЦК партыі А. Андрэеў у выступленні 18 чэрвеня 1938 г. на XVII з'ездзе КП(б)Б падкрэсліваў: асноўнае — гэта тое, што Беларусь з'яўляецца прыгранічнай рэспублікай, займае асобнае месца па свайму палітычнаму становішчу.

Пасля ўдзелу ў рабоце з'езда Андрэеў зрабіў паездку па рэспубліцы і перыядычна дакладваў Сталіну аб становішчы спраў. На яго думку, у многіх раённых камітэтах партыі сакратары сядзяць слабыя, а ў Лепельскім, Бягомльскім і іншых — проста ненадзейныя. У выніку гэтага партыйна-палітычная работа ў пагранпаласе пастаўлена крайне слаба. У наступнай

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.13, арк.100.

карэспандэнцыі высокапастаўлены правяраючы з Масквы паведамляў: у найбольш нездавальняючым становішчы аказалася кіраўніцтва зямельнымі справамі і адукацыяй. Наркома асветы Піваварава давялося арыштаваць як шкодніка, магчыма, ён польскі шпіён, а кіраўніка Наркамзема Свінцова — пакуль адхіліць ад работы як падазроную асобу. У інфармацыі выказвалася просьба адклікаць Лявіцкага з Беларусі ў распараджэнне ЦК УКП(б) з-за таго, што яго паводзіны тут нейкія дзіўныя і яго неабходна грунтоўна праверыць. Пасланец з Цэнтра інфармаваў, што яму давялося замяніць частку кіруючых работнікаў, у тым ліку з аддзелаў ЦК. На буйнейшай раённай электрастанцыі БелДРЭС былі зняты з пасады дырэктар, таму што па нацыянальнасці ён латыш, а таксама парторг, які з'яўляўся палякам[1].

Гэты прыклад характарызуе грамадска-палітычныя абставіны, што існавалі ў тыя часы. Ні аб якой партыйнай дэмакратыі і гаварыць не даводзіцца, паколькі аднаасобна, фактычна без усялякага расследавання высокі партыйны эмісар здымаў з пасады тых, хто яму не спадабаўся. Але ж гэта было не проста адхіленне людзей ад працы. Усе яны, як вядома, перадаваліся ў следчыя органы, якія, безумоўна, тут жа знаходзілі матэрыял для арышту і рэпрэсій.

Падазронасць і ўсеагульны прадузяты кантроль, у першую чаргу на прадмет палітычнай надзейнасці, ахоплівалі літаральна ўсе сферы грамадскага жыцця 30-х гадоў. Асабліва пільным быў кантроль за выдавецкай справай. Галоўным упраўленнем па справах літаратуры і выдавецтваў (Галоўлітбелам) БССР пастаянна рабіліся агляды літаратурна-мастацкіх часопісаў і газет. У прыватнасці, у аглядзе за 1932 г. часопісаў "Шляхі калектывізацыі", "Савецкая краіна", "Паляўнічы Беларусі", "Тэхніка ў масы" канстатавалася, што ў працэсе праверкі ўся ўвага была скіравана на выяўленне галоўным чынам палітычных зрываў у рабоце гэтых выданняў, а таксама на праявы класава-варожых вылазак[2].

Сродкі масавай інфармацыі былі пад асабліва пільнай увагай партыйна-дзяржаўных структур. У першую чаргу іх непакоіла кадравае забеспячэнне. У прыватнасці, аб гэтым сведчыць пісьмо першага сакратара ЦК КП(б)Б Гікала, накіраванае 17 верасня 1936 г. у ЦК УКП(б). У ім указвалася, што рэдакцыі

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.73, воп.2, спр.23, арк.82 — 89, 126, 158.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.391, арк.364.

газет і часопісаў, выдавецтвы БССР у значнай ступені "засмечаны" трацкістамі, нацдэмамі, бундаўцамі, іншымі класава-варожымі элементамі. ЦК КП(б)Б правёў вялікую работу па выкрыццю і выгнанню іх. У выніку шмат якія выданні, у тым ліку рэспубліканскія газеты "Звязда", "Рабочы" і іншыя, аказаліся без многіх сваіх супрацоўнікаў. Толькі кіруючых работнікаў друку не хапала каля 70 чалавек. Асабліва цяжкае становішча з кадрамі склалася ў Белдзяржвыдавецтве і нават у Галоўлітбеле. Кіраўнік кампартыі Беларусі прасіў прыслаць адпаведных людзей для замяшчэння вакантных пасад[1]. Зразумела, што прысланыя работнікі не ведалі спецыфікі рэспублікі, асаблівасцей беларускага народа, яго гісторыі і традыцый. Іх менш за ўсё цікавіла Беларусь як нацыянальная рэспубліка, затое яны з'яўляліся актыўнымі праваднікамі афіцыйнай лініі.

Для ўзмацнення нагляду за выдавецкай дзейнасцю пашыралася практыка прыцягнення да гэтай справы няштатных кантралёраў. У прыватнасці, група супрацоўнікаў Інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышава ў маі 1937 г. атрымала заданне прарэцэнзаваць артыкулы па пытаннях гаспадарчага планавання, змешчаныя ў часопісе "Сацыялістычнае будаўніцтва" за апошнія 10 гадоў. Рэцэнзентаў арыентавалі на тое, што матэрыялы могуць мець некаторае значэнне для выкрыцця варожай дзейнасці выяўленых, а, магчыма, яшчэ не знойдзеных шкоднікаў. Тыя цытаты, якія былі выбраны з некаторых публікацый, сведчаць, што іх прэтэнзіі зводзіліся нярэдка да відавочных, агульнапрынятых выказванняў. Тым не менш такое "высысанне з пальца" пранізвала ўсю працу кантралёраў[2].

Як вынікае з дакументальных матэрыялаў, нават у гэты час, нягледзячы на масіраваны ўціск літаральна па ўсіх напрамках грамадска-палітычнага жыцця, асобныя людзі спрабавалі весці барацьбу з бальшавіцкай таталітарнай сістэмай. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць антысавецкія лістоўкі, што час ад часу з'яўляліся ў тых ці іншых мясцінах. У прыватнасці, у верасні 1930 г. у в. Матусава Галава Хутарскага сельсавета Чэрвеньскага раёна была расклеена такая лістоўка. Органы паў-

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.884, арк.19 — 20.

[2] Там жа, спр.1074, арк.1 — 7.

намоцнага прадстаўніцтва АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе меркавалі, што яе напісаў жыхар вёскі Я. П. Ляўшук. Яго арыштавалі[1].

У Мсціслаўскім раёне ў ноч на 20 лістапада 1930 г. на паштовых скрынках былі расклееены лістоўкі, перадрукаваныя на машынцы. У іх гаварылася: мы — барацьбіты за вызваленне ўсяго рабочага класа, мы вольны народ. Нас шмат. Шмат у нас і зброі, якой мы можам адстаяць сябе. Няўжо вы каменныя людзі, што церпіце гэтае ліхалецце пад усякім гнётам? Што нам абяцалі бальшавікі? Яны нам абяцалі волю, зямлю сялянам, свабоду слова. А ці назіраецца гэта? Не.

Далей у лістоўцы прапаноўвалася дапамога тым, хто падзяляе погляды аўтараў. Для гэтага неабходна было наведаць адпаведныя лясныя масівы. Лістоўка таксама ўтрымлівала заклік: не ісці ў калгасы, таму што гэта — гібель. Пад ёю стаяў подпіс: Вызваленцы[2].

Лістоўкі з'яўляліся і ў больш позні час, нават у 1937 г. Адна з іх за подпісам нацыянальнага працоўнага саюза, напісана на рускай мове і ў рэзкіх выразах. У ёй, у прыватнасці, гаварылася, што ілжэ праклятая камулада аб шчаслівым калгасным жыцці. 20 гадоў льецца кроў, поўныя канцлагеры працоўным народам. Не сее Сталін і не жне, а грабіць працоўнае сялянства і рыхтуе сусветную рэвалюцыю на народныя грошы. З гэтым трэба заканчваць. Затым утрымліваліся заклікі да «кармільцаў зямлі рускай»: не плаціць грабежніцкіх падаткаў, адстойваць права на аднаасобнае гаспадаранне, змагацца за свабодную працу на сваёй уласнай зямлі. У закліку да рабочых сцвярджалася, што без заможнага і свабоднага селяніна ў іх таксама не будзе шчаслівага жыцця. Лістоўка змяшчала і звароты да інтэлігенцыі, чырвонаармейцаў, чыгуначнікаў, каб паўсюдна аб'ядноўвацца з мэтай звяржэння сталінскай дэспатыі, пералічваліся прозвішчы вярхоўных кіраўнікоў і ўтрымлівалася патрабаванне прыцягнуць іх да адказнасці[3]. Дадзеная лістоўка, як можна меркаваць па яе зместу, была напісана ў Расіі, але распаўсюджвалася і ў БССР. З'яўленне ва ўмовах таталітарнага сталінскага рэжыму антысавецкіх лістовак сведчыла аб тым, што ўладам не ўдавалася поўнасцю знішчыць іншадумства нягледзячы на татальны ўціск у грамадска-палітычнай і іншых сферах жыцця.

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.249, арк. 158.

[2] Там жа, спр.249, арк158 — 159.

[3] Там жа, спр.1247, арк.1.

У разгалінаванай і строга цэнтралізаванай сістэме ідэалагічнай апрацоўкі людзей важная роля належала партыйнай і камсамольскай палітычнай вучобе. Для членаў партыі і камсамола яна з'яўлялася абавязковай. Лічылася неабходным прыцягненне да яе беспартыйных. Тэматыка заняткаў была строга кананізаванай. Урэшце рэшт усё пачало зводзіцца да "Кароткага курса гісторыі УКП(б)", апублікаванага ў 1938 г.

Вывучэнню "Кароткага курса..." надавалася надзвычай вялікая ўвага. Гэта стала асноўным напрамкам работы сістэмы партыйнай, камсамольскай, іншых форм вучобы. Ход і эфектыўнасць гэтай працы пастаянна кантралявалі партыйныя органы. У прыватнасці, пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 15 — 16 лістапада 1939 г., разгледзеў пытанне "Аб ходзе выканання рашэння ЦК УКП(б) ад 16 жніўня 1939 года "Аб пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма ў Беларускай ССР". У прынятай пленумам пастанове было адзначана, што "Кароткі курс..." у Беларускай ССР распаўсюджаны ў колькасці каля 400 тыс. экземпляраў, даклад Сталіна на XVII з'ездзе УКП(б) — больш за 500 тыс. экземпляраў. Разам з іншымі выданнямі агульны тыраж распаўсюджанай марксісцка-ленінскай літаратуры склаў на працягу года каля 3 млн экземпляраў.

Пленум засяродзіў увагу на тым, што ЦК УКП(б) у прынятай пастанове назваў самым буйным недахопам прапагандысцкай работы тую акалічнасць, што лекцыі па гісторыі партыі чытаюцца пераважна па першых раздзелах "Кароткага курса...", што паслякастрычніцкі перыяд, які мае важнае значэнне ў гісторыі бальшавіцкай партыі, амаль не закранаецца і застаецца не вывучаным. Таксама было ўказана на слабы кантроль за якасцю лекцый, сярод якіх мала папулярных, недастатковая ўвага надавалася пытанням бягучай палітыкі, міжнароднага становішча, важнейшых палітычных і гаспадарчых мерапрыемстваў партыі і ўрада.

У пастанове пленума таксама адзначалася, што за мінулы год у рэспубліканскіх і абласных газетах надрукавана 1116 артыкулаў, кансультацый, лекцый у дапамогу тым, хто самастойна вывучае "Кароткі курс...". Што датычыць работы партыйных кабінетаў, дык яна заключалася галоўным чынам у правядзенні групавых і індывідуальных кансультацый. Іх інтэнсіўнасць была дастаткова вялікай. Толькі ў Гомельскай вобласці за апошнія два з паловай месяцы

адбыліся 94 групавыя і 1268 індывідуальных кансультацый. Усе яны датычыліся зместу "Кароткага курса...". З праведзеных партыйнымі кабінетамі Магілёўскай вобласці 615 групавых кансультацый палова была выязднымі. Яны праходзілі ў сельскіх саветах і калгасах. Аднак у працэсе гэтай работы многія парткабінеты былі слаба звязаны з нізавымі партыйнымі ячэйкамі[1].

Адбывалася перабудова сістэмы партыйнай і камсамольскай вучобы. Калі ў Беларускай ССР да згаданай пастановы ЦК УКП(б) дзейнічала 2336 гурткоў, то пасля перабудовы іх засталося 278. Рабіўся націск на тое, каб склад слухачоў фарміраваўся пераважна на добраахвотных пачатках. У пастанове пленума ЦК КП(б)Б канстатавалася, што практыка прымусовага залічэння партыйных і непартыйных работнікаў у гурткі фактычна пераадолена[2].

Такая масіраваная кампанія па вывучэнню "Кароткага курса гісторыі УКП(б)", несумненна, садзейнічала засваенню тых дагматычных палажэнняў, якія ўтрымліваліся ў гэтым сталінскім выданні. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што прапагандысты аддавалі перавагу дакастрычніцкай частцы гісторыі партыі і стараліся менш выкладаць яе савецкі перыяд. Гэта было не выпадкова, таму што слухачы курсаў, іншых форм вучобы, несумненна, бачылі істотную розніцу паміж зместам гэтай кнігі і рэчаіснасцю, сведкамі якой яны з'яўляліся.

У сістэме ідэалагічнай апрацоўкі грамадзян асабліва важнае значэнне надавалася вывучэнню выказванняў Сталіна. Таталітарны бальшавіцкі рэжым павінен мець і меў свайго лідэра, культ асобы якога пераўзыходзіў усе магчымыя межы. У рэгіёнах адпаведна ствараліся і культы мясцовых кіраўнікоў. У БССР гэта ў першую чаргу адносілася да Гікала, які ўзначальваў кампартыю Беларусі ў 1932—1937 гг., а потым быў рэпрэсіраваны.

Характэрнай асаблівасцю грамадска-палітычнага, як і іншых сфер, жыцця быў шырокі і скрупулёзны кантроль за настроямі грамадства, у тым ліку розных яго сацыяльных пластоў. Паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца спецыяльная зводка, накіраваная кіраўніком карных органаў БССР Цанавай першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панамарэн-

[1] НАРБ, ф.4, воп. 20, спр. 195, арк. 121, 130, 133.
[2] Там жа, арк.136 — 138.



9. Зак. 5022

ку. Гэты дакумент быў складзены на аснове даных стопрацэнтнай апрацоўкі карэспандэнцыі за тры дні — 9 — 11 кастрычніка 1940 г. Апрацоўка пісем была зроблена з мэтаю выяўлення палітычных настрояў студэнцтва і іншых груп насельніцтва ў сувязі з пастановай савецкіх органаў аб ўвядзенні платнага навучання ў старэйшых класах сярэдніх школ і ў вышэйшых навучальных установах і аб зменах у парадку назначэння стыпендый, калі іх маглі мець толькі выдатнікі вучобы. У зводцы прыведзена шмат вытрымак з пісем, якія сведчылі аб адмоўных настроях іх аўтараў да адзначаных мерапрыемстваў савецкай улады. Характэрна, што разам з вытрымкамі ў спецзводцы прыведзены адрасы як тых, хто адпраўляў пісьмы, так і тых, хто павінен быў іх атрымаць[1]. Няцяжка здагадацца, што гэтыя людзі траплялі ў катэгорыю палітычна ненадзейных з усімі адсюль вынікамі.

Наогул тая падазронасць, якая была створана ў дзяржаве, ахоплівала ўсё грамадства — ад простых працаўнікоў да вярхоўнага кіраўніцтва. Паказальна, што нават самыя высокія кіраўнікі не давяралі свайму акружэнню і хавалі свае намеры. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць запіска, накіраваная Сталіным свайму калегу і сябру Варашылаву. Яна адносіцца да 30-х гадоў, верагодна, да 1937 г. У ёй Сталін пісаў: "Клім! Учора пры людзях, асабліва пры сваячцы (балбатушка) і дактарах (могуць прагаварыцца), не хацеў назваць дакладны тэрмін ад'езду. Цяпер паведамляю, што вырашыў даўно паехаць заўтра ў суботу. Гаварыць аб гэтым не трэба шырока: мы ўдваіх вельмі прывабны кусок, і папярэдзіць іх сваёю неасцярожнасцю не патрэбна. Значыць, калі ты згодзен, едзем заўтра ў 2 гадзіны. Я абяжу Юсіса з'явіцца нечакана да начальніка станцыі і загадаць яму прычапіць вагон без паведамлення аб ад'язджаючых асобах. Значыць, заўтра ў 2 гадзіны. Справу падрыхтуюць Юсіс і іншыя чэкісты"[2]. Гэты дакумент, які захоўваецца ў адным з архіваў Масквы, у фондзе Варашылава, выразна сведчыць аб той атмасферы падазронасці і недаверу, якая існавала ў вярхоўнага кіраўніка партыі і дзяржавы да свайго акружэння і нават сваякоў. Што ўжо тады гаварыць пра іншыя ўзроўні грамадства, якое ва ўсім арыентавалася на

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2097, арк.32.

[2] РЦЗВДНГ, ф.74, воп.2, спр.38, арк.91.

таго, чый культ асобы так моцна праяўляўся літаральна ва ўсіх сферах жыцця.

Аб некаторых баках бальшавіцкай формы праўлення ў другой палове 30-х гадоў аўтарытэтна засведчыў першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка ў пісьме сакратару ЦК УКП(б) Г. Малянкову, якое было накіравана 3 ліпеня 1939 г. Характарызуючы створаныя грамадска-палітычныя абставіны ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі, ён пісаў: кадры пісьменнікаў, мастакоў, скульптараў, артыстаў паспыталі на сабе "дзікія хуліганскія адносіны". У сярэдзіне 1938 г. яны былі ў стане творчай пасіўнасці і маральнай падаўленасці. Пісьменнікі і найбольш вядомыя артысты дайшлі да таго, што літаральна гадалі, хто з іх наступны будзе арыштаваны. Вакол гэтых людзей ствараліся абставіны іх аддаленасці ад партыі і савецкай улады.

"Агідная грубасць, вокрык і нават мат" сталі культываваецца як стыль работы апарату. Зацісканне самакрытыкі, нецярпімасць да якога б то ні было праяўлення актыўнасці, крытыкі і самакрытыкі камуністаў назіраліся паўсюдна. За рэплікі здымалі з работы.

На XVII з'ездзе КП(б)Б для даклада сакратару ЦК Волкаву па рэгламенту былі дадзены дзве гадзіны. Ён гаварыў шэсць гадзін, і калі адзін з ваенных у сваім выступленні сказаў, што даклад па зместу яго не зусім задавальняе, а па форме ён занадта доўгі, то дакладчык кваліфікаваў гэта "як вылазку класавага ворага" і запатрабаваў ад дэлегацыі вобласці ноччу сабрацца і абмеркаваць гэты ўчынак.

Такіх фактаў "дзікага самадурства", канстатаваў кіраўнік кампартыі Беларусі, можна прывесці незлічоную колькасць[1].

Дадзеная характарыстыка абставін у жыцці партыі, у тым ліку самых высокіх кіруючых органаў, сведчыць аб надзвычай цяжкім маральна-псіхалагічным клімаце, створаным у БССР, як і ва ўсёй краіне, у канцы 30-х гадоў. Гэта было характэрна не толькі для партыйнага асяроддзя, але і для іншых уладных структур. Да таго ж няўпэўненасць у заўтрашнім дні наглядалася не толькі ў многіх інтэлігентаў, але і ў прадстаўнікоў рабочага класа і сялянства. Калі пры гэтым улічыць надзвычай мажорную танальнасць афіцыйнай агітацыі і прапа-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1522, арк.7.

ганды, то агульная характарыстыка палітычнага стану тагачаснага грамадства будзе надзвычай складанай і супярэчлівай.

Такім чынам, грамадска-палітычнае жыццё з'яўлялася сферай, без авалодання якой нельга было разлічваць на ўсталяванне бальшавіцкага таталітарнага рэжыму, што і было зроблена. Паралельна з укараненнем камандных метадаў у сацыяльна-эканамічным развіцці адбывалася падпарадкаванне ідэалагічнай сферы. Дадзеныя працэсы ішлі адначасова, дапаўнялі і ўзмацнялі адзін аднаго. Гэта з'явілася вынікам мэтанакіраванай палітыкі, у ажыццяўленні якой БССР адводзілася адно з прыярытэтных месцаў.

## 4. Культурнае будаўніцтва: поспехі, наступленне на нацыянальныя адметнасці

З першых дзён існавання бальшавіцкая ўлада надавала важнае значэнне павышэнню культурнага ўзроўню працоўных. Гэта з'ўлялася натуральнай задачай, якую разумелі як кіраўнікі розных ўзроўняў, так і шырокія пласты народа, аднак змест, формы і, галоўнае, накіраванасць дадзенай працы з самага пачатку браліся пад строгі кантроль. Увесь працэс навучання і выхавання павінен быў быць прасякнуты прынцыпамі партыйнасці, класавасці і інш. Гэта ўжо пачыналася ў ходзе работы па засваенню навыкаў чытання і пісьма.

У справе павышэння граматнасці нямала было зроблена на працягу 20-х гадоў, што дасягалася як шляхам пашырэння навучання дзяцей, так і пераадолення непісьменнасці сярод дарослых. У выніку ў канцы 1926 г. удзельная вага пісьменных жыхароў БССР ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў павысілася да 53,1 % супраць 47,4 % у 1920 г.[1]

У 30-я гады такая работа была прадоўжана. Аднак бальшавіцкая таталітарная сістэма, якая набірала моц, праявіла сябе ў Беларускай ССР у гэтых адносінах даволі своеасабліва. У 1932 г. рэспубліканскае кіраўніцтва абвясціла БССР рэспублікай суцэльнай пісьменнасці, як быццам тут ужо ажыццёўлена ўсеагульнае пачатковае навучан-

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.129, 132.

не. На самай справе гэта было далёка не так. Яшчэ значная колькасць дзяцей і дарослых не валодалі граматай, патрэбны быў пэўны час, каб у асноўным дасягнуць жаданага становішча. Такое імкненне як мага хутчэй адрапартаваць Цэнтру — уласцівая рыса дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР.

Нярэдкае разыходжанне слоў і справы — адна з асаблівасцей функцыяніравання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Дадзеная рыса захавалася на працягу ўсяго перыяду існавання савецкай улады. Гэта праяўлялася не толькі ва ўзаемаадносінах паміж рэспубліканскім і саюзным кіраўніцтвам, але і ўнутры БССР, паміж партыйна-дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі розных узроўняў.

Нават праз значны адрэзак часу, у 1939 г., яшчэ каля 700 тыс. чалавек заставаліся ва Усходняй Беларусі непісьменнымі. Гэта складала 19,2 % усяго насельніцтва ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ва ўсходніх абласцях рэспублікі ў той ці іншай ступені валодалі граматай каля 85 % жыхароў[1]. З аднаго боку, гэта было ўнушальным дасягненнем, аднак з другога — нават у гэты час усеагульная пісьменнасць дасягнута не была нягледзячы на пераможныя рапарты амаль дзесяцігадовай даўнасці.

Характэрна, што кіраўнікоў бальшавіцкай таталітарнай улады не задавальняла сістэма адукацыі і выхавання, якая існавала ў Савецкім Саюзе ў пачатку 30-х гадоў. Яны лічылі, што яна недастаткова падтрымлівае існуючы лад, а тым больш той рэжым, які ствараўся. У выніку ў 1931 — 1935 гг. ЦК УКП(б) і СНК СССР прынялі шэраг пастаноў, згодна з якімі былі ажыццёўлены даволі істотныя змены ў структуры школ, арганізацыі іх працы, вучэбнай рабоце, ва ўнутраным распарадку. На бяскрайніх прасторах вялікай дзяржавы была ўсталявана адзіная школьная сістэма, якая функцыяніравала па строга аднолькавых правілах. Да таго ж былі значна зменены праграмы школьнага навучання і падручнікі. Гэта таксама было зроблена ў напрамку уніфікацыі зместу вучэбнага і выхаваўчага працэсу. Усе гэтыя змены моцна абмяжоўвалі творчы пошук настаўнікаў у выбары лепшых форм і метадаў навучання.

У БССР, як і ва ўсёй дзяржаве, асноўным тыпам

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.181.

агульнаадукацыйнай школы стала дзесяцігодка, што было важным дасягненнем. Увядзенне новай сістэмы навучання прывяло да рашучай адмовы ад ранейшых методык выкладання. Валявыя рашэнні не садзейнічалі рацыянальнаму падыходу да ўсталявання новых форм навучання, але такія дзеянні былі тыповымі для таталітарнай сістэмы бальшавікоў, якая ўсё больш умацоўвала свае пазіцыі ў грамадстве.

Што датычыць колькасных паказчыкаў, якія характарызавалі працэс навучання, як і ўсяго культурнага будаўніцтва, то яны пaступова павялічваліся. У прыватнасці, на працягу 1933 — 1937 гг. лік сямігадовых і сярэдніх школ узрос у БССР з 1619 да 1954. Паколькі асноўная частка насельніцтва жыла ў сельскай мясцовасці, тут і знаходзілася большасць школьных устаноў. За гэты час агульная колькасць сямігадовых і сярэдніх школ на вёсцы павялічылася з 1291 да 1588[1]. Усяго ў рэспубліцы ў 1937/38 навучальным годзе налічвалася 7132 агульнаадукацыйныя школы.

Наглядаўся значны рост колькасці вучняў. Да гэтага імкнуліся органы адукацыі, выконваючы рашэнні савецкай улады аб усеагульным ахопе навучаннем дзяцей школьнага ўзросту. І хоць гэта ў тых умовах з'яўлялася няпростай справай, тым не менш колькасць навучэнцаў няўхільна ўзрастала. У 1937/38 навучальным годзе яна перавысіла ў БССР 1 млн чалавек, што было ў два разы больш, чым у 1928/29 навучальным годзе. Асабліва інтэнсіўна павялічваўся ў гэты час кантынгент навучэнцаў у 5 — 10 класах. За ўказаны перыяд ён узрос у школах рэспублікі з 63,6 тыс. да 313,6 тыс чалавек[2].

Гэта было звязана з мерамі па ажыццяўленню ўсеагульнага пачатковага, а затым і сямігадовага навучання. Асабліва актывізавалася работа пасля таго, як XVII з'езд УКП(б) (1934) вырашыў ажыццявіць у бліжэйшы час усеагульнае абавязковае навучанне ў аб'ёме сямігадовай школы.

Развіццё школьнай адукацыі стварала базу для пашырэння вучобы ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Іх сетка паступова ўзрастала. У пачатку 1938 г. у Беларускай ССР дзейнічалі 23 вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе займалася

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3 С.584.

[2] Культурное строительство БССР. Мн., 1940. С.10 — 13.

звыш 15 тыс. студэнтаў. У гэты час у сістэме адукацыі налічвалася 96 тэхнікумаў і іншых спецыяльных навучальных устаноў з агульнай колькасцю навучэнцаў больш за 33 тыс. Акрамя стацыянарнага навучання развівалася і завочнае. Усімі яго формамі, што выкарыстоўваліся ў вышэйшых навучальных установах, тэхнікумах, а таксама на курсах, у гэты час было ахоплена звыш 20 тыс. чалавек. Паступлова павялічвалася і колькасць выпускнікоў. На працягу 1933 — 1937 гг. у рэспубліцы было падрыхтавана каля 7,5 тыс. спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі і каля 20 тыс. — сярэдняй.

Асабліва важнае значэнне надавалася падрыхтоўцы кадраў настаўнікаў, паколькі яны ў першую чаргу забяспечвалі навучальны працэс. Маштабы працы па падрыхтоўцы педагагічных кадраў паступлова нараталі. У 1937/38 навучальным годзе ў 11 вышэйшых педагагічных установах праходзілі падрыхтоўку амаль 6,3 тыс. чалавек, а ў 20 педтэхнікумах — амаль 10,9 тыс. На працягу 1933 — 1937 гг. у педагагічных інстытутах і тэхнікумах было падрыхтавана больш за 10,5 тыс. настаўнікаў.

Рыхтаваліся спецыялісты і іншых профіляў: інжынеры, кадры для сельскагаспадарчай вытворчасці, медыцынскія работнікі і г. д. У выніку значна папаўняліся рады інтэлігенцыі. Дастаткова сказаць, што на пачатак 1938 г. колькасць спецыялістаў у Беларускай ССР павялічылася да 48,4 тыс. чалавек[1].

У асноўным гэта былі людзі, падрыхтаваныя пры савецкай уладзе. Сярод іх зусім нязначную частку складалі тыя, хто атрымаў адукацыю ў дарэвалюцыйны час. Недавер партыйна-дзяржаўных улад да старых спецыялістаў, як і непрыняцце многімі з іх новых сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных парадкаў, значная эміграцыя за мяжу не садзейнічалі пераемнасці інтэлектуальнага патэнцыялу ў краіне, у тым ліку ў БССР. У многіх адносінах савецкая інтэлігенцыя фарміравалася без уліку традыцый, назапашаных у папярэднія часы.

Пэўная частка старых спецыялістаў — вучоных, дактароў, інжынераў, ваенных і іншых перайшла на бок савецкай улады і дапамагала яе ўмацаванню. Аднак жорсткі класавы падыход, абсалютызацыя пра-

[1]Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.594 — 596.

летарскага паходжання, бескампрамісnасць, непрыняцце самых нязначных адхіленняў ад партыйнай ідэалогіі і практыкі, а таксама іншыя прычыны такога тыпу адразу стварылі пэўную дыстанцыю паміж бальшавіцкай уладай і інтэлігенцыяй.

У 20-я гады ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі з яе адносным дэмакратызмам гэты разрыў крыху зменшыўся. Аднак ён не быў пераадолены з-за таго, што камуністычная партыя і савецкая ўлада не толькі стаялі ў грамадска-палітычным жыцці на ранейшых непрымірымых пазіцыях, але і садзейнічалі іх узмацненню. Гэта асабліва пачало праяўляцца пад канец 20-х гадоў, калі быў узяты курс на згортванне НЭПа і ўзмацненне аўтарытарных метадаў кіравання грамадствам. Дадзеная тэндэнцыя значна ўзмацнілася з пачатку 30-х гадоў. Яна праяўлялася не толькі ва ўсё большай цэнтралізацыі кіравання развіццём эканомікі, сацыяльнай сферы, грамадска-палітычнага жыцця, але і ва ўзрастаючай цэнтралізацыі і ідэалагічнай зададзенасці розных напрамкаў культурнага будаўніцтва.

Аднак самай характэрнай рысай бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў галіне культуры была барацьба з праявамі нацыянальнага развіцця. І гэта не выпадкова. Нацыянальныя адметнасці супярэчылі накіраванасці таталітарнага праўлення. Іх захаванне і тым больш далейшае развіццё сведчылі аб багатых традыцыях, звычаях, наогул культуры кожнага з народаў. Замацаванне і ўдасканаленне нацыянальных праяў аб'ектыўна прыводзіла да паступальнага развіцця нацый, што супярэчыла імкненням кіраўнікоў таталітарнай сістэмы, скіраваным на стварэнне новай супольнасці людзей — савецкага народа. Дадзенае супярэчанне вырашалася партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам на карысць палітыкі Цэнтра, і толькі ў некаторых выпадках рабіліся ўступкі нацыянальнаму развіццю, калі гэта было вельмі неабходна.

Непрыняцце ўсяго нацыянальнага, нават варожасць да яго, якая значна вырасла ў пачатку 30-х гадоў, фактычная вайна нацыянальным праявам з боку кіраўнікоў камуністычнай партыі і савецкай улады — усё гэта ўзмацнілася ў сувязі з развіццём нацыянальных культур, што мела месца ў многіх рэспубліках, у тым ліку ў БССР, у 20-я гады. Асноўнай часткай дадзенага працэсу было правядзенне палітыкі беларусізацыі. Як і палітыка ўкраінізацыі і іншыя, яна была вынікам пэўных абяцанняў і канк-

рэтных дзеянняў савецкіх кіраўнікоў па стварэнню нацыянальных рэспублік, а таксама грамадска-палітычных абставін, якія ўзніклі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі. Аднак гэтыя ўмовы мелі кароткатэрміновы характар. Яны з'яўляліся перашкодай на шляху ўсталявання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы і валявымі метадамі былі адкінуты.

На практыцы гэта выразілася ў акцыях рэпрэсіўнага характару. У БССР дадзеная палітыка праявілася ў барацьбе з так званым нацыянал-дэмакратызмам, якая вялася ў канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў. Аднак ідэалагічная падрыхтоўка да яе пачалася кіраўніцтвам кампартыі Беларусі значна раней. Яна фактычна адносілася да сярэдзіны 20-х гадоў і грунтавалася на агульнапартыйных падыходах да вырашэння нацыянальнага пытання і праблем культурнага развіцця.

Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца выказванне І.Сталіна, зробленае ім 25 красавіка 1923 г. Выступаючы на XII з'ездзе РКП(б) з заключным словам па дакладу "Аб нацыянальных момантах у партыйным і дзяржаўным будаўніцтве", ён заявіў: "Неабходна помніць, што акрамя права народа на самавызначэнне ёсць яшчэ права рабочага класа на ўмацаванне сваёй улады, і гэтаму апошняму праву падпарадкавана права на самавызначэнне. Бываюць выпадкі, калі права на самавызначэнне ўступае ў супярэчнасць з іншым, вышэйшым правам — правам рабочага класа, які прыйшоў да ўлады, на ўмацаванне сваёй улады. У такіх выпадках — аб гэтым неабходна сказаць прама — права на самавызначэнне не можа і не павінна служыць перашкодай справе ажыццяўлення права рабочага класа на сваю дыктатуру. Першае павінна адступіць перад другім"[1].

Далей у заключным слове ён працягваў: "...Раздаючы ўсялякія абяцанні нацыяналам... неабходна памятаць, што сфера дзейнасці нацыянальнага пытання і межы, так сказаць, яго кампетэнцыі абмяжоўваюцца пры нашых знешніх і ўнутраных умовах сферай дзейнасці і кампетэнтнасці "рабочага пытання" як асноўнага з усіх пытанняў"[2].

Пры гэтым І.Сталін абапіраўся не толькі на выказванні У.Леніна, але і на яго спасылку на К.Мар-

---

[1] *Сталин И*. Соч. Т.5. С.265.

[2] Там жа, С.265 — 266.

кса. Як вядома, у працы "Аб праве нацый на самавызначэнне" У. Ленін канстатаваў: "У параўнанні з "рабочым пытаннем" падпарадкаванае значэнне нацыянальнага пытання не падлягае сумненню для Маркса"[1]. Прывёўшы гэтыя словы, І.Сталін шматзначна дабавіў: "Тут усяго два радкі, але яны вырашаюць усё. Вось гэта патрэбна зарубіць сабе на носе некаторым не па розуму стараннным таварышам"[2].

К сярэдзіне 20-х гадоў гэта ўжо была адпрацаваная палітыка, якая прыводзілася ў дзеянне як у Цэнтры, так і на месцах. У рашэннях VII з'езда кампартыі Беларусі, які адбыўся ў сакавіку 1923 г., выказвалася занепакоенасць тым, што ў нашых культурна-асветных установах наглядаецца засілле некамуністычных, дробнабуржуазных, нацыяналістычных элементаў, якія выкарыстоўваюць права свабоднага развіцця нацыянальнай культуры ў мэтах свядомага накіравання гэтай работы ў бок развіцця вузкага нацыяналізму і ажыццяўлення нацыяналістычных ідэалаў, адраджэння буржуазна-дэмакратычнай дзяржаўнасці.

Істотную ролю ў падрыхтоўцы барацьбы з нацыянальнай беларускай культурай і яе носьбітамі адыграў Крыніцкі, які ў 1924 — 1927 гг. узначальваў КП(б)Б. Выступаючы 18 верасня 1925 г. на сходзе бюро ячэйкі Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі, ён заявіў, што адзначаецца непазбежнае пры росце гаспадаркі павелічэнне імкнення некаторых элементаў дробнабуржуазнай інтэлігенцыі да нацыянальна-дэмакратычнай платформы, асабліва пад уплывам заможнага сялянства, яго эканамічнага і культурнага росту, павышэння палітычнай актыўнасці[3].

Практычна праз год, выступаючы 25 верасня 1926 г. з дакладам на сходзе актыву Мінскай гарадской арганізацыі кампартыі Беларусі, ён зноў звярнуўся да гэтай тэмы і заявіў, што «... актыўнае правядзенне беларусізацыі будзе ўздымаць у некаторай часткі беларускіх работнікаў праявы беларускага нацыяналізму...»[4] Характэрна, што гэтыя настойлівыя заявы рабіліся ў разгар работы па ажыццяўленню афіцыйна аб'яўленай палітыкі беларусізацыі.

---

[1] *Ленин В. И.* Полн. собр. соч. Т.25. С.301.

[2] *Сталин И.* Соч. Т.5. С.266.

[3] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.145.

[4] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2544, арк.11.

У пачатку другой паловы 20-х гадоў задача барацьбы з праявамі нацыянал-дэмакратызму неаднаразова ставілася не толькі пленумамі ЦК КП(б)Б, але і з'ездамі кампартыі Беларусі. Гэта была прадуманая лінія. З улікам той напорыстасці і паслядоўнасці, з якімі яна прапагандавалася, было зразумела, што палітыка беларусізацыі мае часовы характар і што будуць зроблены канкрэтныя і рашучыя крокі па яе пераадоленню.

Ідэалагічная падрыхтоўка наступлення на палітыку беларусізацыі і прадстаўнікоў беларускага "нацыянал-дэмакратызму" пад канец 20-х гадоў пачала праяўляцца ў канкрэтных дзеяннях. На вераснёўскім пленуме ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў 1928 г., было прапанавана шырока разгарнуць крытыку дробнабуржуазнай ідэалогіі, весці рашучую барацьбу супраць усіх праяў антыкамуністычнай ідэалогіі і немарксісцкіх ухілаў у дзейнасці ўстаноў БССР[1].

Затым былі зроблены захады да гэтай барацьбы. Іх ініцыятарамі з'яўляліся цэнтральныя партыйныя органы. Менавіта яны накіравалі ў БССР камісію ЦКК УКП(б), якую ўзначальваў старшыня ЦКК кампартыі Украіны В. Затонскі. Камісія мела на мэце абследаванне практыкі правядзення нацыянальнай палітыкі ў рэспубліцы. Яна знаходзілася ў БССР даволі працяглы тэрмін — з 9 мая да канца чэрвеня 1929 г. Па выніках працы камісія прадставіла аб'ёмісты даклад, у якім дала шырокі агляд становішча спраў у Беларускай ССР у канцы 20-х гадоў, у першую чаргу па пытаннях практыкі правядзення нацыянальнай работы. Асноўная ўвага была засяроджана на ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі. У асобных раздзелах даклада разглядаліся пытанні беларусізацыі дзяржапарату, прафсаюзаў, кампартыі, камсамола, Чырвонай Арміі. Найбольш значны раздзел даклада — "Назіранні і заўвагі з галіны нацыянальнай ідэалогіі".

Характарыстыкі камісіі вызначаліся катэгарычнасцю. Было адзначана, што ў палітычным жыцці БССР рэзка кідаецца ў вочы непамерна высокая роля культурных сіл — навуковых работнікаў, літаратараў, іншых дзеячаў. Камісія прызнала, што працэс развіцця беларускай мовы праходзіць нармальна і

---

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Мн.,1984. Т.2. С.66.

што сама мова з'яўляецца, несумненна, магутным рычагом, які дапамагае шырокім масам у культурным развіцці. Новыя паняцці на беларускай мове ўспрымаюцца карэнным беларускім насельніцтвам непараўнальна лягчэй, чым калі б да іх звярталіся па-руску. І гэта нягледзячы на тое, што паланізацыя закранула толькі вышэйшыя пласты беларускага грамадства, а працэс русіфікацыі вельмі глыбока захапіў і нізы.

У адносінах да беларускай інтэлігенцыі пазіцыі камісіі вызначаліся імкненнем да яе расслаення па розных напрамках — палітычных поглядах, ступені ўплыву на грамадска-палітычнае жыццё і інш. Рабіўся вывад, што вярхушка інтэлігенцыі пры адноснай слабасці пралетарскай базы на Беларусі іграе непамерна вялікую ролю, з яе настроямі лічацца, надаецца шмат увагі, каб дабіцца ад таго ці іншага прадстаўніка інтэлігенцыі станоўчага водгуку аб савецкай уладзе.

Практыка правядзення нацыянальнай палітыкі ў рэспубліцы ўвязвалася са становішчам у сельскай гаспадарцы. У прыватнасці, камісія разглядала палітыку ў адносінах да заможнай часткі вёскі ў параўнанні са станам нацыянальнага пытання, адзначыўшы, што кулацкае наступленне на ідэалагічным фронце Беларусі адчуваецца найбольш моцна, магчыма, нават мацней, чым у іншых частках СССР, што змест кулацкага наступлення ўсё больш прымае нацыянальныя формы. Гэта тым больш цікава, зазначыла камісія, што на Беларусі да рэвалюцыі нацыяналізм шырокага распаўсюджання не меў, шырокія масы беларускага сялянства да гэтага часу не дайшлі да нацыянальнай самасвядомасці, што асабліва выразна кідаецца ў вочы пры параўнанні з украінцамі[1].

27 чэрвеня 1929 г. Затонскі выступіў на бюро ЦК КП(б)Б з асноўнымі вывадамі, да якіх прыйшла камісія ў працэсе сваёй работы. Пры іх абагульненні ён заўважыў: "Вы з нацыяналістамі вельмі шмат важдаецеся. Я разумею, быў час, калі прыязджалі з-за мяжы эмігранты, неабходна было для знешняга свету іх прымаць, садзіць ва ўстановы... Я разумею, што быў час, калі патрэбна было іх выкарыстоўваць для сваіх мэт, правільна рабілі, але таптацца вакол іх нельга бясконца. Цяпер 1929 год. Вельмі ў вас зацягнулася гэта справа"[2].

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.85, спр.365, арк.1 — 111.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.199, арк.34.

У выступленні была звернута ўвага на некаторых найбольш вядомых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. Аказваецца, як заўважыў старшыня камісіі, яшчэ на X з'ездзе КП(б)Б Крыніцкі адзначаў "няправільнасці" ў напісанні гісторыі Беларусі Ігнатоўскім. Жылуновіча Затонскі кваліфікаваў так, што па лініі наркамасветы ён — галоўны стараста, таму небяспечны ўдвайне і ўтрайне. Не таму што ў яго ўстаноўка прынцыпова няправільная, антысавецкая, антымарксісцкая. Гэта цвёрдая ўстаноўка тыпова адраджэнца, якога з тактычных меркаванняў можна было трымаць у партыі, але якому нельга было даваць волі[1]. Падобныя характарыстыкі ў многім прадвызначылі яго далейшы лёс.

Даклад камісіі быў накіраваны ў ЦК і ЦКК УКП(б), у тым ліку асабіста Сталіну. Акрамя таго, яе старшыня даводзіў адпаведную інфармацыю ў цэнтральныя партыйныя органы. Вывады камісіі з'явіліся важнай падставай для тых абвінавачванняў, якія былі прад'яўлены шмат каму з беларускай навуковай і творчай інтэлігенцыі ў канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў. Накіраванне ЦКК УКП(б) у БССР дадзенай камісіі можна разглядаць як адну з мер па падрыхтоўцы расправы над беларускай інтэлігенцыяй.

Зыходзячы з вывадаў камісіі і з ўлікам шматгадовай падрыхтоўкі да барацьбы, у 1929 г. кіраўніцтва кампартыі Беларусі прыняло ўстаноўку на тое, што нацыянал-дэмакратызм з'яўляецца галоўнай небяспекай на дадзеным этапе развіцця[2].

Для непасрэднага правядзення гэтай барацьбы былі зроблены адпаведныя змены ў кіраўніцтве Беларускай ССР. Першым сакратаром ЦК КП(б)Б стаў К. Гей. У сярэдзіне 1930 г. паўнамоцнае прадстаўніцтва АДПУ па рэспубліцы ўзначаліў прысланы з Масквы Р. Рапапорт. Пад іх непасрэдным кіраўніцтвам была "раскрыта" "нацдэмаўская, контррэвалюцыйная, антысавецкая арганізацыя", якая атрымала кодавую назву "Саюз вызвалення Беларусі" — СВБ.

Па дадзенай справе было арыштавана 108 чала-

---

[1] Там жа, арк.29, 31.

[2] Там жа, спр.243, арк.21.

век — буйных вучоных, літаратараў, іншых прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Фактычна першай ахвярай гэтай ганебнай кампаніі стаў У.М.Ігнатоўскі — вядомы вучоны-гісторык і грамадскі дзеяч БССР, былы кіраўнік Наркамзема, затым Наркамасветы рэспублікі, старшыня Інбелкульта, першы прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук, першы дырэктар Інстытута гісторыі, член бюро ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР. Абвінавачаны ў "нацыянал-апартунізме", у прыналежнасці да СВБ, зняты з усіх пасад, выведзены з выбарных органаў, выключаны з партыі, ён застрэліўся 4 лютага 1931 г.

Рашэннем калегіі АДПУ па БССР ад 18 сакавіка 1931 г. нарком земляробства рэспублікі Д. Ф. Прышчэпаў, нарком асветы А. В. Баліцкі і некаторыя іншыя абвінавачаныя былі прыгавораны да 10 гадоў канцлагераў. 10 красавіка таго ж года былі вынесены пазасудовыя прыгаворы яшчэ 86 арыштаваным. Большасць з іх атрымала ад трох да пяці гадоў турэмнага зняволення. Толькі на 18 чалавек справу спынілі[1]. Але ў недалёкім будучым большасць з асуджаных і нават вызваленых зноў была арыштавана і іх напаткаў трагічны лёс сталінскіх ахвяр.

Аднак колькасць вядучых беларускіх нацыянальных дзеячаў, што мелі непасрэднае дачыненне да справы "Саюза вызвалення Беларусі", з'яўлялася большай, чым лік тых, каго судзіла калегія паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па Беларускай ССР. У першую чаргу гэта адносіцца да выдатнага песняра беларускага народа Янкі Купалы. Трапіўшы пад жорсткі прэс карных органаў, 20 лістапада 1930 г. ён зрабіў спробу самазабойства. Вось як аб гэтым пісаў на наступны дзень кіраўнік кампартыі Беларусі Гей сакратару ЦК УКП(б) Постышаву: ён лічыць неабходным паведаміць, што ўчора раніцай зрабіў пакушэнне на самазабойства Янка Купала — народны паэт Беларусі. Замах на жыццё быў не сур'ёзным. Купала нанёс сабе удар перачынным нажом у правы бок. Жыццё яго па-за небяспекай, і калі не будзе ўскладненняў, то дзён праз пяць ён будзе здаровы.

Звяртае на сябе ўвагу характарыстыка ролі Янкі Купалы ў сувязі са справай "Саюза вызвалення Беларусі". У пісьме адзначаецца, што Купала ўваходзіў у кіруючы цэнтр арганізацыі. Аб гэтым свед-

[1] *Міхнюк У.* Захоўваць вечна: справа № 20951-С // Маладосць. 1992. № 6. С.111 — 112.

чаць паказанні некаторых абвінавачаных. Ён з'яўляўся "ідэйным цэнтрам нацдэмаўскай контррэвалюцыі", што знайшло адлюстраванне ў яго творчасці. Разам з творамі яўна савецкімі ў яго маюцца вершы і кулацкага і прама контррэвалюцыйнага зместу. Далей у пісьме канстатуецца, што ў АДПУ Я.Купала настойліва адмаўляў сваю прыналежнасць да якой бы то ні было контррэвалюцыйнай арганізацыі і не выказаў ніякага жадання пайсці насустрач нам у сэнсе хаця б асуджэння контррэвалюцыйнай дзейнасці сваіх сяброў — удзельнікаў і кіраўнікоў СВБ.

Незадоўга да 20 лістапада Я. Купала пачаў падаваць прыкметы некаторых хістанняў. Аднак гэта не знайшло адлюстравання ў яго «перадсмяротным» пісьме. Яно адрасавана Чарвякову і ўтрымлівае сцвярджэнне, што ён не быў у контррэвалюцыйнай арганізацыі. Затым Купала спрабуе апраўдаць свой верш, у якім ухваляецца Пілсудскі, а таксама просіць паклапаціцца аб яго сям'і.

Усё гэта здарэнне, кваліфікаваў Гей, разглядаецца як пратэст супраць палітыкі барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам. Было вырашана не патрабаваць ад Я. Купалы прызнання ўдзелу ў СВБ і засяродзіць усе намаганні на тым, каб ён выступіў з адкрытым асуджэннем контррэвалюцыйнай дзейнасці групы беларускіх інтэлігентаў, арыштаваных па справе СВБ. На яго думку, гэта ім удасца[1] . Як вядома, кіраўнік кампартыі Беларусі моцна памыліўся ў сваім прагнозе. Народны паэт Беларусі, прарок беларускага народа і яго гонар, хоць і з цяжкасцю, але вытрымаў націск партыйных і карных органаў і не выступіў з асуджэннем сваіх калег за тую справу, якую ён поўнасцю падзяляў і падтрымліваў.

Сфабрыкаваная справа "Саюза вызвалення Беларусі" была самай маштабнай з усіх спраў такой накіраванасці, што меліся ў актыве бальшавіцкіх карных органаў. Менавіта Беларуская ССР стала своеасаблівым і найбольш значным палігонам для адпрацоўкі сродкаў і метадаў барацьбы з нацыянальнымі праявамі ў развіцці культуры. Разлік быў просты: талерантныя беларусы больш спакойна, чым іншыя, успрымуць такую палітыку, тыя гвалт і здзекі над самымі аўтарытэтнымі носьбітамі нацыянальнай культуры.

Некалькі раней, чым у Беларускай ССР,

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.233, арк.8а.

аналагічная справа была сфабрыкавана на Украіне. Яна называлася "Спілка вызволення Украіны". Аднак маштаб украінскай справы быў меншым, чым у БССР. На працэсе, які праходзіў у Харкаве з 9 сакавіка па 17 красавіка 1930 г., на лаве падсудных знаходзіліся 45 дзеячаў украінскай культуры. Асноўная іх частка атрымала розныя тэрміны зняволення.

Характэрнай асаблівасцю арганізацыі спраў абодвух гэтых "саюзаў" быў моцны кантроль з боку цэнтральных партыйных органаў. У прыватнасці, у час падрыхтоўкі працэсу над "Саюзам вызвалення Украіны" палітбюро ЦК УКП(б) 25 студзеня 1930 г. разгледзела пытанне аб яго арганізацыі і накіраванасці. У ходзе працэсу цэнтральны выканаўчы партыйны орган зноў вярнуўся да гэтага пытання 5 красавіка 1930 г. Была прынята пастанова, у якой у асноўным ухваляліся прапановы ЦК кампартыі Украіны аб прыгаворах па справе СВУ. Пры гэтым было вырашана не пагадзіцца з думкай украінскіх партыйных кіраўнікоў аб змякчэнні прыгавору галоўным абвінавачаным. Палітбюро даручыла на аснове матэрыялаў працэсу напісаць некалькі фельетонаў, у якіх у адпаведнай форме даваліся б адказы на пытанні аб незалежнасці Украіны, аб тым, як яе прадавалі ўкраінскія нацыяналісты палякам, і г. д. Пастанова арыентавала таксама на выкарыстанне пры выкананні дадзенага задання паказанняў падсудных, вытрымак з іх прамоў і інш. Фельетоны неабходна было перавесці на замежныя мовы[1].

Не меншым, а, магчыма, больш пільным быў нагляд цэнтральных партыйных органаў за вядзеннем справы "Саюза вызвалення Беларусі". 15 кастрычніка 1930 г. палітбюро ЦК УКП(б) разгледзела заяву першага сакратара ЦК кампартыі Беларусі Гея і старшыні Савета Народных Камісараў БССР Галадзеда. У сувязі з ёю працавала камісія ў складзе Постышава, Мянжынскага, Гея, Янсона. На гэтым пасяджэнні палітбюро былі разгледжаны яе прапановы, да якіх зрабілі шэраг паправак. Прынятае рашэнне зводзілася да наступнага:

па заканчэнні выбараў у Польшчы надрукаваць кароткае паведамленне аб арышце ў Мінску контрэвалюцыйнай групы інтэлігенцыі;

пытанне аб накіраванні справы СВБ паставіць на пасяджэнне палітбюро па заканчэнні следства;

---

[1] РЦЗВДНТ, ф.17, воп.162, спр.8, арк.129.

былога кіраўніка Наркамасветы БССР Баліцкага і былога намесніка кіраўніка Наркамзема Адамовіча выключыць з партыі як чужы элемент, які ў сваёй дзейнасці іграў на руку контррэвалюцыйнай арганізацыі СВБ. Выслаць Баліцкага, Адамовіча і Прышчэпава з Беларусі;

Ігнатоўскага (прэзідэнта Беларускай Акадэміі навук) вывесці са складу бюро ЦК і ЦКК КП(б)Б і перадаць на разгляд ЦКК КП(б)Б пытанне аб яго паводзінах у адносінах да ўдзельнікаў контррэвалюцыйнай арганізацыі і аб сувязях з імі;

справу Жылуновіча перадаць у ЦКК КП(б)Б;

даручыць бюро ЦК КП(б)Б дабіцца выступленняў шэрагу беспартыйных інтэлігентаў-нацыяналаў з асуджэннем поглядаў і дзейнасці арыштаваных па справе СВБ;

па прычыне таго, што ў працэсе следства па справе СВБ выявіліся акалічнасці, якія дыскрэдытуюць Васілевіча як кіруючага партыйнага работніка, лічыць немагчымым пакідаць яго на пасадзе другога сакратара ЦК КП(б)Б і адклікаць у распараджэнне ЦК УКП(б);

дазволіць накіраваць на кіруючую работу ў Беларусь Шаранговіча пасля таго, як будзе знойдзена адпаведная замена[1].

З улікам вопыту арганізацыі працэсу над "Саюзам вызвалення Украіны" і беспадстаўнасці абвінавачванняў вядучых беларускіх нацыянальных дзеячаў кіраўніцтва кампартыі Беларусі не асмелілася ісці на арганізацыю працэсу па справе СВБ. Першы сакратар ЦК КП(б)Б Гей у пісьме, накіраваным 15 снежня 1930 г. у палітбюро ЦК УКП(б), адзначаў: у сувязі з заканчэннем следства па справе "Саюза вызвалення Беларусі" неабходна вырашыць пытанне аб далейшым накіраванні гэтай справы. Найбольш мэтазгодным уяўляецца закончыць яго пастановай калегіі АДПУ без судовага працэсу. Разам з заканчэннем гэтай справы ён прасіў дазволу надрукаваць шэраг паказанняў абвінавачаных. Справа ў тым, што паведамленне аб арышце контррэвалюцыйнай інтэлігенцкай групы нацыянал-дэмакратаў, надрукаванай згодна з пастановай палітбюро, выклікала ў некаторых пластах інтэлігенцыі вядомае здзіўленне. Неабходна раскрыць сапраўдную контррэвалюцыйную дзейнасць СВБ, каб палегчыць работу галоўным чынам сярод сялянства і інтэлігенцыі.

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.9, арк.47.

Адначасова вельмі пажадана, каб пасля рашэння калегіі АДПУ надрукаваць кароткае паведамленне аб гэтай пастанове ў той частцы, якая датычыць Лёсіка, Некрашэвіча, Ластоўскага, Цвікевіча і Краскоўскага. Да дадзенага пісьма прыкладваліся вытрымкі з паказанняў абвінавачаных, якія меркавалася надрукаваць[1].

Характэрна, што вышэйшы выканаўчы партыйны орган — палітбюро ЦК УКП(б) — на сваім пасяджэнні 15 студзеня 1931 г. прыняў кароткую пастанову: "Пагадзіцца з прапановамі беларусаў па справе СВБ"[2].

Аднак на гэтым пільны нагляд цэнтральных партыйных органаў за справай "Саюза вызвалення Беларусі" не закончыўся. Яе аналізавалі вышэйшыя кантрольныя партыйныя органы. У прыватнасці, аб гэтым сведчыць рэзалюцыя прэзідыума Цэнтральнай кантрольнай камісіі УКП(б), прынятая 25 сакавіка 1931 г. і прысвечаная справе "беларускіх нацдэмакратаў". Членаў прэзідыума ЦКК непакоіла тое, што погляды прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі датычыліся адзінства нацыі, адмаўлення наяўнасці эксплуатататарскіх класаў і класавай барацьбы ў беларускім грамадстве, што яны быццам бы арыентаваліся на капіталістычны Захад у супрацьлегласць пралетарскай Маскве, рабілі стаўку на кулака і г. д. Яшчэ больш членаў цэнтральнага кантрольнага органа партыі абуралі дзеянні, якія ажыццяўлялі прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі Беларускай ССР у выдавецтвах, акадэмічнай навуцы, сістэме перападрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў і ў іншых галінах[3].

Пасля здзяйснення спраў "Саюза вызвалення Беларусі", "Саюза вызвалення Украіны" і іншых наступленне на ўсё нацыянальнае рэзка ўзмацнілася. Аднак улады не маглі не ўлічваць пры гэтым ступень развіцця нацыянальнай свядомасці і гістарычнай памяці народаў. Самы слабы паказчык у гэтых адносінах быў у беларускага народа. Таму менавіта ў Беларускай ССР наступ на вынішчэнне ўсяго нацыянальнага з'яўляўся асабліва бесцырымонным і жорсткім. Перш за ўсё гэта датычылася згортвання палітыкі беларусізацыі.

Істотная роля тут належала непасрэдным выканаўцам афіцыйнай лініі — работнікам партыйных і

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.233, арк.112.

[2] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.9, арк.116.

[3] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.946, арк.6 — 8.

дзяржаўных структур, некаторым прадстаўнікам інтэлігенцыі. Характэрная, аднак, такая акалічнасць. Паколькі палітыка беларусізацыі ў сярэдзіне 20-х гадоў была афіцыйна аб'яўлена на рэспубліканскім партыйным і дзяржаўным узроўні, а затым не было ніякіх рашэнняў аб яе адмене і згортвалася яна ў рабочым парадку, асабліва ў ходзе сфабрыкаванай справы "Саюза вызвалення Беларусі", дык некаторыя работнікі ідэалагічнага фронту, не маючы канкрэтных афіцыйных рашэнняў аб адмене беларусізацыі, працягвалі (ва ўсякім разе на словах) весці гэту лінію.

Характэрнай у гэтых адносінах з'яўляецца дакладная запіска загадчыка культурна-прапагандысцкага аддзела ЦК КП(б)Б Тамаркіна кіраўніку кампартыі Беларусі Гікала, напісаная ў канцы 1933 г. Гэты дакумент вядомы пад назвай "Аб фактах вялікадзяржаўных скажэнняў у правядзенні нацыянальнай палітыкі партыі і ігнараванні правядзення беларусізацыі". Дасведчаны аўтар адзначае, што ў пераважнай большасці абследаваныя арганізацыі не ставілі і па-бальшавіцку не змагаліся за ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, а пускалі гэтую важнейшую партыйную справу на самацёк і абязлічванне. У падтрымку дадзенай думкі прыведзены канкрэтныя факты, у прыватнасці тое, што ў Беларускім політэхнічным інстытуце выкладчык Міхалковіч пераконваў студэнтаў у наступным: сутнасць спрашчэння беларускага правапісу заключаецца ў яго набліжэнні да правапісу ў рускай мове. Выкладчык беларускай мовы Бранявіцкі спрабаваў даказаць, што праз набліжэнне беларускай мовы да рускай адбываецца рух да інтэрнацыяналізму.

Далей у дакладной сцвярджалася, што ад набліжэння беларускай мовы да рускай вялікадзяржаўнікі пераходзяць да больш адкрытага наступлення, у прыватнасці на беларускую кнігу. Начальнік прапагандысцка-агітацыйнага аддзела Гомельскага гарадскога савета Шапіра адмовіўся распаўсюджваць сярод гомельскіх рабочых літаратуру на беларускай мове, спасылаючыся на тое, што яны яе не ведаюць. Заканчвалася дакладная канстатацыяй фактаў, што ў справаводстве шэрагу арганізацый (Белкаапсаюз, Дзяржбанк, гарадскі савет) беларуская мова замяняецца рускай. У якасці прыкладу прыводзіўся факт,

як старшыня Белкаапсаюза Туркевіч, які добра ведаў беларускую мову, апраўдваў яе замену рускай тым, што "карыстанне беларускай мовай ёсць праява нацдэмакратызму"[1].

Гэты дакумент дастаткова яскрава ілюструе становішча ў першай палове 30-х гадоў у галіне культурнага будаўніцтва і нацыянальнай палітыкі, калі без канкрэтных афіцыйных рашэнняў аб адмене палітыкі беларусізацыі (і гэта было не выпадкова) на практыцы атрымлівалася своеасаблівае спалучэнне ў выкарыстанні як беларускай, так і рускай моў. Аднак перавага ўсё больш аддавалася рускай мове. Гэта рабілася на самых розных узроўнях не толькі партыйна-дзяржаўных структур, але вышэйшых навучальных і іншых установ.

Дадзеная практыка спалучалася з ганьбаваннем у перыядычным друку дзеячаў беларускай нацыянальнай культуры, якіх залічылі ў "Саюз вызвалення Беларусі". У прыватнасці, у канцы 1933 г. у адным са сваіх перадавых артыкулаў орган ЦК КП(б)Б газета "Звязда" клеймавала тых, хто хацеў працягваць лінію Ігнатоўскіх, Баліцкіх, Ластоўскіх, Лёсікаў. У матэрыяле таксама "абгрунтоўвалася" лінія на тое, чаму "галоўны агонь" павінен быць сканцэнтраваны "на мясцовым нацыяналізме"[2].

У культурным будаўніцтве 30-х гадоў, калі пераважала лінія на вынішчэнне ўсяго нацыянальнага, выключную ролю адыгрывала асноўнае патрабаванне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы да развіцця культуры ў Савецкім Саюзе. Згодна з ім, культура павінна быць "сацыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме". Усё пачало зводзіцца ў першую чаргу да ідэйнай накіраванасці розных форм мастацтва, г. зн. толькі да апраўдання савецкай рэчаіснасці, а затым і да яе ўхвалення. Фактычна выключаліся любыя праяўленні крытыкі. Змест культурнага развіцця быў строга уніфікаваны як у літаратуры, так і ў розных галінах мастацтва. Нацыянальнае магло мець пэўныя праявы толькі ў формах развіцця культуры. Аднак і яны знаходзіліся пад пільным кантролем партыйных, дзяржаўных і карных структур.

У ганебнай справе вынішчэння ўсяго нацыянальнага ў культуры вялікае значэнне надавалася не толькі

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.227, арк.84 — 85.

[2] Звязда. 1933, 8 снеж.

падрыхтоўцы адпаведных кадраў, але і татальнаму палітычнаму вышуку за работнікамі адукацыі, культурна-асветных устаноў. Напрыклад, пад пільным наглядам знаходзілася настаўніцтва. Згодна з матэрыяламі НКУС БССР, за чэрвень 1938 г. у выніку тайнай праверкі 1057 настаўнікаў горада Мінска на 266 меліся кампраметуючыя матэрыялы: як быццам яны з'яўляліся выхадцамі з сацыяльна чужога асяроддзя ці мелі антысавецкія погляды. Такі кампрамат на настаўнікаў меўся ў абласцях і раёнах[1].

Важную ролю ў распаўсюджанні культурных каштоўнасцей сярод насельніцтва адыгрывалі культурна-асветныя ўстановы. Іх колькасць няўхільна павялічвалася. Калі ў 1928 г. у рэспубліцы налічвалася 266 клубаў і 461 хата-чытальня, дык у 1940 г. — адпаведна 1766 і 1387. Колькасць масавых бібліятэк на працягу 1929 — 1940 гг. павялічылася з 631 да 3716, а кніг — з 1,5 да 3,9 млн. Гэта былі ўнушальныя дасягненні, аднак змест літаратуры і працы культурна-асветных устаноў усё больш падпарадкоўвалі ідэалагічным патрабаванням. У канцы 30-х гадоў гэта звязвалася з "Кароткім курсам гісторыі УКП(б)".

Характэрна, што нават у той час у БССР удзельная вага выданняў на беларускай мове была даволі значнай. У 1938 г. у рэспубліцы выдавалася 149 рэспубліканскіх, абласных, раённых і шматтыражных газет на беларускай мове з агульнай колькасці ў 199 выданняў. Значную ўдзельную вагу займалі беларускамоўныя кнігі. На працягу 1928 — 1938 гг. агульны тыраж выдадзенай у рэспубліцы літаратуры павялічыўся з 2,2 млн да 14, 7 млн экземпляраў, з іх на беларускай мове — з 1,8 млн да 12, 3 млн[2].

Асноўная ўвага ва ўсіх выданнях, асабліва ў беларускамоўных, звярталася на іх ідэалагічную накіраванасць. Яна павінна была адпавядаць тым падыходам, якія дыктаваліся партыйна-дзяржаўнымі органамі. Асноўную ролю ў ажыццяўленні нагляду выконваў Галоўлітбел. Ён рабіў аналіз перыёдыкі і кніжных выданняў з боку ідэалагічнай вытрыманасці. У прыватнасці, 11 лістапада 1932 г. быў падрыхтаваны агляд беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісаў і газеты "Літаратура і мастацтва" за бягучы год. У падрабязным і шматслоўным дакуменце выказана

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 1400, арк. 7.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. Т.2. С.180 — 182.

нямала заўваг, перш за ўсё палітычнага характару, у адрас розных выданняў і іх аўтараў[1]. Такія агляды рабіліся сістэматычна. Пры гэтым ацэнкі ўсё больш станавіліся жорсткімі і бескампраміснымі. Яны нарасталі па меры таго, як умацоўвалася адзінаўладдзе, узмацнялася бальшавіцкая таталітарная сістэма, павялічваўся ідэалагічны ўціск.

Акрамя штатных работнікаў Галоўлітбел выкарыстоўваў пазаштатных рэцэнзентаў. Дапамагалі яму, як і партыйным органам, некаторыя добраахвотныя цэнзары з ліку навуковых работнікаў. Актыўным сярод іх быў гісторык С. Агурскі. У прыватнасці, 25 жніўня 1933 г. ён накіраваў у ЦК КП(б)Б матэрыял пад назвай "По поводу нацдемовской фальсификации на страницах советских энциклопедий", дзе сцвярджаў, што антысавецкая фальсіфікатарская дзейнасць беларускіх нацыянал-дэмакратаў праявілася і на старонках савецкіх энцыклапедый і энцыклапедычных слоўнікаў, у якіх змешчаны артыкулы і інфармацыйныя матэрыялы аб Беларусі, грамадскім і рэвалюцыйным руху. У шэрагу выпадкаў, на думку аўтара, адкрыта фальсіфікавалася гісторыя, што выразілася ў ідэалізацыі "Беларускай сацыялістычнай грамады". Аўтар пісьма спрабаваў паказаць, наколькі беларускія нацыянальныя дэмакраты скажалі гісторыю бальшавізму і ідэалізавалі дробнабуржуазныя партыі. Пры гэтым меліся на ўвазе такія выданні, як "Советский энциклопедический словарь", малая і вялікая савецкія энцыклапедыі[2]. Дадзеная запіска, як і іншыя, аказвала пэўнае ўздзеянне на кіраўнікоў Беларускай ССР, фарміравала іх думку, а затым і дзеянні ў адносінах да адпаведных прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

У барацьбе з нацыянальнай беларускай культурай і яе носьбітамі партыйна-дзяржаўныя структуры шырока выкарыстоўвалі карныя органы, а тыя не толькі сваіх шматлікіх работнікаў, але і сакрэтных інфарматараў з асяроддзя інтэлігенцыі. Адзін з іх у дакладзе ад 12 мая 1930 г. рабіў агляд настрояў у нацыянальна-дэмакратычных колах Мінска. Засакрэчаны аўтар, у прыватнасці, паведамляў, што, калі партыя пачала барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, гэта не сустрэла падтрымкі сярод большай часткі беларускай інтэлігенцыі як партыйнай,

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.364, арк.13 — 42.

[2] Там жа, спр.391, арк.520 — 523.

так і беспартыйнай. Некаторыя інтэлігенты адказалі на гэта масавымі звальненнямі з працы. Калі знялі з работы кіраўніка Наркамзема З. Прышчэпава, супрацоўнікі гэтай установы "чуть ли не все скопом" падалі заявы аб звальненні. Такія акцыі мелі месца і ў Беларускай Акадэміі навук.

Ананімны аўтар пісаў, што вялікая і арганізаваная група інтэлігентаў (З. Жылуновіч, М. Зарэцкі, А. Александровіч, А. Вольны, А. Дудар, А. Цвікевіч, І.Ільючонак і інш.) вяла работу па дыскрэдытацыі ЦК КП(б)Б, карных органаў, асобных прадстаўнікоў інтэлігенцыі — ворагаў нацыянал-дэмакратызму. Дзеянні партыйна-дзяржаўных улад, органаў НКУС па барацьбе з праявамі нацыянал-дэмакратызму балюча ўспрымаліся інтэлігенцыяй. Узнікалі вялікі недавер і падазронасць. Назіраўся рост антысемітызму. Паведамлялася таксама аб моцных шавіністычных вялікадзяржаўных настроях сярод вышэйшага каманднага саставу воінскіх часцей, размешчаных у Мінску[1].

У абставінах татальнай падазронасці і шырока распаўсюджаных даносаў многія работнікі савецкіх органаў, у тым ліку Галоўлітбела, не былі застрахаваны ад недаверу з боку бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, часткай якой яны з'яўляліся. Як паведамляў 17 верасня 1936 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Гікала сакратару ЦК УКП(б) М. Яжову, у выніку чыстак асабліва цяжкае становішча з кадрамі склалася ў некаторых структурах, у тым ліку ў Галоўлітбеле. На гэты час у ім не хапала шмат супрацоўнікаў. З 12 штатных адказных работнікаў засталіся толькі два, ды і тыя з'яўляліся вельмі слабымі спецыялістамі. Не былі запоўнены вакансіі начальніка Галоўлітбела, яго намесніка, пяці рэдактараў[2]. Аднак гэта была часовая з'ява. Вакансіі запаўняліся і ідэалагічны ўціск працягваўся.

Ён праяўляўся і ў барацьбе з журналістамі. У гэты час былі моцна аслаблены рэдакцыі многіх перыядычных выданняў. У першую чаргу рэпрэсіям падлягалі прыхільнікі ўсяго беларускага. Выключна вострая патрэба ў кваліфікаваных работніках існавала ў рэдакцыях некаторых рэспубліканскіх газет, а таксама ў рэдакцыях перыядычных выданняў такіх раёнаў, як Барысаўскі, Аршанскі, Уздзенскі, Расонскі і інш.[3] Гэта аслабляла ў першую чаргу бе-

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.249, арк.20 — 26.

[2] Там жа, спр.884, арк.19 — 20.

[3] Там жа.

ларускамоўныя газеты, садзейнічала вынішчэнню ўсяго нацыянальнага з беларускай культуры.

У барацьбе з праявамі нацыянальна-культурнага развіцця партыйна-дзяржаўныя структуры і карныя органы актыўна падтрымлівалі тых інтэлігентаў, якія дапамагалі ім у гэтым. Адзін з іх — Воўк-Леановіч, прыхільнік супрацьлеглых нацыянал-дэмакратам палітычных поглядаў. Ён з'яўляўся дацэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Прыехаў у Мінск у 1925 г., а праз год выдаў кнігу "Лекции по истории белорусского языка", якая адлюстроўвала яго погляды на культуру Беларусі. Я.Лёсік, А.Смоліч, А.Цвікевіч вялі з ім актыўную палеміку. Урэшце рэшт яму давялося пакінуць рэспубліку. З яго ад'ездам распалася група, што супрацьдзейнічала развіццю беларускай нацыянальнай культуры[1].

Вялікую ролю ў захаванні беларускага этнасу, яго традыцый і здабыткаў адыгрывалі навуковыя даследаванні ў галіне гуманітарных навук. Кантроль за імі ў 30-я гады стаў татальным. У першую чаргу ён ахапіў Акадэмію навук, дзе канцэнтраваліся асноўныя навуковыя сілы гуманітарыяў. Умяшанне ў іх дзейнасць шляхам рэцэнзавання навуковых прац рабілася ўсё больш пастаянным і прадузятым. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць заключэнне намесніка дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б Раманчука на працу прафесара П. А. Бузука "Украінскія гаворкі Паўночнага Каўказа". Заключэнне было зроблена адпаведна даручэнню першага сакратара ЦК кампартыі Беларусі Гікала ў канцы 1932 г., калі Бузук працаваў дырэктарам Інстытута мовазнаўства Беларускай Акадэміі навук. Прафесійнага аналізу працы ў гэтым заключэнні фактычна няма. Усё падменена палітычнымі ацэнкамі. Вывады зроблены ў такім жа напрамку: даследаванне (прычым гэта слова заўсёды бярэцца ў двукоссе) прафесара Бузука незалежна ад суб'ектыўных намераў аўтара па сваёй палітычнай накіраванасці і асноўных палітычных вывадах з'яўляецца антысавецкім, буржуазна-нацыяналістычным. Яно дае зброю ў рукі контррэвалюцыйным нацыяналістычным элементам для барацьбы супраць дыктатуры пралетарыяту. Акрамя таго, сцвярджаў аўтар заключэння, факты асабістых паездак прафесара Бузука ў 1929, 1930 і

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 249, арк. 33 — 36.

1932 гг. на Паўночны Каўказ не выключаюць магчымасці ўстанаўлення арганізацыйных сувязей з асобнымі ўкраінскімі буржуазна-нацыяналістычнымі элементамі. Аднак для гэтага неабходна дадатковая грунтоўная праверка[1].

Такія "заключэнні" на навуковыя даследаванні з'яўляліся звычайнай практыкай у той час. Яны рабіліся не з мэтаю выяўлення прафесійных якасцей аўтара, а толькі на прадмет пошуку палітычнага кампрамата. Пры гэтым зададзенасць ацэнак і вывадаў была відавочнай. Фактычна рэцэнзенты выконвалі палітычны заказ з боку партыйных, савецкіх, карных органаў. Пазней гэта праца набыла беспрэцэдэнтна шырокія маштабы, а вывады і ацэнкі станавіліся ўсё больш вострымі і злавеснымі.

25 чэрвеня 1938 г. старшыня НКУС БССР Наседкін накіраваў у ЦК КП(б)Б дакладную запіску "О фактах засоренности личного состава и вредительства в Белорусской Академии наук". У ёй сцвярджалася, што пасля рэарганізацыі Інбелкульта ў Акадэмію яна стала прыстанішчам польскіх шпіёнаў, трацкістаў, правых нацыянал-фашыстаў, якія па заданню польскіх разведорганаў праводзілі актыўную шпіёнскую і шкодніцкую работу. У мэтах збору шпіёнскіх звестак выдумляліся такія тэмы, як праблемы вялікага Дняпра, Палесся, эканамічнае апісанне раёнаў БССР і інш.

У дакладной сцвярджалася, што шкодніцкай работай у Акадэміі навук ахоплены ўсе інстытуты. У выніку прынятых мер са 139 аспірантаў, якія навучаліся тут у 1934 г., засталося толькі шэсць. У Інстытуце эканомікі з прадугледжаных планамі да выканання на працягу 1932 — 1937 гг. 44 навуковых работ надрукавана 24, з іх канфіскавана 17. За гэты час у Інстытуце літаратуры і мовы прадугледжвалася выдаць 103 навуковыя працы, выдадзена 19, з іх канфіскавана 16.

Такія адносіны да навуковай прадукцыі суправаджаліся рэпрэсіямі да яе стваральнікаў. Толькі на працягу 1937 — 1938 гг. у Акадэміі навук было арыштавана 57 чалавек. Іх абвінавацілі ў тым, што яны з'яўляліся агентамі замежных разведак. У запісцы таксама канстатавалася, што сярод кіраўніцтва Акадэміі навук знаходзяцца актыўныя контррэвалюцыянеры — віцэ-прэзідэнт Я. Колас, а таксама Дарошкін, Казлоў, Вальфсон і інш.

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.340, арк.19 — 20.

Кіраўнік карных органаў БССР паведамляў, што шэраг інстытутаў створаны з яўна шкодніцкімі мэтамі. Таму Фізіка-тэхнічны інстытут, Інстытут філасофіі і Інстытут эканомікі рашэннем бюро ЦК КП(б)Б у 1938 г. ліквідаваны, рэарганізаваны ці зліты з іншымі інстытутамі. Вялікія прэтэнзіі меліся да Інстытута літаратуры і мовы. Па словах аўтара дакладной, тут польскія шпіёны і нацыянал-фашысты асабліва прыклалі сваю шкодніцкую руку. Пры гэтым называліся прозвішчы Жылуновіча, Чарота, Замоціна, Сурты і інш[1].

На думку кіраўніка карных органаў рэспублікі, у Інстытуце гісторыі шкодніцтва выяўлялася ў тым, што на працягу шэрагу гадоў "тармазілася распрацоўка сапраўднай гісторыі беларускага народа", а таксама выданне вучэбных дапаможнікаў. Быццам інстытутам быў выдадзены шэраг контррэвалюцыйных кніг, сярод якіх называліся "Древняя культура Белоруссии" Ляўданскага, "Покровский как историк-марксист" Горына і інш. Сцвярджалася, быццам кіраўнікі інстытута зрывалі распрацоўку гісторыі Беларусі, фальсіфікавалі яе, падмяняючы буржуазна-нацыяналістычнымі тэорыямі аб самабытнасці беларускага народа. Работнікі інстытута абвінавачваліся ў тым, што яны амаль не займаюцца вывучэннем гісторыі, а больш за ўсё ўдзяляюць увагу этнаграфіі і фальклору. Пры гэтым рабіўся вывад, што дадзеная работа мае выразныя нацыяналістычныя адценні[2].

Такія адносіны да развіцця беларускай гуманітарнай навукі, як і нацыянальнай культуры ўвогуле, з боку карных органаў, партыйна-дзяржаўных структур уяўлялі сабою татальны ўціск, нічым і нікім не абмежаваны дыктат, што дапаўняўся масавымі неабгрунтаванымі палітычнымі абвінавачваннямі і ў канчатковым выніку рэпрэсіямі. У такіх умовах існаванне навукі і культуры адбывалася ў строга рэгламентаваным рэчышчы.

Такім чынам, на працягу 30-х гадоў бальшавіцкай уладай было шмат зроблена па пераадоленню непісьменнасці беларускага народа, развіццю школьнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, сеткі культурна-асветных устаноў. Аднак наступ на ўсё нацыянальнае ў культуры вёўся мацнеючай

---

[1] НАРБ ф.4, воп.21, спр.1400, арк.12 — 18.

[2] Там жа, арк. 20 — 24.

таталітарнай сістэмай шырока і напорыста. Яго вастрыня была скіравана на лепшых прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі, супрацьдзеянне іх творчасці, падрыў у ёй гістарычных каранёў, вынішчэнне ўсяго, што ўзбагачала беларускую культуру. Вынікам гэтай барацьбы стала аслабленне пазіцый нацыянальнай інтэлігенцыі, а з ёю і інтэлектуальнага патэнцыялу беларускага народа. У дадзеных умовах узмацнялася русіфікацыя. Аднак глыбінныя карані адметнасцей беларусаў, іх культуры захаваліся. Яны працягвалі жыць не толькі ў асяроддзі нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, але і ў народзе, асабліва сярод яго вясковай часткі.

## 5. Ажыццяўленне рэпрэсіўнай палітыкі

Найбольш злавеснай праявай таталітарных сістэм з'яўлялася масавае ганенне тых грамадзян, якія не падзялялі афіцыйную ідэалогію і практыку. Барацьба з іншадумствам нярэдка прымала шырокія памеры і вялася ў жорсткіх формах. Падаўленне адкрытага і скрытага супраціўлення заўсёды разглядалася лідэрамі таталітарных рэжымаў як важнейшая задача.

Аднак кіраўнікі бальшавіцкай таталітарнай сістэмы — Сталін і яго бліжэйшае акружэнне пайшлі ў гэтых адносінах яшчэ далей. Яны не толькі вялі бескампрамісную барацьбу з тымі, хто не падзяляў іх поглядаў, але пад надуманымі матывамі ажыццяўлялі шырокія рэпрэсіі сярод ні ў чым не вінаватых людзей. Задача такой "прафілактычнай работы" — стварыць у грамадстве маральна-псіхалагічную атмасферу страху, падазронасці, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Ужо ў 1930 г. у палітычнай справаздачы Цэнтральнага Камітэта XVI з'езду УКП(б) Сталін заявіў: "Рэпрэсіі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва з'яўляюцца неабходным элементам наступлення..." Аднак тут ён яшчэ дабаўляў, што гэты элемент дапаможны, а не галоўны[1].

Адпрацоўка метадаў масавага знішчэння людзей вялася значна раней пры непасрэднай падтрымцы Сталіна. Як стала вядома ў апошні час, ён праявіў зацікаўленасць у стварэнні так званай "шахцінскай справы". Гэта звязана з тым, што калі паўнамоцны прадстаўнік АДПУ па Паўночнаму Каўказу Еўдакі-

[1] *Сталин И.* Соч. Т.12. С.309.

маў прывёз у канцы 1927 г. старшыні калегіі АДПУ Мянжынскаму дэталёва, на яго думку, распрацаваную агентурную справу, то апошні не ўбачыў у ёй доказаў. Тады Еўдакімаў звярнуўся непасрэдна да Сталіна і атрымаў не толькі яго поўную падтрымку, але і паўнамоцтвы прыняць на месцы ўсе меры, якія ён палічыць неабходнымі. "А з таварышам Мянжынскім, — сказаў Сталін, — мы як-небудзь дамовімся".

З улікам гэтага Еўдакімаў правёў масавыя арышты і даручыў свайму намесніку Курскаму любымі сродкамі дабіцца "чыстасардэчнага прызнання" ў прад'яўленых абвінавачваннях. У выніку былі закладзены асновы езуіцкіх допытаў: фізічнае ўздзеянне, забарона сну, прымяненне хімічных, псіхалагічных сродкаў і інш. Дарэчы, іх выканаўцы былі шчодра ўзнагароджаны: яны атрымалі ордэны, а Еўдакімаў хутка стаў першым сакратаром Паўночна-Каўказскага крайкома УКП(б), членам пленума ЦК УКП(б). Пра Курскага спачатку забыліся, і толькі ў 1936 г. ён быў прызначаны намеснікам наркома ўнутраных спраў СССР, але нечакана памёр (скончыў, як быццам, жыццё самагубствам).

Дадзеная методыка стварэння агентурных спраў і вядзення следства была распаўсюджана на ўсю дзяржаву, у тым ліку і на Беларускую ССР. Акрамя СВБ у рэспубліцы былі сфабрыкаваны дзесяткі іншых "спраў". Сярод іх "Беларускі нацыянальны цэнтр", "контррэвалюцыйныя арганізацыі" ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, у Мазыры, у Лельчыцкім раёне і ў многіх іншых месцах. Па кожнай з іх былі асуджаны дзесяткі і нават сотні чалавек.

Шырокае распаўсюджанне атрымала практыка стварэння на месцах розных адгалінаванняў ад быццам бы выкрытых у Цэнтры контррэвалюцыйных антысавецкіх арганізацый. Так, у БССР быў прыдуманы філіял "Працоўнай сялянскай партыі", па якому рэпрэсіравалі 59 чалавек, філіял "Прампартыі" (30 чалавек), філіял "Саюзнага бюро РСДРП (меншавікоў)" — 30 чалавек і інш.

Уся гэта дзейнасць кантралявалася і накіроўвалася рознымі партыйнымі інстанцыямі, у першую чаргу цэнтральнымі. Характэрна ў гэтых адносінах рашэнне палітбюро ЦК УКП(б), прынятае 19 мая 1934 г. Разгледзеўшы прадстаўленне камісіі партыйнага кантролю, яно вырашыла змяніць пастанову ад 10 красавіка гэтага ж года і прыняць прапа-

нову дадзенай камісіі аб неадкладным прывядзенні ў выкананне прыгавораў да вышэйшай меры сацыяльнай абароны, г. зн. да расстрэлу, 24 асуджаных па справе "Беларускага нацыянальнага цэнтра". Толькі ў адносінах братоў Доўнар вышэйшая мера пакарання замянялася 10 гадамі турэмнага зняволення[1].

Пад рэпрэсіі траплялі фактычна ўсе пласты грамадства — інтэлігенцыя, рабочы клас. Але асабліва дасталося сялянству, у першую чаргу найбольш гаспадарлівай і, зразумела, больш заможнай яго частцы. Гэтыя сяляне з'яўляліся асноўнымі носьбітамі сельскагаспадарчага вопыту, нацыянальных і гістарычных традыцый. Зыходзячы з класавага прынцыпу, які партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам быў абсалютызаваны і даведзены да крайнасці, улады абрушылі на яго ў час масавай калектывізацыі і правядзення палітыкі раскулачвання нябачаныя па памерах і жорсткасці рэпрэсіі. Заможным сялянам фактычна было адмоўлена ў самім існаванні, у тым, каб знайсці сваё месца ў ствараемай калгасна-саўгаснай сістэме. Таму рэпрэсіі сярод сялянства вызначаліся асаблівай маштабнасцю. Дастаткова сказаць, што ўжо к канцу мая 1930 г. у Беларускай ССР было раскулачана больш за 15, 6 тыс. гаспадарак заможных сялян[2]. З улікам таго што гэтыя сем'і былі ў асноўным шматлюднымі, можна меркаваць: агульная колькасць рэпрэсіраванага сялянскага насельніцтва склала ў рэспубліцы за гэты кароткі прамежак часу ў межах 100 тыс. чалавек. Па звестках У. Адамушкі, за час правядзення палітыкі раскулачвання ў Беларускай ССР было выслана за яе межы звыш 250 тыс. чалавек[3].

Аб надзвычай вялікай удзельнай вазе рэпрэсіраваных сялян у агульнай колькасці пацярпеўшых ад бальшавіцкага таталітарнага рэжыму гавораць даныя апрацоўкі ў Камітэце па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь 40,3 тыс. картак персанальнага ўліку жыхароў Мінска, Мінскай і Віцебскай абласцей, якія былі рэпрэсіраваны судовымі і несудовымі органамі ў 20 — 50-я гады і рэабілітаваны ў 1955 — 1994 гг. Нават з улікам таго, што ў гэту агульную колькасць рэпрэсіраваных

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.16, арк.62.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.166.

[3] *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20 — 50-х гадоў на Беларусі. Мн., 1994. С.41.

уваходзілі жыхары Мінска і іншых гарадоў абедзвюх абласцей і што рэпрэсіі праводзіліся на працягу значна большага перыяду, чым масавая калектывізацыя, тым на менш з агульнай колькасці рэпрэсіраваных сялян было 31 738, што складала 78, 75 %[1].

Значная частка рэпрэсій прыпала менавіта на перыяд масавай калектывізацыі і ажыццяўлення палітыкі раскулачвання. Калі ўдзельная вага рэпрэсіраваных у 1928 г. склала ад іх агульнай колькасці 0,58 %, то ў 1929 г. — 3,8, а ў 1930 г. — 9,33 %. Далей было некаторае зніжэнне інтэнсіўнасці рэпрэсій на вёсцы. Колькасць рэпрэсіраваных сельскіх жыхароў у 1931 г. раўнялася 2,72 % ад указанай вышэй лічбы.

Затым рэпрэсіі на вёсцы зноў актывізаваліся і склалі ў 1932 г. 5,11 %, а ў 1933 г. дасягнулі нават 15,25 % ад агульнай колькасці рэпрэсіраваных, чые карткі персанальнага ўліку былі апрацаваны. У 1934 г. дадзены паказчык раўняўся 2,58 %[2].

Гэтыя лічбы хоць і не поўнасцю звязаны з дынамікай рэпрэсій на вёсцы, аднак адлюстроўваюць у асноўным дадзены працэс, паколькі ад агульнай колькасці рэпрэсіраваных, чые карткі былі апрацаваны, сяляне склалі, як бачна вышэй, амаль 4/5. Актывізацыя рэпрэсій у 1933 г. тлумачыцца новай хваляй вышуку кулацкіх гаспадарак. У гэты час пад рэпрэсіі ўсё больш траплялі сераднякі.

Менавіта ў гэты час асабліва актыўна фабрыкаваліся карнымі органамі розныя справы, па якіх праходзілі дзесяткі і нават сотні "ўдзельнікаў". Паводле зробленых падлікаў, толькі на працягу 1933 г. у Беларускай ССР былі ліквідаваны 22 "контррэвалюцыйныя арганізацыі" ў галіне сельскай гаспадаркі з агульнай колькасцю ўдзельнікаў 2524. Найбольш буйная такая "арганізацыя" (740 чалавек) як быццам была ў сістэме Нацкамзема і Трактарацэнтра. Яе кіраўнікі — М. А. Тарасаў, К. Н. Масюкоў. У "Партыі вызвалення сялян" на чале з М. Я. Лінскім, К. С. Муравіцкім і іншымі знаходзілася 110 чалавек. Каля 60 удзельнікаў быццам было ў "Працоўнай сялянскай партыі", якой "кіравалі" Р.Я.Бонч-Асмалоўскі, Г.І. Гарэцкі, П. А. Хоцкі[3].

[1] Звязда. 1996. 17 мая.

[2] Там жа.

[3] *Процька Т.* Ліквідацыя сялянства // Круг. 1996. № 6.

Рэзкі рост колькасці рэпрэсіраваных у пачатку 30-х гадоў у сувязі з правядзеннем масавай калектывізацыі і палітыкі раскулачвання запатрабаваў значнага павелічэння асабовага складу карных органаў. Паводле сакрэтнага рашэння палітбюро ЦК УКП(б), прынятага 10 жніўня 1930 г., кантынгент АДПУ павялічваўся з 1 кастрычніка таго ж года на 3165 супрацоўнікаў. Акрамя таго, з гэтага часу колькасць унутраных войскаў дадзенага ведамства ўзрастала на 3500 чалавек, а пагранічная ахова АДПУ — на 2500 чалавек і 3000 коней.

Для ўмацавання карных органаў былі праведзены змены ў іх кіраўніцтве. У прыватнасці, 25 ліпеня 1931 г. па дакладу Сталіна палітбюро ЦК УКП(б) прыняло рашэнне аб змене ў кіраўніцтве АДПУ. Адным з намеснікаў яго старшыні — Мянжынскага быў прызначаны Ягода, а членамі калегіі ўведзены паўнамоцныя прадстаўнікі АДПУ: ад Украіны — Родэнс, ад Беларусі — Мядзведзь, а таксама кіраўнік АДПУ па Ленінградскай вобласці Еўдакімаў[1].

Аднак нягледзячы на гэтыя меры, яшчэ 20 кастрычніка 1930 г. вышэйшы выканаўчы партыйны орган — палітбюро, заслухаўшы паведамленне АДПУ аб паказаннях членаў цэнтральнага камітэта прампартыі, прыняло рашэнне, у якім разам з іншым "абавязала таварыша Сталіна неадкладна спыніць хадзьбу па гораду пешшу"[2]. Дадзенае рашэнне — вынік агульнага абвастрэння палітычнай сітуацыі ў краіне, што ў першую чаргу было, несумненна, звязана з правядзеннем масавай калектывізацыі і шырокамаштабнай палітыкі раскулачвання.

Менавіта ў пачатку 30-х гадоў палітбюро ЦК УКП(б) удзяляла павышаную ўвагу рэпрэсіўнай палітыцы — высяленню заможных прадстаўнікоў вёскі з родных мясцін і адпраўцы іх у неабжытыя раёны Урала, Казахстана, Сібіры ці Поўначы. Дакументы сведчаць, што гэта быў адзін з найбольш важных напрамкаў у дзейнасці вышэйшага выканаўчага партыйнага органа. У прыватнасці, 20 лютага 1931 г. на яго пасяджэнні заслухалі пытанне аб кулаках. Па інфармацыі Сталіна, Мянжынскага, Ягоды было

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 162, спр. 9, арк. 20; спр. 10, арк. 127.
[2] Там жа, спр.9, арк.54.

прынята рашэнне, у якім АДПУ прапанавалі вызначыць і падрыхтаваць на працягу шасці месяцаў раёны для ўзвядзення кулацкіх пасёлкаў на 200 — 300 тыс. сем'яў пад кіраўніцтвам спецыяльна прызначаных камендантаў. Пры гэтым у першую чаргу меліся на ўвазе раёны Казахстана, што знаходзіліся на поўдзень ад Караганды. Была таксама пастаўлена задача на працягу мая—ліпеня 1931 г. перасяліць у заходнесібірскі край 40 тыс. кулацкіх гаспадарак[1].

У сувязі з правядзеннем масавай калектывізацыі і палітыкі раскулачвання імкненне павялічыць памеры рэпрэсіўнай палітыкі пранізвала многія звенні бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Разам з высокімі разнарадкамі зверху з некаторых рэгіёнаў ішлі сустрэчныя прапановы. Мясцовыя партыйныя функцыянеры, што стараліся выслужыцца перад Цэнтрам, рабілі такія заяўкі, якія прыходзілася нават змяншаць. Часткова аб гэтым сведчыць пратакол камісіі палітбюро ЦК УКП(б) па раскулачванню на чале з Андрэевым. На пасяджэнні, што адбылося 30 мая 1931 г., была заслухана просьба Татарскага абласнога камітэта УКП(б) аб павелічэнні колькасці высяляемых з вобласці кулакоў да 8 тыс. чалавек. У прынятай пастанове камісія не задаволіла дадзеную просьбу, а пацвердзіла сваё рашэнне, прынятае два тыдні таму назад, аб высяленні з Татарскай вобласці 5 тыс. кулакоў. На гэтым жа пасяджэнні кіраўніцтву Ленінградскай вобласці было дазволена замест перасялення 4 тыс. кулацкіх сем'яў у Казахстан направіць іх у паўночныя раёны вобласці для гаспадарчага выкарыстання на будаўніцтве аб'ектаў у раёне ракі Нявы і на апатытавых распрацоўках у Хібінах[2].

Дзейнасць камісіі па раскулачванню была станоўча ацэнена вышэйшым выканаўчым партыйным органам. У пастанове "Аб кулаках" ад 20 ліпеня 1931 г. палітбюро ЦК УКП(б) вырашыла лічыць, што заданне па масаваму высяленню кулацкіх гаспадарак камісіяй у асноўным выканана. У далейшым меркавалася праводзіць высяленне заможных гаспадарак з раёнаў суцэльнай калектывізацыі ў індывідуальным парадку[3].

Аднак гэта лінія на некаторае змяншэнне маштабаў рэпрэсій на вёсцы, калі заможныя сяляне і аднесеная да іх частка сераднякоў былі рэпрэсіраваны,

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 162, спр. 9, арк. 138.

[2] Там жа, спр.10, арк.74.

[3] Там жа, арк.126.

не праводзілася ў жыццё. Пераважаў ранейшы падыход, г. зн. разнарадкі зверху па далейшаму ўзмоцненаму вышуку "кулакоў". Менавіта ў такім духу было прынята рашэнне палітбюро ЦК УКП(б) ад 4 мая 1932 г. Пасля разгляду прадстаўлення камісіі ЦК УКП(б) па спецперасяленцах аб плане высялення кулацкіх гаспадарак у 1932 г. было прынята рашэнне зацвердзіць прадстаўлены АДПУ план высялення заможных сялян у колькасці 38 300 сем'яў. Пры гэтым прадугледжвалася выселіць з Украіны на Урал 6 тыс. сем'яў, з Беларусі ў Паўночны край — 2 тыс. сем'яў. У некаторых рэгіёнах дадзеная пастанова прадугледжвала ўнутранае рассяленне. У прыватнасці, па Ленінградскай вобласці рассяляліся 1500 сем'яў, у іншых раёнах Казахстана — 3 тыс., па Сярэдняй Азіі — 7 тыс., па Уралу — 2 тыс. сем'яў і г. д. Было прадугледжана выдзяленне некаторых сродкаў для правядзення гэтых чарговых рэпрэсій сярод заможнай часткі вёскі[1].

Характэрна, што дадзенае рашэнне мела сілу толькі 12 дзён, да таго часу, калі 16 мая 1932 г. палітбюро вырашыла адмяніць сваю пастанову ад 4 мая гэтага ж года "Аб гаспадарчым высяленні 38 300 кулацкіх сем'яў". Пры гэтым АДПУ было прапанавана асобныя контррэвалюцыйныя злосныя элементы ў вёсцы "изымать" у парадку індывідуальнага арышту[2].

Гэтыя факты сведчаць аб пэўных рознагалоссях паміж членамі палітбюро адносна інтэнсіўнасці далейшага ажыццяўлення палітыкі раскулачвання: ці ісці ранейшым шляхам жорсткіх разнарадак, ці перайсці на гэтым этапе, калі ўжо рэпрэсіравана не толькі кулацтва, але і многія іншыя сяляне, да выбарачных індывідуальных арыштаў.

У той жа час бачна, што ад прыняцця дадзенай пастановы і да яе адмены прайшло амаль два тыдні. Вядома, з якой аператыўнасцю выконваліся тагачасныя рашэнні вышэйшых партыйных органаў, таму можна толькі меркаваць, ці былі адменены зробленыя па разнарадцы арышты ці да іх дабавілі новыя ў індывідуальным парадку. Ва ўсякім разе, як вынікае з практыкі работы партыйных, дзяржаўных і карных органаў у тых умовах, іх кіраўнікі і непасрэдныя выканаўцы неслі адказнасць за недавыкананне тых ці іншых рашэнняў і ні ў якім выпадку за тое, што "изымание" ўладальнікаў заможных гаспадарак было

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.12, арк.126.

[2] Там жа, арк.134.

зроблена ў значна большых памерах, чым загадана. За такую стараннасць звычайна не каралі, а ўзнагароджвалі.

У сувязі з правядзеннем на вёсцы шырокамаштабных рэпрэсій на аснове раскулачвання перад вышэйшым партыйным і дзяржаўным кіраўніцтвам Саюза ССР паўстала таксама праблема арганізацыі існавання, працы і максімальнага выкарыстання дармовай рабочай сілы спецперасяленцаў, як тады называлі ў партыйна-дзяржаўным апараце, карных органах рэпрэсіраваных. Гэтым таксама займалася камісія палітбюро ЦК УКП(б) на чале з Андрэевым. На пасяджэнні, якое яна правяла 15 мая 1931 г. і ў якім прынялі ўдзел члены камісіі Постышаў, Ягода, а таксама прысутнічалі Еўдакімаў, Нікалаеў, Альшанскі, Берман, была прынята пастанова "Аб арганізацыі ўпраўлення і вытворчага выкарыстання спецперасяленцаў". Гэты дакумент палітбюро ЦК УКП(б) зацвердзіла 20 мая 1931 г. Ён прадугледжваў даволі кардынальныя змены ў дадзенай справе. З улікам вельмі дрэннага выкарыстання рабочай сілы спецперасяленцаў і беспарадкаў у іх утрыманні гаспадарчымі органамі было вырашана поўнасцю перадаць АДПУ адміністрацыйнае, арганізацыйнае і гаспадарчае кіраванне спецперасяленцамі, а таксама ўсе матэрыяльныя і грашовыя фонды, што адпускаліся на іх перасяленне і ўтрыманне. Для арганізацыі ўсёй гэтай работы ў АДПУ ствараўся спецыяльны апарат кіравання пры яго цэнтральных органах і паўнамоцных прадстаўніцтвах на месцах[1].

З-за тэхнічнай немагчымасці перасялення 150 тыс. кулацкіх гаспадарак у Казахстан прызнавалася магчымым пакінуць да канца 1931 г. у гэтым рэгіёне 56 тыс. гаспадарак, а 55 тыс. сем'яў размясціць на Урале. Згодна з пастановай рабілася ўнутранае перасяленне з паўднёвых прыгранічных раёнаў у паўночныя ва Усходняй Сібіры і на Урале па 12 тыс. сем'яў у кожным з гэтых рэгіёнаў.

Камісія палітбюро на чале з Андрэевым займалася не толькі пытаннямі размяшчэння перасяленцаў у тых ці іншых месцах дзяржавы, але і арганізацыяй рэжыму ўнутранага жыцця калоній. Гэтыя рашэнні ў пратаколах камісіі праходзяць як асобныя. У прыватнасці, 15 мая 1931 г. было ўстаноўлена, што

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.10, арк.51.

калі які-небудзь перасяленец выконвае ўсе пастановы савецкай улады, паводзіць сябе як сумленны работнік, то пасля пяцігадовага тэрміну з моманту перасялення ён атрымлівае права голасу і ўсе грамадзянскія правы[1].

Аднак ужо ў пачатку 1932 г. было вырашана пачаць здзяйсняць дадзеную меру. Пастанова палітбюро ад 28 студзеня ўтрымлівала палажэнне аб мэтазгоднасці ў індывідуальным парадку па хадайніцтву гаспадарчых органаў і АДПУ пачаць аднаўленне ў правах сумленна працуючых перасяленцаў, якія даказалі вернасць савецкай уладзе[2].

Характэрнай асаблівасцю дзейнасці партыйных, дзяржаўных і карных структур сярод перасяленцаў з'яўлялася імкненне ўнесці раскол паміж моладдзю і старэйшым пакаленнем, дзецьмі і бацькамі, пагоршыць іх узаемаадносіны. У згаданай пастанове камісіі Андрэева па спецперасяленцах, прынятай 15 мая 1931 г. і праз пяць дзён зацверджанай палітбюро ЦК УКП(б), у асобным рашэнні прапаноўвалася АДПУ ў яго арганізацыйна-гаспадарчай і адміністрацыйнай рабоце асаблівую ўвагу ўдзеляць моладзі з мэтай ўсямернага прыцягнення яе да працы. Пры гэтым рэкамендавалася ствараць для маладых людзей асобныя ўмовы, развіваць калектыўныя метады работы і не распаўсюджваць той строгі рэжым, у якім знаходзіўся галава сям'і[3].

У пазнейшай пастанове камісіі, прынятай 7 жніўня 1931 г. і праз тры дні зацверджанай палітбюро ЦК УКП(б), гаварылася: "Улічваючы неабходнасць хутчэйшага адрыву моладзі спецперасяленцаў ад контррэвалюцыйнай часткі кулацтва, прызнаць магчымым аднаўленне ў правах моладзі, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту, да заканчэння пяцігадовага тэрміну ў тых выпадках, калі гэта моладзь праявіла сябе з дадатнага боку". Пастанова нават вызначала канкрэтныя мерапрыемствы: ствараць асобныя маладзёжныя брыгады на вытворчасці, уцягваць моладзь у працоўнае спаборніцтва, за ударную работу датэрмінова вызваляць маладых людзей са спецпасяленняў і г. д. Аднак 8 верасня 1931 г. палітбюро ЦК УКП(б) прыняло рашэнне аб адмене гэтай часткі

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.10, арк.51 — 53.

[2] Там жа, спр.11, арк.162.

[3] Там жа, спр.10, арк.54.

пастановы камісіі Андрэева, прынятай 7 жніўня гэтага ж года і ім жа зацверджанай. Пры гэтым ніякая матывіроўка не прыводзілася[1]. Можна меркаваць, што справа па адрыву моладзі ад бацькоў і ўсёй радні рухалася не так проста, як хацела вышэйшае партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва. Ганебны намер раскалоць пакаленні ў асяроддзі рэпрэсіраваных людзей, несумненна, сустракаў на месцах актыўнае супрацьдзеянне.

Пратаколы камісіі па спецперасяленцах і закрытыя рашэнні палітбюро сведчаць аб надзвычай цяжкіх умовах існавання тых, каго аднеслі да кулакоў і адправілі на перавыхаванне ў далёкія і неабжытыя раёны. Пры той абмежаванай колькасці маёмасці, харчу, прасцейшага сельскагаспадарчага інвентару, што ім дазвалялі ўзяць з сабой, вельмі цяжкіх і нязвыклых кліматычных умовах, у якіх яны апынуліся, пры мізэрных асігнаваннях дзяржавы, што адпускаліся на іх існаванне і арганізацыю вытворчай дзейнасці, абжыванне новых мясцін праходзіла надзвычай цяжка, з вялікімі чалавечымі ахвярамі. Аднак усё было так і задумана, каб у крайне складаных умовах як мага больш рэпрэсіраваных загінула. Бальшавіцкая таталітарная сістэма праявіла сябе адносна іх з самага антычалавечнага боку.

Вельмі вялікія складанасці з арганізацыяй існавання спецперасяленцаў вымушана была прызнаць нават камісія Андрэева. У пастанове, прынятай 28 ліпеня 1931 г. і праз некалькі дзён зацверджанай палітбюро, канстатавалася абсалютна недапушчальнае становішча спраў як з гаспадарчым выкарыстаннем спецперасяленцаў, так і з іх уладкаваннем, забеспячэннем жыллём, прамысловымі і харчовымі таварамі, выплатай заработнай платы і г. д.

Праз паўгода на пасяджэнні камісіі канстаталіся яшчэ больш жудасныя факты. У пастанове ад 26 студзеня 1932 г., якая праз дзень была зацверджана палітбюро ЦК УКП(б), прызнавалася нездавальняючае санітарнае становішча ў месцах пражывання спецперасяленцаў, адзначалася асабліва вялікая смяротнасць сярод дзяцей малодшых узростаў (да 8 гадоў), якая даходзіла ў некаторых месцах да 10 % ад іх колькасці на працягу месяца. Вельмі высокая дзіцячая смяротнасць, як указвалася ў прынятым дакуменце, залежала не толькі ад агульных

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.10, арк.159; спр.11, арк.5.

адмоўных фактараў — санітарных, бытавых, кліматычных, але і ад недастатковага па колькасці і нездавальняючага па якасці харчавання[1]

Паводле рашэння ЦК УКП(б) ад 8 сакавіка 1933 г., былі ўстаноўлены сярэднія нормы забеспячэння пазбаўленых волі па сістэме наркамата юстыцыі ў наступных памерах: мукі — 1,5 кг у месяц на чалавека, крупы — 1,5 кг, цукру і кандытарскіх вырабаў — па 0,3 кг. Пры гэтым хлебны паёк павінен быў дыферэнцыравацца ў залежнасці ад характару работы па аналогіі з лагерамі АДПУ[2].

Нягледзячы на гэтыя крайне нізкія нормы забеспячэння спецперасяленцаў харчовымі таварамі, функцыянеры розных узроўняў, прадстаўнікі карных органаў, наглядальнікі тым не менш знаходзілі магчымасці, каб прысвойваць сабе пэўную іх частку. Пытаннямі злоўжывання службовым становішчам, крадзяжамі вымушаны быў займацца нават вышэйшы выканаўчы партыйны орган — палітбюро ЦК УКП(б). У яго пастанове ад 23 красавіка 1932 г. Заходнесібірскаму краявому камітэту было прапанавана прыцягнуць да партыйнай адказнасці членаў праўлення Захсіблестрэста, а непасрэдных вiноўнікаў разбазарвання грашовых сродкаў і прамыслова-харчовых фондаў, што выдзяляліся для забеспячэння спецперасяленцаў, аддаць пад суд[3].

Мізэрнае харчаванне, надзвычай цяжкія ўмовы існавання, жорсткая эксплуатацыя на самых цяжкіх работах даводзілі людзей да адчаю і розных форм пратэсту, у тым ліку ўцёкаў з месцаў зняволення. Іх распаўсюджанне было даволі значным. Камісія па спецперасяленцах вымушана была разгледзець 28 студзеня 1932 г. пытанне "Аб беглых спецперасяленцах". У прынятай пастанове адзначалася: лічыць магчымым пакідаць на месцах сем'і збеглых са спецпасёлкаў перасяленцаў, якія не маюць працаздольных старэйшын сем'яў, у тым выпадку, калі яны не з'яўляюцца сацыяльна небяспечнымі[4].

Прымаліся некаторыя захады з мэтаю аслаблення вастрыні становішча ў месцах зняволення. З 1 лю-

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.10, арк.144; спр.11, арк.167.

[2] Там жа, спр.14, арк.92.

[3] Там жа, спр.12, арк.110.

[4] Там жа, спр.11, арк.169.

тага 1932 г. былі зменшаны адлічэнні ў фонд АДПУ з зарплаты спецперасяленцаў з 15 да 5 %[1].

Разам з тым вышэйшае партыйнае кіраўніцтва пастаянна непакоілася аб папаўненні месцаў заключэння. У прыватнасці, камісія па спецперасяленцах 10 красавіка 1932 г. прапанавала, а палітбюро зацвердзіла рашэнне, згодна з якім высяляліся 30 — 35 тыс. сем'яў кулакоў, вычышчаных з калгасаў і раскулачаных. У наступным 1933 г. па хадайніцтву АДПУ палітбюро ЦК УКП(б) вырашыла накіраваць у працоўныя (спецыяльныя) пасёлкі АДПУ Заходняй Сібіры і Казахстана, акрамя ўжо выселеных, якія прыбылі на месца, і тых, што знаходзіліся ў дарозе (усяго — 124 тыс. чалавек), дадаткова 426 тыс. чалавек[2].

Уражваюць лічбы, якімі аперыравалі вышэйшыя партыйныя кіраўнікі і з якой лёгкасцю яны адносіліся да лёсаў соцень тысяч людзей. Гэта была глабальная палітыка па перасяленню і ў значнай частцы знішчэнню савецкіх грамадзян, многія з якіх у свой час, несумненна, падтрымлівалі савецкую ўладу і дапамагалі ёй у станаўленні і ўмацаванні. Такое абыходжанне са сваім народам на аснове ўзведзенага ў ранг дзяржаўнай палітыкі класавага прынцыпу характарызуе бальшавіцкую таталітарную сістэму як глыбока антычалавечную.

Вялікая і ўсё ўзрастаючая колькасць рэпрэсіраваных стварала значныя цяжкасці з іх утрыманнем. Турмы і іншыя месцы зняволення былі перапоўнены. Патрэбны былі крокі, скіраваныя на тое, каб канвеер рэпрэсій працаваў больш інтэнсіўна. З гэтай мэтай палітбюро ЦК УКП(б) 8 сакавіка 1933 г. прыняло пастанову "Аб разгрузцы месцаў пазбаўлення волі". У ёй прапаноўвалася неадкладна прыняць меры да паскарэння вытворчасці следчых спраў адносна асоб, якія праходзілі па сістэме зняволення АДПУ. Гаворка вялася ў першую чаргу аб 35 тыс. зняволеных, што ўтрымліваліся на Паўночным Каўказе, 25 тыс. — на Украіне, 12,5 тыс. — у Цэнтральнай чарназёмнай вобласці і г. д.

З дадзенага часу судова-следчым органам забаранялася браць пад варту ў парадку папярэдняга следства па ўсіх справах, акрамя контррэвалюцый-

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.11, арк.169.

[2] Там жа, спр.12, арк.106; спр.15, арк.14.

ных злачынстваў, крадзяжу дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, карысных службовых злачынстваў, кулацкага супрацiўлення і некаторых іншых. Па ўсіх астатніх справах загадвалася абмяжоўвацца, як правіла, падпіскай аб нявыездзе, паручыцельствам, залогам. Было таксама вырашана арганізаваць пры буйных месцах пазбаўлення волі "спецыяльныя камеры народнага суда" для разгляду спраў па асобах, якія ўтрымліваюцца ў гэтым месцы.

З мэтаю разгрузкі месцаў пазбаўлення волі існуючы чатырнаццацідзённы касацыйны тэрмін па ўсіх катэгорыях спраў скарачаўся да 5 дзён. Разам з тым павялічваліся кантынгент пракурораў, штат міліцыі. Было дадзена заданне ў месячны тэрмін пераабсталяваць пад месцы пазбаўлення волі неабходную колькасць былых турмаў ці іншыя будынкі[1].

Літаральна праз дзень пасля прыняцця дадзенай пастановы, 10 сакавіка 1933 г., вышэйшы партыйны выканаўчы орган зноў займаўся пытаннямі правядзення рэпрэсіўнай палітыкі. Было вырашана даць права разгляду спраў па паўстанцтву і контррэвалюцыі на Украіне з прымяненнем вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу пазасудовым органам — "тройкам". Яшчэ раней такое рашэнне было прынята адносна Беларускай ССР. Пасля разгляду 9 лютага 1933 г. пытання ЦК кампартыі Беларусі палітбюро вырашыла даць права "тройцы" паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ на Беларусі прымяняць вышэйшую меру пакарання па справах контррэвалюцыйных арганізацый і груповак, якія складаліся з кулацкіх і белагвардзейскіх элементаў[2].

Уражвае размах усёй гэтай работы па забеспячэнню рэпрэсіўнага канвеера — ад разнарадак па вышукванню "ворагаў", іх перамяшчэнню ў аддаленыя раёны краіны і рассяленню ў спецыяльна прызначаных месцах. Характэрнай асаблівасцю дадзенай дзейнасці з'яўлялася і тое, што вышэйшы выканаўчы партыйны орган толькі ў асобных выпадках не зацвярджаў тыя прадстаўленні, якія рабіліся кіраўніцтвам кампартыі на месцах, АДПУ, НКУС ці адпаведнымі камісіямі. Аб гэтым сведчаць як прыведзеныя вышэй факты, так і рашэнне, прынятае палітбюро ЦК УКП(б) 10 сакавіка 1933 г. У ім у ас-

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.14, арк.90 — 91.

[2] Там жа, арк.61, 96.

ноўным былі ўхвалены прапановы АДПУ аб стварэнні працоўных пасяленняў у Заходняй Сібіры і Казахстане. Пры гэтым указвалася, што яны павінны быць разлічаны на 500 тыс. чалавек у кожным краі[1]. Вядома, аднак, што акрамя Заходняй Сібіры і Казахстана яшчэ былі і іншыя рэгіёны Сібіры, Поўнач з Салаўкамі і г.д.

Шырокая геаграфія і надзвычай вялікія лічбы ўмяшчальнасці месцаў пазбаўлення волі сведчаць аб размаху рэпрэсій ужо ў пачатку 30-х гадоў, калі агульная колькасць рэпрэсіраваных у межах краіны вымяралася мільёнамі ў першую чаргу за кошт заможнага сялянства і часткі серадлякоў. Асноўныя кантынгенты праходзілі па сістэме АДПУ. У ёй рабілася ўсё для таго, каб як мага больш прынізіць чалавека, зрабіць яго пакуты невыноснымі. Аднак не лягчэйшымі былі ўмовы і ў іншых адгалінаваннях рэпрэсіўнага канвеера, што працаваў бесперапынна.

Зневажанне людзей фактычна пачыналася ўжо на першай стадыі працы гэтага канвеера — у час следства і допытаў. Усё шырэй у практыку ўваходзілі фізічныя меры ўздзеяння на арыштаваных. Гэтаму садзейнічала пазіцыя кіраўнікоў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Справа дайшла да таго, што ў 1937 г. ад імя ЦК УКП(б) Сталін даў органам НКУС дырэктыву аб прымяненні фізічных мер. У 1939 г., калі пік рэпрэсій ужо мінуў, ён пацвердзіў гэту сваю пазіцыю і патрабаваў абавязковага прымянення фізічнага метаду як цалкам правільнага і мэтазгоднага[2].

Ёсць сведчанні, што фізічныя меры прымяняліся ўжо ў час следства па справе СВБ. У далейшым гэта ўсё больш станавілася нормай. 17 ліпеня 1934 г. кіраўнік групы адміністрацыйна-савецкай сувязі Булатаў накіраваў Сталіну і Кагановічу пісьмо, дзе паведамляў аб недапушчальнай практыцы следства асобнымі работнікамі пастаяннага прадстаўніцтва АДПУ на Беларусі. Характэрная рэзалюцыя Сталіна на гэтым дакуменце: "Т.т. Гикало и Голодеду" — і больш ніякіх тлумачэнняў[3].

Грубейшыя парушэнні правоў асобы мелі месца не толькі ў Беларускай ССР. Яны наглядаліся і ў іншых рэгіёнах краіны. Усё большае іх распаўсюджанне вы-

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, опр.14, арк.96.

[2] Правда. 1988. 7 окт.

[3] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.691, арк.1.

мушала кіраўнікоў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў сярэдзіне 30-х гадоў яшчэ звяртацца да гэтага пытання. Пасля разгляду 5 чэрвеня 1934 г. матэрыялаў, прадстаўленых АДПУ, палітбюро ЦК УКП(б) прапанавала "ўсёй кіруючай вярхушцы" гэтай арганізацыі звярнуць увагу на сур'ёзныя недахопы ў справе вядзення следства. Было прызнана недапушчальным, што пракуратура пакінула скаргі з боку шэрагу абвінавачаных на імя пракурора без разгляду і адказу[1].

Аднак гэта рашэнне не прымалася ўсур'ёз ні пракуратурай, ні іншымі звеннямі карнай сістэмы. Агульныя ўнутрыпалітычныя абставіны ў краіне, накіраванасць палітыкі вярхоўнага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва спрыялі стварэнню ўмоў для пашырэння беззаконня і нарошчвання рэпрэсій. З гэтай мэтай адбывалася рэарганізацыя карных органаў, павялічваўся іх апарат, міліцыя была падпарадкавана непасрэдна АДПУ СССР. У яго сістэму былі перададзены папраўча-працоўныя лагеры. 1 снежня 1934 г., у дзень забойства С. М. Кірава, быў вельмі спрошчаны парадак вядзення спраў па падрыхтоўцы ці здзяйсненню тэрарыстычных актаў. Усё больш іх пачало разглядацца ў пазасудовым парадку, без пракурора і адваката, з прымяненнем вышэйшай меры пакарання.

Важкі ўклад у нарошчванне беззаконня ўнёс генеральны пракурор СССР Вышынскі. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць яго тэлеграма ўсім пракурорам саюзных рэспублік, краёў, абласцей, накіраваная 17 красавіка 1938 г. У ёй гаварылася: у сувязі з запытамі шэрагу пракурораў аб парадку разгляду скаргаў па справах ён указвае, што праверку правільнасці асуджэння неабходна праводзіць толькі ў выключных выпадках, калі асуджаныя да пазбаўлення волі прыводзяць сур'ёзныя доказы, якія паказваюць на няправільнасць іх асуджэння. Ва ўсіх астатніх выпадках неабходна паведамляць тым, хто скардзіцца, што справа пераглядацца не будзе і што прынятае рашэнне з'яўляецца канчатковым[2].

Усё гэта стварала надзвычай спрыяльныя ўмовы для хуткага распаўсюджвання беззаконня на месцах, у тым ліку ў БССР. Тут знайшлося нямала паслядоўнікаў аднаго са стваральнікаў "шахцінскай справы" Курскага, метады якога "ўдасканальваліся".

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.16, арк.89.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1724, арк.2.

У 1937 — 1938 гг. начальнік Полацкага гарадскога аддзела НКУС Дабраседаў і начальнікі аддзяленняў Зельдзін і Нікіцін стварылі дзве рэжымныя камеры. Адна была плошчаю 15 кв. м, другая — 22 кв. м. Яны размяшчаліся побач з дэзактывацыйнай камерай і лазняй, якія працавалі круглыя суткі. Пераграэтае паветра і пар прасочваліся ад іх у камеры праз шчыліны. У гэтых камерах знаходзілася па 60 чалавек. Сядзець і ляжаць было немагчыма, арыштаваныя суткамі стаялі на нагах. Многія гублялі прытомнасць. Тады іх аблівалі вадой і зноў запіхвалі ў камеры.

Да таго ж у гэтыя "парылкі" садзілі агентаў-камернікаў, якія тут жа прымушалі арыштаваных даваць неабходныя для следства паказанні супраць сябе. Адзін з агентаў — нехта Браўдэ — пахваляўся: "Я сам заблытаў чалавек сто. Даў на іх паказанні, а цяпер няхай разбіраюцца"[1].

Кіраўнік Аршанскай аператыўнай групы і па сумяшчальніцтву начальнік Магілёўскага гарадскога аддзела НКУС Шліфельсон так інструктаваў следчых: "Усё, што вы будзеце рабіць з арыштаванымі, мяне не датычыць. Мне толькі патрэбны іх прызнанні". Калі адзін з работнікаў напісаў рапарт аб прымяненні фізічных метадаў на імя наркома НКУС БССР Бермана і Шліфельсон даведаўся аб гэтым, ён на адной з аператыўных нарад папярэдзіў увесь асабовы склад аб тым, што пісаць пра такія рэчы "могуць толькі ворагі, якія не маюць нічога агульнага з партыяй"[2].

Шырокія памеры набылі розныя злачынствы з боку службовых асоб НКУС у адносінах да арыштаваных. Начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення НКУС капітан дзяржаўнай бяспекі Радноў 2 снежня 1938 г. прывёў у выкананне прыгавор "тройкі" да вышэйшай меры пакарання на 25 чалавек. Атрымаўшы ад наркома ўнутраных спраў БССР спіс арыштаваных, якіх патрэбна было перавезці з віцебскай турмы ў мінскую, але без загада аб выкананні вышэйшай меры, ён паверыў на слова распараджэнню былога памочніка наркома Стаяноўскага і ўсіх пералічаных у спісе арыштаваных расстраляў. Пры гэтым акты аб выкананні прыгавораў ён афарміў пасля, але паставіў дату: 22 лістапада 1938 г.[3]

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1699, арк.1 — 3.

[2] Там жа, спр.1398, арк.65.

[3] Там жа, арк.62.

Такіх фактаў у дзейнасці карных органоў было нямала. Час ад часу яны выяўляліся і вінаватыя неслі пакаранне. Але гэта не мяняла сутнасці бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, у якой працавала жудасная машына знішчэння людзей. Дадзены працэс быў пастаўлены на канвеер, і частковая замена тых, хто яго абслугоўваў, не ўплывала на агульныя вынікі. Была толькі спроба замесці сляды крывавых злачынстваў.

Іх жа маштабы былі надзвычай вялікія. У БССР яны таксама характарызаваліся асаблівым размахам. Паводле даных апошніх гадоў, пачынаючы з лістапада 1917 г. і па красавік 1953 г. судовымі і несудовымі органамі ў рэспубліцы было разгледжана звыш 170 тыс. спраў у адносінах да 250 тыс. чалавек, якія прыцягваліся да адказнасці толькі па палітычных матывах. З гэтай колькасці 10 тыс. чалавек былі рэпрэсіраваны ў 1917 — 1929 гг., 46 тыс. — у 1929 — 1934 гг. Пік рэпрэсій прыйшоўся на 1935 — 1940 гг. Звыш 85 тыс. нашых суайчыннікаў пацярпелі ад палітычных рэпрэсій у гэты час[1]. Аднак найбольш трагічнымі з'явіліся 1937 — 1938 гг. — самыя чорныя ў гісторыі савецкай Беларусі. Дастаткова сказаць, што з 40,3 тыс. чалавек, звесткі аб якіх апрацаваны ў апошні час, 16 040 чалавек (39,81 %) былі рэпрэсіраваны іменна ў гэтыя два гады[2].

Ажыццяўленне рэпрэсій набыло настолькі масавы характар, што кіраўніцтва НКУС Савецкага Саюза пачало складаць спісы асоб, справы якіх траплялі пад юрысдыкцыю калегіі ваеннага трыбунала. Пры гэтым прыгаворы рыхтаваліся загадзя. Звычайна гэтыя спісы накіроўваліся асабіста Сталіну, які зацвярджаў прапанаваную меру пакарання. Вядома, што на працягу 1937 — 1938 гг. яму былі пасланы 383 такія спісы з імёнамі тысяч партыйных, савецкіх, камсамольскіх, ваенных і гаспадарчых работнікаў. Ён зацвярджаў гэтыя спісы[3].

Практыка самых высокіх эшалонаў улады павінна была быць прадубліравана на месцах. І гэта на самай справе было так. Напрыклад, 23 жніўня 1937 г. начальнік Старобінскага райаддзела НКУС

---

[1] *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20 — 50-х гадоў на Беларусі. С.9.

[2] Звязда. 1996. 17 мая.

[3] *Авторханов А. Г.* Технология власти // Вопросы истории. 1992. №1. С.77.

Гарбачэўскі выпісаў ордэры на арышт з нумара 161 па 231, г. зн. на 70 чалавек[1].

Паводле статыстычных звестак трэцяга аддзела ўпраўлення дзяржаўнай бяспекі НКУС БССР, толькі на працягу трох месяцаў, з 1 чэрвеня па 1 верасня 1938 г., было рэпрэсіравана 6530 "шпіёнаў, дыверсантаў і паўстанцаў польскай, латвійскай і нямецкай разведак". Сярод рэпрэсіраваных больш за ўсё было беларусаў — 2717, палякаў — 2663, латышоў —400, яўрэяў — 375, украінцаў — 68 і г.д. Па сацыяльнаму становішчу рэпрэсіраваныя за гэты час размяркоўваліся наступным чынам: "кулакоў" — 1844, калгаснікаў — 1762, аднаасобнікаў — 640, служачых — 1268, рабочых — 424, кустароў — 227. З гэтай колькасці арыштаваных 299 чалавек працавалі ў Наркаммясцпраме, 227 — у Наркамлесе, 132 — у Наркамземе, 129 — у Наркамасветы. У сувязі з арыштам 181 чалавек быў выключаны з партыі, а 343 пазбаўлены членства ў ёй яшчэ да арышту[2].

Аднак прыведзеныя даныя даюць толькі частковае ўяўленне аб маштабе рэпрэсій у гэты час. Яны ажыццяўляліся і іншымі паралельнымі структурамі карных органоў. Так, па звестках чацвёртага сакрэтна-палітычнага аддзела ўпраўлення дзяржаўнай бяспекі НКУС БССР, на працягу 1937 — 1938 гг. яго супрацоўнікі раскрылі і арыштавалі 2570 удзельнікаў "аб'яднанага антысавецкага падполля". З іх 23 чалавекі працавалі ў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, 16 — у ЦВК і СНК БССР, 40 — наркомамі і іх намеснікамі, 24 — сакратарамі абласных, гарадскіх, раённых саветаў, 179 — кіраўнікамі савецкіх і гаспадарчых органаў, 25 чалавек з'яўляліся работнікамі Акадэміі навук БССР, 40 — выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, 20 — пісьменнікамі[3].

Можна ўявіць тыя маральна-псіхалагічныя абставіны, створаныя ў грамадстве ў выніку такога зацятага і безагляднага ажыццяўлення рэпрэсіўнай палітыкі. Абсалютная большасць людзей з'яўлялася запалоханай, ніхто не быў застрахаваны ад прад'яўлення яму палітычнага абвінавачвання.

Ва ўмовах татальнага вышуку, падазронасці і шпіёнаманіі надзвычай цяжка было адважыцца на

---

[1] Народная газета. 1993. 25 лістап.

[2] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1412, арк. 2 — 12.

[3] Там жа, спр.1410, арк.2, 23.

пратэсты. І тым не менш яны былі. Выяўлялася гэта не толькі ў форме нелегальных лістовак (аб чым ішла гаворка раней), але і ў іншых. У Беларускай ССР некаторае распаўсюджанне атрымалі пасіўныя пратэсты, калі пэўная колькасць людзей у некаторых мясцовасцях займала пазіцыю маўчання ў адносінах да афіцыйных асоб. Так, пры правядзенні студзеньскага перапісу насельніцтва 1937 г. (ён потым быў засакрэчаны, а яго выканаўцы рэпрэсіраваны[1]) уладальнікі 53 аднаасобных гаспадарак з Лепельскага раёна адмовіліся адказваць на пытанні перапісчыкаў. За гэта іх празвалі "маўчунамі". Але маўчалі яны не проста так, а ў выніку таго, што падатковая палітыка ўлад давяла іх да крайніх абставін. За несвоечасовую выплату падаткаў ад іх забралі фактычна ўсё: ураджай, жывёлу, нажыты скарб. Па дадзенаму раёну нават у тых умовах былі ўстаноўлены 143 выпадкі незаконнай канфіскацыі маёмасці. Гэта форма пратэсту з'явілася рэакцыяй даведзеных да адчаю людзей. Аб абставінах у раёне стала вядома нават у Маскве. Расследаваць дадзеную справу ў БССР прыязджаў загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК УКП(б) Якаўлеў[2].

Форма пратэсту ў выглядзе маўчання была распаўсюджана і сярод веруючых. Гэта было іх пасіўным адказам на шырокія рэпрэсіі сярод духоўных асоб. Звыш 200 веруючых Лепельскага і Тураўскага раёнаў перасталі размаўляць з прадстаўнікамі ўлады і часткова нават з мясцовым насельніцтвам. Да таго ж яны адмаўляліся ўдзельнічаць у выбарах, перапісе насельніцтва, выконваць дзяржаўныя пастаўкі па сельгаспрадукцыі[3].

Наогул адносіны ў 30-х гадах бальшавіцкай таталітарнай сістэмы да царквы, маштаб рэпрэсій сярод служыцеляў культу з'яўляюцца надзвычай паказальнымі. Яны сталі працягам палітыкі, што вялася ў папярэдняе дзесяцігоддзе. Аднак яе памеры, бескампраміснасць і жорсткасць значна ўзраслі. Фак-

---

[1] *Жиромская В.Б., Киселев И.Н., Поляков Ю.А.* Полвека под грифом СЕКРЕТНО. Всесоюзная перепись населения 1937 года. М., 1996. С. 3 — 4.

[2] *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20 — 50-х гадоў на Беларусі. С.45.

[3] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1400, арк.57, 64, 72.

тычна справа ішла да поўнага знішчэння рэлігіі як грамадскай з'явы.

У гэтым ганебным намеры таталітарная сістэма бальшавікоў дасягнула многага. Калі да рэвалюцыі на Беларусі мелася 1445 цэркваў і іх дзейнасць забяспечвалі 2155 служыцеляў рэлігійнага культу, то к пачатку 1937 г. у рэспубліцы засталіся толькі 74 дзеючыя царквы. Іх функцыяніраванне забяспечвалі каля 100 духоўных асоб. Налічвалася таксама амаль 300 чалавек, якія знялі з сябе духоўны сан.

Па стану на 24 чэрвеня 1938 г. у Беларускай ССР засталіся толькі дзве дзеючыя царквы — у Оршы і Мазыры. На ўліку ў НКУС БССР было ўсяго 15 служыцеляў культу, у тым ліку 13 тых, хто зняў з сябе царкоўны сан[1].

Як дакладваў 8 чэрвеня 1938 г. у ЦК УКП(б) тагачасны кіраўнік НКУС БССР Наседкін, следствам устаноўлена, што кіраўнікі розных царкоўных арыентацый поўнасцю знаходзіліся на службе германапольскай і японскай разведак яшчэ ў 1918 — 1920 гг. Паводле дадзенай інфармацыі, у ліпені—верасні 1937 г. у БССР была ліквідавана шпіёнска-паўстанцкая арганізацыя "Беларуская праваслаўная аўтакефальная царква" з цэнтрам у Мінску. Як быццам у дзейнасці гэтай арганізацыі ўдзельнічалі два архіепіскапы, у тым ліку Афанасій Вячорка, 30 папоў, да 170 кулакоў, жандараў, былых чыноўнікаў, іншых антысавецкіх элементаў. Паведамлялася таксама, што ў Гомелі і прылеглых да яго раёнах ліквідавана арганізацыя старацаркоўнікаў, якая складалася з 58 удзельнікаў. У Віцебску і прылеглых да яго раёнах выкрыта контррэвалюцыйная шпіёнска-паўстанцкая дыверсійная арганізацыя ў складзе 84 чалавек на чале з архіепіскапам Дабрамыславым. У сакавіку 1938 г. у Мінску і некаторых раёнах выкрыта шпіёнска-паўстанцкая арганізацыя царкоўнікаў на чале з японска-польскім агентам мітрапалітам Бліновым. Яна як быццам налічвала больш за 100 служыцеляў рэлігійных культаў, сектантаў і кулакоў.

Арыштаваным прад'яўлялася абвінавачанне, што на працягу 1936 — 1937 гг. служыцелямі культаў у Беларускай ССР было сабрана да 90 тыс. подпісаў пад заявамі з патрабаваннем адкрыць цэрквы, якія

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1400, арк.56.

не функцыяніруюць. Агульная колькасць арыштаваных удзельнікаў усіх груп, што ўключалі служыцеляў культу і тых, хто ім спачуваў, склала 2387 чалавек. Акрамя таго, у 1937 — 1938 гг. быў ліквідаваны яшчэ шэраг контррэвалюцыйных сектанцкіх арганізацый і груп. У сувязі з гэтым арыштавалі і асудзілі яшчэ 850 чалавек. Галоўным чынам у выніку арыштаў духавенства функцыяніраванне цэркваў у БССР у 1937 — 1938 гг. фактычна спынілася[1].

Як у пачатку 30-х гадоў, так і ў іх канцы карнымі органамі ствараліся антысавецкія арганізацыі, у якія запісвалі многіх людзей. Паводле інфармацыі ад 11 лістапада 1939 г. тагачаснага кіраўніка НКУС БССР Цанавы першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панамарэнку, карнымі органамі была раскрыта агентурная справа № 3 "Ворагі". Яна была заведзена на падставе агентурных матэрыялаў і паказанняў арыштаваных удзельнікаў антысавецкай праватрацкісцкай арганізацыі, якая быццам бы існавала на заходняй чыгунцы. Па гэтай справе былі арыштаваны начальнік чыгуначнай станцыі Мінск Ф.А.Фралоў, дыспетчар станцыі Мінск-Таварная К. С. Мароз і інш.[2]

Хто ж трапляў пад рэпрэсіі? У дадатак да вышэй сказанага пэўны адказ на гэта дае распрацоўка даных на 20 тыс. рэпрэсіраваных асоб. З іх 17 тыс. з'яўляліся жыхарамі Мінска, Мінскай вобласці і 3 тыс. — Віцебскай вобласці. Сярод гэтай колькасці грамадзян Беларускай ССР было 17 958 (89,79 %) мужчын і 2042 (10,21 %) жанчын ва ўзросце ад 18 да 63 гадоў. Людзі ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў складалі звыш 90 %. Большасць сярод рэпрэсіраваных складалі беларусы — 10 554 чалавекі (52,77 %). Палякаў налічвалася 3896 (19,38 %), яўрэяў — 951 (4,76 %), рускіх — 484 (2,42 %).

Па сацыяльнаму паходжанню абсалютная большасць рэпрэсіраваных, як адзначалася вышэй, прыходзілася на сялян — 15 389 чалавек (76, 945 %). Сярод жыхароў вёсак найбольш было сялянаднаасобнікаў — 4243 чалавекі, калгаснікаў — 4121. Рабочых налічвалася ў гэтым спісе 1941 (9,705 %), служачых — 965 (5,825 %).

Зразумела, што дамінавалі сярод тых, хто быў рэпрэсіраваны, беспартыйныя. У дадзеным спісе іх налічвалася 18 699 чалавек (93,49 %). Членаў бальшавіцкай партыі было 1129 чалавек (5,56%).

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1400, арк.57 — 70.

[2] Там жа, спр.1700, арк.3.

Аб стане "законнасці" ў краіне ў гэты час сведчыць той факт, што з усіх 20 тыс. рэпрэсіраваных толькі 1691 чалавек (8,46 %) быў прыцягнуты да адказнасці судамі, справы астатніх разглядаліся пазасудовымі органамі — "двойкамі", "тройкамі", асобымі нарадамі. Найбольш "папулярным" артыкулам крымінальнага кодэксу БССР, на аснове якога прад'яўляліся абвінавачванні, быў артыкул 72 — прапаганда і агітацыя супраць савецкай улады. На аснове яго было асуджана 8627 чалавек (43,14 %). Шырока выкарыстоўваўся артыкул 68 — шпіянаж. На яго падставе асудзілі 6960 чалавек (34,8 %).

Меры пакарання вызначаліся надзвычайнай жорсткасцю: 7482 чалавекі (37,41 %) былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, ці, як было запісана ў крымінальным кодэксе 1928 г., "да вышэйшай меры сацыяльнай абароны", г. зн. расстрэлу. Астатнія атрымалі розныя тэрміны зняволення — ад 1 да 25 гадоў[1]. Абсалютная большасць гэтых людзей затым была рэабілітавана.

Агульная лічба рэпрэсіраваных жыхароў Беларусі яшчэ патрабуе далейшага абгрунтавання і ўдакладнення. Аднак ужо цяпер можна гаварыць, што яна знаходзіцца ў межах 600 — 650 тыс. чалавек. Да 500 тыс. з іх прыходзіцца на Усходнюю Беларусь. Калі зыходзіць з таго, што ў ёй налічвалася да вайны каля 5 млн чалавек, то тут быў рэпрэсіраваны ў сярэднім амаль кожны дзесяты жыхар.

Аб сітуацыі ў БССР у канцы 30-х гадоў у сувязі з масавымі неабгрунтаванымі рэпрэсіямі, аб разгуле беззаконня аўтарытэтна засведчыў першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка ў пісьме сакратару ЦК УКП(б) Г. Маленкову, якое ён накіраваў 3 ліпеня 1939 г. У чэрвені 1938 г. ён узначаліў кампартыю Беларусі і адразу адчуў на сабе тэндэнцыйныя адносіны карных органаў, аб чым ён вымушаны быў пісаць у студзені 1939 г. таму ж Маленкову і прасіць яго абароны[2]. Панамарэнка добра пазнаёміўся са станам спраў у рэспубліцы і як чалавек новы, які непасрэдна не адказваў за тое, што адбывалася, мог гаварыць аб гэтым адкрыта.

У прыватнасці, ён адзначаў, што ў Беларускай ССР асабліва масавы характар набыло стварэнне

[1] Звязда. 1994. 24 лістап.

[2] Звязда. 1996. 10 лют.

правакацыйных спраў супраць раённых, савецкіх і партыйных кіраўнікоў.

Былі выключаны з партыі і па правакацыйных матэрыялах арыштаваны кіраўнікі Бялыніцкага, Рудзенскага, Сенненскага, Бярэзінскага, Чэрвеньскага, Сіроцінскага, Кармянскага і іншых раёнаў. На працягу другой паловы 1937 г. і ў пачатку 1938 г. па непасрэднаму заданню кіраўніцтва ЦК КП(б)Б у рэспубліцы шырока разгарнуліся паказальныя працэсы над раённымі кіраўнікамі. Былі выключаны з партыі і страцілі пасады 24 сакратары раённых камітэтаў, а 33 сакратары зняты з работы і атрымалі партыйныя пакаранні. 35 сакратароў РК, 50 старшынь раённых выканаўчых камітэтаў, яшчэ больш загадчыкаў раённых зямельных і фінансавых аддзелаў былі арыштаваны. Арыштоўваліся многія дырэктары МТС, аграномы, іншыя спецыялісты. Усялякая памылка ці няўдача ў практычнай рабоце, як адзначаў кіраўнік КП(б)Б, цягнула за сабой абвінавачванне ў шкодніцтве, шпіянажы, дыверсіі і выклікала рэпрэсіі[1].

У гэтым дакуменце ахарактарызавана практыка пасяджэнняў вышэйшых выканаўчых партыйных органаў у той час: на кожным пасяджэнні бюро ЦК здымаліся з работы, арыштоўваліся і аддаваліся пад суд некалькі раённых кіраўнікоў. Першы сакратар кампартыі Беларусі канстатаваў, што па самых неверагодных паклёпніцкіх матэрыялах людзі выключаліся з партыі і арыштоўваліся. Далей у пісьме адзначалася, што ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б мог ліквідаваць цэлую раённую арганізацыю. Так, у Бялыніцкі раён быў пасланы Зямцоў. Ён дабіўся выключэння з партыі і арышту раённых кіраўнікоў. Па складзенаму ім спісу з партыі выключылі 17 чалавек. Затым ён закрыў будынак раённага партыйнага камітэта на замок, апячатаў дзверы, ключы аддаў у раённае аддзяленне НКУС і паехаў. Такім жа чынам ён паступіў і ў Рудзенскім раёне. Пры гэтым, калі на пасяджэнні бюро ЦК паведамілі, што сакратар раённага камітэта партыі Плятнёў спрабаваў закончыць жыццё самагубствам, але быў выратаваны, было цынічна заяўлена: «Нічога, дастраляем»[2].

Характэрным для партыйнай работы гэтага часу з'яўляўся прыклад, калі 31 снежня 1937 г. на

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1522, арк.2 — 3.

[2] Там жа, арк.5.

пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б за некалькі гадзін былі разгледжаны па пяці раёнах (Чырвонаслабодскаму, Лёзненскаму, Лоеўскаму, Сенненскаму, Бялыніцкаму) стандартныя аднатыпныя рашэнні, па якіх сакратары раённых камітэтаў і старшыні РВК абвінавачваліся ў правядзенні шкодніцкай лініі, у саўдзельніцтве ў шпіянажы, іншых падобных дзеяннях. Іх выключылі з партыі і арыштавалі.

Работнік ЦК КП(б)Б Лявіцкі разам з былым кіраўніком наркамата ўнутраных спраў Берманам прыехалі ў Бабруйск на сход партыйнага актыву і за адну ноч арыштавалі 17 раённых работнікаў, у тым ліку старшыню РВК і пракурора. Шырока была распаўсюджана практыка агульнага недаверу да кадраў. У партыйнай арганізацыі, як канстатаваў кіраўнік КП(б)Б, былі створаны абставіны невераподнай падазронасці. Такія метады абыходжання з членамі партыі, у тым ліку з кіруючымі работнікамі, распаўсюджваліся на ўсё грамадства. У Быхаўскім раёне ў калгасе "Гайсма" пад відам барацьбы з нацыянальным контррэвалюцыйным фарміраваннем з 70 сем'яў калгаснікаў былі арыштаваны па правакацыйных падложных матэрыялах амаль 68 старэйшын сем'яў латышоў[1].

Гэта пісьмо-дакладная ў ЦК УКП(б) кіраўніка адной з буйнейшых кампартый саюзных рэспублік — ненаўмыснае, але надзвычай сур'ёзнае абвінавачванне рэжыму, створанаму ў Савецкім Саюзе, у тым ліку ў БССР.

Рэпрэсіі — самае цяжкае злачынства бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў яе сталінскім варыянце, учыненае супраць свайго народа. Тэрор, які яму быў аб'яўлены ўладамі, не меў ніякага апраўдання — ні спасылкамі на класавую барацьбу, ні на капіталістычнае акружэнне, ні на перспектыву сусветнай рэвалюцыі. Кошт жыцця чалавека ў краіне, дзе будаваўся сацыялізм, быў зведзены да самай нізкай адзнакі, а часам і зусім на нішто. Гэтымі злачыннымі дзеяннямі таталітарны сталінскі рэжым назаўсёды паставіў сябе ў шэраг самых крывавых і дэспатычных рэжымаў, якія зведала чалавецтва за ўсю гісторыю свайго існавання.

Шырокамаштабныя неабгрунтаваныя палітычныя рэпрэсіі, створаныя ў БССР, як і ва ўсім Савецкім

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1522, арк.5.

Саюзе, абставін усеагульнай падазронасці, страху, даносаў, калі ніхто не быў застрахаваны ад арышту і допытаў з прымяненнем самых садысцкіх метадаў фізічнага ўздзеяння, — усё гэта сведчыць аб поўным укараненні на працягу 30-х гадоў у жыццё грамадства бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў яе найбольш адыёзным антычалавечным варыянце. Разам з каманднымі метадамі ў эканоміцы, адміністраваннем у сацыяльнай сферы, дыктатам у грамадска-палітычным жыцці, вынішчэннем шматлікіх праяў нацыянальнага былі створаны абставіны поўнага таталітарнага партыйна-дзяржаўнага праўлення.

Разам з тым бальшавіцкая таталітарная сістэма змагла мабілізаваць працоўных (галоўным чынам пазаэканамічнымі метадамі) на самаадданую і гераічную працу ў імя новай, сацыялістычнай будучыні. Тыя дасягненні, што меліся ў прамысловым і культурным развіцці, надзвычай мажорная танальнасць афіцыйнай прапаганды ў спалучэнні са шматлікімі адмоўнымі рысамі ў будаўніцтве жыцця на сацыялістычных пачатках рабілі новае грамадства супярэчлівым, шмат у чым драматычным і трагічным.

## РАЗДЗЕЛ 4

# УЗДЗЕЯННЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ ТАТАЛІТАРНАЙ СІСТЭМЫ НА ЗАХОДНЮЮ БЕЛАРУСЬ

### 1. Уплыў на сацыяльны і нацыянальна-вызваленчы рух

Стваральнікі бальшавіцкай таталітарнай сістэмы клапаціліся не толькі аб яе ўзмацненні непасрэдна ў Савецкім Саюзе, кожным яго рэгіёне, але імкнуліся распаўсюдзіць свае метады ўздзеяння на жыццё грамадства па-за межамі краіны. Пры гэтым яны кіраваліся ідэяй аб сваёй выключнай місіі ў гісторыі чалавецтва і інтарэсамі сусветнай рэвалюцыі, у ажыццяўленне якой працягвалі верыць нягледзячы на яе адступленне яшчэ ў пачатку 20-х гадоў.

Распаўсюджанне свайго ўплыву яны перш за ўсё бачылі на тэрыторыях, насельніцтва якіх было ўключана ў склад іншых дзяржаў і адарвана ад той этнічна роднаснай часткі, што знаходзілася ў СССР. Праводзіць адпаведную работу на такіх землях можна было абапіраючыся на тую частку нацыі, якая знаходзілася ў межах савецкай дзяржавы і поўнасцю падпарадкоўвалася яе кіраўніцтву. У дадзеных умовах этнічны фактар, які ўсё больш ігнараваўся кіраўніцтвам СССР ва ўнутранай палітыцы, выкарыстоўваўся з гэтай мэтай у максімальнай ступені.

Такімі тэрыторыямі за межамі Савецкага Саюза ў першую чаргу з'яўляліся Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь, што ўваходзілі на працягу 1921 — 1939 гг. у склад Польшчы. Яны былі даволі значнымі як па памерах, так і па колькасці насельніцтва. Насільны адрыў ад другой часткі этнасу, сацыяльны і нацыянальны ўціск з боку польскіх улад аб'ектыўна стваралі на гэтых землях абставіны, спрыяльныя для вядзення бальшавіцкай прапаганды.

Што датычыць Заходняй Беларусі, то сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя ўмовы для такой работы былі асабліва спрыяльнымі. Разбураль-

ныя вынікі першай сусветнай вайны, нямецка-кайзераўскай і польскай акупацый, савецка-польскай вайны, каланізацыйная палітыка польскіх улад, што ўключала ўсё мацнеючую паланізацыю беларускага насельніцтва, стваралі ў краі абставіны цяжкага матэрыяльнага становішча і нацыянальнай прыгнечанасці сярод сялян, рабочых, інтэлігенцыі. Гэта вяло да ўзнікнення на заходнебеларускіх землях атмасферы сацыяльнай напружанасці.

Яе вызначальным момантам з'яўлялася ўсведамленне шырокімі пластамі народа гістарычнай несправядлівасці ў адносінах да беларускай нацыі ў сувязі з яе падзелам на дзве часткі. З улікам агульных ваенна-палітычных абставін і традыцый апошніх 125 гадоў, калі Беларусь знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, па сутнасці неаспрэчнай была думка аб тым, што Заходняя Беларусь праз БССР павінна ўвайсці ў межы Савецкага Саюза.

Дадзеная акалічнасць у поўнай ступені была выкарыстана бальшавіцкім кіраўніцтвам для ажыццяўлення такой палітыкі на заходнебеларускіх землях, якая садзейнічала б вяртанню іх у склад СССР. Гэта палітыка была сугучная імкненням асноўнай часткі заходнебеларускага насельніцтва, хаця кардынальна супярэчыла Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 г., у якім сцвярджалася, што бакі абавязваюцца не ствараць і не падтрымліваць арганізацыі, якія маюць на мэце барацьбу з іншым бокам[1].

Аднак з-за несправядлівага і нават грабежніцкага характару Рыжскага міру адносна заходнебеларускіх зямель гэта акалічнасць не прымалася пад увагу ні кіраўнікамі БССР, ні тымі заходнебеларускімі дзеячамі, якія ўзначальвалі арганізацыі і рухі, што выступалі за ўз'яднанне з Усходняй Беларуссю. Што датычыць кіраўніцтва савецкай краіны, то ахвяраванне падчас заключэння Рыжскага міру заходнімі тэрыторыямі Беларусі і Украіны расцэньвалася як вымушаны і часовы акт. Польская дзяржава пры гэтым разглядалася (і не без падстаў) у якасці фарпоста антысавецкіх сіл на захадзе.

Гэта ацэнка вызначала і ваенна-палітычную лінію

[1] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. М., 1965. Т.3. С.525.

як у цэлым адносна Польшчы, так і заходнебеларускіх зямель. Што датычыць апошніх, то дзеянні савецкіх улад былі даволі актыўнымі, напорыстымі і нярэдка бесцырымоннымі. Не даводзячы справу да міждзяржаўных ваенных канфліктаў паміж СССР і Польшчай, яны тым не менш падтрымлівалі ўзброеную партызанскую барацьбу, якая мела месца на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў першай палове 20-х гадоў. Формы і метады гэтай падтрымкі былі самыя розныя — ад палітычнай прапаганды да засылкі ўзброеных атрадаў і дыверсійных груп.

Палітычная агітацыя па свайму зместу была скіравана ў адзін бок — прасавецкі, пракамуністычны. Яна ўключала як прапаганду дасягненняў БССР і СССР у сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным развіцці, так і зусім неверагодныя абяцанні ў выпадку пашырэння заходнебеларускім насельніцтвам узброенай барацьбы. Адзін з актывістаў нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі сярэдзіны 20-х гадоў С. Хмара (падпольная мянушка — Сіняк, чалавек, якому ў польскай дэфензіве перабілі барабанную перапонку і які адсядзеў больш за дзесяць гадоў у польскіх, савецкіх і нямецкіх турмах) ва ўспамінах засведчыў: камуністы пускалі правакацыйныя чуткі, што калі Заходняя Беларусь пачне ўзброенае паўстанне, то савецкая Беларусь аб'явіць сябе незалежнай і дапаможа паўстаўшым зброяй, каб злучыцца ў беларускую дзяржаву, асобную ад СССР[1].

Аднак асноўная стаўка бальшавіцкім кіраўніцтвам рабілася на непасрэднае пашырэнне ў Заходнебеларускім краі партызанскай барацьбы. Сюды накіроўваліся ўзброеныя атрады і групы на чале са спрактыкаванымі ўдзельнікамі грамадзянскай вайны. Пасля пераходу граніцы гэтыя фарміраванні папаўняліся мясцовымі добраахвотнікамі і ператвараліся ў немалыя баявыя адзінкі. Дадзеная практыка значна актывізавалася пасля таго, як у 1923 г. была створана камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая па сутнасці ўзначаліла ўзброеную барацьбу і надала ёй больш арганізаваны і мэтанакіраваны характар. У выніку ўзрасла актыў-

[1] Народная газета. 1995. 25 — 27 лют.

насць баявых дзеянняў, было зроблена нямала адпаведных акцый. У прыватнасці, у маі 1924 г. партызаны разграмілі паліцэйскія ўчасткі ў мястэчку Крывічы Вілейскага павета, у жніўні — у Стоўбцах, у кастрычніку — у Кажан-Гарадку Столінскага павета, у верасні быў зроблены напад на цягнік, у якім ехаў ваявода з іншымі чыноўнікамі. Толькі з красавіка 1924 г. да лістапада 1925 г. партызаны ажыццявілі ў Заходняй Беларусі каля 250 баявых аперацый. Летам 1924 г. польскія ўлады вымушаны былі нават увесці асаднае становішча на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства. Супраць партызан былі накіраваны войскі і атрады паліцыі[1].

Прыкметны, а магчыма, самы значны ўклад у разгортванне партызанскай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўнёс ураджэнец в. Мышкавічы сучаснага Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці К.П.Арлоўскі. Ён прымаў актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне, дзе набыў значны баявы вопыт. З мая па ліпень 1920 г. ён арганізаваў чырвонапартызанскі атрад у тыле белапольскіх акупантаў, байцы якога ўзарвалі чыгуначны мост, захапілі польскі абоз з 60 падводамі, забілі не менш 200 акупантаў, ажыццявілі іншыя дыверсійныя акты. К. П. Арлоўскі быў накіраваны савецкім разведупраўленнем у Заходнюю Беларусь, дзе знаходзіўся па май 1925 г. у якасці арганізатара і камандзіра чырвонапартызанскіх атрадаў і дыверсійных груп. Пад яго кіраўніцтвам было ажыццёўлена некалькі дзесяткаў баявых аперацый, у тым ліку спынены тры пасажырскія цягнікі, узарваны чыгуначны мост, заняты дзве чыгуначныя станцыі, тры мястэчкі, некалькі памешчыцкіх маёнткаў. Як засведчыў ён сам, толькі за адзін 1924 г. па яго ініцыятыве і асабіста ім было забіта больш за 100 жандараў і памешчыкаў[2].

Эфектыўная баявая дзейнасць атрадаў і груп пад кіраўніцтвам К.П.Арлоўскага, як, дарэчы, і іншых (у прыватнасці, С.А.Ваўпшасава), у многім была прадвызначана дапамогай савецкай Расіі. Вядома, што для гэтай мэты нават стварылі пры вышэйшым кіраўніцтве Чырвонай Арміі “нелегальную ваенную

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.229.

[2] Народная газета. 1995. 25 — 27 лют.

арганізацыю". Яе дзеянні скіроўваліся на заходні напрамак. Работа гэтай, а таксама іншых адпаведных структур была пастаўлена належным чынам. Тыя, хто найбольш праявіў сябе ў дыверсійнай рабоце на акупаванай Польшчай заходнебеларускай тэрыторыі, нават узнагароджваліся. Так, К.П.Арлоўскага ў 1923 г. узнагародзілі імянной агнястрэльнай аўтаматычнай зброяй з надпісам: "За боевую работу на Западном фронте"[1].

У мэтах арганізацыі барацьбы на заходнебеларускіх землях, пашырэння і паглыблення бальшавіцкага ўплыву важна было павысіць ролю кампартыі Беларусі. Імкненне яе кіраўнікоў выканаць гэту задачу было надзвычай напорыстым. Нават ва ўмовах спаду рэвалюцыйнага руху ў Польшчы яны імкнуліся да яго максімальнай актывізацыі.

Другая канферэнцыя КПЗБ, што адбылася 30 лістапада 1924 г. у Вільні, нават узяла курс на падрыхтоўку ўзброенага паўстання. Аднак гэта было памылковае рашэнне. Яно дазволіла польскім уладам рэзка ўзмацніць рэпрэсіі. У першую чаргу яны былі скіраваны на беларускае насельніцтва. Пачаліся масавыя арышты і катаванні мірных жыхароў, якіх западозрылі ў сувязях з партызанамі. Толькі ў красавіку 1925 г. у Навагрудскім ваяводстве паліцыя арыштавала каля 1400 чалавек. Пасля гэтай і іншых масавых карных акцый ЦК кампартыі Заходняй Беларусі вымушаны быў заклікаць адмовіцца ад узброенай барацьбы. Восенню 1925 г. партызанскі рух у Заходняй Беларусі фактычна спыніўся[2]. Такая пазіцыя КПЗБ, несумненна, была ўзгоднена з партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам у Мінску і Маскве. Кіраўнікі Савецкага Саюза не палічылі магчымым пайсці на абвастрэнне адносін з суседняй Польшчай і пашырыць узброеную барацьбу на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Гэта пазіцыя была замацавана ў адпаведных рашэннях, прынятых на высокім узроўні. У прыватнасці, 25 лютага 1925 г. палітбюро ЦК УКП(б) зацвердзіла пастанову камісіі па актыўнай разведцы. У ёй адзначалася, што актыўная разведка — гэта дзеянне дыверсійных, ваенна-падрыўных груп і г. д. З усталяваннем больш ці менш нармальных дыпламатычных адносін з прымыкаючымі да СССР краінамі развед-

[1] Народная газета. 1995. 25 — 27 лют.
[2] НАРБ, ф.242, воп.1, спр.563, арк.51.

вальным упраўленнем неаднаразова даваліся дырэктывы аб спыненні актыўных дзеянняў. Аднак набытыя арганізаванымі за мяжой групамі традыцыі, слабасць кіраўніцтва з боку камуністычнай партыі, стыхійна нарастаючы рух замежнага сялянства, з асяроддзя якога камплектаваліся кадры дыверсійных груп актыўнай разведкі, не давалі магчымасці арганізавана кіраваць гэтымі групамі, якія часта не выконвалі неабходныя дырэктывы. Адсюль вынікаў цэлы шэраг выступленняў, што шкодзілі савецкай дыпламатычнай рабоце і абцяжарвалі працу адпаведных камуністычных партый[1].

Далей у дакуменце гаварылася: з-за яскрава вызначанай немагчымасці шляхам цыркуляраў увесці ў патрэбнае рэчышча работу замежных партыйных груп і прымаючы пад увагу, што камуністычныя партыі ўжо рэальна паставілі пытанне аб захопе пад свой уплыў стыхійна ўзрастаючага руху на ўскраінах, прызнаць неабходным:

актыўную разведку (арганізацыя сувязі, забеспячэнне і кіраўніцтва дыверсійнымі атрадамі на тэрыторыі Польскай Рэспублікі) ліквідаваць;

ні ў адной краіне не павінна быць нашых актыўных баявых груп, якія ажыццяўляюць баявыя акты і атрымліваюць ад нас непасрэдна сродкі, указанні і кіраўніцтва;

уся баявая і паўстанцкая работа атрадаў і груп, паколькі яны палітычна мэтазгодны (што вызначаецца ў чыста партыйным парадку), павінна быць перададзена ў поўнае падпарадкаванне камуністычнай партыі дадзенай краіны. Астатнія групы актыўнай разведкі павінны быць ліквідаваны[2].

Значыць, у сярэдзіне 20-х гадоў бальшавіцкае кіраўніцтва, зыходзячы з унутраных умоў і знешнепалітычных абставін, рабіла захады, каб адмежавацца ад той дыверсійнай работы, што вялася на тэрыторыі Польшчы, у тым ліку ў Заходняй Беларусі. Частка дыверсійных сіл перадавалася ў падпарадкаванне мясцовым камуністам. Аднак трэба адзначыць, прымаючы пад увагу залежнасць камуністычных партый Польшчы і Заходняй Беларусі ад кіраўнікоў Савецкага Саюза, іх ўплыў на дыверсійную работу, несумненна, заставаўся.

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.2, арк.79.

[2] Там жа, арк.79 — 80.

Далей у дадзенай пастанове ставілася задача, каб для чыста ваенных мэт замест актыўнай разведкі арганізоўваць у суседніх дзяржавах самым кансператыўным чынам асобыя пункты для абследавання і вывучэння ваенных аб'ектаў, устанаўлення сувязі з патрэбнымі людзьмі. Гэта павінна быць зроблена для падрыхтоўкі да дэструктыўнай работы ў час вайны ў тыле праціўніка.

Пастанова таксама прадугледжвала, каб на савецкай тэрыторыі ствараліся строга законспіраваныя невялікія баявыя групы з неабходным узбраеннем. У выпадку заняцця нашай тэрыторыі праціўнікам іх задачай з'яўляліся дэзарганізацыя варожага тылу і партызанская вайна[1].

З гэтага вынікае, што ўжо ў сярэдзіне 20-х гадоў вышэйшае партыйнае кіраўніцтва фактычна ставіла задачу ствараць на самых заходніх рубяжах савецкай тэрыторыі пэўную базу для арганізацыі партызанскай вайны ў выпадку акупацыі яе варожым бокам. Аднак з-за высокай ступені сакрэтнасці дадзенай пастановы пра гэту задачу ведала вельмі абмежаванае кола вышэйшага кіраўніцтва бальшавіцкай партыі.

Каб з найменшымі стратамі правесці адзначаныя мерапрыемствы, пазбегнуць незадаволенасці дыверсійных атрадаў, груп ці асоб, пастанова прызнавала неабходным выдзеліць адпаведныя сумы грошай, каб забяспечыць стварэнне ўмоў для работы на будучае ў памерах, якія гарантуюць арганізаваную і вытрыманую дзейнасць усіх супрацоўнікаў.

Далей у пастанове адзначалася, што ўсе акрэсленыя меры могуць быць шкоднымі, калі не будзе праведзена цвёрдая і ясная палітыка ў адносінах да Польшчы, якая ўжо вызначана палітбюро. Пры гэтым канстатавалася, што польскі ўрад у дадзеным пытанні не мае супраць нас яўных доказаў, а базіруецца толькі на здагадках. Таму ўсялякім выпадам з польскага боку павінен быць дадзены рашучы адпор. Вышэйшае партыйнае кіраўніцтва савецкай краіны палічыла неабходным запісаць у гэтым дакуменце, каб яшчэ раз звярнуць увагу камуністычных партый усходніх ускраін Польшчы на неабходнасць кіравання сялянскім рухам у дадзеных мясцовасцях. Пры гэтым мелася на ўвазе аказваць сялянству дапамогу ў яго барацьбе за лепшае жыццё, імкнуцца надаць руху арганізаваны характар,

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.2, арк.80.

выкарыстоўваючы ўсе магчымыя формы: беспартыйныя сялянскія камітэты, камітэты абароны і інш[1].

Ва ўмовах згортвання дыверсійнай работы гэты напрамак станавіўся вызначальным. Партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР і БССР скіравала свае намаганні на пашырэнне ўплыву ў масавых арганізацыях, што ўзніклі з-за незадаволенасці заходнебеларускага насельніцтва каланізацыйнай палітыкай Польшчы. Самай значнай сярод іх з'яўлялася Беларуская сялянска-рабочая грамада, якая сфарміравалася ў маі—чэрвені 1926 г. Яе ўзначалілі шырока вядомыя ў Заходнебеларускім краі нацыянальныя дзеячы Б.А.Тарашкевіч (старшыня), М.Т.Бурсевіч, П.П.Валошын, М.В.Мятла, С.А.Рак-Міхайлоўскі і інш. Арганізацыя хутка вырасла да значных памераў: ад 950 чалавек у чэрвені 1926 г. да 45 тыс. у верасні, 68 тыс. у лістападзе, 100 тыс. у пачатку 1927 г., 117 тыс. па стану на 1 лютага і 150 тыс. на 22 сакавіка гэтага ж года[2].

Зыходзячы са сваіх палітычных установак і выконваючы ўказанні цэнтральных партыйных органаў у Мінску і Маскве, КПЗБ імкнулася як мага больш пашырыць і паглыбіць свой уплыў на Грамаду. У яе ўступілі звыш 200 камуністаў, якія ўваходзілі не толькі ў склад цэнтральных органаў, павятовых і гмінных камітэтаў, але стаялі на чале некаторых гурткоў. У многім яны вызначалі палітычную лінію і характар практычных дзеянняў арганізацыі, членам якой нават выдаваліся партыйныя білеты[3]. Уплыў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і культурна-асветных фарміраванняў на Грамаду быў значна аслаблены.

У канцы 1926 г. антыпольская дзейнасць Грамады набыла асабліва значны размах. Каб пазбегнуць перарастання яе ва ўзброенае паўстанне, урад Ю. Пілсудскага, які прыйшоў да ўлады ў маі 1926 г. у выніку дзяржаўнага перавароту, прыняў рашэнне разграміць арганізацыю. У ноч на 15 студзеня 1927 г. па ўсёй заходнебеларускай тэрыторыі пачаліся масавыя вобыскі і арышты камуністаў і іншых дзеячаў Грамады. Былі кінуты ў турмы і аддадзены пад суд 490 чалавек. 21 сакавіка 1927 г. арганізацыю

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 162, спр. 2, арк. 81.

[2] НАРБ, ф. 242, воп. 1, спр. 563, арк. 51.

[3] Там жа.

афіцыйна забаранілі. Над 56 кіраўнікамі і актывістамі Грамады адбыўся палітычны працэс. Ён праходзіў у Вільні ў лютым — маі 1928 г.[1]

Лейтматывам абвінаваўчага боку на працэсе была сувязь Грамады з камуністычным рухам, моцны ўплыў Мінска і Масквы на яе дзейнасць. Гэтыя прэтэнзіі з'яўляліся не беспадстаўнымі. У распараджэнні следчых меліся адпаведныя факты, у прыватнасці тое, што ў беларускай гімназіі ў Радашковічах збіраліся сродкі для міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі, што многія яе вучні паўцякалі праз дзяржаўную мяжу ў сталіцу Беларускай ССР — Мінск. Паводле даных польскага боку, 9/10 друкаванай прадукцыі Грамады дастаўлялася з Мінска[2].

Істотным момантам у характарыстыцы ўздзеяння бальшавіцкага кіраўніцтва на Грамаду былі суадносіны ў яе рабоце нацыянальных беларускіх задач, за што выступалі кіраўнікі нацыянальна-дэмакратычных партый і культурна-асветных фарміраванняў, і камуністычнага ўплыву з боку КПЗБ. Афіцыйныя польскія ўлады ацэньвалі вынік гэтай супярэчнасці такім чынам, што камуністы выйгралі дадзеную партыю ў нацыянальнага беларускага элемента Грамады, што яны "апанавалі" арганізацыю і былі "поўнымі гаспадарамі" ў ёй[3].

Такое становішча было не выпадковым. Як адзначалася ў час працэсу над кіраўнікамі Грамады ліберальна-дэмакратычным заходнебеларускім друкам, можна з упэўненасцю гаварыць, што адным з галоўных рухавікоў невядомага ў гісторыі беларускага народа масавага грамадскага руху была іменна моц бальшавіцкай Расіі, якая падабалася беларускаму селяніну і цень якой заўсёды стаяў за Грамадою. Пад гэтым уплывам нацыянальны момант у яе дзейнасці адыходзіў на другі план, уступаючы месца сацыяльным задачам. Памылкова думаць, што Грамада арганізавалася раптам. Яе ўзнікненне было падрыхтавана на працягу некалькіх гадоў, калі вялася сістэматычная камуністычная агітацыя на заходнебеларускіх землях. Бальшавікі не шкадавалі грошай на адпаведны беларускі друк з камуністычнай афарбоўкай, але пад радыкальна-нацыянальным

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.233.

[2] Gazeta Warszawska. 1928. 28 kw.

[3] Беларускі дзень. 1928. №15.

прыкрыццём. Адначасова выдзяляліся сродкі і на нелегальную работу. Усё гэта паступова падрыхтавала глебу для ўзнікнення Грамады. Гэты друк прызнаваў, што камуністычнае пранікненне ў беларускі рух ніколі не заходзіла так далёка, як у часы Грамады. Канстатавалася таксама, што "адчуваецца нейкая таемная рука, якая мае вялікі ўплыў"[1].

Новыя, раней невядомыя дакументы пэўным чынам праліваюць святло на тое, як ажыццяўлялася ўздзеянне на сацыяльны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў напрамку надання яму прасавецкай арыентацыі. Гэтым займаліся самыя высокія партыйныя органы, выкарыстоўваючы каланіяльную палітыку польскіх улад на заходнебеларускіх землях. У прыватнасці, палітбюро ЦК УКП(б) 20 студзеня 1927 г. прыняло рашэнне, што Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сувязі са становішчам у Заходняй Беларусі павінен разгарнуць у друку, а таксама на сходах у гарадах і вёсках шырокую кампанію пратэсту супраць фашысцкага тэрору ў Польшчы, асабліва ў Заходняй Беларусі. Пры гэтым планавалася правесці ў Беларускай ССР кампанію збору грошай для дапамогі зняволеным у турмах Польшчы, а таксама сем'ям, якія пацярпелі ад белага тэрору, асабліва ў сувязі з апошнімі арыштамі.

Пастанова таксама патрабавала правесці ў БССР у парадку грамадскай ініцыятывы збор хлеба і грашовых ахвяраванняў для галадаючага насельніцтва Заходняй Беларусі, асабліва дзяцей, не ствараючы пакуль што спецыяльнага цэнтральнага органа ў выглядзе Камітэта дапамогі галадаючым Заходняй Беларусі. Прадугледжвалася, што пытанне аб яго стварэнні можа быць пастаўлена ў далейшым перад палітбюро.

Згодна з пастановай, акрамя адзначаных момантаў у змест кампаніі неабходна было ўключыць наступныя лозунгі:

фашысцкі разгром Пілсудскім масавага рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі з'яўляецца падрыхтоўкай тылу для будучага нападзення Польшчы на БССР;

шляхам фашысцкіх пераваротаў у пагранічных з СССР дзяржавах Англія рыхтуе нападзенне на СССР;

---

[1] Кур'ер Віленскі. 1928. 23 сак.; Слова. 1928. № 81.

задача працоўных Беларускай ССР — умацаванне справы абароны Савецкага Саюза і тым самым забеспячэнне правядзення савецкай палітыкі міру.

Асабліва звяртае на сябе ўвагу тое месца пастановы, дзе ўказвалася, што ЦК КП(б)Б павінен імкнуцца да таго, каб кампанія прыняцця рэзалюцый не насіла характару кіруемай зверху. У той жа час разведвальнаму ўпраўленню было загадана пазбягаць у Заходняй Беларусі момантаў, якія б маглі ствараць паўстанцкія настроі. Разам з тым было вырашана даць указанне друку аб наданні дастатковай увагі падзеям, што адбываліся ў "польскай Беларусі"[1].

Дадзенае рашэнне мела працяг. У першую чаргу гэта адносіцца да ідэі стварэння арганізацыі, якая займалася б дапамогай тым жыхарам заходнебеларускіх зямель, якія цярпелі ад цяжкага існавання. Разгледзеўшы 21 красавіка 1927 г. "пытанне ЦК Кампартыі Беларусі", палітбюро вырашыла даручыць ЦК КП(б)Б працягнуць кампанію дапамогі працоўным Заходняй Беларусі. З гэтай мэтай прадугледжвалася арганізаваць у БССР Камітэт дапамогі пацярпеўшым ад неўраджаю ў Заходняй Беларусі. Меркавалася стварыць гэты камітэт з прадстаўнікоў ЦК, Сялянскага камітэта грамадскай узаемадапамогі,Чырвонага Крыжа,Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў Беларусі, іншых арганізацый. Але ў камітэт не павінны былі ўваходзіць афіцыйныя прадстаўнікі ўрада. Было даручана ўстанавіць асоб у Польшчы, праз якіх камітэт будзе ажыццяўляць дапамогу[2].

Разам з тым вышэйшы выканаўчы партыйны орган прымаў рашэнні аб прамым фінансаванні адпаведнай работы на заходнебеларускай тэрыторыі. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць рашэнне палітбюро ЦК УКП(б) ад 30 сакавіка 1927 г. Пасля абмеркавання пытання "Аб валютнай смеце ЦК КП Беларусі" было вырашана дазволіць ЦК КП(б)Б расходаваць дадаткова да адпушчаных раней сродкаў да канца бюджэтнага года праз сакратарыят Камуністычнага Інтэрнацыянала на закардонную работу 48 тыс. долараў і адпаведна павялічыць на гэтую суму смету выканаўчага камітэта Камінтэрна[3].

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.4, арк.49 — 50.

[2] Там жа, арк.104 — 105.

[3] Там жа, арк.114.

Вышэйшае партыйнае кіраўніцтва Савецкага Саюза сачыла за падрыхтоўкай і ходам працэсу над кіраўнікамі і актывістамі Грамады, арганізаванага польскімі ўладамі. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць пастанова палітбюро ад 15 сакавіка 1928 г. "Аб санкцыяніраванні арганізацыі камітэта навуковых работнікаў і пісьменнікаў па абароне Беларускай сялянска-рабочай грамады". У рашэнні была выказана згода з прапановамі ЦК КП(б)Б аб тым, каб зацвердзіць праграму работы камітэта на бліжэйшы перыяд. Праграма ўключала выпуск зваротаў да працоўных усяго свету і дзеячаў культуры, выданне спецыяльнай брашуры аб працэсе над Грамадой, зварот да секцыі навуковых работнікаў СССР і да асобных вучоных з заклікам далучыцца да пратэсту. Прадугледжвалася звярнуцца да прагрэсіўных дзеячаў Польшчы з прапановаю выступіць у абарону Грамады. Меркавалася пасланць двух членаў камітэта за мяжу (у Чэхаславакію і Германію) для арганізацыі кампаніі пратэсту[1]. Такім чынам, пастанова прадугледжвала ажыццяўленне практычных захадаў з тым, каб узняць як мага больш высокую хвалю пратэсту ў абарону кіраўнікоў і актывістаў Грамады.

У той жа час трэба адзначыць, што савецкая прапаганда і адпаведная дзейнасць бальшавікоў знаходзілі спрыяльную глебу сярод насельніцтва Заходняй Беларусі. Гэта меў на ўвазе і заходнебеларускі друк, калі сцвярджаў, што Грамада складала ў беларускіх масах занадта вялікі рух, каб можна было яго тлумачыць толькі грашыма ці "інтрыгай Масквы". Кіраўнікі Грамады былі дэмакратычнымі нацыянальнымі дзеячамі, ва ўсякім разе не прыхільнікамі камуністычнай дактрыны. "Усходняя арыентацыя" ў дзейнасці Грамады ў значнай ступені стала вынікам нацыянальнай палітыкі ўлад Польшчы, а не сімпатый да савецкага ладу жыцця[2]. Сведчанні абвінавачвання адносна залежнасці Грамады ад савецкай Расіі з'яўляліся раўназначнымі таму, што тагачасная польская палітыка па беларускаму пытанню пацярпела поўнае паражэнне[3].

Кароткая, але насычаная гісторыя Беларускай сялянска-рабочай грамады з'яўляецца асабліва паву-

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 162, спр. 6, арк. 41.

[2] Работнік. 1928. 20 крас.

[3] Кур'ер Віленскі. 1928. 21 крас.

чальным момантам у беларускім нацыянальным руху. Узнікшая на глебе вострага незадавальнення жыхароў Заходнебеларускага краю каланіяльнай палітыкай польскіх улад, яна тут жа зведала энергічнае ўздзеянне з боку партыйна-дзяржаўных органаў савецкай Беларусі і СССР. Гэта акалічнасць, як і палітызацыя работы Грамады, усё большая перавага ў ёй прасавецкіх тэндэнцый, несумненна, паскорылі яе знікненне з арэны грамадскага жыцця. Уздзеянне з усходу і захаду — характэрная рыса ўсёй шматвяковай гісторыі Беларусі.

Аднак і пасля разгрому Грамады асноўная тэндэнцыя барацьбы беларускага народа за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працягвалася. Не спынялася і імкненне розных сіл максімальна ўздзейнічаць на гэту барацьбу ў сваіх мэтах. Выбраныя ў 1926 г. у сейм Польшчы дэпутаты ад рабочых і сялян Заходняй Беларусі Ф. Валынец, Я. Гаўрылік, І. Грэцкі, І. Дварчанін, П. Крынчык утварылі ў ім радыкальную фракцыю — Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб "Змаганне". Неўзабаве ён аб'яднаў вакол сябе некалькі соцень былых актывістаў Грамады. Узніклі 16 павятовых сакратарыятаў. Клуб ператварыўся ў рэвалюцыйна-дэмакратычную і нацыянальна-вызваленчую арганізацыю, але прыняць масавы характар яму не дазволілі польскія ўлады.

Кампартыя Заходняй Беларусі не пакінула без увагі і дадзеную арганізацыю. Пад яе уплывам ужо ў 1929 г. кіраўніцтва клуба пачало займаць больш жорсткую пазіцыю ў адносінах да дробнабуржуазных партый і да тых, хто ім спачуваў, а таксама празмерна завастраць патрабаванні і лозунгі барацьбы. Гэта не садзейнічала пашырэнню ўплыву арганізацыі сярод насельніцтва.

Абвастрэнне палітычнай лініі ў дзейнасці КПЗБ было абумоўлена ўзмацненнем левасектанцкіх тэндэнцый, што грунтаваліся на памылковых рашэннях VI кангрэса Камінтэрна, які адбыўся ў другой палове ліпеня — пачатку верасня 1928 г. Такая палітыка была навязана яму бальшавіцкім кіраўніцтвам, якое зыходзіла з перспектывы пралетарскіх рэвалюцый у іншых краінах і палажэння аб адсутнасці істотнай розніцы паміж сацыял-дэмакратамі і фашыстамі[1].

Аб актыўнай пазіцыі кіраўніцтва Саюза ССР у развіцці ўнутрыпалітычных абставін на заходне-

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.235.

беларускіх і заходнеўкраінскіх землях, імкненні паўплываць на гэты працэс сведчыць рашэнне палітбюро ЦК УКП(б), прынятае 5 студзеня 1928 г. З мэтаю каардынацыі ўсёй работы сярод нацыянальных меншасцей Польшчы было прынята рашэнне стварыць у Маскве пастаянную камісію палітбюро ў складзе Бухарына (з заменай Пятніцкім), Кагановіча (з заменай Скрыпнікам), Стаманякова, Уншліхта, Трылісера, Кнорына. Камісія павінна была сістэматычна, не радзей разу ў месяц, заслухоўваць даклады і інфармаваць аб рабоце сярод нацыянальных меншасцей у Польшчы і выпрацоўваць асноўныя дырэктывы для правядзення гэтай работы[1].

Зразумела, што дадзеныя дырэктывы маглі ўздзейнічаць на грамадска-палітычныя працэсы, якія адбываліся на заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх землях, толькі пры ўмове іх матэрыяльнага забеспячэння. Гэты бок дзейнасці пастаянна мела на ўвазе вышэйшае савецкае партыйнае кіраўніцтва. Як і раней, КПЗБ атрымлівала праз пэўныя каналы, пераважна праз ЦК КП(б)Б ці выканаўчы камітэт Камінтэрна, некаторыя сродкі. У прыватнасці, рашэннем палітбюро ЦК УКП(б) ад 20 красавіка 1930 г. было вырашана выдаць у валюце з рэзерву Саўнаркома 45 тыс. руб. для КПЗУ і 15 тыс. руб. для КПЗБ[2].

Такія рашэнні паўтараліся перыядычна. 19 сакавіка 1933 г. было вырашана адпусціць ЦК КП(б) Беларусі 8 тыс. амерыканскіх долараў з тым, каб выдача іх праводзілася ў злотых[3]. Сума, выдадзеная ў польскіх грашовых знаках, прадвызначалася для выкарыстання на тэрыторыі Польшчы і ў першую чаргу ў Заходняй Беларусі.

Усталяванне і ўзмацненне ў 30-я гады бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў СССР, у тым ліку ў савецкай Беларусі, актыўная дзейнасць партыйна-савецкіх улад у заходнім напрамку вялі не толькі да актывізацыі барацьбы на заходнебеларускіх землях за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне іх жыхароў, але і да ўскладнення ўмоў змагання, рэпрэсій у адносінах да кіраўнікоў гэтай барацьбы. Нярэдка нават справядлівыя акцыі савецкага кіраўніцтва ў рэшце рэшт мелі трагічны зыход. Абме-

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.162, спр.6, арк.12.

[2] Там жа, спр.8, арк.138.

[3] Там жа, спр.14, арк.101.

нены ў 1933 г. палітвязень польскіх улад Б. Тарашкевіч на Ф. Аляхновіча сустрэў у пралетарскай дзяржаве даволі халодны прыём і вымушаны быў працаваць навуковым супрацоўнікам міжнароднага аграрнага інстытута ў Маскве, хаця з'яўляўся правадзейным членам Беларускай Акадэміі навук. І яго не абмінулі сталінскія рэпрэсіі. 6 мая 1937 г. ён быў арыштаваны, а 29 лістапада 1938 г. расстраляны[1].

Вялікае вераломства было праяўлена ў адносінах да кіраўнікоў і радавых членаў кампартыі Заходняй Беларусі, з дапамогай якой аказваўся савецкі ўплыў на Грамаду, клуб "Змаганне", іншыя арганізацыі. У 1938 г. выканаўчы камітэт Камінтэрна па ўказанню з Масквы зрабіў неабгрунтаваны роспуск кампартыі Польшчы і яе складаных частак — кампартый Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Супраць іх кіраўнікоў было высунута абвінавачванне, быццам яны з'яўляліся агентамі польскай вайсковай арганізацыі і палітычнай паліцыі — дэфензівы. Тыя, хто хаваўся ад польскіх улад і знаходзіўся ў Маскве, Кіеве, Мінску, былі арыштаваны і амаль усе загінулі ў сталінскіх засценках. Сярод іх кіруючыя дзеячы кампартыі Заходняй Беларусі А. Альшэўскі, М. Маслоўскі, С. Мертэнс, А. Славінскі і інш. Загінуў і палітычны сакратар ЦК КПЗБ, кандыдат у члены палітбюро ЦК кампартыі Польшчы І.К.Лагіновіч (П.Корчык). Былі рэпрэсіраваны больш за 200 актывістаў КПЗБ, якія ў пошуках паратунку ад праследаванняў польскіх улад перайшлі ў свой час праз мяжу і апынуліся ў савецкай дзяржаве[2].

Такім чынам, зыходзячы з палітычных мэт, кіраўнікі таталітарнай бальшавіцкай сістэмы ў поўнай ступені выкарыстоўвалі нацыянальна-этнаграфічны фактар на заходнебеларускіх землях, імкненне беларускага народа да ўз'яднання ў адзінай дзяржаве. Уздзеянне на сацыяльны і нацыянальна-вызваленчы рух садзейнічала яго палітызацыі, узмацненню прасавецкай і пракамуністычнай накіраванасці. Аднак метады гэтага ўздзеяння былі тыпова сталінскімі: спачатку прыцягненне неабходных людзей да інтэнсіўнай работы, а затым рэпрэсіі ў адносінах да многіх з іх. Такі падыход з'яўляўся пераважным у практыцы правядзення савецкім

[1] Літаратура і мастацтва. 1992. 7 лют.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С250.

кіраўніцтвам унутранай і знешняй палітыкі. Гэта — адзін з фактараў, што ў рэшце рэшт прывялі бальшавіцкую таталітарную сістэму да глыбокага крызісу.

## 2. Стваральная дзейнасць і рэпрэсіўныя акты сярод насельніцтва Заходняй Беларусі пасля ўз`яднання з БССР

У выніку вызваленчага паходу Чырвонай Арміі і далучэння, паводле савецка-германскіх дагавароў і сакрэтных пратаколаў да іх, Заходняй Беларусі да БССР, Заходняй Украіны да УССР, іншых тэрыторый да Савецкага Саюза тут пачаліся пераўтварэнні, скіраваныя на іх максімальна хуткае набліжэнне ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных адносінах да бальшавіцкіх парадкаў, што існавалі ва ўсёй краіне. У тых ваенна-палітычных умовах гэта быў непазбежны працэс.

На заходнебеларускіх землях ён разгортваўся даволі інтэнсіўна. Актыўна прайшлі грамадска-палітычныя мерапрыемствы, звязаныя з уваходжаннем Заходняй Беларусі ў склад БССР. У выніку была пераадолена гістарычная несправядлівасць, калі амаль 20 гадоў беларуская нацыя падзялялася на дзве часткі, якія знаходзіліся ў суседніх дзяржавах з рознымі палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі сістэмамі. Фактар аб'яднання нацыі стаў важным стымулам у ажыццяўленні эканамічных, сацыяльных, культурных мерапрыемстваў бальшавіцкай накіраванасці ў Заходняй Беларусі.

Перш за ўсё гэта датычылася прамысловасці, якая не атрымала ў 20 — 30-х гадах на заходнебеларускай тэрыторыі колькі-небудзь істотнага развіцця. Таму ставілася задача рэканструкцыі існуючых прадпрыемстваў, а таксама будаўніцтва новых у харчовай, будаўнічай, керамічнай, дрэваапрацоўчай і іншых галінах. Дадзеная работа вялася хуткімі тэмпамі. Дастаткова сказаць, што толькі за 10 месяцаў 1940 г. у заходніх абласцях рэспублікі ўступілі ў лік дзеючых 105 прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці. Пераважная большасць з іх з'яўляліся новымі. Да пачатку 1941 г. у заходняй частцы Беларусі дзейнічалі 392

прамысловыя прадпрыемствы, на якіх працавала амаль 40 тыс. чалавек. Для параўнання неабходна зазначыць, што да верасня 1939 г. на гэтай тэрыторыі было занята, ды і то няпоўны тыдзень, на 10 тыс. чалавек менш.

Характэрнай асаблівасцю прамысловага будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі ў перадваенны час з'яўлялася тое, што адбывалася ўзбуйненне прамысловай вытворчасці. У канцы 1940 г. майстэрань з колькасцю рабочых да 5 чалавек амаль не засталося, а прамысловых прадпрыемстваў, дзе працавала ад 5 да 20 рабочых, налічвалася 127. Значна павялічылася колькасць сярэдніх і буйных фабрык і заводаў. На 157 з іх працавала ад 20 да 100 чалавек, на 92 — ад 100 да 500, а на 16 — ад 500 да 1500 рабочых.

Рэканструкцыя старых і будаўніцтва новых прадпрыемстваў садзейнічалі росту вытворчых паказчыкаў. Дастаткова сказаць, што аб'ём валавой прамысловай прадукцыі ў канцы 1940 г. павялічыўся амаль у два разы ў параўнанні з 1938 г.[1] Такі рост за кароткі тэрмін сведчыў аб высокіх тэмпах пераўтварэнняў у прамысловасці заходніх абласцей Беларускай ССР. Гэтаму, у прыватнасці, садзейнічаў той факт, што ў лістападзе - снежні 1939 г. адбылася нацыяналізацыя прамысловых прадпрыемстваў і банкаў. Кантроль дзяржавы быў устаноўлены не толькі за буйнымі і сярэднімі фабрыкамі і заводамі, але і за большай часткай дробных майстэрань. У тагачасных умовах гэта дало, як бачна, добры вытворчы вынік, хаця і супярэчыла інтарэсам дробных прадпрымальнікаў.

У лепшым стане, чым прамысловасць, знаходзілася на адышоўшай у 1921 г. да Польшчы заходнебеларускай тэрыторыі сельская гаспадарка. Аднак вострай праблемай з'яўлялася малазямелле. Колькасць сялянскіх гаспадарак, якія мелі ў сваім карыстанні да 5 га зямлі, дасягала 340 тыс. з агульнай колькасці 710 тыс. Таму першачарговай задачай бальшавіцкай улады стала пераразмеркаванне зямлі і надзяленне ёю беднякоў, батракоў, а таксама часткі серадняков. Для гэтай мэты выкарыстоўваліся землі памешчыкаў, асноўная частка якіх пакінула тэрыторыю Заходняй Беларусі з уступленнем сюды Чырвонай Арміі. Акрамя таго, зямлю адразалі ў тых заможных сялян, якія мелі яе звыш устаноўленых нормаў. Гэтыя нормы

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т.3. С.98 — 99.

раўняліся 10, 12 ці 15 га ў залежнасці ад мясцовых умоў, складу сям'і, іншых фактараў. Зямля была адрэзана ў 12,2 тыс. гаспадарак з 26,4 тыс., якія мелі яе больш, чым было ўстаноўлена нормай . Аднак надзяленне зямлёю тых, хто яе не меў ці меў зусім недастаткова, было ажыццёўлена не на аснове выкупу ці хаця б частковай кампенсацыі яе ўладальнікам, а адміністрацыйна — шляхам канфіскацыі і адпаведнага пераразмеркавання.

Паралельна з гэтай работай вялося стварэнне калектыўных гаспадарак. Да канца 1940 г. у заходніх абласцях БССР было арганізавана 646 калгасаў, а да чэрвеня 1941 г. — 1115. Яны аб'ядноўвалі 49 тыс. сялянскіх гаспадарак, што складала каля 7 % ад іх агульнай колькасці. За гэты час у Заходняй Беларусі была створана 101 машынна-трактарная станцыя, дзе мелася каля 1000 трактароў, іншая сельскагаспадарчая тэхніка. На землях лепшых маёнткаў былі арганізаваны 28 саўгасаў[1]. Калгасна-саўгаснае будаўніцтва вялося фактычна на тых жа прынцыпах і з выкарыстаннем тых жа метадаў, што і раней ва Усходняй Беларусі.

Актыўнай была дзейнасць у сацыяльнай сферы. З мэтай пераадолення беспрацоўя ў гарадах і буйных населеных пунктах на прадпрыемствы Мінска, Магілёва, Віцебска, Оршы, Гомеля, іншых гарадоў усходніх абласцей БССР было накіравана 22 тыс. чалавек з Заходняй Беларусі. У выніку к пачатку 1941 г. у заходніх абласцях беспрацоўе ў асноўным было пераадолена.

Таксама было ўведзена бясплатнае медыцынскае абслугоўванне. Інтэнсіўна пашыралася сетка лячэбных устаноў. Калі ў 1938 г. на заходнебеларускай тэрыторыі мелася каля 60 бальніц і не больш 700 дактароў, то ў канцы 1940 г. налічвалася 243 бальніцы і радзільныя дамы, дзе працавалі 1755 дактароў і каля 5,6 тыс. чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу.

Важнай задачай з'яўлялася павышэнне пісьменнасці насельніцтва. З гэтай мэтай у большасці школ навучанне было пераведзена на беларускую мову. Пашыралася сетка агульнаадукацыйных устаноў. Гэта дазволіла павялічыць школьны кантынгент больш як на 100 тыс. дзяцей, якія раней не мелі магчымасці вучыцца. Агульны лік вучняў дасягнуў у заходніх абласцях БССР у 1940/41 навучальным годзе 774,5 тыс.

---

[1] Нарысы Гісторыі Беларусі. Ч.2. С.262 — 263.

Значная ўвага надавалася пераадоленню непісьменнасці сярод дарослых. Ужо ў пачатку 1941 г. у школах для непісьменных і малапісьменных займаліся каля 170 тыс. чалавек. Для забеспячэння школьнага навучання рыхтаваліся адпаведныя кадры. У першую чаргу гэта рабілася ў педагагічных і настаўніцкіх інстытутах. Пачалі дзейнічаць 25 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, дзе рыхтаваліся спецыялісты розных профіляў. Пэўнае развіццё атрымала бібліятэчная справа. У лістападзе 1940 г. у абласцях Заходняй Беларусі працавалі 220 бібліятэк, якія мелі каля 450 тыс. кніг[1].

Аднак стваральная праца бальшавіцкай улады ў гэтай і іншых галінах спалучалася з недаверам да значнай часткі насельніцтва. Гэты недавер пераўзыходзіў тыя межы, якія маглі існаваць пасля далучэння да краіны тэрыторый, што значны час знаходзіліся ў складзе другой дзяржавы з іншым грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным ладам. Падазронасць у адносінах да свайго народа, якая мела месца ў Савецкім Саюзе, у тым ліку ў Беларускай ССР, у такой жа ступені была распаўсюджана на насельніцтва далучаных тэрыторый. Недавер і падазронасць перараслі ў рэпрэсіўную палітыку.

Знаходзячы магчымасці для ажыццяўлення рэпрэсій у адносінах да некаторых жыхароў Заходняй Беларусі нават тады, калі яна яшчэ была ў складзе Польшчы, кіраўніцтва бальшавіцкай таталітарнай сістэмы не было нічым абмежавана пасля атрымання поўнай улады над гэтым краем. З усталяваннем тут новых парадкаў карныя органы адразу прыступілі да выяўлення асоб, якія маглі б быць нелаяльнымі да бальшавікоў.

Як меркавалася, нелаяльнасць павінна была ў першую чаргу зыходзіць ад тых, хто спачуваў палякам у сувязі з разгромам польскай дзяржавы. Пад барацьбу з імі была нават падведзена пэўная база ў выглядзе савецка-нямецкіх пагадненняў, у тым ліку сакрэтных. Як стала вядома ў апошні час, да заключанага 28 верасня 1939 г. дагавора аб сяброўстве і межах паміж СССР і Германіяй дадаваўся сакрэтны пратакол, падпісаны Молатавым і Рыбентропам. Ён, у прыватнасці, прадугледжваў, што абодва бакі не павінны дапускаць на сваіх тэрыторыях ніякай

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.262 — 264.

польскай агітацыі. Яны абавязваліся ліквідаваць усе крыніцы падобнай агітацыі і інфармаваць адзін аднаго аб мерах, прынятых з гэтай мэтай[1].

Выконваючы дадзенае абавязацельства і зыходзячы са зместу і накіраванасці сваёй унутранай палітыкі, бальшавіцкія ўлады ў значных памерах ажыццяўлялі рэпрэсіўную палітыку на заходнебеларускіх землях. Пры гэтым яны ішлі двума шляхамі — выбарачныя арышты сярод мясцовага насельніцтва і правядзенне буйнамаштабных дзяржаўных акцый па высяленню пэўных катэгорый жыхароў.

Мерапрыемствы, характэрныя для першага шляху, ажыццяўляліся даволі інтэнсіўна з першых дзён усталявання савецкай улады. Дастаткова сказаць, што па стану на 7 кастрычніка 1939 г. органамі НКУС БССР было арыштавана 2708 жыхароў заходніх абласцей. Праз тыдзень гэта лічба ўзрасла да 3535 чалавек, а яшчэ праз 7 дзён дасягнула 4315. Па звестках карных органаў, сярод арыштаваных у першую чаргу былі памешчыкі, дваране, капіталісты, кіраўнікі і члены палітычных партый, кулакі, асаднікі, агенты палітычнай паліцыі, жандары, мытнікі і іншыя, каго падазравалі ў магчымым шпіянажы[2].

Што датычыць другога шляху, г. зн. буйнамаштабных аперацый, то была звернута ўвага на тыя асобы, якія служылі ў ваенных фарміраваннях польскай дзяржавы і апынуліся ў час паходу Чырвонай Арміі ў заходнія вобласці Беларусі і Украіны ў савецкім палоне і былі змешчаны ў лагеры. У тых з іх, якія знаходзіліся на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі і Украіны, па стану на сакавік 1940 г. утрымлівалася 18 632 зняволеных, з якіх 10 685 з'яўляліся палякамі[3].

Каля паўгода пратрымаўшы гэтых людзей у лагерных умовах, савецкае кіраўніцтва вырашыла заняцца іх лёсам. У пачатку сакавіка 1940 г. камісар унутраных спраў СССР Берыя напісаў на імя Сталіна дакладную запіску, у якой паведамляў, што ў лагерах для ваеннапалонных і турмах заходніх абласцей Украіны і Беларусі ўтрымліваецца вялікая колькасць

[1] Народная газета. 1995. 25 жн.

[2] *Хацкевіч А.* Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939 — 1941 гг.) //Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1. С. 89.

[3] Звязда. 1995. 30 чэрв.

былых работнікаў польскай паліцыі і разведвальных органаў, членаў нацыяналістычных партый, удзельнікаў паўстанцкіх арганізацый, перабежчыкаў і інш. Усе яны з'яўляюцца "заклятымі ворагамі савецкай улады". Знаходзячыся ў зняволенні, ваеннапалонныя афіцэры і паліцэйскія спрабуюць весці контррэвалюцыйную работу.

Запіска ўтрымлівала прапанову: справы ўсіх арыштаваных разгледзець у асобным парадку з прымяненнем да іх вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Усё зрабіць без выкліку арыштаваных і без прад'яўлення абвінавачвання. Гэта павінна правесці "тройка" ў складзе намеснікаў Берыі — Мяркулава, Кабулова і начальніка першага спецыяльнага аддзела НКУС СССР Баштакава.

Разгляд дакладной быў надзвычай аператыўным. Ужо 5 сакавіка 1940 г. палітбюро ЦК УКП(б) заслухала гэта пытанне і прыняло адпаведнае рашэнне. Яго падпісалі ўсе члены вышэйшага выканаўчага партыйнага органа, што прысутнічалі на дадзеным пасяджэнні.Усяго, як сведчаць строга сакрэтныя партыйныя дакументы больш позняга часу, згодна з вышэй адзначаным рашэннем палітбюро, было расстраляна 21 857 ваеннапалонных польскай арміі. З іх у шырока цяпер вядомым Катынскім лесе — 4421, у Заходняй Украіне і Беларусі — 7305 чалавек[1]. Астатнія расстраляны ў іншых месцах — Казельску, Старабельску, Асташкаве.

Сярод расстраляных ваеннапалонных разгромленай польскай дзяржавы нямала было жыхароў Заходняй Беларусі, якія служылі ў розных фарміраваннях польскай арміі. Праведзеныя масавыя расстрэлы без выкліку арыштаваных і без прад'яўлення ім абвінавачвання — жудаснае злачынства бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, праяўленае не толькі адносна жыхароў суседняй дзяржавы, але і прадстаўнікоў цяпер ужо (пасля далучэння да СССР) свайго ўласнага народа. Катынская трагедыя ў апошнія гады атрымала шырокі рэзананс не толькі ў Польшчы, але і ў многіх іншых краінах свету. Яна з'яўляецца адным з самых цяжкіх абвінавачванняў таталітарнаму сталінскаму рэжыму.

У канцы 1939 — пачатку 1940 г., калі кіраўніцтвам

---

[1] *Хацкевіч А.* Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939 — 1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1. С.90; Звязда. 1995. 30 чэрв.

НКУС СССР яшчэ толькі выношвалася ідэя аб пагалоўным знішчэнні ваеннапалонных з польскай арміі, была падрыхтавана і праведзена на тэрыторыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі буйнамаштабная карная акцыя па высяленню асаднікаў і работнікаў лясной аховы. Яна ажыццяўлялася на аснове сакрэтнай пастановы Савета Народных Камісараў Саюза ССР, прынятай 5 снежня 1939 г. Савецкія кіраўнікі бачылі віну асаднікаў, леснікоў, аб'ездчыкаў і іншых служачых былой лясной аховы ў тым, што з іх асяроддзя рыхтаваліся кадры дыверсантаў, шпіёнаў, тэрарыстаў на выпадак вайны з СССР. Для гэтага як быццам бы існавалі спецыяльныя паўгадавыя курсы ў Гродне, Нясвіжы, Валожыне, іншых месцах Заходняй Беларусі.

З мэтай выканання дадзенай пастановы НКУС Саюза ССР накіраваў 19 і 25 снежня 1939 г. адпаведныя дырэктывы карным органам УССР і БССР. У сваю чаргу камісар унутраных спраў БССР Цанава разаслаў 25 снежня 1939 г. адпаведную дырэктыву начальнікам органаў НКУС заходніх абласцей рэспублікі. Яны павінны былі неадкладна прыступіць і да 5 студзеня 1940 г. закончыць дакладны ўлік усіх асаднікаў, леснікоў і членаў іх сем'яў. Пры гэтым асаблівая ўвага звярталася на неабходнасць выключных канспіратыўных мер пры правядзенні дадзенай акцыі, каб папярэдзіць магчымыя ўцёкі. Улік людзей, іх маёмасці рэкамендавалася рабіць пад выглядам удасканалення падаткаабкладання. Займаючыся арганізацыяй аперацыі, карныя органы павінны былі адпаведным чынам падрыхтаваць і тых, хто выдзяляўся для яе непасрэднага выканання. Звярталася ўвага на тое, што не выключана магчымасць "ажыўлення ўнутранага контррэвалюцыйнага элемента".

Падрыхтаваныя карнымі органамі мерапрыемствы 19 студзеня 1940 г. разгледзела бюро ЦК КП(б)Б. Яно зацвердзіла кантынгент для высялення — 9252 гаспадаркі, якія ўключалі 49,5 тыс. чалавек.Для правядзення акцыі сфарміравалі 37 аператыўных участкаў. Найбольшая іх колькасць (12) прыходзілася на Беластоцкую вобласць, найменшая (4) — на Брэсцкую, у астатніх заходнебеларускіх абласцях іх налічвалася ад 6 да 8. Было вырашана звярнуцца ў ваенны савет Беларускай асобай ваеннай акругі з тым, каб забяспечыць у дні правядзення аперацыі адпаведнае патруляванне на станцыях, дзе будзе ажыццяўляцца пагрузка людзей на цягнікі, а таксама ў

тых месцах, дзе яны будуць перагружацца з адных вагонаў у другія, каб перавесці іх з вузкай каляіны на шырокую. Абласным і павятовым камітэтам партыі ўказвалася на неабходнасць выпрацаваць канкрэтны план ажыццяўлення дадзенай акцыі на месцах, у першую чаргу арганізаваць улік і ахову маёмасці выселеных[1].

Для непасрэднага ажыццяўлення аперацыі было створана 4005 аператыўных "троек". Для іх укамплектавання праверанымі і надзейнымі работнікамі з усходніх абласцей БССР было камандзіравана 2289 кіруючых і аператыўных кадраў, а таксама 6718 чырвонаармейцаў і міліцыянераў. Непасрэдна ў Заходняй Беларусі было прыцягнута 4632 чалавекі. Для суправаджэння ў дарозе чыгуначных эшалонаў да іх начальнікаў прыстаўляліся намеснікі з ліку аператыўных работнікаў НКУС БССР. Каб выключыць спробы арыштаваных збегчы за мяжу, а таксама магчымыя "контррэвалюцыйныя вылазкі варожага элемента ў тыле", былі прыняты меры для ўзмоцненай аховы дзяржаўнай мяжы і "актывізацыі агентурнай работы".

Усебаковая падрыхтоўка дадзенай маштабнай акцыі на рэспубліканскім узроўні адпаведным чынам адлюстроўвалася на месцах. Напрыклад, у Навагрудскім спецыяльным участку сфарміравалі 250 аператыўных груп, якія павінны былі забяспечыць высяленне 492 гаспадарак з 2570 жыхарамі. Для дастаўкі выселеных на чыгуначныя станцыі Наваельня, Нёман і Молчадзь падрыхтавалі 984 падводы (сані). Кіраўніком аперацыі тут прызначылі начальніка павятовага аддзела НКУС БССР лейтэнанта дзяржаўнай бяспекі Габісонія. У аператыўную "тройку" акрамя яго таксама ўвайшлі начальнік другога аддзялення трэцяга аддзела НКУС сяржант дзяржаўнай бяспекі Уваніцян і начальнік трэцяга аддзялення павятовага аддзела НКУС сяржант дзяржаўнай бяспекі Ткачэнка. У іх распараджэнні знаходзілася 696 аператыўных работнікаў, у тым ліку вайсковы рэзерв[2].

Маштабы ўсёй акцыі ў Заходняй Беларусі ўражваюць. Дастаткова сказаць, што для вывазу выселеных спатрэбілася каля 20 тыс. падвод. На чыгунач-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.885, арк.121, 153 — 161.

[2] Там жа, воп.21, спр.2085, арк.8, 24, 55.

ных станцыях гэтых людзей чакалі 1583 вагоны з рухам па вузкай чыгуначнай каляіне і 1957 вагонаў — па шырокай каляіне.

Былі зроблены ў выглядзе карт схемы пасадкі ў цягнікі і маршруты іх руху. Звяртае на сябе ўвагу вельмі падрабязная "Инструкция о порядке проведения операции по выселению осадников и работников лесной сторожевой охраны". У ёй адзначалася, што акцыя мае вялікае палітычнае значэнне. Асабліва падкрэслівалася неабходнасць правесці яе без шуму і панікі, каб не дапусціць якіх-небудзь выступленняў ці іншых эксцэсаў не толькі з боку выселеных, але і пэўнай часткі насельніцтва, якая варожа ставіцца да савецкай улады.

У інструкцыі звярталася ўвага на тое, што работнікі, якія забяспечваюць аперацыю, павінны зразумець: асаднікі і леснікі з'яўляюцца "ворагамі савецкай улады і народа. Яны — апора і палітычная база былога польскага ўрада". Строга ўстанаўлівалася, што аперацыю неабходна пачынаць на світанку, калі ўжо можна пазнаць людзей і асаднік ці ляснік можа бачыць, што да іх прыйшлі прадстаўнікі ўлады. Пры гэтым асабліва падкрэслівалася задача знайсці і канфіскаваць зброю, каштоўнасці, лістоўкі.

Выселеным дазвалялася браць з сабою адзенне, бялізну, абутак, посуд, харчы з разліку месячнага запасу на сям'ю, а таксама дробны гаспадарчы і бытавы інструмент, грошы, куфар. Аднак агульная вага гэтай маёмасці не павінна была перавышаць 500 кг на сям'ю. Астатняя маёмасць апісвалася. На ўсё гэта адводзілася не больш дзвюх і толькі ў асобных выпадках тры гадзіны. Выканаўцы акцыі па высяленню папярэджваліся, што зброю можна прымяняць толькі ў крайнім выпадку[1].

Рэалізацыя ўсіх гэтых прадпісанняў вялася з ваеннай дакладнасцю. Як і патрабавалася, да 5 студзеня 1940 г. былі складзены спісы тых, хто высяляўся. У наступныя некалькі тыдняў былі праведзены астатнія мерапрыемствы, звязаныя з выкананнем акцыі. Яна была ажыццёўлена ў асноўным 10 лютага. Аднак пагрузка рэпрэсіраваных у цягнікі зацягнулася на некалькі дзён у сувязі з выключна цяжкімі ўмовамі надвор'я: маразы даходзілі да 37 — 42°С, былі вялікія снегапады, снежныя завеі і заносы на дарогах.

На заключным этапе падрыхтоўкі аперацыі колькасць апісаных гаспадарак і выселеных жыхароў уз-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2085, арк.100 — 111.

расла. Па канчатковых звестках, высяленню падлягалі 9810 двароў з агульнай колькасцю насельніцтва 52 892 чалавекі. Сярод іх гаспадарак асаднікаў налічвалася 6064, леснікоў — 3746. Колькасць жыхароў у іх адпаведна раўнялася 34 203 і 18 689.

Карныя органы на працягу 10 лютага давалі падрабязныя (прыблізна раз у тры гадзіны) зводкі аб ходзе правядзення аперацыі. За ёй напружана сачылі кіраўнікі партыйна-дзяржаўных і карных органаў усіх узроўняў. У дакументах аб выніках акцыі засведчана, што вывезены 50 224 жыхары з 9584 гаспадарак, 307 чалавек арыштавалі, 4 памерлі ці былі забіты, 197 жыхароў рэпрэсіравалі пасля 10 лютага. Іх змясцілі ў ізалятары для наступнага накіравання ў месцы высылкі. Такім чынам, агульная колькасць рэпрэсіраваных дасягнула 50 732 чалавекі. Па розных прычынах засталіся не выселенымі 226 гаспадарак з агульнай колькасцю 2160 жыхароў. Хворых з усяго кантынгенту высланых налічвалася 547, папярэдне збеглі 32 жыхары, у час высялення адсутнічалі 1581 чалавек[1].

Акцыя выконвалася сіламі аператыўна-каманднага састава агульнай колькасцю 16 279 работнікаў. Значыць, у сярэднім на трох выселеных, уключаючы жанчын, старых, дзяцей усіх узростаў, прыходзіўся адзін узброены і спецыяльна адабраны аператыўны работнік альбо чырвонаармеец. З агульнай колькасці тых, хто праводзіў аперацыю, 11 647 работнікаў з'яўляліся прадстаўнікамі ўсходніх абласцей БССР. Толькі 4632 чалавекі прадстаўлялі адпаведныя структуры заходніх абласцей рэспублікі. На ўсіх выканаўцаў аперацыі прыйшлося звыш 300 выпадкаў абмарожвання. Сярод выселеных гэта не ўлічвалася.

За ўвесь час правядзення акцыі толькі ў двух месцах было аказана ўзброенае супраціўленне. Асаднік Высоцкі (Ваўкавыскі павет) у час перастрэлкі быў забіты, лесніка Паўловіча (Зэльвенскі павет) у час узброенага супраціўлення паранілі. Ён і дзве гэтыя сям'і былі высланы. У вёсках Боркі і Сукачы Лунінецкага павета тры асаднікі аказалі супраціўленне з выкарыстаннем халоднай зброі. Адзін з іх быў паранены, другі затрыманы, трэці ўцёк. Адзначаны пяць выпадкаў пасіўнага супраціўлення прад-

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2086, арк.1 — 3.

стаўнікам улады, што выявілася ў адмове адчыніць ім дзверы. У выніку яны ўзламваліся. Ахвяр з боку выканаўцаў акцыі не было.

У час павальных вобыскаў у хатах, іншых памяшканнях было канфіскавана 90 камплектаў зброі, 5 гранат, 24 стрэльбы, 66 рэвальвераў, 43 паляўнічыя ружжы, 14 шашак, 1454 патроны. Выяўлена золата царскай чаканкі на 2030 руб. і 145 амерыканскіх долараў. Аднак асноўная рэквізіцыя закранула іншую маёмасць выселеных. Усяго было апісана звыш 20 тыс. жылых і гаспадарчых пабудоў, больш за 103 тыс. га зямлі, у тым ліку 62 тыс. ворнай, больш за 8 тыс. коней, каля 20 тыс. кароў, 17,6 тыс. галоў дробнай жывёлы, 4,5 тыс. адзінак буйнога сельскагаспадарчага інвентару, 7,5 тыс. падвод і інш.[1]

Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ў афіцыйных дакументах карных структур і партыйна-дзяржаўных органаў адзначалася, быццам навакольныя жыхары аднесліся вельмі станоўча да зробленай акцыі, а першы сакратар ЦК КП(б)Б Панамарэнка ў пісьме Сталіну нават адзначыў, што "насельніцтва паўсюдна сустрэла высяленне з вялікім задавальненнем і аказвала аператыўным службам усялякую дапамогу", хаця канкрэтных фактаў кіраўнік кампартыі Беларусі не прывёў[2].

Цяжка паверыць у гэта і іншыя сведчанні афіцыйных асоб, калі ўлічыць, хто ж высяляўся. У прыватнасці, быў вывезены асаднік Войтэк з в. Пеглевічы Ваўкавыскага павета, 1887 г. нараджэння, па нацыянальнасці паляк, у польскай арміі і разведцы не служыў — гэта вымушаны былі засведчыць нават органы НКУС. У яго была сям'я з дзевяці чалавек: жонка, тры сыны, дзве дачкі, адна з іх замужняя. Зяць служыў у польскай арміі ў якасці радавога пяхотнага палка. У дадзенай мясцовасці пражываў з 1927 г. Яго маёмаснае становішча было наступным: стары дом з аднаго пакоя, гумно, адзін конь, тры каровы, меў 11 га зямлі і неабходны ў гаспадарцы дробны інвентар.

Выселены ляснік Крайнік з в. Лаўрыновічы Ваўкавыскага павета, 1903 г. нараджэння, па нацыянальнасці беларус, меў траіх дзяцей, служыў у польскай арміі радавым кавалерыйскага палка, валодаў 4 га зямлі, 0,15 га сенажаці. У гаспадарцы былі адзін конь, адна карова, адна свіння. У 1937—

---

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 2086, арк. 7 — 9; спр. 1900, арк. 5.

[2] Там жа, спр.1900, арк.1.

1939 гг. ён служыў лесніком у памешчыка Сапегі[1].

Як бачна, высяляліся небагатыя людзі, беднякі ці ў лепшым выпадку сераднякі. Правядзенне дадзенай шырокамаштабнай акцыі, як і іншых, з'яўлялася звычайнай практыкай у дзейнасці бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. На думку яе кіраўнікоў, перамяшчэнне ў аддаленыя раёны Поўначы, Сібіры, Далёкага Усходу вялікіх мас людзей павінна было служыць не толькі іх асваенню, але і палітычнаму "аздараўленню" тых мясцовасцей, адкуль яны высяляліся. На мэце была і задача запалохаць шырокую грамадскасць магчымым паўтарэннем і пашырэннем рэпрэсіўных мер. У той жа час негатыўныя вынікі не браліся пад ўвагу: не ўлічвалася сапраўднае ўздзеянне падобных акцый на навакольнае насельніцтва, на фарміраванне ўяўлення аб сутнасці і характары савецкай улады, метадах, спосабах і формах праўлення бальшавікоў. Усе гэтыя фактары, несумненна, патэнцыяльна падрывалі моц бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, накаплівалі энергетычны матэрыял, што ўрэшце рэшт прывёў яе да глыбокага крызісу і імкнення пераадолець існуючую сістэму ў многіх дзяржавах, якія ўзніклі на абшарах былога СССР. Праўленне, заснаванае на недаверы, падазронасці, страху, рэпрэсіях, — заўсёды часовае.

Сярод маштабных рэпрэсіўных акцый было перасяленне жыхароў населеных пунктаў васьмісотметровай пагранічнай паласы ўздоўж заходняй савецкай граніцы, у тым ліку ў заходніх абласцях БССР. Гэта аперацыя ажыццяўлялася ў адпаведнасці з пастановай СНК СССР ад 2 сакавіка 1940 г. "Аб ахове дзяржаўнай мяжы ў заходніх абласцях УССР і БССР". Яна ўстанаўлівала неабходнасць ажыццявіць адсяленне жыхароў гэтых населеных пунктаў і нават расчыстку тэрыторыі ад пабудоў у чатырох пагранічных абласцях Заходняй Беларусі. Усяго ў рэспубліцы падлягала адсяленню 7442 гаспадаркі з колькасцю жыхароў 35,3 тыс. чалавек. Найбольшы кантынгент тых, хто адсяляўся, прыпадаў на Брэсцкую і Беластоцкую вобласці (адпаведна 3214 і 3031 гаспадарка), найменшая іх колькасць была ў Баранавіцкай вобласці — 710 двароў, у Вілейскай вобласці адсялялася 1467 гаспадарак. Па маёмаснаму становішчу ўсе, хто адсяляўся, дыферэнцыраваліся наступным чынам:

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2086, арк.25 — 27, 31 — 32.

серадняцкіх гаспадарак — 4420, бядняцкіх — 3109, кулацкіх — 893.

Уяўляе цікавасць і нацыянальны склад тых, хто павінен быў пакінуць родныя мясціны. У Брэсцкай вобласці беларусы складалі 65 %, украінцы — 15, палякі і яўрэіі — па 10 %. У Беластоцкай вобласці ўдзельная вага палякаў дасягала 65 %, беларусаў — 30, па Вілейскай вобласці 60 % складалі літоўцы, 40 % — беларусы і палякі. Што датычыць Баранавіцкай вобласці, то тут у асноўным высяляліся беларусы.

Як патрабавалася ў такіх выпадках, неабходна было зрабіць абгрунтаванне чарговай рэпрэсіўнай акцыі. Таму ў афіцыйных дакументах адзначалася, што насельніцтва большасці пунктаў, якія адсяляюцца, займаецца кантрабандай, мае вялікія сваяцкія і эканамічныя сувязі з сумежнай тэрыторыяй[1].

Ачышчэнне васьмісотметровай паласы ішло двума шляхамі. 2593 гаспадаркі адсяляліся ў тыльныя мясціны сваіх альбо недалёка размешчаных вёсак, але асноўную частку — 5829 двароў — перасялялі ў вызваленыя дамы асаднікаў і леснікоў. Лічылася, што ў той час іх не заселена каля 7 тыс. Гэтым самым улады мелі на ўвазе кампенсаваць тым, хто адсяляўся з васьмісотметровай паласы, дамы і іншыя пабудовы. Меркавалася, што бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі атрымаюць беззваротную суду ў сярэднім 500 руб. на кожны двор. Што датычыць кулацкіх гаспадарак, то іх перасялялі без усялякай дапамогі. Беднякам і сераднякам планавалі кампенсаваць азімыя пасевы і зямлю, што належала ім, за кошт выселеных асаднікаў і леснікоў у роўных памерах. У вызваленых такім чынам дамах у межах васьмісотметровай пагранічнай паласы размяшчаліся адпаведныя службы саўгасаў, машынна-трактарных станцый, а таксама клубы, медыцынскія ўстановы войскаў НКУС. Уся акцыя па перасяленню заканчвалася 25 красавіка 1940 г., а па адсяленню — на тыдзень пазней.

Для параўнання з яе маштабамі ў Беларускай ССР трэба зазначыць, што ў Заходняй Украіне з васьмісотметровай паласы высяляліся 229 населеных пунктаў, якія ўключалі 22 212 гаспадарак з насельніцтвам у 102,8 тыс. жыхароў. Глыбіня перасялення там вагалася ад 5 да 150 км. Як на Беларусі, так і на

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1875, арк.13.

Украіне не дапускалася кампактнае пражыванне пераселеных у новых месцах[1].

Уражвае, наколькі лёгка бальшавіцкая ўлада ішла на падобныя акцыі. Яе зусім не цікавіла шматгадовая і нават векавая прыхільнасць сельскіх жыхароў да мясцовасцей, дзе жылі яны і іх продкі. Не браўся пад ўвагу псіхалагічна-бытавы бок гэтай справы. Лічылася зусім нармальным прымусова зняць са сваіх месцаў дзесяткі тысяч людзей і адправіць іх жыць у незнаёмыя мясціны і ў новае людское асяроддзе. Гэта таксама адна з заганных праяў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы кіравання, калі перасяляліся не толькі асобныя групы жыхароў, але, як вядома, і цэлыя народы.

Паралельна з ачышчэннем васьмісотметровай паласы рыхтавалася чарговае высяленне жыхароў з яе заходніх абласцей. Яно таксама праходзіла пад партыйным кіраўніцтвам. 8 красавіка 1940 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б Панамарэнка накіраваў абласным камітэтам партыі ў Баранавічах, Беластоку, Брэсце, Вілейцы, Пінску тэлеграму. У ёй гаварылася, што 13 красавіка органы НКУС зробяць высяленне сем'яў рэпрэсіраваных памешчыкаў, афіцэраў, паліцэйскіх і іншых асоб. Ад імя ЦК КП(б)Б ён абавязаў сакратароў абласных камітэтаў партыі абмеркаваць на закрытым пасяджэнні абкомаў даклад начальніка абласнога аддзялення НКУС і вызначыць усе неабходныя мерапрыемствы па аказанню дапамогі ў правядзенні аперацыі[2].

Дапамога, зразумела, была аказана, і ў вызначаны дзень — 13 красавіка 1940 г. — на заходнебеларускіх землях было выселена 8055 сем'яў, у якія ўваходзілі 26 777 чалавек. На працягу дня ў вагоны пагрузілі 7286 сем'яў з 24 253 жыхарамі. Як бачна, арганізацыя гэтай акцыі была больш высокай, чым папярэдніх, што дазволіла ў вельмі кароткі тэрмін, літаральна на працягу аднаго дня, перамясціць выселеных у падрыхтаваныя для іх цягнікі. Органы НКУС "удасканальвалі" сваю карную работу, праводзілі яе больш "эфектыўна". Паводле падлікаў аўтара, толькі ў невялікім гарадку Навагрудку за гэты дзень было арыштавана 114 чалавек.

Характэрна, што ў адпаведных рапартах аб правядзенні дадзенай аперацыі няма той высака-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.1875, арк. 14 — 19.

[2] Народная газета. 1995. 15 верас.

моўнасці, як гэта мела месца раней, аб тым, з якім энтузіязмам гэта так званая работа сустракалася мясцовым насельніцтвам. Галоўны прадстаўнік Берыі ў Беларусі Цанава стрымана даносіў, што "аперацыя ў асноўным праходзіла здавальняюча. Настрой мясцовага насельніцтва ў асноўным дадатны"[1]. Што хавалася за такой стрыманасцю, дакументы не раскрываюць. Аднак відавочна, што трэцяя буйная карная акцыя, ажыццёўленая на працягу кароткага тэрміну — лютага — красавіка 1940 г., несумненна, прымусіла мясцовых жыхароў моцна задумацца: што ж будзе далей, які лёс чакае кожнага з іх?

Акрамя аперацый па высяленню мясцовых жыхароў савецкія органы займаліся ў перадваенны час у заходніх абласцях БССР праблемай бежанцаў. Гэта былі тыя людзі, якія, ратуючыся ад фашысцкіх парадкаў, беглі на ўсход у час разгрому польскай дзяржавы. Паводле звестак на 7 лютага 1940 г., іх налічвалася на заходнебеларускіх землях 72 896 чалавек. Значная колькасць бежанцаў стварала шмат цяжкасцей у жыцці тых населеных пунктаў, дзе яны канцэнтраваліся. У прыватнасці, у Слоніме знаходзілася да 15 тыс. бежанцаў. Абмежаваныя магчымасці гэтага гарадка не дазвалялі здавальняюча арганізаваць іх размяшчэнне.

Сярод тых, хто пакінуў родныя мясціны з-за фашысцкай навалы, больш за ўсё было асоб яўрэйскай нацыянальнасці — 65 796. Палякаў налічвалася 4290, беларусаў — 1703, рускіх — 577, украінцаў —169 і г. д. Па роду заняткаў пераважалі рабочыя — 31 939, затым ішлі кустары — 15 380, былых служачых налічвалася 11 674, гандляроў — 2858, сялян — 1488. Працаўладкаванне гэтых людзей адбывалася з вялікімі цяжкасцямі. Па стану на 7 лютага 1940 г. работу мелі 25 621 чалавек. Астатнія былі без пэўных заняткаў. Да таго ж нават тыя, хто атрымаў працу, далёка не заўсёды яе трымаліся. З 22 тыс. бежанцаў, уладкаваных ва ўсходніх абласцях БССР, засталіся 17,7 тыс., астатнія разбегліся[2].

Улічваючы цяжкасці працы з бежанцамі, а таксама зыходзячы з характэрнага для бальшавіцкай

---

[1] *Хацкевіч А.* Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939—1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 2. С.73; Памяць. Навагрудскі раён. Мн., 1996. С. 278, 472 — 475.

[2] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.1145, арк.202; воп.21, спр.1900, арк.8.

таталітарнай сістэмы недаверу да людзей і сваёй апрабаванай практыкі арганізаванага масавага іх перасялення ў іншыя месцы, карныя органы Беларускай ССР правялі 29 чэрвеня 1940 г. аперацыю па высяленню бежанцаў з заходніх абласцей рэспублікі. Усяго ў гэты дзень былі пасаджаны ў цягнікі 7224 сям'і, якія ўключалі 22 879 чалавек. Астатніх адпраўлялі пазней, наўздагон. Найбольшая колькасць вывезеных прыйшлася на Беластоцкую вобласць — 4210 сем'яў, што налічвалі 13 250 чалавек. У гэтай аперацыі па высяленню бежанцаў было задзейнічана 9408 афіцэраў, аператыўных работнікаў і радавых з органаў НКУС, супрацоўнікаў міліцыі, а таксама прадстаўнікоў партыйна-савецкага актыву[1].

Адначасова з правядзеннем буйнамаштабных акцый па перамяшчэнню пэўных груп насельніцтва інтэнсіўна праводзілася аператыўная работа па раскрыццю і ліквідацыі падпольных арганізацый і груп, дзейнасць якіх, як сцвярджалі карныя органы, скіроўвалася супраць савецкай улады. Паводле дакументальных даных на 27 ліпеня 1940 г., у заходніх абласцях БССР было выяўлена 109 такіх фарміраванняў, якія ўключалі 3231 чалавека. Пераважную большасць сярод іх складалі палякі — 2904 удзельнікі. Як паведамлялася, у склад гэтых арганізацый і груп у першую чаргу ўваходзілі памешчыкі, асаднікі, былыя афіцэры, чыноўнікі, капіталісты, гандляры, навучэнцы, святары, але больш за ўсё сяляне — 1164 чалавекі. Знойдзеныя ў апошнія гады дакументальныя матэрыялы сведчаць, што акрамя гэтай колькасці людзей былі арыштаваны 5584 члены контррэвалюцыйных партый і арганізацый. Такім чынам, агульная колькасць затрыманых толькі ў выніку аператыўна-следчай работы дасягнула ў заходніх абласцях БССР з кастрычніка 1939 г. па ліпень 1940 г. 8815 чалавек[2].

Не выклікае здзіўлення, што турмы, асабліва ў заходніх абласцях БССР, былі моцна перапоўнены. У прыватнасці, у абласным цэнтры Вілейка, дзе мелася ўнутраная турма НКУС з нарматыўнай ёміс-

---

[1] *Хацкевіч А.* Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939—1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 2. С. 74.

[2] Там жа.

тасцю 210 зняволеных, па стану на 14 мая 1940 г. утрымліваліся 854 чалавекі. У гэты час у дадзенай вобласці мелася сем турмаў[1].

Вышэй адзначаныя акцыі карных органаў супраць насельніцтва заходніх абласцей Беларусі, а таксама паўсядзённая аператыўна-пошукавая работа сведчаць аб маштабнасці дзеянняў карных органаў. Тым не менш за два дні да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у ноч з 19 на 20 чэрвеня 1941 г. на заходнебеларускіх землях была ажыццёўлена новая загадзя падрыхтаваная акцыя па далейшаму арышту ўдзельнікаў паўстанцкіх арганізацый і фарміраванняў і высяленню іх сем'яў. У гэтым выпадку было рэпрэсіравана 24 412 чалавек, з якіх выселена 22 353. Як паведамлялася, сярод іх звыш 2 тыс. складалі кіраўнікі і члены розных польскіх, беларускіх, украінскіх, яўрэйскіх "контррэвалюцыйных арганізацый і фарміраванняў". Усяго, па падліках гісторыка А. Ф. Хацкевіча, з кастрычніка 1939 г. па 20 чэрвеня 1941 г. у заходніх абласцях Беларускай ССР былі рэпрэсіраваны, калі не ўлічваць ваеннапалонных польскай арміі, не менш як 125 тыс. чалавек. З іх 120 тыс. былі сасланы ў Сібір, Казахстан і іншыя месцы неабсяжнага Савецкага Саюза[2].

Аднак як вынікае з прыведзеных вышэй даных, колькасць рэпрэсіраваных у заходніх абласцях БССР з верасня 1939 г. і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны складала каля 150 тыс. чалавек (без ваеннапалонных польскай арміі, з-за адсутнасці дакладных звестак і без выселеных з Беларусі бежанцаў). У гэтую колькасць уваходзяць як высланыя ў аддаленыя раёны краіны (такіх абсалютная большасць), так і перамешчаныя ў межах рэспублікі. Такое насільнае перасяленне з родных мясцін таксама з'яўлялася для сельскіх жыхароў сапраўднай трагедыяй.

Як бачна, на працягу кароткага тэрміну — з часу ўступлення Чырвонай Арміі на заходнебеларускія землі і да пачатку іх акупацыі фашысцкімі войскамі — рэпрэсіі супраць насельніцтва і яго дэпартацыя ў аддаленыя раёны краіны дасягнулі значных памераў.

---

[1] Народная газета. 1995. 15 верас.

[2] *Хацкевіч А.* Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939—1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 2. С.75—76.

Калі ўлічыць, што ў перадваенны час у Заходняй Беларусі, уключаючы Беластоцкую вобласць, пражывала 4,7 млн чалавек[1], то вынікае, што за гэты кароткі тэрмін у заходнебеларускім краі быў рэпрэсіраваны ў сярэднім кожны трыццаць першы жыхар.

Такім чынам, маштаб рэпрэсій аказаўся даволі значным і ў заходняй частцы Беларусі. Бальшавіцкі таталітарны рэжым зыходзячы з установак сваіх лідэраў і тут у поўнай меры ажыццяўляў рэпрэсіўную палітыку. Заходнебеларускія жыхары, хоць і ў меншай ступені, чым іх усходнебеларускія браты, але ўсё ж такі моцна зведалі на сабе ўздзеянне сталінскай таталітарнай сістэмы.

Зыходзячы з класавага прынцыпу карныя органы расцэньвалі тых, каго яны арыштоўвалі і высялялі, як ворагаў савецкай улады. Аднак абсалютная большасць гэтых людзей затым была рэабілітавана з-за адсутнасці ў іх дзеяннях саставу злачынства.

Значыць, стваральная дзейнасць савецкай улады ў эканамічнай, сацыяльнай, культурнай сферах на заходнебеларускіх землях пасля верасня 1939 г. спалучалася з маштабнай рэпрэсіўнай палітыкай. Дадзенае спалучэнне — характэрная рыса бальшавіцкага праўлення, асабліва ў яго сталінскім варыянце. Рабілася ўсё гэта, як вядома, пад сцягам пабудовы новага, сацыялістычнага ладу жыцця. Пры гэтым стваральны бок быў шырока вядомы, ён усяляк папулярызаваўся, а рэпрэсіўны — ажыццяўляўся скрытна і быў разлічаны на палітычнае "аздараўленне" тэрыторыі і запалохванне насельніцтва. У гэтым і ёсць адна з праяў функцыяніравання бальшавіцкай сістэмы ўлады.

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.258.

## РАЗДЗЕЛ 5

# У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ПАСЛЯ ЯЕ

## 1. Гераічная барацьба з ворагам і таталітарныя метады кіраўніцтва

Таталітарны характар бальшавіцкага праўлення, усебакова апрабаваны ў мірны час, атрымаў далейшае развіццё ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Яе экстрэмальныя ўмовы, неабходнасць высокай цэнтралізацыі ўсіх бакоў жыцця, шырокае прымяненне надзвычайных мер, вострых форм і метадаў для вырашэння ўзніклых праблем — усё гэта ў значнай ступені практыкавалася ў мірныя гады. Таму ваенныя абставіны дазволілі прадоўжыць і ўзмацніць практыку, складзеную ў перадваенны і больш ранні перыяд.

Фактычна грамадска-палітычныя абставіны 30-х гадоў у СССР, у тым ліку ў савецкай Беларусі, у пэўнай ступені вызначаліся тымі метадамі кіравання, якія характэрны для ваеннага часу. І гэта зразумела, бо таталітарная сістэма, якая функцыяніравала ў мірных умовах, не можа не мець у сваёй практычнай дзейнасці такія рысы, якія яшчэ больш яскрава праяўляюцца ў ваенных абставінах. У гэтых адносінах таталітарны сталінскі рэжым не быў выключэннем. Таму метады кіравання савецкім грамадствам, характэрныя для яго, даволі лагічна ўпісаліся ў спецыфічныя ўмовы ваеннага ліхалецця.

Адным з вынікаў панавання культу асобы і фактычнага адзінаўладдзя ў СССР у мірны перыяд, які праявіўся ў пачатку вайны, стаў факт недастатковай падрыхтаванасці да яе. Поўны пралік аднаго чалавека — кіраўніка партыі і дзяржавы Сталіна — у ацэнцы міжнародных ваенна-палітычных абставін прывёў да таго, што краіна аказалася шмат у чым не гатовай да гэтага сур'ёзнага выпрабавання. Акрамя беспадстаўнага даверу да верхаводаў фашысцкага рэйха, пераацэнкі значэння падпісаных з імі дакументаў, неабгрунтаванага (насуперак усім папярэджанням)

меркавання, што вайна з Германіяй пачнецца пазней, гэта праявілася і ў шматлікіх фактах непадрыхтаванасці краіны да вайны ў ваенных адносінах. Сюды трэба аднесці і памылковую ваенную дактрыну, скіраваную толькі на наступальныя аперацыі, і марудны перавод прамысловасці на ваенныя рэйкі, і невыкананне праграмы пераўзбройвання арміі і многае іншае. Асобна трэба сказаць аб знішчэнні асноўнай часткі камандавання Чырвонай Арміі ў выніку неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій. Да таго ж вялікае дэмабілізуючае значэнне мела заява ТАСС, зробленая за тыдзень да нападу Германіі на СССР, аб тым, што чуткі пра вайну з'яўляюцца правакацыйнымі. На самай справе ў адносінах да народаў СССР, у тым ліку беларускага, правакацыйнай была сама гэта заява.

Усе названыя і іншыя пралікі вельмі выразна праявіліся на Беларусі. Цяжкія паражэнні савецкіх войскаў у першыя дні вайны, знішчэнне вялікай колькасці баявой тэхнікі, у тым ліку асноўнай часткі самалётаў, у многім прадвызначылі ход ваенных дзеянняў не толькі на тэрыторыі БССР, але і сумежных рэспублік. Аднак самыя балючыя страты — людскія. Гэта наглядалася ўсюды. Як стала вядома ў апошнія гады, на тэрыторыі на захад ад Мінска адбылася вялікая катастрофа для злучэнняў Чырвонай Арміі. Па сведчанню заходніх даследчыкаў, тут было акружана і ўзята ў палон больш за 330 тыс. савецкіх байцоў і камандзіраў[1]. Трагедыя войскаў спалучалася з трагедыяй беларускага народа, які адным з першых стаў ахвярай фашысцкага нашэсця.

Вядома, што заходняя частка Беларусі была захоплена менш чым за тыдзень. Мінск аказаўся акупіраваным на шосты дзень вайны. Таму шырока распаўсюджанае бальшавіцкай прапагандай у перадваенныя часы пераканане ў тым, што Чырвоная Армія будзе ваяваць толькі на чужой тэрыторыі, і адваротная рэальнасць аказаліся вялікай нечаканасцю для жыхароў Беларусі, як і ў цэлым для народаў Савецкага Саюза. Тыя невялікія, але моцныя ачагі супраціўлення (Брэсцкая крэпасць, шэраг контрудараў, прыкрыццё 100-й дывізіяй генерала Д. М. Русі-

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.271.

янава Мінска і некаторыя іншыя) не маглі істотна паўплываць на ход падзей, хаця і абнадзейвалі.

Тыпова сталінскай была рэакцыя на буйнейшае паражэнне Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі. Камандаванне фронту абвінавацілі ў "бяздзейнасці" і "баязлівасці". Яно было арыштавана і пасля допытаў расстраляна. На самай справе камандуючы фронтам генерал арміі Д. Л. Паўлаў і яго паплечнікі аказаліся заложнікамі вышэйшага бальшавіцкага кіраўніцтва, у першую чаргу Сталіна, у яго грандыёзных ваеннапалітычных пралікаў. Расстрэл камандавання Заходняга фронту быў зроблены з мэтаю адвесці падазрэнні ад сябе.

Сутнасць бальшавіцкай таталітарнай сістэмы праявілася ў першыя дні вайны і ў адносінах да палітычных і іншых зняволеных, што знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі. У апошнія гады стала вядома аб расправе над тымі, хто сядзеў у турме, што размяшчалася недалёка ад Глыбокага ў Беразвецкім манастыры. Перад вайною тут утрымлівалася больш за 2 тыс. чалавек. Перш чым пачалася эвакуацыя, шмат хто з іх быў закатаваны. А ў той час, калі калона рухалася на ўсход і яе атакавалі фашысцкія самалёты, ахоўнікі расстралялі зняволеных. Усяго загінула каля 1,8 тыс. чалавек. Неабходна нагадаць, што перад вайною ў Беларускай ССР мелася 32 турмы[1].

У іншых турмах і лагерах расстрэл зняволеных ці значнай іх часткі мог быць ажыццёўлены непасрэдна на месцы. Ва ўсякім разе кіраўніцтва турмаў і лагераў магло атрымаць канкрэтныя ўказанні з боку кіруючых органаў. Цяпер вядома, што ў першы дзень вайны, 22 чэрвеня 1941 г., бюро ЦК КП(б)Б заслухала пытанне аб зняволеных, якія ўтрымліваюцца ў турмах заходніх абласцей Беларускай ССР і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. У прынятай пастанове кіраўнікам карных органаў рэспублікі давалася даручэнне перадаць дырэктыву аб выкананні прыгавораў у адносінах да асуджаных да вышэйшай меры пакарання, якія ўтрымліваліся ў гэтых турмах[2]. Прыняцце дадзенага рашэння адпавядала накіраванасці і зместу бальшавіцкай палітыкі. Імкненне ліквідаваць тых, хто быў прыгавораны да

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.2122, арк.47; Звязда. 1992. 19 снеж.

[2] Народная газета. 1995. 15 верас.

вышэйшай меры пакарання, несумненна, ставіла сваёй мэтай не дапусціць, каб ва ўмовах хуткага наступлення фашысцкіх войскаў адбылося іх вызваленне і тады яны маглі б стаць на шлях барацьбы з савецкай уладай.

Нягледзячы на жорсткі характар бальшавіцкага таталітарнага праўлення, у грозныя гады ваеннага ліхалецця на ўсю моц праявіўся свабодалюбівы дух рускага, украінскага, беларускага, іншых народаў СССР. Гэта было не толькі традыцыйнае імкненне да свабоды і незалежнасці, але і жаданне абараніць ідэалы новага жыцця, у якія верыла пераважная большасць савецкага, у тым ліку беларускага народа.

Застаецца бясспрэчным факт, што ў бязлітаснай барацьбе з фашысцкімі захопнікамі за выжыванне і захаванне дзяржаўнага суверэнітэту Савецкага Саюза асноўным натхняльнікам гераічнага і самаадданага змагання была бальшавіцкая партыя, якая так моцна пацярпела ў час шырокамаштабных і неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій. Менавіта праз партыйныя арганізацыі з іх высокай дысцыплінай савецкае кіраўніцтва ў значнай ступені забяспечвала мабілізацыю народа на максімальныя намаганні ў арганізацыі адпору ворагу.

Перш за ўсё самыя высокія патрабаванні датычыліся камуністаў. Мабілізаванасць іх на барацьбу з агрэсарам была надзвычай высокай. У гады вайны больш за 80 % ад складу партыйных арганізацый знаходзілася ва Узброеных Сілах СССР і ў тых галінах гаспадаркі, якія ў першую чаргу забяспечвалі патрэбы фронту. Для параўнання неабходна зазначыць, што ў гады грамадзянскай вайны на кожныя 100 чырвонаармейцаў прыходзілася пяць камуністаў, у пачатку Вялікай Айчыннай вайны — 13, а ў канцы вайны кожны чацвёрты воін быў членам ці кандыдатам у члены партыі.

На працягу 1418 дзён гераічнай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінулі больш за 3 млн членаў партыі. Аднак за гэты час яе рады папоўнілі 5,3 млн чалавек. Такога імклівага росту, які наглядаўся ў гады ваеннага ліхалецця, не было за ўсю партыйную гісторыю. Па стану на 1 студзеня 1945 г. у арміі знаходзілася 3 млн 324 тыс. камуністаў, г. зн. 57,7 % ад агульнага складу партыйных арганізацый[1].

---

[1] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: В 3 т. Мн., 1985. Т.3. С.436.

Жыхары Беларусі, як кіруючыя работнікі, так і радавыя ўдзельнікі вайны, якія з'яўляліся камуністамі, унеслі свой уклад у агульную справу барацьбы с ворагам. Гэта адбывалася і на шматлікіх савецка-германскіх франтах, і ў партызанскіх атрадах і ў падпольных групах. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў партызанскіх фарміраваннях налічвалася больш за 1200 пярвічных партыйных арганізацый. Функцыяніравалі таксама 184 тэрытарыяльныя падпольныя партгрупы.

Узмацнялі адпор ворагу і камсамольцы. Ім належала значная роля ва ўсёй савецкай ваенна-палітычнай сістэме. На акупіраваных беларускіх землях супраць гітлераўскіх захопнікаў змагаліся амаль 100 тыс. камсамольцаў, аб'яднаных больш чым у 5,5 тыс. пярвічных арганізацый[1].

Партыйна-камсамольская накіраванасць на барацьбу з ворагам з'явілася адным з рашаючых фактараў у агульнай сістэме арганізацыі адпору захопнікам. Дзяржаўныя ваенна-палітычныя структуры — ваенныя камісарыяты, установы па падрыхтоўцы ваенных кадраў, уся разгалінаваная ваенная сістэма з яе ідэалагічным забеспячэннем, разведвальнымі ўпраўленнямі, спецыяльнымі фарміраваннямі, карнымі структурамі савецкай дзяржавы і іншымі органамі — усё гэта дазволіла, абапіраючыся на гераічную працу народа ў савецкім тыле, паступова ўзмацняць адпор войскам фашысцкага вермахта як на франтах, так і на акупіраванай тэрыторыі.

Паступова нарастала партызанская барацьба. Ужо летам 1941 г. баявыя аперацыі супраць гітлераўцаў на Беларусі разгарнулі каля 12 тыс. партызан. Па стану на 1 студзеня 1943 г. на беларускай зямлі дзейнічалі 448 партызанскіх атрадаў і 64 дыверсійныя групы. У іх налічвалася каля 58 тыс. чалавек. Узмацнялася супраціўленне ворагу і ў іншых месцах. У гэты час на акупіраванай тэрыторыі Смаленскай вобласці мелася 120 партызанскіх атрадаў і 6 дыверсійных груп, а іх колькасны склад перавышаў 10 тыс. чалавек. На Украіне к гэтаму часу былі арганізаваны 63 партызанскія атрады з колькасцю ўдзельнікаў каля 9 тыс. чалавек[2].

У наступныя гады партызанская барацьба дасягнула на беларускай зямлі асабліва вялікага размаху. За час акупацыі Беларусі былі створаны і вялі

---

[1] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Т.3.. С.443.

[2] РЦЗВДНГ, ф.69, воп.1, спр.1090, арк.1.

баявыя дзеянні 1255 партызанскіх атрадаў. У іх налічвалася 374 тыс. байцоў. Акрамя таго, праз скрытыя партызанскія рэзервы за гады вайны прайшлі амаль 400 тыс. мясцовых жыхароў, многія з якіх прымалі непасрэдны ўдзел ва ўзброенай барацьбе. З улікам 70 тыс. падпольшчыкаў агульная колькасць тых, хто змагаўся супраць гітлераўскіх акупантаў на Беларусі, перавышала (без скрытых рэзерваў) 440 тыс. чалавек.

Выніковай з'яўлялася баявая дзейнасць беларускіх партызан і падпольшчыкаў. За тры гады вайны ў тыле ворага, з чэрвеня 1941 г. па ліпень 1944 г., на Беларусі было знішчана і паранена больш за 500 тыс. гітлераўскіх салдат і афіцэраў, пушчана пад адхон 11 128 воінскіх эшалонаў і 34 бронепаязды, разгромлена 29 чыгуначных станцый, 948 штабоў і гарнізонаў праціўніка, падарвана больш за 18,7 тыс. аўтамашын, знішчана 819 чыгуначных і 4710 дарожных мастоў, нанесены іншыя значныя страты захопнікам[1].

Самаадданая барацьба беларускага народа ў тыле ворага праходзіла пад кіраўніцтвам шырока вядомых у рэспубліцы і за яе межамі партыйных і савецкіх работнікаў — П.К.Панамарэнкі, П.З.Калініна, У.Р.Ванеева, Р.Б.Эйдзінава і многіх іншых. Непасрэдна на акупіраванай тэрыторыі партызанскай і падпольнай барацьбой кіравалі У.Е.Лабанок, Р.Н.Мачульскі, К.С.Заслонаў, В.І.Казлоў, В.З.Корж, К.Т.Мазураў, М.В.Зімянін, П.М Машэраў і інш.

Актыўным быў удзел беларускага народа ў барацьбе з ворагам і на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У асабліва складаных умовах пачатку баявых дзеянняў і да жніўня 1941 г. у Чырвоную Армію былі прызваны больш за 500 тыс. жыхароў Беларусі. За ўвесь перыяд вайны колькасць тых прадстаўнікоў беларускай зямлі, якія былі мабілізаваны ці добраахвотна ўліліся ў Чырвоную Армію, перавысіла 1,3 млн чалавек. Сюды ўваходзяць больш за 194 тыс. удзельнікаў расфарміраваных пасля вызвалення Беларусі партызанскіх атрадаў і брыгад.

Масавым з'яўляўся гераізм абаронцаў Айчыны, у тым ліку жыхароў Беларусі. За мужнасць і адвагу, якія яны праявілі ў баявых дзеяннях, 300 тыс. з іх узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, а 396

---

[1] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. Т.3. С.446, 449.

атрымалі высокае званне Героя Савецкага Саюза, чатыры прадстаўнікі Беларусі — П.Я.Галавачоў, І.І.Гусакоўскі, С.Ф. Шутаў, І.І.Якубоўскі — удастоены гэтага звання двойчы. 63 воіны-беларусы і ўраджэнцы беларускай зямлі сталі кавалерамі ордэнаў Славы трох ступеняў. Высока былі ацэнены баявыя справы партызан і падпольшчыкаў Беларусі. За мужнасць і стойкасць звыш 140 тыс. з іх атрымалі ордэны і медалі СССР, а 88 чалавек сталі Героямі Савецкага Саюза.

Аднак, калі абсалютная большасць беларускага народа самаадданa змагалася з фашысцкімі агрэсарамі, былі і тыя, хто звязваў з імі ажыццяўленне сваіх палітычных і асабістых намераў, што было не выпадкова і тлумачыцца ўзаемаадносінамі гэтых людзей з савецкай уладай. Негатыўным вынікам дзеяння бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў перадваенны час, які праявіўся ў суровыя гады ваеннага ліхалецця, стаў калабарацыянізм. Незадаволеныя і пакрыўджаныя бальшавіцкім рэжымам, яго нацыянальнай і рэпрэсіўнай палітыкай убачылі ў фашысцкім нашэсці магчымасць ажыццявіць свае планы. Гэта выявілася ў службе ў нямецкай адміністрацыі, удзеле ў ваенных нацыяналістычных фарміраваннях, выдачы акупантам камуністаў і камсамольцаў, іншых акцыях.

Магчымасць адпаведных паводзін гэтых людзей у ваенных умовах абсалютна не ўлічвалася кіраўнікамі таталітарнай сістэмы ў іх перадваеннай палітыцы. Таму колькасць тых, хто служыў ці прыслужваў фашысцкім акупантам і непасрэдна ці ўскосна змагаўся з бальшавіцкай уладай, была не такою ўжо абмежаванай, як гэта прадстаўляла раней афіцыйная савецкая прапаганда. Па падліках некаторых даследчыкаў, зробленых у апошнія гады, агульная іх колькасць дасягала на Беларусі 120 тыс. чалавек. Гэта лічба хоць і ўнушальная, але яна ў шмат разоў меншая за колькасць тых ураджэнцаў Беларусі, якія са зброяй у руках змагаліся з фашызмам на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх фарміраваннях ці падполлі.

Праявы супрацьдзеяння савецкай уладзе ў ваенных умовах на тэрыторыі Беларусі былі самыя розныя, але характэрна, што яны моцна звязаны з даваенным часам. Як сведчаць, у прыватнасці, прыведзеныя вышэй дакументальныя матэрыялы, дзейнасць бальшавіцкай улады ў БССР перад вайной вызнача-

лася даволі прадузятымі адносінамі да нацыянальных меншасцей, у першую чаргу да палякаў. Крытычнае стаўленне да іх, шырокае выкарыстанне "польскага фактару" ў рэпрэсіўнай палітыцы не маглі не выклікаць у сваю чаргу адпаведных адносін пасля таго, як Беларусь аказалася пад фашысцкай акупацыяй. Так, у населеным пункце Глыбокае, што да вайны ўваходзіў у Вілейскую вобласць, значная частка польскага насельніцтва адкрыта выказвала свае сімпатыі акупантам. Фашыстам тут выдавалі савецкіх актывістаў, у першую чаргу камуністаў, камсамольцаў. На сходах і мітынгах, што наладжваліся захопнікамі, нярэдка выступалі прадстаўнікі польскай часткі насельніцтва і заяўлялі, што яны вітаюць сваё вызваленне ад бальшавікоў. З улікам гэтага акупанты нават стварылі ў Глыбокім польскі магістрат. Яны раздавалі асобам польскай нацыянальнасці прамысловыя і харчовыя тавары з захопленых магазінаў і складаў. З дазволу акупацыйных улад магістрат вярнуў палякам нацыяналізаваную ў савецкі час маёмасць. З яго дапамогай ажыццяўляўся грабёж мясцовых жыхароў. Усё гэта выклікала незадаволенасць беларускай і рускай частак насельніцтва. Яны сталі зрываць мерапрыемствы, што праводзіліся польскім магістратам і фашысцкай управай. Гэту акалічнасць вымушаны былі ўлічыць нямецкія захопнікі. Ужо к канцу 1941 г. у большасці створаных устаноў прадстаўнікі палякаў былі заменены на беларусаў. У школах забаранілі выкладанне польскай мовы. Адносіны фашыстаў да палякаў сталі больш строгімі[1]. Дадзеныя факты сведчаць аб праяўленні ў ваенны час адмоўных адносін да савецкай улады, што склаліся перад вайною ў часткі польскага насельніцтва Беларусі. Аднак вядома, што польскі народ праявіў у барацьбе з фашысцкай агрэсіяй мужнасць і самаадданасць, зрабіў значны ўклад у дасягненне агульнай перамогі і панёс пры гэтым вялікія людскія і матэрыяльныя страты.

У гады вайны нярэдка асабліва выразна праяўляліся тыя якасці таталітарнага сталінскага рэжыму, што ўкараняліся ў перадваенны час, — падазронасць, недавер да людзей, жорсткасць. Перш за ўсё гэта знаходзіла адлюстраванне на дзяржаўным узроўні ў палітычнай лініі савецкага кіраўніцтва

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.69, воп.1, спр.1081, арк.62.

ці буйных акцыях карных органаў. Магчыма, найбольш яскравым выяўленнем гэтага былі адносіны да тых суайчыннікаў, што аказаліся ў выніку розных ваенных абставін, як правіла, экстрэмальных, у фашысцкім палоне. Лёс савецкіх ваеннапалонных прынцыпова адрозніваўся ад лёсу прадстаўнікоў Францыі, Англіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, іншых краін. Характэрна, што аснова такога становішча была закладзена значна раней, яшчэ тады, калі ў 1929 г. Савецкі Саюз не далучыўся да Жэнеўскай канвенцыі па пытанню абыходжання з палоннымі. Гэту канвенцыю ў 1934 г. падпісала нават Германія.

Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ў 1930 г. выканаўчы камітэт савета Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР спрабаваў абгрунтаваць гэту адмову тым, што шэраг палажэнняў канвенцыі не адпавядаюць савецкаму грамадскаму ладу, быццам у ёй недастаткова выразна гарантаваліся правы ваеннапалонных, адсутнічала забарона на выкарыстанне іх на работах ваеннага характару і інш. Аднак дадзеная аргументацыя была падставай для таго, каб не падпісаць дакумент. Адносіны да яго з савецкага боку вызначаліся ваенна-палітычнай дактрынай, якая існавала ў краіне. У яе аснове ляжаў пастулат, што магчымая вайна будзе для савецкага боку заключацца толькі ў наступальных дзеяннях і што яны будуць весціся на чужой тэрыторыі. Пры дадзеным характары вайны меркавалася, што масавага паланення савецкіх войскаў не будзе. Такія самаўпэўненыя і неабгрунтаваныя падыходы выключалі неабходнасць падпісання канвенцыі[1].

Суровая практыка пачатку Вялікай Айчыннай вайны засведчыла абсалютную беспадстаўнасць такіх разлікаў. Гэта самым негатыўным чынам адлюстравалася на лёсе мільёнаў савецкіх ваеннапалонных, таму што краіна фактычна ад іх адмовілася. У гэты лік трапілі і тыя, хто быў прымусова вывезены ў Германію. Такая пазіцыя кіраўнікоў Савекага Саюза адносна савецкіх ваеннапалонных развязала заправілам фашысцкага рэйха рукі ў ажыццяўленні генацыду супраць мільёнаў савецкіх салдат і афіцэраў, што аказаліся ў палоне, а таксама тых мірных жыхароў, каго прымусова вывезлі ў Германію. У выніку савецкія грамадзяне, што знаходзіліся ў палоне, не атрымлівалі дапамогі ад Міжнароднага Чыр-

[1] Народная воля. 1996. № 84.

вонага Крыжа, іншых арганізацый. Да таго ж, зыходзячы з прынцыповага падыходу Сталіна, што кожны палонны — гэта вораг савецкай улады, да іх вельмі падазрона адносіліся, калі яны ўрэшце рэшт вярталіся на радзіму. Вялікая колькасць тых, хто прайшоў нямецкія лагеры і выжыў, трапілі ў савецкія лагеры. Адносіны да ваеннапалонных выразна характарызуюць таталітарную сістэму сталінскага варыянта.

Яе сутнасць знаходзіла праявы і ў іншых напрамках. Нават у суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны працягвалася ганебная практыка пакарання вялікіх груп людзей савецкага грамадства шляхам масавага перасялення ў аддаленыя рэгіёны краіны. Гэта датычылася нават цэлых народаў — татараў, калмыкаў і іншых. Надзвычай паказальнай з гэтых акцый з'яўляецца перасяленне чэчэнцаў і інгушоў, што адбылося ў другой палове лютага 1944 г. Усяго было перасялена каля 500 тыс. чалавек. Іх прымусова даставілі ў новыя месцы пражывання ў Казахстан і Сярэднюю Азію. У дарозе 1272 чалавекі памерлі. З-за масавых хвароб, пераважна сыпнога тыфу, былі адчэплены для санітарнай апрацоўкі 70 вагонаў, у якіх знаходзілася каля 3 тыс. чалавек. У час высялення звыш 2 тыс. прадстаўнікоў гэтых народаў былі арыштаваны і асуджаны.

Улады праяўлялі некаторы элементарны клопат аб тых, каго перавозілі на новае месца жыхарства за тысячы кіламетраў ад роднага краю. Сакрэтнай пастановай Дзяржаўнага Камітэта Абароны для забеспячэння перасяленцаў было выдзелена 6 тыс. т мукі, 3 тыс. т круп. Сем'і атрымлівалі ссуду ў памеры 5 тыс. руб. з тэрмінам выплаты да 7 гадоў. Паводле пастановы СНК СССР, кожнай сям'і перасяленца, акрамя зерня, выдзялялася па адной галаве буйной рагатай жывёлы ў лік пагашэння доўгу за пакінутыя ў родных мясцінах жывёлу і збожжа. Перасяленыя сем'і былі размешчаны пераважна ў дамах карэннага насельніцтва з тым разлікам, каб яны мелі асобны пакой. З мэтаю санітарнай апрацоўкі перасяленых было абсталявана 11 тыс. лазняў.

Уся гэта акцыя па перасяленню абышлася дзяржаве ў 150 млн руб. На гэтыя грошы можна было пабудаваць каля 700 танкаў Т-34. Характэрна, што колькасць перасяленых амаль на 34 тыс. перавысіла тыя заданні, якія ўстанавілі адпаведныя органы. Вялікая колькасць тых, хто ажыццяўляў гэта спецыяльнае перасяленне, была прадстаўлена да дзяржаўных узнагарод. Гэтыя народы былі рэабілітаваны

толькі больш чым праз 10 гадоў, а ў 1957 г. была аднаўлена Чэчэна-Інгушская Аўтаномная Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка[1].

Дадзеная акцыя, як і іншыя мерапрыемствы бальшавіцкага кіраўніцтва, зразумела, не афішыравалася. Сярод тайных спраў, якія сталі вядомы ў апошні час, быў намер узарваць Ленінград у выпадку захопу яго нямецка-фашысцкімі войскамі. З гэтай мэтай у фундаменты прадпрыемстваў і будынкаў іншага прызначэння было закладзена 325 тыс. кілаграмаў выбуховых рэчываў — толу, дынаміту. Па спецыяльнай камандзе ў паветра маглі ўзляцець не толькі будынкі, але і караблі, якія знаходзіліся на рэйдзе. Аб гэтым сведчаць дакументы Упраўлення федэральнай службы бяспекі па Санкт-Пецярбургу і вобласці, Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў горада і інш.[2]

Гэтыя буйныя акцыі, як здзейсненыя, так і запланаваныя бальшавіцкім кіраўніцтвам на выпадак неспрыяльнага развіцця падзей, дапаўняліся адпаведнымі дзеяннямі на месцах — на франтах і ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у час партызанскай і падпольнай барацьбы. Праявы гэтага былі самыя розныя, у тым ліку знішчэнне непажаданых сведак, каб замесці сляды злачынстваў ці крымінальных дзеянняў. Выразным сведчаннем гэтага на Беларусі з'явіўся расстрэл 1—3 студзеня 1943 г. па загаду камбрыга Луніна ў Заслаўскім раёне васьмі савецкіх разведчыкаў. Акцыю ажыццявілі з мэтаю замесці сляды сумніўных учынкаў камандзіра брыгады і яго прыбліжаных[3].

У ходзе гераічнай барацьбы з ворагам мелі месца іншыя негатыўныя з'явы. Аб гэтым амаль не гаварылася за ўсе пасляваенныя дзесяцігоддзі. Яны выяўляліся ў паборах з насельніцтва часткай партызан, тэрарызаванні імі мясцовых жыхароў. Гэтыя факты сталі вядомымі толькі ў апошнія гады з новых дакументальных матэрыялаў.

Разам з належнымі ўзаемаадносінамі партызан і мірнага насельніцтва, аб чым шырока сказана ў савецкай, у тым ліку беларускай гістарычнай літарату-

---

[1] Рэспубліка. 1996. 15 жн.

[2] Известия. 1997. 19 июня.

[3] Мінская праўда. 1989. 13 чэрв.

ры, меліся праявы марадзёрства. Гэта адлюстроўвалася ў рэквізіцыі харчавання, адзення, абутку. У прыватнасці, летам 1942 г. такія дзеянні мелі месца ў атрадах Луніна, Чаркасава, групе Мухіна, што размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі. Дадзеныя факты былі характэрны для партызанскіх атрадаў, якімі камандавалі Міцюгін і Захараў, што дзейнічалі ў Лагойскім раёне. Адносна гэтых атрадаў старшы памочнік начальніка палітаддзела Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) брыгадны камісар Конкін адзначаў 11 студзеня 1943 г., што яны з'яўляюцца паўбандыцкімі фарміраваннямі. У іх пануюць анархія, п'янкі, грабяжы, самадурства камандзіраў.

Такія негатыўныя з'явы наглядаліся ў разведвальнай групе пад камандаваннем капітана Шарова, што дзейнічала ў Асіповіцкім раёне. Як паведамляў начальнік палітычнага аддзела ЦШПР Малін у Галоўнае разведвальнае ўпраўленне Генштаба Чырвонай Арміі, у гэтай групе шырокія памеры прынялі п'янства, марадзёрства, тэрарызм мясцовага насельніцтва. Камандзір групы некалькі разоў папярэджваўся камандаваннем партызанскіх атрадаў, аднак не рабіў з гэтага неабходных вывадаў[1].

Дадзеныя праявы мелі месца і ў партызанскім атрадзе пад камандаваннем Шпака. Гэту акалічнасць вырашылі выкарыстаць фашысты. У верасні 1942 г. яны разам з паліцэйскімі пераапрануліся ў форму войскаў НКУС, а таксама пад выглядам партызан бесперашкодна з'явіліся ў месцазнаходжанні атрада — у в. Пудоць. Яны бясшумна знялі вартавых, зайшлі ў дом каманднага саставу, расстралялі ў ім некаторых камандзіраў і партызан, затым занялі вёску. Партызанскі атрад панёс вялікія страты[2].

Такое становішча ў некаторых партызанскіх атрадах і групах непакоіла начальніка ЦШПР генерал-лейтэнанта П. К. Панамарэнку. У адным з падпісаных ім у пачатку 1943 г. дакументаў адзначалася, што асобныя камандзіры і камісары замест самаадданай барацьбы з фашыстамі ў тыле ворага абзавяліся сямейнай утульнасцю, п'янствуюць, распуснічаюць. Каманднаму саставу давалася ўказанне непрымірыма ставіцца да такіх фактаў і змагацца супраць іх усімі сіламі[3].

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.69, воп.1, спр.1090, арк.19; спр.1112, арк.74.

[2] Там жа, спр.1090, арк.25.

[3] Там жа, спр.1112, арк.81 — 85.

Трэба падкрэсліць, што абсалютная большасць кіраўнікоў партызанскіх атрадаў і груп не займалася гэтымі ганебнымі справамі і вяла барацьбу з імі. Становішча выпраўлялася больш актыўна пасля стварэння падпольных партыйных органаў.

У экстрэмальных умовах ваеннага часу на акупіраванай тэрыторыі Беларусі меліся выпадкі, калі карныя органы скрупулёзна даводзілі справу да канца ў адносінах нелаяльных да савецкай улады людзей. Паказальная ў гэтым сэнсе гісторыя з адным з лістападаўцаў (аб іх ішла гаворка вышэй) — М. Мяцельскім. Суд над імі адбыўся ў Мінску яшчэ ў 1926 г. М. Мяцельскі лічыў, што ўлада павінна ісці з глыбінь народа, адлюстроўваць інтарэсы сялянства. Дзеля гэтай мэты ён актыўна рыхтаваўся да барацьбы з бальшавіцкай сістэмай. На яго думку, у выпадку вайны неабходна арганізаваць беларускія аддзелы, якія дапамаглі б культурным народам Еўропы знішчыць "дзікі бальшавізм". Гэтыя аддзелы павінны весці наступленне супраць савецкай улады і стварыць беларускі нацыянальны ўрад.

Як і іншыя ўдзельнікі працэсу 1926 г., М. Мяцельскі быў асуджаны да турэмнага зняволення. Пасля адбыцця пакарання ён прыехаў ў в. Цітва Рудзенскага раёна і там працаваў настаўнікам. Так сталася, што ў час масавых рэпрэсій 30-х гадоў ён не быў арыштаваны карнымі органамі (выключна рэдкі выпадак). У час фашысцкай акупацыі працягваў настаўнічаць у роднай вёсцы. У канцы сакавіка 1943 г. у "Беларускай газеце", якая выходзіла ў Мінску, з'явіўся артыкул "З мінулых дзён". У ім расказвалася аб акалічнасцях, што папярэднічалі працэсу над лістападаўцамі ў 1926 г., а таксама ход самога працэсу.

Гэта публікацыя прыцягнула ўвагу партызанскага кіраўніцтва. У другую Мінскую партызанскую брыгаду паступіла паведамленне аб тым, што адзін з лістападаўцаў М. Мяцельскі пражывае ў сваёй роднай вёсцы. 6 красавіка 1943 г. ён быў арыштаваны асобым аддзелам брыгады і дапрошаны. Яго абвінавацілі ў тым, што пасля адбыцця зняволення ў савецкім лагеры ён падтрымліваў сувязі з удзельнікамі лістападаўскай групы. Гэта было расцэнена такім чынам, быццам ён і яго сябры мелі на мэце актывізацыю нацдэмаўскай контррэвалюцыйнай дзейнасці, скіраванай супраць савецкай улады і бальшавізму. Яму прад'явілі і іншыя абвінавачванні, і ў той жа

дзень начальнік асобага аддзела брыгады прыняў рашэнне аб яго расстрэле, што і было здзейснена[1].

Гэта гісторыя прыкметная тым, што ў час Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай тэрыторыі карным партызанскім органам быў расстраляны чалавек не за супрацоўніцтва з фашыстамі, а за дастаткова даўнюю антысавецкую дзейнасць. Нават у экстрэмальных ваенных умовах была даведзена да канца карная акцыя з перадваенных гадоў.

У час, калі бальшавіцкая таталітарная сістэма цярпела вялікія выпрабаванні ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у тыле здараліся ўзброеныя выступленні даведзеных да адчаю людзей, што знаходзіліся ў сістэме ГУЛАГа. Актыўнымі ўдзельнікамі выступленняў з'яўляліся асуджаныя і высланыя з Беларусі. Адно з іх пачалося 24 студзеня 1942 г. у лагеры "Лесарэйд", які размяшчаўся на тэрыторыі Комі АССР. У ім знаходзілася звыш 50 ураджэнцаў Беларусі, у тым ліку былы нарком асветы БССР У. Півавараў, якога арыштавалі яшчэ 2 лістапада 1938 г. Сярод зняволеных узнікла смелае рашэнне — узняць паўстанне і вызваліць сябе, а таксама тых, хто знаходзіўся ў суседніх лагерах. Яны нават марылі стварыць добраахвотную армію са спецперасяленцаў і мясцовага насельніцтва.

Паўстанне было добра падрыхтавана і пачалося паспяхова. Зняволеныя захапілі пэўную колькасць зброі. Аднак са 141 чалавека працягваць барацьбу пагадзіліся 109. Яны рушылі на суседні пасёлак, што знаходзіўся на адлегласці 6 км, вызвалілі вязняў з камеры папярэдняга зняволення, занялі пошту, але мясцовы аэрадром захапіць не ўдалося. Завязаўся бой за будынак міліцыі. Аднак аднаму з мясцовых работнікаў удалося выклікаць па радыё дапамогу. Рашаючае сутыкненне працягвалася каля сутак. Да 28 студзеня паўстанне падавілі. Уцалелых кіраўнікоў паўстання, у тым ліку і У.Піваварава, даставілі ў сыктыўкарскую турму НКУС. Пасля працяглага следства 30 сакавіка 1942 г. іх расстралялі[2]. Гэта выступленне, як, дарэчы, і іншыя, сведчыла аб тым, што зняволеныя не заўсёды мірыліся са сваім становішчам і нават у безнадзейных умовах пана-

[1] Народная газета.1994. 25 жн.

[2] Советская Белоруссия. 1996. 17 янв.; Літаратура і мастацтва. 1994. 9 снеж.

вання таталітарных парадкаў імкнуліся адстойваць сваю чалавечую годнасць.

Змаганне з фашысцкай Германіяй і яе памагатымі з боку Савецкага Саюза было доўгім і адчайным, з напружаннем усіх людскіх сіл і матэрыяльных рэсурсаў. Патрыятызм савецкіх людзей і масавы гераізм, шырока раскрытыя ў гістарычнай і іншай гуманітарнай літаратуры, у многім дапаўняліся прымусовым характарам дзеянняў бальшавіцкага таталітарнага рэжыму, які дасягнуў у экстрэмальных ваенных умовах свайго апагею. Моцны прэс дзяржаўнага ўздзеяння на фронце забяспечвала дэталёва распрацаваная сістэма, у якую ўваходзіла вайсковае камандаванне, паліторганы, асобыя аддзелы, пракуратура, трыбуналы, загараджальныя атрады, штрафныя роты, штурмавыя батальёны, іншыя фарміраванні. Дзеянні ўсіх гэтых франтавых структур часоў Вялікай Айчыннай вайны былі эфектыўнымі. У савецкім тыле таксама функцыяніравала разгалінаваная сістэма нагляду за людзьмі, як радавымі працаўнікамі, так і кіруючымі работнікамі. Яго ажыццяўлялі НКУС і ўсе тыя службы і прыватныя асобы, што супрацоўнічалі з імі.

Такім чынам, у гады Вялікай Айчыннай вайны бальшавіцкая таталітарная сістэма зведала вялікія выпрабаванні з боку таталітарнага нацысцкага рэжыму. Нямала ў іх было агульнага — татальная падазронасць і вышук у сваіх краінах, татальнае праследаванне і фізічнае знішчэнне іншадумцаў, стварэнне з гэтаю мэтаю адпаведных карных органаў, фарміраванне культаў сваіх кіраўнікоў, укараненне адпаведна іх мэтам ідэалогій і інш. Як гэта было ў мінулым, шмат у чым падобныя рэжымы сутыкнуліся паміж сабою, што вылілася ў самую крывавую і жорсткую за ўсю гісторыю чалавецтва барацьбу.

Аднак у адрозненне ад бальшавіцкага гітлераўскі таталітарны рэжым адкрыта і нахабна імкнуўся да сусветнага панавання, узвёў яго ў ранг сваёй дзяржаўнай палітыкі, здзяйсняў татальнае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва, праводзіў генацыд сярод славянскіх і іншых народаў. Грунтавалася ўсё гэта на ганебнай тэорыі перавагі нямецкай нацыі над усімі іншымі. Самыя рэакцыйныя тэорыі і чалавекаг ненавісная практыка ўвайшлі ў арсенал нацысцкай партыі і дзяржавы. Таму і выступіла супраць яго большасць чалавецтва, утварылася антыгітлераўская кааліцыя краін з розным сацыяльна-эканамічным і

грамадска-палітычным ладам, народы якой вынеслі асноўны цяжар барацьбы.

Што датычыць бальшавіцкага таталітарызму, то яго імкненне да самазахавання супала з самаадданай барацьбой савецкіх народаў, у тым ліку беларускага, за сваю незалежнасць. Гэта адзінства мэт і забяспечыла поспех у жудаснай вайне. Яе вынікі шмат у чым мы адчуваем яшчэ і цяпер.

## 2. Бальшавіцкая таталітарная сістэма і аднаўленне гаспадаркі ў рэспубліцы: цяжкасці і дасягненні

Вынікі вайны для беларускага народа аказаліся надзвычай трагічнымі. Знаходзячыся ў цэнтры савецка-германскага супрацьборства, Беларусь у поўнай ступені зведала на сабе яго знішчальнае ўздзеянне. Асабліва цяжкімі былі людскія страты. Рэспубліка не далічылася больш чым кожнага чацвёртага жыхара. Гэты трагічны паказчык — адзін з самых высокіх у свеце. Ён моцна адчуваўся на працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў. І нават цяпер, у канцы XX стагоддзя, не залечана гэта глыбокая рана.

Эканоміка рэспублікі за час вайны таксама панесла найцяжэйшыя страты. Было разбурана ці вывезена ў Германію звыш 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, спалена больш за 200 гарадоў і раённых цэнтраў, звыш 9 тыс. вёсак. Матэрыяльныя страты дасягнулі 75 млрд руб. Гэта сума ў 35 разоў перавысіла дзяржаўны бюджэт БССР 1940 г.[1]

Як і ў гады вайны, дзе трэба было выстаяць у смяротнай барацьбе, так і ў пасляваенны час, калі востра паўстала задача аднаўлення дашчэнту разбуранай гаспадаркі, мэты бальшавіцкага таталітарнага рэжыму і савецкага народа, у тым ліку беларускага, супалі. Гэта супадзенне было з'явай аб'ектыўнай, хаця характар таталітарнай сістэмы сталінскага варыянта, накіраванасць яе дзеянняў не змяніліся. Больш таго, у апошні, пасляваенны перыяд жыцця яе кіраўніка яна дасягнула ў сваім развіцці вяршыні і перайшла ў стадыю пэўнай закасцянеласці. Гэта

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.324.

праяўлялася літаральна на ўсіх напрамках. Што датычыць сацыяльна-эканамічнага боку аднаўлення гаспадаркі, то яшчэ больш узрасла цэнтралізацыя кіраўніцтва, мясцовая ініцыятыва была пад жорсткім кантролем. Аднак пасля экстрэмальных ваенных умоў у цяжкі пасляваенны перыяд гэта ў асноўным успрымалася як з'ява неабходная.

У той жа час найбольш перадавая частка тых, хто ўдзельнічаў у вызваленні еўрапейскіх краін ад фашызму і пэўным чынам адчуў дэмакратычныя традыцыі ў іх жыцці, спадзяваліся на перамены да лепшага. Але гэтыя спадзяванні не маглі здзейсніцца. Прырода сталінскага рэжыму заставалася ранейшай, як і яго ўнутраная, так і агульная накіраванасць знешняй палітыкі. Даволі хутка адносіны з саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі, дарэчы, не без іх дапамогі, пайшлі на зніжэнне і наступіў перыяд "халоднай вайны". СССР зноў стаў закрытым грамадствам. У такіх звыклых умовах вялася вельмі цяжкая работа па аднаўленню гаспадаркі.

У выніку самаадданай працы народа і намаганняў таталітарнай сістэмы ў адносна кароткі тэрмін былі дасягнуты ў цэлым станоўчыя паказчыкі. Прамысловасць БССР ужо ў 1950 г. перавысіла даваенны ўзровень. Больш інтэнсіўна ў параўнанні з іншымі галінамі аднаўляліся машынабудаванне і металаапрацоўка. У 1947 г. далі першую прадукцыю мінскія аўтамабільны і мотавелазаводы, тонкасуконны камбінат. У 1952 г. валавая вытворчасць прамысловасці сталіцы рэспублікі перавысіла ўзровень 1940 г. у 3,5 раза. За гэты час забеспячэнне горада электраэнергіяй узрасло ў 7,3 раза[1]. Дадзеныя дасягненні сталі таксама магчымымі дзякуючы дапамозе як з боку цэнтральных партыйна-савецкіх органаў, так і саюзных рэспублік.

Больш нізкія тэмпы аднаўлення і развіцця прамысловай вытворчасці наглядаліся ў Заходняй Беларусі. К 1953 г. выпуск валавой прамысловай прадукцыі тут падвоіўся, а энергетычныя магутнасці павялічыліся ў чатыры разы ў параўнанні з 1940 г.[2] Ніжэйшыя тэмпы прамысловага развіцця ў заходніх абласцях БССР у параўнанні з усходнімі тлумачацца не толькі больш слабай зыходнай базай, якая ме-

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.329; НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.154.

[2] НАРБ, ф. 4, воп. 20, спр. 295, арк. 175.

лася тут у перадваенны перыяд, але і тагачаснай палітыкай савецкага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, скіраванай на пераважнае развіццё ўсходніх беларускіх тэрыторый.

Палітычны недавер сталінскага рэжыму да насельніцтва Заходняй Беларусі быў значны, устойлівы і праяўляўся ў многіх адносінах, у тым ліку ў эканамічным развіцці. Нават партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі Беларускай ССР у пачатку 50-х гадоў вымушаны былі канстатаваць, што развіццё заходніх абласцей рэспублікі значна адстае ад усходніх. У 1953 г. удзельная вага Заходняй Беларусі ў выпуску валавой прадукцыі склала толькі 17,2 %, а па энергетычных магутнасцях — 17, 7 %.

Такое становішча стварала мэтанакіраваная бюджэтная палітыка савецкай дзяржавы. Дастаткова сказаць, што ў тым жа 1953 г. капітальныя ўкладанні ў гаспадарку заходніх абласцей склалі толькі 12 % ад бюджэтных выдаткаў на ўсю гаспадарку БССР. Гэта не магло не адбіцца на вытворчасці тых ці іншых відаў прадукцыі. У 1953 г. у Заходняй Беларусі было здабыта 600 т торфу, а ва ўсёй БССР — 4,5 млн т. Вытворчасць цэглы на працягу года склала 190 млн штук. Гэта была толькі чацвёртая частка ад таго, што выраблі ўсяго ў рэспубліцы[1].

Дыскрымінацыя заходніх абласцей Беларускай ССР з боку кіраўнікоў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў працэсе пасляваеннага аднаўлення і развіцця гаспадаркі была свядомай і разлічанай палітыкай. Яе мэтай з'яўлялася пакаранне насельніцтва гэтай часткі рэспублікі за менш актыўны ўдзел у параўнанні з усходнімі абласцямі ў партызанскім руху, за тое, што ў гэтых мясцінах яшчэ заставаліся моцнымі пазіцыі прыватнай уласнасці, а адносіны да савецкай улады сталі даволі стрыманымі пасля таго, як заходнебеларускае насельніцтва з радасцю сустрэла Чырвоную Армію ў верасні 1939 г., а затым пад уздзеяннем дэпартацый насельніцтва, іншых праяў унутранай палітыкі лепш зразумела, што ўяўляе сабою бальшавіцкі рэжым.

У параўнанні з прамысловасцю значна цяжэй у БССР адбывалася аднаўленне сельскай гаспадаркі. Пасляваенная разруха тут адчувалася найбольш моцна. Вытворчыя сілы вёскі аказаліся на вельмі нізкім узроўні. Запушчаныя пасяўныя плошчы, амаль поў-

---

[1] НАРБ, ф. 4, воп. 20, спр. 295, арк.175 — 177.

ная адсутнасць вытворчай базы, у першую чаргу сельскагаспадарчай тэхнікі, прымушалі сельскіх працаўнікоў спадзявацца выключна на фізічную сілу свойскай жывёлы і свае асабістыя намаганні. Аднак і з гэтага боку становішча было вельмі цяжкім. Нават пры максімальнай мабілізацыі мужчынскіх працоўных рэсурсаў у калгасах Беларускай ССР іх удзельная вага склала толькі 23 % ад даваеннага паказчыка. Колькасць мужчын ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў у калгасах рэспублікі зменшылася ў параўнанні з даваенным часам амаль напалову[1]. У гэтых умовах значна ўзрасла роля жаночай працы.

Сумным вынікам надзвычай цяжкага становішча ў сельскай гаспадарцы БССР, бядотнага жыцця ў беларускай вёсцы ў пасляваенны час з'явілася імкненне значнай колькасці яе жыхароў перасяліцца ў Польшчу згодна з адпаведнымі міждзяржаўнымі пагадненнямі. Па стану на 15 чэрвеня 1945 г. выказалі жаданне выехаць з рэспублікі ў суседнюю краіну 96 129 гаспадарак, якія мелі ў сваім складзе 320 414 чалавек. Адначасова хацелі перасяліцца ў БССР з Польшчы 10 206 гаспадарак, якія налічвалі 36 971 чалавека. Розніца, як бачна, унушальная. Фактычна к гэтаму ж часу з Беларусі направіліся ў Польскую Рэспубліку 17 664 гаспадаркі (50 806 чалавек), а выехалі з Польшчы ў Беларусь 7272 гаспадаркі (26 740 чалавек).

Звяртае на сябе ўвагу той факт, што, нягледзячы на пераважную колькасць сем'яў і лік іх членаў, якія выехалі з БССР, у параўнанні з тымі, хто сюды прыязджаў, яны мелі прыблізна такую ж колькасць узятай з сабою жывёлы — коней, кароў, свіней, авечак і коз[2]. Гэта сведчыць аб тым, што ад'язджалі з Беларусі значна бяднейшыя сяляне, чым тыя, хто сюды прыязджаў.

У гэтым узаемным, але пераважным з беларускага боку добраахвотным перасяленні, несумненна, igралі ролю нацыянальна-этнічны і сваяцкі фактары. Блізкія людзі хацелі жыць не ў розных дзяржавах, а ў межах адной. Аднак відавочна, што тыя, хто высяляўся з БССР, імкнуліся збегчы не толькі ад страшэннай разрухі, але і ад існуючага рэжыму, які зведалі як у перадваенны час, калі ажыццяўляліся рэпрэсіўныя акты ў адносінах да розных катэгорый жыхароў ці выбарачна, так і адразу пасля вызвалення ад

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.29, спр.622, арк.324.

[2] Там жа, спр.223, арк.39.

нямецка-фашысцкіх захопнікаў, калі адбывалася "зачыстка" тэрыторыі. Не жадаючы рызыкаваць сваім лёсам і лёсам блізкіх, тыя, хто ад'язджаў у Польшчу, хацелі быць далей ад сталінска-бальшавіцкіх парадкаў.

Аднаўленне сельскай гаспадаркі ва ўсходніх абласцях ішло на аснове калгасна-саўгаснай вытворчасці. Па стану на 1 студзеня 1950 г. тут налічвалася 9770 калгасаў. З улікам іх невялікіх памераў было прынята рашэнне аб узбуйненні, і ўжо праз год агульная колькасць калектыўных гаспадарак зменшылася амаль да 3 тыс. У сярэднім іх памеры павялічыліся больш чым у тры разы. Толькі каля 300 калгасаў засталіся не ўзбуйненымі[1].

Важнейшым палітычным і сацыяльна-эканамічным мерапрыемствам бальшавіцкага рэжыму ў БССР у пасляваенны час з'яўлялася калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях. Яна была праведзена ў больш сціплыя тэрміны, чым ва Усходняй Беларусі ў пачатку 30-х гадоў — фактычна на працягу 1949 — 1950 гг. Пад яе была падведзена пэўная матэрыяльная база. К пачатку 1950 г. у Заходняй Беларусі налічвалася 78 машынна-трактарных станцый, якія мелі да 860 трактароў, іншую тэхніку.

Аднак адмоўны вопыт кампаніі дваццацігадовай даўнасці не быў улічаны. Прымусовы характар у дзеяннях тых, хто праводзіў калектывізацыю, пераважаў. Уцёкі сялян у лясы былі звычайнай справай. У шырокіх памерах ажыццяўлялася раскулачванне, якое нярэдка закранала і сераднякоў. Толькі ў Гродзенскай вобласці на працягу 1949 — 1950 гг. партыйна-дзяржаўныя органы вымушаны былі выключыць з ліку кулацкіх гаспадарак 458 серадняцкіх як няправільна аднесеных да гэтай катэгорыі[2].

Тым не менш у Маскве лічылі, што наступленне на заможнае сялянства зроблена ў недастатковых памерах. Ініцыятыва і тут зыходзіла ад цэнтральнага бальшавіцкага кіраўніцтва. Нават тады, калі калектывізацыя фактычна была завершана, а так званых кулакоў ужо выселілі, Савет Міністраў СССР у верасні 1951 г. прыняў пастанову "Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР". Згодна з ёю толькі ў 1952 г. з

[1] НАРБ, ф.4, воп.62, спр.182, арк.63.

[2] Там жа, воп.20, спр.295, арк.224.

заходніх абласцей рэспублікі выслалі яшчэ 4431 сям'ю, аднесеную да гэтай катэгорыі.

У дапамогу тым, хто непасрэдна ажыццяўляў калектывізацыю, былі створаны, як і ў 1933 г. ва Усходняй Беларусі, палітычныя аддзелы машынна-трактарных станцый — надзвычайныя партыйныя органы. Усё гэта прывяло да высокіх тэмпаў у стварэнні калектыўных гаспадарак.

Калі на 1 ліпеня 1948 г. у заходніх абласцях рэспублікі налічвалася 330 калгасаў, у якія ўваходзілі амаль 11,5 тыс. двароў, то на 20 сакавіка 1949 г. колькасць калгасаў дасягнула 1440. Яны аб'ядноўвалі больш за 60 тыс. гаспадарак. Гэта складала звыш 10 % ад іх агульнай колькасці. Толькі за час правядзення сяўбы азімых у 1948 г. было створана 578 новых калгасаў, а за 2,5 месяцы 1949 г. — 513[1].

Характэрна, што як у пачатку 30-х гадоў ва ўсходніх абласцях, так і ў Заходняй Беларусі ў час прымусовай калектывізацыі наглядалася супраціўленне гэтай гвалтоўнай акцыі. Толькі ў Баранавіцкай вобласці на працягу 1948 г. мелі месца больш за 100 падпальванняў калгасных пабудоў і двароў калгаснікаў, а таксама некалькі тэрарыстычных актаў. У Мірскім раёне ў канцы гэтага года ў час пасяджэння праўлення і актыву калгаса "Перамога" Жухавіцкага сельскага савета ў акно была кінута ручная граната. Сярод удзельнікаў пасяджэння меліся ахвяры[2].

Аднак масіраванае наступленне партыйна-дзяржаўных структур, дзеянні карных органаў, жорсткая падатковая палітыка, раскулачванне і высылка тысяч заможных гаспадароў і іх сем'яў дазволілі ў кароткі тэрмін уключыць асноўную частку сялянства заходніх абласцей у калектыўныя гаспадаркі. Ужо на 1 студзеня 1951 г. іх налічвалася больш за 6 тыс., а аб'ядноўвалі яны амаль 84 % сялянскіх двароў. К канцу 1952 г. у Заходняй Беларусі на калектыўны шлях гаспадарання было пераведзена звыш 540 тыс. гаспадарак. Яны складалі 95 % ад іх агульнай колькасці[3].

Метады бальшавіцкай сістэмы, што выкарыстоўваліся ў час правядзення калектывізацыі ў заходніх

[1] НАРБ, ф.4, воп.62, спр.1, арк.431, 444.

[2] Там жа, арк.447.

[3] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.334.



16 Зак. 5022

абласцях БССР, былі характэрны для ўсяго працэсу аднаўлення і далейшага развіцця прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Гэта датычылася фактычна ўсіх бакоў жыцця, але праяўлялася з рознай ступенню прымянення прымусовых мер. У прыватнасці, шырокія памеры набыло адміністраванне ў адносінах да кіраўнікоў калектыўных гаспадарак, арганізацый і ўстаноў. Асабліва гэта было характэрна для калгасна-саўгаснай сістэмы. Так, у ходзе справаздачна-выбарчай кампаніі ў калгасах у зімовы перыяд 1948—1949 гг. былі заменены 1654 старшыні калгасаў. Прычына адна — не справіліся з работай[1]. У многіх выпадках такая замена, магчыма, была апраўданай. Аднак высокая замяняльнасць старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў наглядалася фактычна кожны год, што стварала вялікую цякучасць не толькі сярод іх, але адпаведна і сярод іншых работнікаў калектыўных і савецкіх гаспадарак. Гэта не магло садзейнічаць паляпшэнню і стабілізацыі становішча.

Вынікі аднаўлення і далейшага развіцця аграмаджанай сельскагаспадарчай вытворчасці былі вельмі сціплымі. Да таго ж дзяржава забірала асноўную частку прадукцыі. Гэта ў першую чаргу адлюстроўвалася на матэрыяльным становішчы калгаснікаў і працаўнікоў саўгасаў. У 1952 г. у калгасах усходніх абласцей БССР было ў сярэднім выдадзена на адзін працадзень: грашыма — 37 кап., збожжавымі — 1 кг, бульбай — 1,4 кг. У гэты час у Заходняй Беларусі калгаснікі атрымалі на адзін працадзень 27 кап., зерня — 1,3 кг, бульбы — 0,5 кг. Нямала калгасаў зусім не выдавалі на працадні ні хлеба, ні бульбы, ні грошай. У гэтым жа годзе 45 калектыўных гаспадарак не выдалі па працаднях збожжа, да 1 кг выдалі больш чым 3 тыс. калгасаў. За ўдзел у грамадскай працы 2523 гаспадаркі не змаглі выдаць бульбы, 2251 — грошай. Асабліва нізкай была аплата за работу ў калгасах Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Полацкай, Маладзечанскай абласцей. У калектыўных гаспадарках Заходняй Беларусі выдача бульбы на працадзень не перавышала 0,5 кг[2].

Дынаміка павышэння выплат у калгасах за зробленую працу была ў пасляваенны час надзвычай павольнай. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць наступ-

[1] НАРБ, ф.4, воп.62, спр.1, арк.456—457.

[2] Там жа, воп.20, спр.295, арк.20.

ныя даныя па ўсходніх абласцях Беларускай ССР аб выдачы на адзін працадзень збожжа: 1945 г. — 400 г; 1946 г. — 300 г; 1947 г. — 500 г; 1948 г. — 570 г; 1949 г. — 400 г; 1950 г. — 600 г; 1951 г. — 600 г; 1952 г. — 1 кг.

У некаторых мясцінах становішча было яшчэ горшае, чым у сярэднім па рэспубліцы, а таксама па яе ўсходняй і заходняй частках. Толькі ў 1952 г. упершыню пасля вайны калгасы Магілёўскай вобласці змаглі выдаць на працадні збожжа. Не лепшым было становішча і ў Гродзенскай вобласці. У 1952 г. тут было выдадзена на адзін працадзень толькі па 12 кап. грошай, зерня — 1 кг 275 г, бульбы — 285 г. Гэта было значна менш, чым у сярэднім па рэспубліцы і нават па яе заходніх абласцях.

Такая нізкая выдача на працадні была абумоўлена ў першую чаргу надзвычай слабымі паказчыкамі ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Дастаткова сказаць, што ў 1952 г. у БССР не былі дасягнуты планавыя паказчыкі ні па адной з сельскагаспадарчых культур, а ў перыяд уборкі дапушчаны вялікія страты ўраджаю[1].

Адной з прычын такога становішча ў аграмаджаным сектары сельскай гаспадаркі БССР з'яўлялася неймаверная цэнтралізацыя кіраўніцтва, што заўсёды было неад'емнай рысай бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Па самых нязначных пытаннях патрабавалася згода цэнтральных партыйных ці савецкіх органаў. Паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца пісьмо першага сакратара ЦК КП(б)Б М. Патолічава сакратару ЦК УКП(б) Г.Малянкову, накіраванае 26 лютага 1951 г. Аб яго змесце гаворыць сама назва — "О производстве телег в Белорусской ССР".

Высокая ступень цэнтралізацыі кіраўніцтва эканамічным жыццём дапаўнялася валявымі і неапраўданымі дзеяннямі многіх службовых асоб на месцах. Асабліва распаўсюджанымі былі факты адміністравання, беззаконня і свавольства ў заходніх абласцях БССР. Вельмі выразна гэта праяўлялася пры рэалізацыі падатковай палітыкі сярод сялянства, што знаходзіла адлюстраванне ў самых розных формах: завышаліся заданні па нарыхтоўках сельскагаспадарчай прадукцыі, прымяняліся вопісы маёмасці і прымусовыя меры пры зборы розных плацяжоў, паставак і нядоімак, шырока практыкаваліся штрафы і

[1] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.115, 161, 187, 216.

нават асуджэнне сялян. Гэтыя з'явы мелі масавае распаўсюджанне і, як адзначалася на чэрвеньскім (1953 г.) пленуме ЦК КПБ, атрымалі "палітычна небяспечны характар"[1].

У 1951 г. фінансавыя органы рэспублікі правялі вопіс маёмасці ў 92 тыс. гаспадарак. Сярод іх 39 тыс. прыйшліся на гаспадаркі Заходняй Беларусі. Да судовай адказнасці былі прыцягнуты ўладальнікі 50 тыс. двароў. У 4669 выпадках зрабілі канфіскацыю маёмасці.

У 1952 г. масіраваны прэсінг нарыхтоўчых органаў на сялянства яшчэ больш узрос. Прымяняліся жорсткія санкцыі за несвоечасовае выкананне падатковых абавязацельстваў перад дзяржавай. За пастаўкі мяса са спазненнем была апісана маёмасць 127,3 тыс. гаспадарак, за пратэрміноўку ў пастаўцы малака гэту ж меру атрымалі 122,1 тыс. гаспадарак і г. д. На адзначаным вышэй пленуме ЦК КПБ канстатавалася, што тысячы грамадзян аддадзены пад суд без дастатковых падстаў[2].

Толькі на працягу 1952 г. ад сялян паступіла 113,9 тыс. заяў і скаргаў на няправільны ўлік аб'ектаў падаткаабкладання, пазбаўленне ільгот па падатках і на іншае беззаконне. У выніку разгляду 66,6 тыс. скаргаў былі прызнаны правільнымі[3].

Становішча ўскладнялася яшчэ і тым, што разам з жорсткімі мерамі, вызначанымі бальшавіцкай таталітарнай сістэмай па збору шматлікіх падаткаў, з боку службовых асоб было надзвычай шмат парушэнняў у рэалізацыі падатковай палітыкі. У Навамыскім раёне Баранавіцкай вобласці 60 сялянскім гаспадаркам Дубоўскага сельскага савета на працягу трох гадоў налічваўся сельскагаспадарчы падатак і іншыя плацяжы за зямлю, якая была ў іх адабрана і перададзена калгасу. Узамен, як абяцалі, зямлёю іх не надзялілі. Толькі ў 1952 г. устанавілі, што замест 251 га зямлі ў карыстанні гэтых гаспадарак знаходзіцца ўсяго 13,1 га. Такія ж факты мелі месца ў Ляхавіцкім, Сапоцкінскім, Ваўкавыскім і іншых раёнах.

Сярод тых, што непасрэдна рэалізоўваў падатковую палітыку на месцах, былі не толькі несумленныя людзі, а нават злачынцы, якія бессаромна карысталіся сваім службовым становішчам з мэтаю ўласнай на-

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.42.

[2] Там жа.

[3] Там жа.

жывы. Так, фінансавы агент Юрасік, які ажыццяўляў паборы ў Бераставіцкім раёне, пры зборы плацяжоў шырока карыстаўся непісьменнасцю і малапісьменнасцю насельніцтва. Ён збіраў грошы пад выглядам пагашэння плацяжоў, прысвойваў іх, а падаткаплацельшчыкам выдаваў фіктыўныя квітанцыі[1].

Надзвычай шырокія памеры злоўжыванняў пры рэалізацыі падатковай палітыкі абумоўліваліся і тым, што некаторыя партыйныя органы часам нават заахвочвалі такія падыходы. У прыватнасці, на гэтым стаяў Даманавіцкі раённы камітэт кампартыі Беларусі. За няпоўную першую палову 1953 г. толькі ў адносінах да фінансавых разлікаў з дзяржавай з яго дазволу былі зроблены вопісы маёмасці ў 400 гаспадарках, а раённы суд разгледзеў 87 спраў.

Фактычна паўсюдна практыкавалася завышэнне падаткаў. У 1952 г. сельскагаспадарчы падатак у БССР быў значна вышэй, чым у папярэдні год. Гэта асабліва датычылася тых, хто не хацеў уступаць у калгасы. У 1951 г. толькі па Гродзенскай вобласці 26 тыс. аднаасобнікам давялі падатак у суме 56 млн руб. У 1952 г. уладальнікам 14 тыс. аднаасобных гаспадарак неабходна было заплаціць дзяржаве ўжо 67 млн руб.[2]

Гэтыя і іншыя дзеянні прадстаўнікоў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы на месцах стваралі ў беларускім грамадстве даволі небяспечныя абставіны. Справа нават дайшла да таго, што рэспубліканскае партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва і яго мясцовыя структуры ўсё больш аддаляліся ад народа. Як вымушаны быў прызнаць сакратар ЦК КПБ М. Зімянін у дакладзе "Пастанова ЦК КПСС "Пытанні Беларускай ССР" і задачы партарганізацыі КП Беларусі", з якой ён выступіў на чэрвеньскім (1953г.) пленуме ЦК КПБ: "Нашы памылкі тлумачацца таксама пэўным адрывам кіраўніцтва ЦК КПБ і Савета Міністраў ад мас працоўных..."[3] Такое, хаця і асцярожнае, выказванне сведчыць аб многім. Савецкая ўлада заўсёды падкрэслівала сваю цесную сувязь з народам.

Традыцыйна негатыўнай з'явай у жыцці беларускага грамадства, як, дарэчы, і ў некаторых нашых

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.42 — 43.

[2] Там жа, арк.55, 192.

[3] Там жа, арк.42.

бліжэйшых суседзяў, стагоддзямі былі крадзяжы маёмасці. У часы панавання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, нягледзячы на жорсткасць мер, якія прымаліся, памеры гэтай з'явы прыкметна не змяншаліся, а нават узраслі, асабліва ў цяжкі пасляваенны час. Як вынікае з дакладной запіскі Міністэрства ўнутраных спраў БССР аб рабоце за перыяд з кастрычніка 1943 г. па 1 студзеня 1949 г. па ўсіх відах злачынстваў у рэспубліцы было ўзбуджана 46,6 тыс. спраў. Па іх матэрыялах прыцягнута да адказнасці звыш 57 тыс. чалавек. У ходзе гэтай работы канфіскавана грошай на суму каля 7,5 млн руб., на 1035 руб. знойдзена залатых вырабаў. Кошт вернутых тавараў склаў 5,7 млн руб. Агульная вага канфіскаваных мясных, хлебных і іншых прадуктаў дасягнула 120 т[1].

Сярод крымінальных дзеянняў, якімі займаліся органы Міністэрства ўнутраных спраў, пераважалі тыя, што датычыліся раскрадання сацыялістычнай маёмасці, спекуляцыі і самагонаварэння. Назіралася тэндэнцыя павелічэння дадзеных правапарушэнняў. Калі ў 1947 г. у гэтых адносінах было ўзбуджана каля 13,6 тыс. крымінальных спраў, дык у 1948 г. — амаль 14,5 тыс. Колькасць асоб, прыцягнутых да адказнасці, перавысіла ў кожным з гэтых гадоў 17 тыс. чалавек. Памер растрат толькі па сістэме дзяржаўнага гандлю дасягнуў у 1947 г. 7,2 млн руб., а за 9 месяцаў 1948 г. — 6,3 млн руб. Самыя значныя растраты былі выяўлены ў спажывецкай кааперацыі. У 1947 г. яны перавысілі 20 млн руб.[2]

Актыўна вялася барацьба з самагонаварэннем. Калі ў 1947 г. па гэтай прычыне было ўзбуджана каля 1 тыс. крымінальных спраў, дык у 1948 г. іх колькасць перавысіла 5,5 тыс. Барацьба з саматужнай вытворчасцю гарэлкі вялася ў самых розных формах. У 1947 г. быў канфіскаваны 121 самагонны апарат, у 1948 г. гэта лічба склала ўжо 2951. Канфіскацыя самагону ў гэтым годзе дасягнула амаль 17 тыс. літраў. Разам з тым было знішчана каля 18 тыс. вядзёр брагі. Гэта рабілася не толькі ў мэтах змяншэння п'янства сярод насельніцтва, але і для эканоміі збожжа. Дастаткова сказаць, што толькі ў 1948 г. па выяўленых фактах вытворчасці самагону было расходавана амаль 61 т хлеба і каля 18 т іншай прадукцыі.

[1] НАРБ, ф.4, воп.62, спр.38, арк.5, 11, 12.

[2] Там жа, спр.38, арк.112.

У галодныя пасляваенныя гады шырокія памеры набылі крадзеж і спекуляцыя хлебнымі прадуктамі. Аб маштабах гэтай з'явы сведчыць хаця б той факт, што на працягу 1947 —1948 гг. у крымінальных элементаў было канфіскавана каля 250 т хлеба. Агульная сума канфіскаваных грошай перавысіла ў 1947 г. 2 млн руб., прамысловых тавараў — больш за 1,8 млн руб.[1]

Як засведчыў пракурор Беларускай ССР А. Бондар на пленуме ЦК КПБ, які адбыўся ў чэрвені 1953 г., толькі па сістэме спажывецкай кааперацыі на працягу 1952 г. было раскрадзена дзяржаўных сродкаў на 10 млн руб. Па Міністэрству харчовай прамысловасці такія страты ацэньваліся ў 17 млн руб., па Міністэрству лёгкай прамысловасці — 13 млн руб. і г.д. Аднак, як канстатаваў пракурор рэспублікі, прыцягваюцца да адказнасці і асуджаюцца на доўгія тэрміны зняволення грамадзяне, якія ўзялі булку хлеба, кошык бульбы ці вязанку саломы.

Адміністрацыйная камісія пры Гродзенскім гарвыканкоме за 1952 г. незаконна аштрафавала 440 грамадзян, а такая ж камісія Кастрычніцкага райвыканкома горада Віцебска за 6 месяцаў 1953 г. незаконна аштрафавала 311 чалавек. На дзеянні ўпаўнаважанага Міністэрства нарыхтовак па Сапоцкінскаму раёну ў 1952 г. паступіла 631 скарга. У час праведзенай праверкі абгрунтаванымі прызнаны 467 скаргаў (73 %). З 300 скаргаў, што паступілі за чатыры месяцы 1953 г., на дзеянні работнікаў Копыльскага райфінаддзела пасля праверкі былі задаволены 225, ці 80 %[2].

Імкненне партыйна-савецкіх органаў змагацца з парушэннямі заканадаўства мела на мэце не дапусціць абвастрэння адносін паміж працоўным народам і адміністрацыйным апаратам. Гэта рабілася для захавання сістэмы, каб не даводзіць да небяспечнай мяжы той прэсінг, які заўсёды быў характэрны для бальшавіцкай улады.

Эканамічна абгрунтаваным і лагічным уяўляецца выкарыстанне ў мэтах аднаўлення разбуранай вайною гаспадаркі працы ваеннапалонных, а таксама інтэрніраваных асоб. Па стану на 1 жніўня 1945 г. у лагерах Міністэрства ўнутраных спраў на тэрыторыі Беларускай ССР іх налічвалася 98 237. К 1 студзеня

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.62, спр. 38, арк.112 — 113.

[2] Там жа, воп.20, спр.295, арк.171.

1949 г. гэта лічба зменшылася і дасягнула 21 007. Працэс перадачы дадзеных асоб нямецкаму боку быў завершаны ў 1951 г.

Ваеннапалонныя і інтэрніраваныя асобы выкарыстоўваліся на важнейшых гаспадарчых аб'ектах: на аднаўленчых работах у сталіцы Беларусі, будаўніцтве мінскіх аўтамабільнага і трактарнага заводаў, узвядзенні станкабудаўнічых заводаў у Мінску, Гомелі, Віцебску, цэментных заводаў у Ваўкавыску, Клічаве, домабудаўнічых камбінатаў у Віцебску і Рэчыцы, цагляных заводаў у Мінску, Гродне, Гомелі, Віцебску, шклозавода ў Гомелі, на аднаўленні чыгуначных вузлоў у Маладзечне, Баранавічах, Гомелі, на будаўніцтве аўтастрады Мінск — Брэст, а таксама іншых важных аб'ектах[1].

Задача заключалася ў тым, каб атрымаць ад дадзенай катэгорыі рабочай сілы як мага большую гаспадарчую аддачу. Таму разам з арганізацыяй унутранага распарадку лагераў, іх аховай, правядзеннем разведвальнай і контрразведвальнай работы, падрыхтоўкай судовых працэсаў над былымі ваеннаслужачымі нямецка-фашысцкай арміі і яе карных органаў, якія ўчынілі злачынствы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, надавалася ўвага павышэнню эфектыўнасці працы гэтага кантынгенту людзей на гаспадарчых аб'ектах. У выніку адпаведных захадаў паступова павышаўся ўдзел ваеннапалонных і інтэрніраваных асоб у гэтых работах. Калі ў 1945 г. на такой працы выкарыстоўвалася толькі 32 % спісачнага складу ваеннапалонных, а за 1946 г. — 63,8, то ў 1948 г. гэта выкарыстанне дасягнула амаль 100 %.

У лагерах для ваеннапалонных і інтэрніраваных прымянялася даволі складаная сістэма арганізацыі працы, яе заахвочвання і ўліку. Гэта садзейнічала павышэнню эфектыўнасці работы. Паводле даных за 1948 г. па дзевяці лагерах, дзе ўтрымлівалася 30 566 чалавек, выхад на аб'екты быў фактычна стопрацэнтным, а выпрацоўка на кожнага зняволенага некалькі перавышала ўстаноўленую норму. Яшчэ вышэйшымі былі сумарныя паказчыкі. Аднак па кожнаму лагеру гэтыя вынікі значна адрозніваліся, асабліва па выпрацоўцы на аднаго чалавека, а таксама па агульных звестках.

У складаны пасляваенны час, калі адной са шматлікіх цяжкасцей з'яўлялася вялікая няхватка працоўнай сілы, выкарыстанне ваеннапалонных, а

[1] НАРБ, ф.4, воп.62, спр.38, арк.15.

таксама інтэрніраваных асоб мела важнае значэнне ў будаўнічых і аднаўленчых работах. Дастаткова сказаць, што на ўзвядзенні карпусоў аўтамабільнага і трактарнага заводаў былі задзейнічаны 7500 чалавек з гэтага кантынгенту, на аднаўленні завода імя Кірава ў Мінску — 1200, на будаўніцтве і рамонце жылога фонду сталіцы рэспублікі, а таксама будынку Акадэміі навук — па 800 чалавек, на аднаўленні тэатра оперы і балета — 1500 і г.д.[1]

Аднак работы па аднаўленню і далейшаму развіццю гаспадаркі нярэдка ўскладняліся стыхійнымі бедствамі ці трагічнымі з'явамі, учыненымі ў выніку злачыннай бяспечнасці людзей. Так, 25 мая 1950 г. у райцэнтры Давыд-Гарадок Пінскай вобласці здарыўся вялікі пажар. Былі знішчаны 102 жылыя дамы, з іх 17 з'яўляліся камунальнымі, а таксама кінатэатр, 92 гаспадарчыя пабудовы. Як меркавалася, пажар адбыўся ад непатушанай цыгарэты[2].

У арсенале дзеянняў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, асабліва яе кіраўніцтва, як саюзнага, так і рэспубліканскага, заўсёды было нямала тайных спраў. Цяпер яны больш вядомы ў адносінах кіраўнікоў цэнтральных партыйна-дзяржаўных органаў і менш — рэспубліканскіх. Лічылася, што гэтыя кіраўнікі, якія знаходзіліся пад пільным кантролем Масквы, не ў стане дапускаць такія дзеянні, каб хаваць іх ад народа. Але так было не заўсёды. І на рэспубліканскім узроўні, калі з'яўлялася магчымасць, дапускаліся злоўжыванні. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць гісторыя з дапамогай Беларускай ССР, аказанай спецыяльным ведамствам пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый — Адміністрацыяй дапамогі і аднаўлення гаспадаркі (ЮНРРА). Згодна з прынятымі рашэннямі, Украінскай ССР дапамога аказвалася ў памеры 189 млн, а Беларускай ССР — 61 млн амерыканскіх долараў. Цэнтральнымі і мясцовымі савецкімі ўладамі гэта дапамога не афішыравалася, аб ёй фактычна нічога не паведамлялася ў друку.

На працягу красавіка 1946 г. — сакавіка 1947 г. БССР атрымала харчаванне, адзенне, медыкаментаў, прамысловага і сельскагаспадарчага абсталявання

---

[1] *Шарков А. В.* Военнопленные и интернированные на территории Беларуси. Роль органов внутренних дел в их содержании и трудовом использовании (1944—1951 гг.). Мн., 1997. С.88, 96, 97.

[2] НАРБ,ф.4, воп.62, спр.152, арк.130.

на суму 60 млн 820 тыс. доларaў. Больш за ўсё было пастаўлена прадуктаў харчавання — мяса, малочных вырабаў, тлушчаў, масла, рыбы, збожжа, бабовых. Згодна з адпаведным рашэннем урада і ЦК КП(б)Б, частка харчовых і прамысловых тавараў павінна была бясплатна перадавацца бальніцам, шпіталям, школам, дзіцячым установам, а таксама насельніцтву, якое больш за ўсё пацярпела ад акупацыі, інвалідам вайны, рэпатрыянтам. Астатнія тавары меркавалася рэалізоўваць па дзяржаўных рознічных цэнах, па картках праз магазіны і прадпрыемствы. Грошы ад іх рэалізацыі планавалася накіраваць на аказанне дапамогі насельніцтву. Аднак, як сведчаць відавочцы тых падзей, частка дапамогі, у першую чаргу харчовыя і прамысловыя тавары, была размеркавана сярод наменклатурных работнікаў і членаў іх сем'яў. Нездарма, паводле пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б, прынятай яшчэ 8 студзеня 1946 г., уся дакументацыя аб аперацыях ЮНРРА была засакрэчана[1].

Не менш паказальнай у гэтых адносінах з'яўлялася праверка фінансава-гаспадарчай дзейнасці ЦК КП(б)Б, зробленая ў 1946 г. камісіяй кіраўніцтва справамі ЦК УКП(б). Па яе выніках была складзена дакладная запіска, у якой прапаноўвалася неадкладна зняць з займаемых пасад кіраўніка справамі ЦК КП(б)Б і галоўнага бухгалтара. Такое рашэнне было прынята перш за ўсё таму, што фінансавыя сродкі выкарыстоўваліся імі не па прызначэнню. Толькі ў 1945 г. кіраўніцтвам справамі ЦК КП(б)Б было расходавана каля 900 тыс. руб. на закупку дарагой мэблі, сервізаў, крышталю. Гэта склала 44 % ад усяго інвентару, які меўся ў карыстанні цэнтральнага камітэта кампартыі Беларусі. Пры гэтым значная частка набытых рэчаў апынулася на кватэрах адказных партыйных работнікаў. Дастаткова сказаць, што з 2 млн руб., у якія ацэньвалася маёмасць ЦК КП(б)Б, у асабістым карыстанні была тая яе частка, якая каштавала 779 тыс. руб. Гэта склала 38 % ад усёй улічанай маёмасці.

Ганебныя падыходы прымяняліся пры размеркаванні рэчаў, якія атрымлівала рэспубліка з Германіі па рэпарацыях. Бясплатнай іх раздачай і

[1] Советская Белоруссия. 1995. 6 июня; *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. 1944 — 1953 гг. Мн., 1997. С.52 — 74.

размеркаваннем падарункаў таксама займалася кіраўніцтва справамі ЦК КП(б)Б. Толькі ў 1945 г. вышэйшым партыйным і савецкім работнікам рэспублікі былі бясплатна выдзелены 124 трафейныя радыёпрыёмнікі, а ў пачатку 1948 г. — яшчэ 70. У асабістае карыстанне перайшлі таксама 17 трафейных піяніна.

Пры гэтым размеркаванні не абыходзілі і работнікаў больш нізкага рангу. У лістападзе 1945 г. у ЦК КП(б)Б было падпісана распараджэнне, якім рэгламентавалася раздача пасылак для партыйных і савецкіх работнікаў раённага звяна. Згодна з гэтым дакументам, для мясцовых кіраўнікоў было адпраўлена 5,8 тыс. м сукна, 1,8 тыс. пар бялізны, 5,4 тыс. ручнікоў, 3 тыс. кавалкаў туалетнага і гаспадарчага мыла і г.д.[1] Дадзеныя факты красамоўна сведчаць аб рэальным становішчы спраў у размеркаванні матэрыяльных каштоўнасцей сярод розных пластоў насельніцтва. Простым людзям атрымаць замежную гуманітарную дапамогу ці тое, што ішло ў рэспубліку па рэпарацыйных пастаўках, было надзвычай складана ці нават немагчыма.

Такім чынам, у выніку самаадданай працы народа, намаганняў бальшавіцкай сістэмы, дапамогі ўсёй краіны ўшчэнт разбураная гаспадарка БССР у канцы 40-х — пачатку 50-х гадоў была ў асноўным аднаўлена. Гэта перш за ўсё адносілася да прамысловасці. Справы ў сельскай гаспадарцы ішлі значна горш. Яны ўскладняліся прымусовай калектывізацыяй у заходніх абласцях рэспублікі, што адмоўна адбілася на паказчыках сельскагаспадарчай вытворчасці. Жыццёвы ўзровень народа заставаўся вельмі нізкім. Сацыяльнае забеспячэнне з боку дзяржавы закранала ў першую чаргу насельніцтва гарадоў, рабочых і служачых. Сельскія жыхары былі ім ахоплены крайне слаба.

Дзеянні бальшавіцкай таталітарнай сістэмы па аднаўленню і далейшаму развіццю гаспадаркі рэспублікі сведчаць аб выкарыстанні ўласцівых ёй сродкаў у шырокіх памерах. У пасляваенны час гэта праявілася асабліва маштабна і рэльефна. Дадзеная сістэма на заключным этапе жыцця яе асноўнага натхняльніка — Сталіна дасягнула высокай ступені бюракратызацыі, кансерватызму, злоўжыванняў. Цяжкае пасляваеннае жыццё беларускага народа яскрава пацвярджае гэта.

[1] Народная воля. 1996. № 61.

## 3. Працяг уціску ў грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным жыцці

Таталітарныя метады кіравання аднаўленнем гаспадаркі дапаўняліся іх выразнымі праявамі ў грамадска-палітычным развіцці, адносінах да нацыянальна-культурных праблем. Інакш фактычна і быць не магло, паколькі розныя бакі жыцця грамадства цесна звязаны паміж сабою. Як у эканамічнай, так і ў грамадска-культурнай сферах дзейнасць улад у пасляваенны час характарызавалася імкненнем захаваць тыя ж націскныя метады пры аднаўленні матэрыяльнай базы і наладжванні работы розных бакоў духоўнага развіцця грамадства.

Адной з асноўных задач з'яўлялася аднаўленне сістэмы адукацыі, разбурэнні ў якой былі надзвычай вялікія. Дастаткова сказаць, што ў час вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ці разбурылі на Беларусі 6808 школ, знішчылі больш за 20 млн экземпляраў вучэбнай літаратуры.

З першых дзён вызвалення пачалася самаадданая праца па аднаўленню агульнаадукацыйнай школы. Да канца 1950 г. гэта мэта ў асноўным была дасягнута. Дадзеная работа ў значнай ступені праводзілася ў першыя пасляваенныя месяцы. Ужо ў 1945/46 навучальным годзе ў БССР працавалі 10 915 школ усіх тыпаў. К 1950/51 навучальнаму году іх колькасць дасягнула 11 767, а лік вучняў павялічыўся з 1 млн 336,7 тыс. да 1 млн 498,6 тыс.

Аднак матэрыяльная база школьнай сеткі была надзвычай слабай. Нават у 1955/56 навучальным годзе 7260 школ размяшчаліся ў прыстасаваных і 2088 — у наёмных будынках, якія мала падыходзілі для заняткаў. Нягледзячы на гэта, да сярэдзіны 50-х гадоў у асноўным было завершана ўсеагульнае сямігадовае навучанне.

Пашыралася і сярэдняя адукацыя, у тым ліку сярэдняя спецыяльная. У 1955 г. у рэспубліцы дзейнічалі 123 тэхнікумы. На працягу пасляваеннага дзесяцігоддзя імі было падрыхтавана каля 90 тыс. спецыялістаў.

Адначасова звярталася пільная ўвага на аднаўленне вышэйшай адукацыі. Ужо ў 1944/45 навучальным годзе пачалі работу 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы. Да 1951 г. яны падрыхтавалі звыш 14 тыс. маладых спецыялістаў. У 1951 — 1955 гг. яшчэ 33,5

тыс. чалавек атрымалі вышэйшую адукацыю. Қ сярэдзіне 1957 г. у рэспубліцы працавала амаль 215 тыс. спецыялістаў, у тым ліку каля 84 тыс. з вышэйшай адукацыяй.

Нямала рабілася і па аднаўленню навуковага патэнцыялу. У 1946 г. у рэспубліцы пачалі дзейнасць 38 навуковых устаноў. Вялікая ўвага надавалася аднаўленню Акадэміі навук БССР. На працягу 1945 — 1950 гг. колькасць навуковых устаноў акадэміі павялічылася да 15. Расла і колькасць супрацоўнікаў. Қалі ў 1946 г. тут працавала 440 чалавек, то ў 1951 г. — каля тысячы. Паступова павышалася кваліфікацыя навуковых кадраў[1].

Вялікія намаганні прыкладваліся для аднаўлення сеткі культурна-асветных устаноў у гарадах і сельскай мясцовасці — клубаў, бібліятэк, хат-чытальняў, чырвоных куткоў і інш. Узнаўляўся іх кніжны фонд. Паступова наладжваўся выпуск газет, як рэспубліканскіх, так і абласных і раённых.

Аднак гэта і іншая стваральная работа вялася ва ўмовах шматлікіх праяў націску бальшавіцкай таталітарнай сістэмы на тых, хто самаадданай працай пераадольваў вынікі самай разбуральнай з войнаў у грамадска-палітычнай і нацыянальна-культурнай галінах. Ініцыятыва, як заўсёды, была за цэнтральным кіраўніцтвам. На месцах арганізоўваліся кампаніі па яе падтрымцы. Лейтматывам усёй дзейнасці ў пасляваенны час з'яўлялася ўхваленне Сталіна. Гэта дасягнула найвышэйшай ступені ў 1949 г. у сувязі з яго 70-годдзем. Як і ў іншых саюзных рэспубліках, у Беларускай ССР было падрыхтавана "Пісьмо вялікаму Сталіну ў слаўнае 70-годдзе з дня нараджэння ад беларускага народа". У сувязі з гэтай кампаніяй у рэспубліцы было арганізавана 31,5 тыс. мітынгаў і сходаў, на якіх прысутнічала звыш 3 млн чалавек. Қаля 100 тыс. з іх выступілі з хвалебнымі прамовамі[2].

Разам з гэтай кампаніяй разгортваліся і іншыя. Шырокі грамадскі рэзананс быў нададзены барацьбе з касмапалітызмам і антысемітызмам. Гэта барацьба мела шмат праяў, у тым ліку забойства С. Міхоэлса — мастацкага кіраўніка дзяржаўнага яўрэйскага тэатра, народнага артыста СССР, старшыні яўрэйскага антыфашысцкага камітэта, які дзейнічаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Акцыя была пра-

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.360 — 364.

[2] Там жа. С.341.

ведзена ў Мінску 13 студзеня 1948 г. Выканаўцы атрымалі ўрадавыя ўзнагароды[1].

У колах інтэлігенцыі, асабліва літаратурнай, супярэчлівы водгук выклікала прынятая ў жніўні 1946 г. пастанова ЦК УКП(б) «Аб часопісах “Звязда” і “Ленінград”». Шмат людзей, у першую чаргу кіруючых работнікаў, былі абвінавачаны і рэпрэсіраваны ў сувязі са сфабрыкаванай у 1949 г. “ленінградскай справай”. Гэтыя і іншыя акцыі цэнтральных партыйных і дзяржаўных улад у многім вызначалі грамадска-палітычнае жыццё дзяржавы, у тым ліку Беларускай ССР.

У значнай ступені пад іх уздзеяннем праходзілі асноўныя грамадска-палітычныя кампаніі пасляваеннага часу. У лютым 1946 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет СССР, а ў сакавіку 1947 г. — у Вярхоўны Савет Беларускай ССР, у студзені 1948 г. і ў снежні 1950 г. — у мясцовыя саветы. Гэта былі надзвычай заарганізаваныя кампаніі, а грамадска-палітычныя якасці кандыдатаў у дэпутаты вызначаліся па ступені іх удзелу ў праводзімых мерапрыемствах і ва ўхваленні кіраўніка партыі і дзяржавы.

Уся грамадска-палітычная работа ажыццяўлялася пад поўным партыйным кантролем. На яе ўздзейнічалі тыя працэсы, што адбываліся ў самой партыі. Для пасляваеннага часу характэрны інтэнсіўны рост колькасці партыйных арганізацый і агульнае павелічэнне іх складу. Калі на 1 студзеня 1945 г. кампартыя Беларусі налічвала 29 515 чалавек, на 1 студзеня 1951 г. — 116 663, то на 1 студзеня 1956 г. у яе радах было 145 069 чалавек[2].

Аднак фактычна на нішто былі зведзены дэмакратычныя пачаткі ў рабоце партыйных камітэтаў і нізавых партарганізацый. Строгая цэнтралізацыя партыйнага жыцця навязвалася зверху, дзе рашэнні прымаліся вышэйшым партыйным кіраўніцтвам пераважна ў рабочым парадку. Дастаткова сказаць, што на працягу 1946 — 1952 гг. адбыліся толькі чатыры пленумы ЦК УКП(б), тры з якіх разглядалі арганізацыйныя пытанні. Праз сем гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай і другой сусветнай вой-

---

[1] Голас Радзімы. 1977. 30 студз.; Звязда. 1998. 14 студз; Советская Белоруссия. 1998. 17 янв.

[2] Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. 1918 — 1978. Мн., 1978. С.76.

наў і пасля трынаццацігадовага перапынку з часу папярэдняга з'езда быў скліканы XIX з'езд партыі. Але ён не стаў месцам аналізу стану спраў у краіне і выпрацоўкі перспектыўных задач, а быў ператвораны ў мерапрыемства па нястрымнаму ўхваленню Сталіна, яго ідэйнага і практычнага кіраўніцтва савецкай дзяржавай.

Для пасляваеннага часу характэрна надзвычай вялікая фармалізацыя дзейнасці саветаў і грамадскіх арганізацый. Іх работа фактычна была зведзена да ўхвалення, станоўчага каменціравання і адпаведнай канкрэтызацыі партыйных рашэнняў. Любая ініцыятыва падтрымлівалася толькі тады, калі адпавядала афіцыйнаму курсу. Дзейнасць саветаў усіх узроўняў жорстка рэгламентавалася адпаведнымі партыйнымі камітэтамі. Гэта датычылася не толькі кадравых пытанняў, але і ўсіх напрамкаў работы. Тое ж самае можна сказаць і пра дзейнасць прафсаюзнай, камсамольскай, іншых арганізацый. Усё ў іх рабоце было прадвызначана адпаведнымі партыйнымі рашэннямі.

Істотны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё ў савецкай дзяржаве, у тым ліку ў БССР, у пасляваенны час аказвала ўсё тое, што было звязана з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Складанай праблемай у гэтай сувязі былі адносіны партыйна-дзяржаўных улад да тых, хто аказаўся ў нямецка-фашысцкім палоне, а затым вярнуўся на радзіму. Аднак пазіцыя вярхоўнага кіраўніцтва бальшавіцкай таталітарнай сістэмы да ваеннапалонных не змянілася пасля пераможнага завяршэння вайны. Яна заставалася ранейшай — палітычны недавер, абвінавачванне ў тым, што яны падпарадкаваліся насіллю і не выбралі для сябе смяротны зыход. Гэта антыгуманная, антычалавечная лінія вынікала з сутнасці і характару сталінскага таталітарнага праўлення. Яго кіраўнікоў не цікавіла тое, што такі падыход быў дыяметральна процілеглым, чым міжнародная практыка. Дадзеная пазіцыя замацоўвалася ў адпаведных рашэннях. 18 жніўня 1945 г. Дзяржаўны Камітэт Абароны прыняў пастанову, згодна з якой пакаранню належалі былыя ваеннаслужачыя і ваеннаабавязаныя Чырвонай Арміі, якія трапілі ў палон да немцаў і служылі ў нямецкіх фарміраваннях. На самай справе праследаваліся ўсе ваеннаслужачыя, якія трапілі ў палон. Усе пасляваенныя гады яны абмяжоўваліся ў

правах атрымаць работу, адукацыю, займацца грамадскай дзейнасцю, выбіраць месцажыхарства.

З улікам гэтых абставін вышэйшае ваеннае кіраўніцтва часам рабіла захады, каб змяніць іх. Так, у пачатку 1950 г. у ЦК УКП(б) паступіла дакладная запіска ад Галоўнага ўпраўлення кадраў Узброеных Сіл СССР. У ёй паведамлялася аб праследаваннях афіцэраў, што трапілі ў палон. Аднак гэты дакумент быў пакінуты без увагі.

У канцы 1954 г. старшыня КДБ Саюза ССР І. Сяроў звярнуўся з пісьмом у ЦК КПСС. У ім выкладаліся меры па вяртанні на радзіму савецкіх грамадзян, якія яшчэ заставаліся пасля вайны ў Заходняй Еўропе. Прапаноўвалася аб'явіць амністыю "перамешчаным асобам", а таксама тым, хто служыў у розных нямецкіх фарміраваннях. Пры гэтым аргументам выступала тое, што дадзеных людзей могуць выкарыстаць заходнія дзяржавы ў антысавецкіх мэтах. Разгледзеўшы прадстаўленне, прэзідыум ЦК КПСС пагадзіўся з ім. 17 верасня 1955 г. з'явіўся ўрадавы ўказ "Аб амністыі савецкіх грамадзян, якія супрацоўнічалі з акупантамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў"[1].

У гэтай сувязі парадаксальна выглядала становішча, калі заставаліся ранейшымі адносіны да ваеннаслужачых, якія былі асуджаны за тое, што трапілі ў палон у ходзе ваенных дзеянняў. Палітыка да іх была вельмі несправядлівай. У сувязі з гэтым міністр абароны Саюза ССР маршал Г.Жукаў паставіў пытанне перад вышэйшымі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі краіны. У выніку была створана камісія пад яго кіраўніцтвам. У кароткі тэрмін яна прадставіла даклад, дзе канстатавалася, што як у час вайны, так і ў пасляваенны перыяд у адносінах да ваеннапалонных, а таксама асоб, якія выходзілі з акружэння і фактычна не былі ў палоне, дапушчаны грубейшыя парушэнні савецкай законнасці. Гэта праяўлялася ў абмежаванасці іх правоў, прымяненні мер, якія прыніжалі іх уласную годнасць. З 1941 г. гэтыя ваеннаслужачыя накіроўваліся праз зборна-перасыльныя пункты пад канвоем войскаў НКУС у тылавыя лагеры з мэтаю спецправерак. Умовы іх утрымання былі такія ж, як для асуджаных. Да таго ж у многіх выпадках да іх прымяняліся незаконныя, правакацый-

[1] Советская Белоруссия. 1997. 8 апр.

ныя метады следства. Шмат хто быў неабгрунтавана рэпрэсіраваны, хаця многія сумленна выканалі свой воінскі абавязак і нічым не скампраметавалі сябе ў палоне.

У мэтах ліквідацыі грубейшых скажэнняў, дапушчаных адносна гэтых людзей, камісія прапанавала прыняць адпаведную пастанову, у якой асудзіць як няправільную і супрацьлеглую інтарэсам савецкай дзяржавы палітыку агульнага палітычнага недаверу да былых савецкіх ваеннаслужачых, што знаходзіліся ў палоне ці акружэнні. Камісія прапаноўвала, каб гэта пастанова абавязала партыйныя і дзяржаўныя органы поўнасцю ліквідаваць дапушчаныя абмежаванні як у адносінах да былых ваеннаслужачых, так і іх сем'яў. Калі палон не быў добраахвотным і ваеннаслужачы не зрабіў якіх-небудзь злачынстваў супраць Радзімы, меркавалася залічваць час у палоне ў тэрмін службы ў арміі, а таксама ў агульны і бесперапынны стаж работы. Мелася на ўвазе адмяніць усе загады, інструкцыі і іншыя дакументы аб утрыманні ў спецлагерах былых ваеннаслужачых.

Камісія прапаноўвала таксама перагледзець у асабістым парадку ўсе справы былых ваеннапалонных савецкіх афіцэраў, пазбаўленых воінскіх званняў, і ва ўсіх неабходных выпадках аднавіць іх. Разам з тым меркавалася прадставіць да ўрадавых узнагарод былых ваеннапалонных, якія мелі раненні ці зрабілі пабег з месцаў утрымання.

Па дакладу была прынята адпаведная пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. Аднак кіраўнікі партыі і дзяржавы не пайшлі далей амністыі тых ваеннаслужачых, якія змаглі даказаць, што трапілі ў палон вымушана. Усе астатнія прапановы аўтарытэтнай камісіі былі праігнараваны[1]. У гэтай сувязі звяртае на сябе ўвагу тое, што партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва краіны сярэдзіны 50-х гадоў нават пасля XX з'езда КПСС у адносінах да ваеннапалонных працягвала тую лінію, якая праводзілася пры жыцці Сталіна, нягледзячы на яе неабгрунтаванасць і супярэчнасць не толькі здароваму сэнсу, але і міжнароднай практыцы.

Палітычны недавер у вярхоўнага кіраўніцтва дзяржавы быў не толькі да савецкіх людзей, якія перанеслі пакуты нямецка-фашысцкіх лагераў, а нярэдка і да тых, хто самааддана змагаўся з ворагам

[1] Советская Белоруссия. 1997. 8 апр.

на акупіраванай тэрыторыі, але быў свядома і з разлікам скампраметаваны фашысцкімі спецыяльнымі органамі і гітлераўскай прапагандай. Такі кампрамат успрымаўся савецкім бокам у нямалай колькасці выпадкаў з даверам. Ведаючы характар бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, гітлераўскія спецслужбы на гэта і разлічвалі. Нярэдка яны не памыляліся. Гэта ў значнай ступені пацвярджае пасляваенны лёс многіх з тых, хто самаадданa змагаўся з ворагам у акупіраваным Мінску. Органамі НКУС у 40 — 50-х гадах было арыштавана 126 былых падпольшчыкаў. У больш позні час 113 з іх рэабілітаваны[1]. Толькі ў пачатку 90-х гадоў зняты абвінавачванні з сакратара Мінскага падпольнага гарадскога камітэта кампартыі Беларусі І. Казалёва, які мужна трымаўся ў фашысцкіх засценках і загінуў там.

З улікам існуючых абставін вялікую занепакоенасць партыйных і дзяржаўных улад выклікала тая замежная літаратура, якая, нягледзячы на закрытасць савецкага грамадства, усё ж такі паступала ў краіну, а таксама тыя трафейныя выданні, што былі захоплены ў краінах Еўропы, асабліва ў Германіі, у час паходу Савецкай Арміі. Да гэтай катэгорыі ўлады таксама адносілі літаратуру, якая дасылалася ў дзяржаву замежнымі арганізацыямі ў якасці падарункаў.

У красавіку і ў верасні 1947 г. Галоўліт СССР накіраваў міністэрствам указанне, якое вызначала парадак атрымання і выкарыстоўвання трафейнай літаратуры. У прыватнасці, устанаўлівалася, што арганізацыі маглі яе атрымліваць толькі з санкцыі кіраўніцтва міністэрства. Па зместу гэта літаратура павінна была адпавядаць профілю дзейнасці міністэрства і ў абавязковым парадку вывучацца з пункту погляду цэнзуры.

Гэтыя захады былі прыняты ў сувязі з тым, што некаторыя арганізацыі доўга не паведамлялі аб такой літаратуры органам цэнзурнага кантролю, нягледзячы на прынятае 14 верасня 1946 г. Саветам Міністраў Саюза ССР адпаведнае рашэнне. Яно вызначала парадак набыцця замежнай літаратуры міністэрствамі, ведамствамі, установамі. Адказнасць за такую літаратуру, яе захаванне і выкарыстанне была ўскладзена на кіраўнікоў ведамстваў. Яны павінны былі вызначыць шэраг падначаленых уста-

[1] Звязда. 1997. 19 ліп.

ноў і асоб, якім давалася права карыстацца замежнай літаратурай для службовых мэт. Дадзеная пастанова абавязвала таксама кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў забяспечыць максімальнае выкарыстанне каштоўнай у навукова-тэхнічных адносінах замежнай літаратуры і патрабавала адначасова перакрыць усялякія магчымасці распаўсюджання ідэалагічна варожых выданняў.

Уся забароненая цэнзураю для шырокага карыстання замежная літаратура павінна была знаходзіцца ў спецыяльных сховішчах. Супрацоўнікі бібліятэк, якім даручалася захоўваць і выдаваць гэту літаратуру, павінны былі мець допуск да працы з сакрэтнымі матэрыяламі адпаведна інструкцыі па вядзенню сакрэтнай работы. Устанаўлівалася, што выпіска замежнай літаратуры павінна ажыццяўляцца толькі цэнтралізавана[1].

Указанні Галоўліта СССР і асабліва адзначаная пастанова Савета Міністраў СССР усё больш скрупулёзна выконваліся на месцах. У мэтах праверкі перыядычна ажыццяўляліся інспекцыі з боку саюзных і мясцовых органаў. У прыватнасці, у БССР да 8 верасня 1948 г. былі правераны пяць арганізацый, якія мелі трафейную літаратуру. У дзвюх з іх на гэты час праверка закончылася. Усяго было прагледжана больш за 50 тыс. экземпляраў такой літаратуры. Амаль столькі ж яшчэ заставалася ахапіць правяраючым у Акадэміі навук БССР[2]. Па гэтай прычыне цэнтральнае кіраўніцтва ў Маскве праяўляла вялікую заклапочанасць.

Аб маштабах і выніках працы па кантролю за замежнай і трафейнай літаратурай сведчаць наступныя даныя[3]:

| | 1946 г. | 1947 г. | 1948 г. | 1949 г. (першае паўгоддзе) |
|---|---|---|---|---|
| З агульнай колькасці замежных выданняў, якія паступілі ў СССР: | | | | |
| забаронена для адкрытага карыстання | 63 293 | 122 123 | 155 343 | 100 372 |
| зроблена канфіскацый | 2440 | 6762 | 14 890 | 8214 |

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп. 132, спр.97, арк.93 — 95.

[2] Там жа, арк.105.

[3] Там жа, спр.149, арк.65.

Разам з замежнай кантралявалася і айчынная літаратура. Акрамя жорсткай цэнзуры пры выданні на яе шляху да чытача быў пастаянны кантроль — перыядычна праглядалася ўсё тое, што ў свой час дайшло да яго. З гэтай мэтай Галоўліт СССР пастаянна рэвізаваў літаратуру бібліятэк і кнігагандлёвай сеткі, каб выявіць крамолу. У прыватнасці, у канцы 1948 г. у чарговы раз было зроблена такое абследаванне. Ў выніку яго ў лік палітычна шкодных былі аднесены 185 кніг. Сярод іх "Памятка красноармейцу на маневрах", выдадзеная ў 1932 г., бо дадзеная брашура ўтрымлівала цытаты з работ "ворага народа" М. Тухачэўскага. У гэты спіс увайшоў таксама фотаальбом "Страницы из истории ВЛКСМ", выпушчаны ленінградскім абласным выдавецтвам у 1938 г. На думку праваяраючых, альбом засмечаны фотаздымкамі "ворагаў народа і ўспамінамі аб іх". Меліся на ўвазе С.Касіёр, А.Косараў і інш. У гэтым спісе была кніга партвыдавецтва "Выполним указания т.Сталина". Прычына яе канфіскацыі заключалася ў тым, што ў ёй станоўча ўспаміналіся Л. Постышаў, Р. Кулік, іншыя рэпрэсіраваныя дзеячы. Канфіскоўваліся таксама творы тых навуковых і іншых работнікаў, якія былі рэпрэсіраваны[1].

З дазволу ЦК УКП(б) Галоўліт СССР у верасні 1948 г. выдаў загад аб канфіскацыі з бібліятэк і кнігагандлёвай сеткі кніг, аўтарам якіх з'яўляўся кіраўнік югаслаўскіх камуністаў І.Ціта, які крытыкаваўся савецкім бокам. Канфіскоўвалася і тая літаратура, што ўтрымлівала яго станоўчыя характарыстыкі ці яго калег па кіраўніцтву саюзам камуністаў Югаславіі. У шэрагу выданняў затушоўваліся адпаведныя месцы, дзе гаворка ішла аб югаслаўскіх кіраўніках. У прыватнасці, гэта было зроблена ў падручніку гісторыі СССР для 10 класа пад рэдакцыяй прафесара Г. Панкратавай[2].

Аднак чыстка літаратуры, як і наогул яе забарона, не задавальнялі бальшавіцкія партыйна-савецкія ўлады. Разам з гэтым яны ў шырокіх памерах ажыццяўлялі цэнзурнае ўмяшанне ў змест таго, што рыхтавалася да выдання. Маштабы дадзенай работы ўражваюць. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, даныя па колькасці цэнзарскіх умяшанняў, зробле-

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17. воп.132, спр.97, арк.113 — 136.

[2] Там жа, спр.149, арк.59, 93 — 94.

ныя на аснове справаздачы аб тым, што здзейснена Галоўлітам па ўзмацненню цэнзуры пасля ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 чэрвеня 1947 г. аб захаванні дзяржаўных сакрэтаў[1]:

| | 1946 г. | 1947 г. | 1948 г. | 1949 г., студзень-чэрвень |
|---|---|---|---|---|
| Забаронена публікацыя розных звестак па прычыне аховы дзяржаўных сакрэтаў: | | | | |
| у цэнтральных выдавецтвах | 1028 | 1320 | 2796 | 3282 |
| у працэнтах да 1946 г. | - | 128 | 272 | 638 |
| у мясцовых выдавецтвах | 6975 | 13 284 | 17 635 | 11 824 |
| у працэнтах да 1946 г. | - | 190 | 249 | 340 |

Кіруючыя партыйныя і савецкія органы пастаянна займаліся гэтай работай, узмацняючы свае патрабаванні. Так, 1 сакавіка 1948 г. Савет Міністраў СССР зацвердзіў "Пералік важнейшых звестак, што складаюць дзяржаўную тайну". На аснове гэтай пастановы к канцу дадзенага года органамі цэнзуры была забаронена адпраўка за мяжу 2849 розных матэрыялаў савецкага інфармацыйнага бюро, антыфашысцкіх камітэтаў, установаў кнігаабмену, іншых арганізацый. Акрамя таго, было зроблена 1045 цэнзарскіх канфіскацый у матэрыялах, якія адпраўляліся.

Аднак самай маштабнай з'яўлялася работа з тымі публікацыямі, што выкарыстоўваліся ўнутры краіны. На працягу 1948 г. органы цэнзуры ў парадку кантролю за дзейнасцю бібліятэк абавязалі іх канфіскаваць 1,1 млн палітычна шкодных кніг і ўнесці папраўкі ў 40 тыс. паасобнікаў, якія не страцілі сваёй каштоўнасці, але ўтрымлівалі асобныя месцы, што падлягалі вынішчэнню, — прадмовы, партрэты і інш.[2]

Такая маштабная работа патрабавала адпаведнага кадравага забеспячэння. Таму штаты Галоўліта пастаянна раслі. Калі ў 1946 г. у яго цэнтральным

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 132, спр. 149, арк. 59.

[2] Там жа, арк.61, 64, 66.

апараце налічвалася 219 работнікаў, то ў 1949 г. — 311. Колькасць цэнзараў за гэты час узрасла са 109 да 196 чалавек, г. зн. амаль падвоілася. Адпаведным чынам павялічваліся штаты мясцовых арганізацый. На працягу ўказанага часу яны выраслі па колькасці цэнзараў з 1159 да 1630[1].

Татальная цэнзура ў кнігавыдавецкай справе і ў выкарыстанні літаратуры дапаўнялася ўціскам на тых, хто непасрэдна ствараў навуковыя, мастацкія ці іншыя творы. У пасляваенны час яскрава гэта праявілася ў біялагічнай навуцы. Дадзеная акалічнасць характэрна як для агульнасаюзнага ўзроўню, так і для БССР. Справа дайшла да прыняцця ЦК УКП(б) 16 жніўня 1948 г. пастановы "О состоянии преподавания биологических наук и мерах по укреплению биологических кафедр в вузах". У ёй былі адзначаны сур'ёзныя недахопы ў выкладанні біялагічных дысцыплін у вышэйшых навучальных установах. У сувязі з гэтым Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР атрымала заданне ўмацаваць кіруючы і прафесарска-выкладчыцкі склад кафедраў біялагічных дысцыплін, перапрацаваць вучэбныя планы і праграмы па біялогіі. Даручалася таксама перагледзець склад экспертных камісій і вышэйшай атэстацыйнай камісіі, а таксама планы навукова-даследчай работы біялагічных факультэтаў універсітэтаў. Былі вызначаны іншыя мерапрыемствы ў дадзеным напрамку.

Ужо праз 10 дзён Міністэрства вышэйшай адукацыі Саюза ССР паведамляла аб карэннай перабудове выкладання біялагічных навук у вышэйшых навучальных установах. Былі ўнесены адпаведныя змены ў вучэбныя планы, перапрацаваны праграмы. Шмат замен зроблена сярод прафесарска-выкладчыцкіх кадраў з пункту погляду іх здольнасці паслядоўна праводзіць у вучэбнай рабоце партыйныя ўказанні па біялогіі.

Гэта надзвычай аператыўная і маштабная дзейнасць праводзілася ва ўсіх рэгіёнах краіны, у тым ліку БССР. У прыватнасці, ЦК КП(б)Б вырашыў, што дырэктар Беларускага сельскагаспадарчага інстытута Каўцэвіч не можа забяспечыць перабудову ў галіне біялогіі ў адпаведным напрамку. Яго вызвалілі ад пасады. Было праведзена шмат іншых кадравых змен. Адначасова ў БССР, як і ва ўсёй краіне, правяралася вучэбная літаратура па біялогіі.

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.132, спр.149, арк.72.

Калегія Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР абмеркавала пытанне аб рабоце выдавецтва “Советская наука”, ідэйным і навуковым змесце вучэбнай літаратуры і ўстанавіла, што ў аснове шэрагу падручнікаў і асобных манаграфій ляжаць рэакцыйныя антымічурынскія погляды мендэлістаў-марганістаў*.

Зыходзячы з таго што погляды заходніх вучоных, якія меліся ў шэрагу падручнікаў і дапаможнікаў па біялогіі, “прыносяць шкоду справе ідэйна-палітычнага выхавання студэнцкай моладзі”, Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР забараніла навучальным установам карыстацца навуковай літаратурай, якая ўтрымлівала антымічурынскія ідэі. Прымаючы пад увагу магчымасць іх пранікнення ў студэнцкае асяроддзе іншымі шляхамі, міністэрства палічыла неабходным канфіскаваць у бібліятэках кнігі, у якіх праводзіліся гэтыя погляды замежных вучоных[1].

У супрацьдзеянні гэтай ганебнай кампаніі на самай ранняй яе стадыі выключную мужнасць і пачуццё грамадзянскага абавязку праявіў беларускі вучоны-біёлаг акадэмік А. Жэбрак, які на працягу мая— лістапада 1947 г. з'яўляўся прэзідэнтам Акадэміі навук БССР. Разам з ленінградскім прафесарам Філіпчанка, маскоўскімі прафесарамі Кальцовым, Серабракоўскім і іншымі ён падзяляў погляды замежных вучоных па дадзенай праблеме і актыўна іх прапагандаваў. Праводзячы навукова-даследчую работу, ён змагаўся супраць мічурынскага напрамку ў біялогіі.

Яшчэ ў кастрычніку 1945 г. амерыканскі часопіс “Навука” надрукаваў яго артыкул пад назвай “Савецкая біялогія”. Гэта публікацыя была задумана як адказ савецкага вучонага на артыкул прафесара Гарвардскага універсітэта (ЗША) К. Сакса, змешчаны ў гэтым жа часопісе ў красавіку таго ж года. Аднак замест крытыкі сцвярджэнняў амерыканскага вучо-

---

*Вейсман, Мендэль — нямецкія вучоныя-біёлагі, Морган — амерыканскі вучоны-біёлаг. Згодна з іх тэорыяй, у арганізмах жывёл і раслін ёсць спадчынныя рэчывы, якія ўтрымліваюцца ў храмасомах. Незалежна ад умоў жыцця яны кіруюць фарміраваннем арганізма. Насуперак ім савецкія вучоныя Лысенка, Вільямс, Мічурын даказвалі, што не гэта, а ўмовы жыцця вызначаюць развіццё арганізмаў, мяняюць іх прыроду, накіроўваюць спадчыннасць ў пажаданы бок.

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп. 132, спр. 66, арк. 7, 8, 35, 39, 40.

нага аб існаванні ў СССР таталітарнай формы праўлення прафесар А.Жэбрак у многім салідарызаваўся з ім. Ён не стаў пісаць, як ад яго патрабавалі, аб сусветна вядомай ролі рускіх і савецкіх вучоных В. Вільямса, І. Мічурына, К.Ціміразева і фактычна ў сваёй публікацыі прынізіў перад сусветнай грамадскасцю "наватара ў галіне фізіялогіі раслін і генетыкі" акадэміка Т. Лысенку. На сцвярджэнне К. Сакса, што навука ў савецкай дзяржаве падаўлена і прыніжана, А. Жэбрак даў адказ, які ў многім гэта пацвердзіў. Тэзіс К. Сакса аб тым, што работы Т. Лысенкі з'яўляюцца "архаічнымі", А. Жэбрак не толькі не абверг, але нават пашырыў і дапоўніў яго шэрагам "неабгрунтаваных і тэндэнцыйных заяў". Гэтым самым былі ануляваны навуковыя і практычныя "дасягненні" шматлікіх устаноў, што працавалі на аснове тэорыі Т. Лысенкі. А. Жэбрак заверыў Сакса ў тым, што савецкія біёлагі разам са сваімі амерыканскімі калегамі будуць развіваць сусветную біялогію[1].

У мэтах барацьбы з такімі ўчынкамі вучоных і іншых дзеячаў вышэйшае бальшавіцкае партыйнае кіраўніцтва ў ліку іншых мерапрыемстваў устанавіла ў сакавіку 1947 г. "суды гонару" ў міністэрствах СССР і цэнтральных ведамствах. Для гэтага была прынята адпаведная пастанова ЦК УКП(б). Згодна з ёю 21 — 22 лістапада 1947 г. адбылося такое судзілішча над А Жэбракам. "Суд гонару" пры Міністэрстве вышэйшай адукацыі СССР прыцягнуў яго да адказнасці "за антыдзяржаўны і антыпатрыятычны ўчынак". На гэтым судзе А. Жэбрак не толькі не прызнаў сябе вінаватым, але зрабіў спробу паказаць свой гарачы патрыятызм. У выніку адпаведна падрыхтаванага абмеркавання «суд гонару» прызнаў яго вінаватым у здзяйсненні антыпатрыятычнага ўчынку і аб'явіў яму грамадскую вымову. На гэтым пасяджэнні прысутнічала каля 1000 чалавек. Сярод іх былі і такія, што падтрымалі пазіцыю беларускага вучонага (прафесар Дубінін і інш.)[2]. Мужна паводзіў сябе А. Жэбрак і на вядомай сесіі Усесаюзнай Акадэміі сельскагаспадарчых навук, якая адбылася ў жніўні 1948 г. Тут ён працягнуў барацьбу ў падтрымку храмасомнай тэорыі спадчыннасці. Пасля дадзенай сесіі асабліва ўзмацніліся ганенні на прыхільнікаў гэтай тэорыі ў БССР.

---

[1] РЦЗВДНГ, ф. 17, воп.132, спр.66, арк.54 — 58, 107 — 110.

[2] Там жа, арк.56 — 58.

Жорсткі ўціск бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў пасляваенны час ажыццяўляўся не толькі ў галіне навукі, але і ў літаратуры, розных відах мастацтва, у прыватнасці ў кіно. Аб гэтым сведчаць дакументальныя матэрыялы, што раскрываюць працэс стварэння некаторых вядомых савецкіх кінафільмаў пасляваенных гадоў. Так, загадчык аддзела ЦК УКП(б) Л.Ільічоў у пісьме сакратару ЦК А.Жданаву 31 ліпеня 1948 г. адзначаў, што мастацкі савет зрабіў прагляд абедзвюх серый фільма "Маладая гвардыя". Да гэтага кінакарціна неаднойчы карэкціравалася. Аднак, на думку савета, і пасля гэтага другая серыя літаральна прыгнечвае гледача. Атрымаўся фільм аб гібелі маладагвардзейцаў, а не аб іх барацьбе з ворагам і маральнай перамозе над ім. Рэжысёр С. Герасімаў хаця і з цяжкасцю, але пагадзіўся з вывадамі мастацкага савета. У адпаведнасці з імі ўдалося правільна вырашыць тэму партыйнага кіраўніцтва барацьбой савецкіх людзей супраць гітлераўскіх акупантаў ва ўмовах падполля. Правільна адлюстравана ў фільме эвакуацыя, "арганізавана праведзеная нашым народам пад кіраўніцтвам партыі". Разам з тым рэкамендавалася перарабіць канец фільма такім чынам, каб у ім выразнымі мастацкімі сродкамі было паказана сцвярджэнне бессмяротнага подзвігу маладагвардзейцаў. Патрабавалася таксама ўнесці змены ў музыку ў тых месцах, дзе яна ўзмацняе настрой падаўленасці і непазбежнасці гібелі герояў фільма[1]. Дадзеныя прамалінейныя і жорсткія патрабаванні далёка не заўсёды супадалі з намерамі стваральнікаў карціны. Гэта сведчыць аб тых складаных умовах, у якіх ім даводзілася працаваць.

Такі ж жорсткі кантроль ажыццяўляўся і пры стварэнні кінафільма "Канстанцін Заслонаў". Дастаткова сказаць, што на ўзроўні сакратара ЦК УКП(б) Г. Малянкова вырашалася пытанне аб выканаўцы галоўнай ролі. Загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК Д.Шапілаў у запісцы на яго імя 25 лістапада 1948 г. прапанаваў замест кандыдатуры народнага артыста Б.Платонава — выканаўцы гэтай ролі ў аднайменнай п'есе ў Беларускім тэатры — артыста У.Дружнікава. Кіраўніка аддзела не задавальняла тое, што Б.Платонаў ні разу не здымаўся ў кіно і што яго знешнія даныя не заўсёды адпавядалі

[1] РЦЗВДНГ, ф.17, воп.132, спр.90, арк.38 — 40.



17. Зак. 5022

вобразу К.Заслонава. На яго думку, акцёр выконвае ролю недастаткова выразна. Што датычыць У. Дружнікава, то ён — лаўрэат Сталінскай прэміі, надзелены адпаведнымі знешнімі данымі і шырока вядомы савецкаму гледачу[1]. Можна ўявіць, якая роля ў гэтых і іншых адносінах адводзілася непасрэдна стваральнікам фільма.

Такія падыходы да кінематаграфіі ў Цэнтры адпаведным чынам адлюстроўваліся і на месцах, у прыватнасці ў БССР. І тут стваральнікі кінафільмаў працавалі пад жорсткім партыйным наглядам. Гэта нярэдка вылівалася ў адпаведныя рашэнні. 26 жніўня 1947 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову "Аб рабоце Міністэрства кінематаграфіі БССР". Менш чым праз год, 29 мая 1948 г., гэты ж партыйны орган прыняў новую пастанову "Аб выніках праверкі работы Міністэрства кінематаграфіі БССР і кінастудыі "Беларусьфільм". У ёй канстатавалася, што міністэрства і кінастудыя абсалютна нездавальняюча выконваюць пастанову ЦК КП(б)Б мінулага года. План вытворчасці мастацкіх і дакументальных фільмаў у 1947 г. у тэрміны, устаноўленыя ЦК, не выкананы. Не выпушчаны на экраны фільмы "Савецкая Беларусь", "Палескія рабінзоны" і інш. Асаблівыя прэтэнзіі прад'яўляліся да кінафільма "Родныя напевы". У адпаведнай дакладной запісцы сцвярджалася, што пасля шматлікіх паправак фільм застаецца невысокім па ідэйна-мастацкаму ўзроўню, у ім пераважаюць штучныя сцэны, парушэнні прынцыпу сацыялістычнага рэалізму, што выяўлялася, у прыватнасці, у не характэрных для савецкай моладзі сумных песнях дарэвалюцыйных часоў і г. д.

У пастанове таксама канстатавалася, што правалена справа кінаабслугоўвання працоўных. На працягу 1947 г. замест прыбытку ў 3 млн 382 тыс. руб. дзяржаўны бюджэт недаатрымаў 1 млн 173 тыс. руб. За першы квартал 1948 г. план ахопу гледачоў з сельскай мясцовасці выкананы толькі на 48,5 %, а фінансавыя зборы — на 38,7 %. Абвінавачваліся ў гэтым тагачасны міністр кінематаграфіі Беларускай ССР Садковіч, іншыя кіруючыя работнікі. Былі зроблены адпаведныя кадравыя перастаноўкі[2]. Прыкладна ў такіх жа ўмовах даводзілася працаваць кіруючым і творчым работнікам іншых галін мастацтва.

---

[1] РЦЗВДНГ, ф.17. воп.132, спр.90, арк.60, 78.

[2] Там жа, арк.17 — 25.

Адным з важнейшых напрамкаў ва ўздзеянні бальшавіцкай таталітарнай сістэмы на грамадска-палітычнае і нацыянальна-культурнае жыццё было падаўленне ўсяго нацыянальнага дзеля стварэння новай супольнасці людзей — савецкага народа. Магчыма, найбольш выразна гэта праявілася на Беларусі. Падставай таму быў працэс абрусення беларускай нацыі, які далёка зайшоў. Многае ў гэтай справе было зроблена яшчэ ў царскія часы, калі метадычна на працягу доўгага перыяду праводзілася палітыка, скіраваная на адлучэнне беларусаў ад усяго нацыянальнага — ад сваіх гістарычных каранёў, нацыянальнай свядомасці, традыцый, звычаяў, мовы. Ужо ў той час на гэтым шляху меліся значныя "дасягненні".

Гэта палітыка ў сваёй аснове працягвалася ў савецкі перыяд. Толькі ў 20-я гады ў сувязі з ажыццяўленнем беларусізацыі меўся пэўны адыход і беларускі этнас атрымаў кароткі перыяд для адраджэння. Аднак ужо з канца 20-х гадоў узмацніўся наступ на палітыку беларусізацыі, а ў сувязі з судовым працэсам над дзеячамі, запісанымі ў "Саюз вызвалення Беларусі", які ніколі не існаваў, беларусізацыя была канчаткова згорнута, і беларускі народ зноў уступіў у паласу наступу на ўсё нацыянальнае.

Пасляваенныя гады сталі працягам русіфікатарскіх тэндэнцый. Характэрнай рысай гэтага працэсу было нарастанне адмоўных адносін да нацыянальных праяў і ўсяго таго, што рабілася на іх аснове. Гэта знайшло адлюстраванне як у грамадска-палітычным, так і ў нацыянальна-культурным развіцці. З улікам таго што ўсходнія і заходнія часткі Беларусі ўяўлялі тады даволі рознае становішча ў нацыянальных адносінах, прадпрымалася ўсё магчымае, каб зменшыць гэтыя пазіцыі ў Заходняй Беларусі, дзе яны былі непараўнальна мацнейшыя. Гэта імкненне бальшавіцкага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва праяўлялася ў розных напрамках, у тым ліку ў кадравай палітыцы. Як адзначалася ў чэрвені 1953 г. на пленуме ЦК КПБ, па стану на сярэдзіну гэтага года з 1175 партыйных работнікаў, што працавалі ў заходніх абласцях БССР, толькі 121 чалавек прадстаўляў мясцовае насельніцтва. У апаратах Баранавіцкага абласнога і гарадскога камітэтаў партыі, Брэсцкага і Гродзенскага гаркомаў, Ваўка-

выскага раённага партыйнага камітэта не было ні аднаго мясцовага работніка.

З 256 сакратароў раённых камітэтаў партыі заходніх абласцей рэспублікі беларусаў налічвалася 170, а выхадцаў з мясцовага насельніцтва — толькі 15. Больш за палову сакратароў калгасных і тэрытарыяльных партарганізацый былі прысланы пераважна з Усходняй Беларусі. Такое ж становішча наглядалася і ў камсамоле. Толькі 34,3% камсамольскіх работнікаў прадстаўлялі мясцовую моладзь.

Не лепш ішлі справы з выкарыстаннем беларускіх кадраў і ў органах савецкай улады, што працавалі ў Заходняй Беларусі. З 1408 работнікаў аблвыканкомаў толькі чвэрць складалі беларусы мясцовага паходжання, а з 231 работніка гарвыканкомаў такіх было толькі 25. У абласным і гарадскім выканаўчых камітэтах Полацкай вобласці не было ні аднаго работніка з мясцовага насельніцтва.

Падобнае становішча існавала ў органах Міністэрства ўнутраных спраў БССР, пракуратуры, сярод фінансавых работнікаў, агентаў па нарыхтоўках, у гандлі і інш. Вельмі слаба вылучаліся прадстаўнікі карэннай беларускай нацыянальнасці на кіруючую гаспадарчую работу ў якасці дырэктараў прадпрыемстваў, машынна-трактарных станцый. Толькі тры дырэктары МТС у сярэдзіне 1953 г. былі з ліку мясцовых жыхароў. З агульнай колькасці 1927 старшынь калгасаў заходніх абласцей рэспублікі мясцовыя складалі 1055[1]. Гэта тлумачыцца не столькі непадрыхтаванасцю мясцовых работнікаў да кіруючай працы, колькі афіцыйнай партыйна-дзяржаўнай палітыкай у адносінах да той часткі Беларусі, якая менш часу знаходзілася пад бальшавіцкай уладай.

У грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным развіцці цэнтральнай выступала праблема роднай мовы. Яе пазіцыі заставаліся не суцяшальнымі. Асноўныя выданні выходзілі пераважна на рускай мове. У прыватнасці, часопіс "Камуніст Беларусі" ў сярэдзіне 1953 г. выдаваўся на рускай мове тыражом 17 — 18 тыс. экземпляраў, а на беларускай — 2—3 тыс. Гэта адбывалася нягледзячы на тое, што, згодна з адпаведнай пастановай ЦК КПСС, тыраж быў вызначаны па 10 тыс. на кожнай мове. У гэты ж час газета "Калгасная праўда", разлічаная ў першую чаргу на сельскіх жыхароў, мела больш чым 56-тысячны тыраж на рускай мове і толькі каля 5 тыс. — на беларускай[2].

[1] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.6 — 7.

[2] Там жа, арк.17 — 18.

Трэба зазначыць, што меліся выпадкі, калі партыйнае кіраўніцтва разумела свае абавязкі ў нацыянальнай галіне. На афіцыйным узроўні часам рабіліся заявы на карысць пашырэння сферы ўжывання беларускай мовы. У прыватнасці, сакратар ЦК КП(б)Б М.Іаўчук, выступаючы ў чэрвені 1947 г. на XIV пленуме ЦК кампартыі Беларусі, заявіў: "Нам неабходна ўсямерна расшыраць друкаваную і вусную прапаганду на беларускай мове, на якой можа вольна выступаць і пісаць значная большасць інтэлігенцыі нашай рэспублікі"[1]. Аб гэтым таксама сведчыць задача, пастаўленая ў дакладзе М.Зімяніна на пленуме ЦК КПБ, які адбыўся ў чэрвені 1953 г. Яна была сфармулявана наступным чынам: "На беларускую мову павінна быць переведзена справаводства партыйных і савецкіх органаў. Мы павінны гаварыць з народам на яго роднай мове"[2].

Аднак на практыцы многае рабілася наадварот, у тым ліку ў кніжнай справе. Дастаткова сказаць, што ў бібліятэках Гомельскай вобласці мелася зусім недастатковая колькасць беларускамоўнай літаратуры. Ва ўсіх бібліятэках сельскіх культасветустаноў па стану на 10 чэрвеня 1953 г. налічвалася 790 тыс. кніг. З іх толькі 180 тыс. (23 %) на беларускай мове. Яшчэ горшыя суадносіны літаратуры на беларускай і рускай мовах наглядаліся ў бібліятэках Гомеля[3].

Цяжкім было становішча беларускай мовы і ў сістэме адукацыі, дзе фарміруюцца, як вядома, асновы светапогляду чалавека. Русіфікацыя ў пасляваенны перыяд набыла тут татальны характар. Як сведчаць партыйныя матэрыялы, калі ў 1945/46 навучальным годзе ў Мінску працавала 14 беларускіх школ і столькі ж рускіх, то ў 1952 г. з 48 школ беларускіх засталося толькі 9. Гэта было зроблена нягледзячы на тое, што абсалютная большасць вучняў з'яўлялася выхадцамі з беларускіх сем'яў. Так, у рускай сямігадовай школе № 7 горада Мінска з 383 вучняў 335 былі беларусамі. У той жа час у Брэсце з 14 школ мелася толькі адна з беларускай мовай выкладання. Аднак і ў ёй у 1953 г. ужо не было першага класа. У Гомелі да Вялікай Айчыннай вайны налічвалася 25 беларускіх школ, а ў сярэдзіне 1953 г. — толькі 8, ды

[1] Літаратура і мастацтва. 1995. 22 снеж.

[2] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.16.

[3] Там жа, арк.88.

і тыя стаялі на шляху ператварэння ў рускамоўныя. Прыкладна такое ж становішча было і ў іншых месцах. У Мінску, абласных і раённых цэнтрах назіралася імкненне работнікаў-беларусаў пасылаць сваіх дзяцей у школы з рускай мовай навучання[1].

Аналагічныя адносіны да беларускай мовы мелі месца не толькі ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе, але і ў вышэйшых навучальных установах. Так, у Гомельскім педагагічным інстытуце ў сярэдзіне 1953 г. са 103 выкладчыкаў беларусаў было толькі 26. У выніку выкладанне ўсіх дысцыплін вялося на рускай мове, за выключэннем беларускай мовы і літаратуры. Аднак і гэтыя прадметы старшы выкладчык, кандыдат філалагічных навук Васілёнак выкладаў на рускай мове[2].

Ігнараванне роднай мовы, паўсюднае вядзенне адукацыйнай і выхаваўчай работы на рускай мове назіралася па ўсёй Беларусі. Разам з тым у адносінах да заходніх абласцей рэспублікі і ў галіне адукацыі мела месца дыскрымінацыйная палітыка. Дастаткова сказаць, што з 27 вышэйшых навучальных устаноў, якія дзейнічалі ў БССР у сярэдзіне 1953 г., у заходніх абласцях былі толькі 6, са 118 тэхнікумаў і спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў — толькі 32[3]. І гэта нягледзячы на тое, што па тэрыторыі і насельніцтву заходнія вобласці складалі амаль палову рэспублікі.

Такім чынам, на працягу 40-х — пачатку 50-х гадоў бальшавіцкая таталітарная сістэма прайшла два этапы: жорсткае выпрабаванне ў Вялікай Айчыннай вайне і пасляваеннае аднаўленне гаспадаркі. Экстрэмальныя ваенныя ўмовы запатрабавалі максімальнага напружання сіл, цеснага яднання з народам, мабілізацыі яго на самаадданую барацьбу. Аднак вайна не змяніла прыроду сталінскага рэжыму. Ён застаўся ранейшым. У яго аснове ляжала жорсткая цэнтралізацыя ўсіх бакоў жыцця, неймавернае разрастанне культу асобы, непрымірымыя адносіны да ўсяго нацыянальнага, праследаванне іншадумства, рэпрэсіі і інш. Для пасляваеннага часу характэрна кансервацыя таталітарнай сістэмы ва ўсіх яе асноўных кампанентах.

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.20, спр.295, арк.89 — 93, 156.

[2] Там жа, арк. 89.

[3] Там жа, арк. 176.

Разам з мабілізацыяй народа на стваральную працу, скіраваную на аднаўленне і далейшае развіццё гаспадаркі, грамадскага і культурнага жыцця, шырока практыкаваліся метады адміністрацыйнага прымусу. Яны спалучаліся з шырокай падазронасцю, недаверам да людзей, праследаваннем тых, у каго думкі, а тым больш дзеянні не супадалі з афіцыйнай палітыкай. Гэта спалучэнне намаганняў у стваральнай працы з прымяненнем жорсткіх прымусовых метадаў у дасягненні пастаўленых задач характарызуе сталінскія таталітарныя парадкі ў пасляваенны перыяд.

Беларускі народ спаўна зведаў як ваеннае ліхалецце, так і пасляваенную разруху, аўтарытарныя формы і метады кіравання грамадствам, самаадданую працу па аднаўленню гаспадаркі. Застаючыся важным звяном бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, БССР з'яўлялася адным з тых рэгіёнаў, дзе яе функцыяніраванне набыло найбольш выразныя рысы. Гэта стварала ўмовы для пэўнай устойлівасці ў рэспубліцы дадзенай формы грамадскага праўлення.

РАЗДЗЕЛ 6

# СПРОБЫ ПЕРААДОЛЕННЯ ТАТАЛІТАРЫЗМУ І ІХ НЕПАСЛЯДОЎНЫ ХАРАКТАР

## 1. Крытыка некаторых асноў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў час першай палітычнай «адлігі». Рух грамадства наперад

Смерць Сталіна, якая была ўспрынята савецкім, у тым ліку беларускім народам як найвялікшая трагедыя, на самай справе стала пачаткам збаўлення ад бальшавіцкага таталітарнага рэжыму ў яго самым выразным варыянце. Аднак усведамленне гэтага прыходзіла паступова. Масіраваная агітацыйна-прапагандысцкая работа, што так настойліва вялася на працягу дзесяцігоддзяў, у спалучэнні з іншымі фактарамі дала адпаведныя вынікі. Савецкія людзі, як і жыхары Беларускай ССР, былі ўпэўнены ў беспамылковасці вярхоўнага кіраўніка партыі і дзяржавы ў вызначэнні і правядзенні ў жыццё ўнутранай і знешняй палітыкі, у яго надзвычай высокіх асабістых маральных якасцях, у тым, што страта правадыра з'яўляецца непапраўнай трагедыяй не толькі для народаў Савецкага Саюза, але і для сусветнага камуністычнага і рабочага руху, для ўсіх працоўных планеты.

Спатрэбіўся пэўны час, каб пад уздзеяннем рэальнага жыцця, перш за ўсё пад уплывам той праўды, якая паступова адкрывалася, аб рэальным змесце сталінскага праўлення, яго формах і метадах, людзі пераконваліся, што сапраўдная асоба Сталіна значна адрозніваецца ад таго міфа, які быў створаны аб ім савецкай прапагандай як аб звышчалавеку.

Гэты міф быў сфарміраваны з яго поўнага адабрэння, пры пастаяннай і ўсебаковай падтрымцы і нават па яго ініцыятыве. Аб гэтым нярэдка сведчаць прыведзеныя вышэй матэрыялы. Да таго ж цяпер стала вядома аб гутарцы Сталіна ў 30-я гады з Шолаха-

вым, які ўжо тады быў прызнаным аўтарытэтам у савецкай літаратуры. Калі пісьменнік выказаў думку, што, магчыма, не патрэбна так узвышаць кіраўніка партыі і дзяржавы, дык Сталін зазначыў: з улікам традыцый расійскага грамадства савецкім людзям патрэбны вобраз бажка (Бога). Такім чынам, ён не пагадзіўся з папярэджаннем знакамітага і мудрага чалавека.

За тыя гады, калі Сталін кіраваў краінай, у гэтых адносінах было зроблена надзвычай многа. Культ яго асобы не даваў магчымасці развівацца творчай думцы народа ў тых напрамках, якія былі неабходны для стварэння рэальнага, а не міфічнага дабрабыту ў краіне.

У агітацыйна-прапагандысцкай рабоце бальшавіцкі таталітарны рэжым ніколі не называўся сваім сапраўдным імем. Наадварот, калі гаворка ішла аб гэтым, то меліся на ўвазе такія заходнія краіны, як гітлераўская Германія, франкісцкая Іспанія, некаторыя іншыя, і ні ў якім разе СССР. Аб савецкай дзяржаве афіцыйная агітацыя і прапаганда распаўсюджвала толькі строга станоўчыя характарыстыкі з самымі высокімі эпітэтамі. Іх шматразовае паўтарэнне давала вынік. У свядомасці савецкіх людзей, у тым ліку беларускага народа, замацавалася ўяўленне аб Савецкім Саюзе як самай дэмакратычнай, самай свабоднай, самай перадавой краіне ў свеце. На тое, што гэта ў многіх адносінах не адпавядала рэальнаму стану спраў, не звярталі асаблівай увагі, тым больш што ведалі, як гэта небяспечна.

У выніку інтэнсіўнай агітацыйна-прапагандысцкай работы і рэпрэсій, што з большай ці меншай актыўнасцю праводзіліся пастаянна ў час працяглага кіравання краінай Сталіным, быў зроблены вялікі падман уласнага народа, які ў цэлым верыў у тое, аб чым гаварылася афіцыйна. Да таго ж на практыцы нярэдка выкарыстоўваліся дэмагагічныя прыёмы як сродак дасягнення пастаўленых мэт. Гэта ў першую чаргу рабілася тады, калі разыходжанні паміж прапагандай і рэальным жыццём былі асабліва значнымі і не маглі быць не заўважанымі.

Адыход з палітычнай арэны галоўнага канструктара і натхняльніка бальшавіцкай таталітарнай сістэмы не мог не прывесці да таго, што яна як адыёзная антычалавечная канструкцыя адразу пачала даваць збоі. Адной з першых праяў гэтага было пра-

вядзенне ў пачатку лета 1953 г. па загаду з Масквы пленумаў ЦК кампартый саюзных рэспублік. На іх выносіліся пытанні нацыянальнага развіцця. Такі пленум адбыўся і ў Мінску. Ён праходзіў 25 — 27 чэрвеня. На яго разгляд была вынесена пастанова ЦК КПСС "Пытанні Беларускай ССР і задачы партарганізацый КП Беларусі". З асноўным дакладам на пленуме выступіў сакратар ЦК КПБ М. Зімянін. У ім, а таксама ў шматлікіх выступленнях рэспубліканскіх і мясцовых кіраўнікоў, у першую чаргу абласнога звяна, быў прыведзены ўнушальны фактычны матэрыял аб заняпадзе развіцця карэннай нацыянальнасці ў БССР[1]. Аднак правядзенне дадзенага пленума ў БССР, як і правядзенне падобных пленумаў у іншых саюзных рэспубліках, мела кан'юнктурны характар і было прадыктавана інтарэсамі барацьбы за ўладу ў краіне. Прынятыя рашэнні фактычна засталіся на паперы.

Самым адыёзным стварэннем бальшавіцкай таталітарнай сістэмы была густая сетка лагераў і іншых падобных устаноў. Як паказвае практыка кіравання грамадствам не толькі ў Савецкім Саюзе ў часы сталінскага праўлення, але і ў іншых краінах з таталітарнымі рэжымамі, гэта неабходны атрыбут любой таталітарнай сістэмы. Аднак для савецкага вопыту характэрна тое, што шматлікія лагеры ў першую чаргу былі арыентаваны не столькі на ўтрыманне палітычных праціўнікаў, колькі "ворагаў народа" — працавітых, сумленных, у пераважнай большасці перадавых людзей, якім улады прыпісалі тыя ці іншыя "злачынствы". У гэтых адносінах таталітарная сістэма ў СССР мела бясспрэчны прыярытэт. Якія гэта былі "ворагі", бачна з таго, што амаль усе яны ў наступныя гады былі рэабілітаваны, хаця падыходы ў час перагляду іх "спраў" з'яўляліся самымі патрабавальнымі.

З сярэдзіны 1953 г. пачало пашырацца імкненне асэнсаваць пражытыя дзесяцігоддзі з крытычнага боку. Гэта ў першую чаргу распаўсюджвалася на тыя бакі жыцця, якія дагэтуль старанна хаваліся. Галоўным зместам такога палітычнага асэнсавання была асоба Сталіна, якая з'яўлялася сімвалам савецкай дзяржавы ў апошнія дзесяцігоддзі. Як вядома, з яго імем звязвалася ўсё лепшае, чаго дасягнула краіна ў будаўніцтве новага жыцця за кошт неймаверных намаганняў. Гэтыя вынікі былі шырока вядомы, а нега-

[1] НАРБ, ф.4, воп, 20, спр. 295, арк. 6 — 224.

тыўныя бакі савецкай рэчаіснасці, тым больш злачынствы бальшавіцкага таталітарнага рэжыму, звязаныя перш за ўсё з правядзеннем шырокіх палітычных рэпрэсій, абсалютная большасць грамадзян пад уплывам афіцыйнай агітацыі і прапаганды ніяк не звязвала з імем Сталіна і па-ранейшаму спісвала на "ворагаў народа" ўсе цяжкасці і трагедыі з сучаснага і мінулага жыцця. Такая спланаваная, строга вызначаная інфармацыя, а нярэдка і дэзінфармацыя насельніцтва — характэрная рыса таталітарных рэжымаў.

Тым не менш паступова пачынаў адкрывацца дадзены бок савецкай рэчаіснасці, на што павінна было рэагаваць кіраўніцтва партыі і дзяржавы. Гэта рэакцыя выяўлялася паступова, спачатку нясмела і вельмі аднабока, затым больш шырока, пакуль аб гэтым не было заяўлена на самым высокім партыйным форуме. XX з'езд КПСС, які праходзіў 14 — 25 лютага 1956 г. , разам з разглядам пытанняў, скіраваных на паляпшэнне спраў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, культуры, навуцы, з пашырэннем дэмакратыі, абгрунтаваннем прынцыпаў мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадска-палітычным ладам вымушаны быў звярнуць увагу на нечуваныя парушэнні законнасці ў гады сталінскага праўлення. Пад канец работы з'езда на яго закрытым пасяджэнні дэлегаты заслухалі даклад "Аб кульце асобы і яго выніках", з якім выступіў першы сакратар ЦК КПСС М.С.Хрушчоў. Гэта стала для іх вялікай нечаканасцю. І хоць даклад не быў надрукаваны да пачатку 90-х гадоў, але яго агульная накіраванасць паступова стала вядома грамадству. Тым больш што 30 чэрвеня 1956 г. ЦК КПСС прыняў пастанову "Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў". У ёй была зроблена спроба выявіць прычыны дадзенай заганнай з'явы, паказаны яе сутнасць і наступствы. Хаця гэта рабілася на ўзроўні таго часу, аднак сам факт вынясення пытання на партыйны з'езд, а затым прыняцце Цэнтральным Камітэтам адпаведнай пастановы мелі надзвычай вялікае значэнне для паляпшэння грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне.

Пачалася рэабілітацыя ахвяр сталінскага праўлення. У БССР на працягу 1956 — 1962 гг. было рэабілітавана больш за 29 тыс. чалавек, а ў партыйным парадку — каля 200[1]. І хоць гэта з'яўлялася

[1] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 324.

зусім нязначнай часткай ад шматлікай колькасці неабгрунтавана асуджаных і бязвінна закатаваных людзей, аднак для далейшага грамадска-палітычнага развіцця такі зрух быў вельмі важным.

Разам з тым нельга не адзначыць, што тая крытыка, якая прагучала на XX з'ездзе КПСС адносна культу асобы, закранула толькі самую адыёзную яго праяву — масавыя рэпрэсіі. Асновы бальшавіцкай таталітарнай сістэмы не ставіліся пад сумненне. Да гэтых асноў трэба аднесці ў эканоміцы дзяржаўную і кааператыўна-калгасную (што вельмі блізкая да дзяржаўнай) уласнасць на асноўныя сродкі вытворчасці, у грамадска-палітычным жыцці — аднапартыйную сістэму і фактычнае падпарадкаванне ёй савецкіх органаў, грамадскіх і іншых арганізацый, у культурным развіцці — адзіную ідэалогію і г. д. Да таго ж усё гэта дапаўнялася высокай цэнтралізацыяй партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва фактычна ўсімі бакамі жыцця.

Аднак нават спроба крыху ўзняць завесу патаемнасці над палітычнымі рэпрэсіямі сустрэла моцнае супрацьдзеянне ў вышэйшых эшалонах улады. У чэрвені 1957 г. на пасяджэнні прэзідыума ЦК КПСС, якое працягвалася тры дні, была зроблена спроба зняць з пасады М.С Хрушчова за тое, што ён як быццам вельмі далёка зайшоў у справе крытыкі культу асобы, чым нанёс моцны ўрон прэстыжу камуністычнай партыі і СССР як у вачах савецкіх людзей, так і сусветнай супольнасці. Аднак гэта спроба правалілася, і чэрвеньскі (1957 г.) пленум ЦК КПСС пацвердзіў курс XX з'езда КПСС, асудзіў дзеянні антыпартыйнай групы Малянкова, Молатава, Кагановіча і Шапілава, які далучыўся да іх. Адметнасцю першай палітычнай "адлігі" з'яўлялася тое, што дадзеныя дзеячы не былі рэпрэсіраваны.

Лінія XX з'езда была замацавана XXII з'ездам партыі, які працаваў 17—31 кастрычніка 1961 г. На аснове яго рашэння цела Сталіна было вынесена з Маўзалея, паўсюдна пачаўся дэмантаж яго помнікаў і замена імя ў назвах гарадоў, прадпрыемстваў, устаноў, калгасаў, саўгасаў і інш.

Паралельна з гэтымі мерамі рабіліся шматлікія спробы па рэфармаванню розных сфер жыцця. Кіраўніцтва партыі і дзяржавы ўвогуле разумела неабходнасць такой работы. У гэтым напрамку было нямала захадаў. Іх асноўнай мэтай з'яўлялася некаторая

дэцэнтралізацыя сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага развіцця. Былі пашыраны правы саюзных рэспублік у вырашэнні шэрагу пытанняў. Аднак істотна гэта праблема не вырашалася. Асноўныя рычагі кіравання па-ранейшаму заставаліся ў Цэнтра, хаця былі зроблены спробы рэарганізацыі сістэмы кіравання прамысловасцю, сельскай гаспадаркай, сацыяльнай сферай і інш. Прынятыя меры ў многім насілі частковы, непаслядоўны характар і належных вынікаў не давалі. Таталітарная сістэма праўлення ў асноўным была захавана.

У намаганнях па рэфармаванню грамадства было шмат пражэкцёрства, новаўвядзенняў, якія адхіляліся жыццём. Нават у той час было відавочна, што некаторыя мэты, абвешчаныя з самых аўтарытэтных трыбун і запісаныя ў самых высокіх дакументах, з'яўляюцца нерэальнымі. Гэта ў першую чаргу адносіцца да тэзіса аб уступленні краіны ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізму, аб чым абвясціў нечарговы XXI з'езд КПСС, які адбыўся 27 студзеня — 5 лютага 1959 г. У прынятай на наступным з'ездзе новай праграме партыі сцвярджалася, што камунізм у СССР будзе пабудаваны на працягу жыцця аднаго пакалення. Гэтыя, а таксама некаторыя іншыя рашэнні ўспрымаліся значнай часткай грамадства даволі скептычна. Аднак ужо сам факт такога ўспрыняцця з'яўляўся значным крокам наперад у грамадска-палітычным развіцці. Ён сведчыў аб тым, што пачыналася пераадоленне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў яе найбольш адыёзным, сталінскім варыянце.

Гэта датычылася не толькі грамадска-палітычнай сферы, але і сацыяльна-эканамічнага жыцця, якія цесна звязаны паміж сабою. Рэфармаванне праводзілася даволі актыўна, але недастаткова абгрунтавана і паслядоўна. Не вытрымала выпрабавання практыкай рэарганізацыя партыйных і савецкіх органаў па гаспадарчаму прынцыпу — на прамысловыя і сельскія. Не заўсёды апраўдана рэфармавалася школьная сістэма.

Аднак некаторыя рэформы былі дастаткова трывалымі. У 1958 г. былі рэарганізаваны машынна-трактарныя станцыі, іх тэхніка перададзена калгасам і саўгасам. У сувязі з ускладненнем становішча ў сферы фінансаў у 1962 г. была праведзена грашовая рэформа. Адзін новы рубель абменьваўся на дзесяць старых, г. зн. была зроблена дэнамінацыя. Праводзіліся і іншыя рэформы.

Нягледзячы на не заўсёды неабходную рэарганізацыю розных сфер жыцця, але дзякуючы ў першую чаргу гераічнай працы савецкіх людзей, у тым ліку беларускага народа, у эканоміцы краіны і ў сацыяльнай сферы былі дасягнуты пэўныя поспехі. Дастаткова сказаць, што ў БССР у канцы 1965 г. валавая прадукцыя прамысловасці перавысіла ўзровень 1958 г. у 2,1 раза замест прадугледжаных планам 1,8 раза. Пры гэтым змянілася структура вытворчасці. Узніклі новыя галіны: электратэхнічная, дакладнага прыборабудавання, аўтаматычных ліній, радыёэлектронная, хімічная і інш.

У сельскай гаспадарцы таксама меліся пэўныя зрухі. У 1965 г. у разліку на 100 га зямлі ў БССР было атрымана па 232 ц малака супраць 115 ц у 1958 г. Што датычыць мяса (у жывой вазе), дык гэты паказчык павялічыўся з 21 да 39 ц. Прыкметна ўзраслі валавыя зборы збожжа, бульбы, ільну, цукровых буракоў. На працягу дадзенага перыяду валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі рэспублікі ўзрасла ў 1,7 раза[1].

Пэўнае развіццё атрымала сацыяльная сфера. Пашырылася кола паслуг для насельніцтва, выраслі іх аб'ёмы. Гэта дзейнасць паступова пачала распаўсюджвацца і ў вёсцы. Важнае значэнне мела прыняцце ў 1956 г. новага закону аб дзяржаўных пенсіях. Іх памеры вагаліся ад 30 да 120 руб. У выніку рэалізацыі закону пенсіі рабочых у 1957 г. у параўнанні з папярэднім годам узраслі на 50 %, служачых — на 27 %. Аднак працаўнікі калгаснай сістэмы па-ранейшаму дзяржаўнымі пенсіямі не забяспечваліся. Адносіны бальшавіцкай сістэмы кіравання грамадствам да гэтай катэгорыі насельніцтва, якія асабліва рэльефна вызначыліся ў ходзе масавай калектывізацыі, у гэты час так і не былі пераадолены.

Як бачна, праводзімыя пераўтварэнні ў савецкай эканоміцы і сацыяльнай сферы давалі пэўныя зрухі, меліся нават дасягненні. Яны маглі быць і большымі, каб эканамічнае развіццё не было моцна абцяжарана вялікімі ваеннымі расходамі. У афіцыйных дакументах іх удзельная вага ў бюджэце краіны вызначалася ў памеры 16 — 17 %. Аднак на самай справе яны з'яўляліся значна большымі, а на думку некаторых даследчыкаў, даходзілі да 40 %. У час першай палітычнай «адлігі» ваенна-прамысловы комплекс не

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т.5. С.368, 469.

толькі захаваў свае пазіцыі, але атрымаў далейшае значнае развіццё. Трэба прызнаць, што з улікам тагачасных умоў для гэтага меліся пэўныя падставы. І міжнародны ваенна-палітычны клімат, і традыцыі "халоднай вайны", якая яшчэ працягвалася, і іншыя прычыны накладвалі адбітак на тыя галіны эканомікі, якія працавалі на абараназдольнасць краіны.

Аднак у сучасных умовах нельга не прызнаць, што ў кіруючых партыйных і дзяржаўных колах СССР было і пэўнае перабольшванне той пагрозы, якая зыходзіла ад капіталістычнага свету. Атрымліваліся замкнутыя абставіны, калі кіраўнікі краін сацыялістычнай сістэмы баяліся капіталістычных дзяржаў, і наадварот. Нягледзячы на тое што ў гэты перыяд былі зроблены першыя захады да ўзаемаразумення, а затым нават і прарыў у "жалезнай заслоне", якая раздзяляла абедзве сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя сістэмы, што быў пакладзены пачатак пераходу ад татальнай замкнутасці да наладжвання кантактаў паміж імі, у нарошчванні ўзбраенняў рабіліся надзвычай вялікія намаганні.

У сувязі з тым што ўсё больш значнае месца ў ваеннай дактрыне займала ядзерная зброя, яе развіццю і ўдасканаленню надавалася выключная ўвага. Гэта моцна закранала не толькі фінансавае становішча краіны, але і лёсы людзей, у тым ліку жыхароў Беларусі. Перш за ўсё дадзеная акалічнасць датычылася тых, хто праходзіў службу ў Савецкай Арміі. Некаторая частка ваеннаслужачых трапляла ў катэгорыю тых, каго цяпер называюць "атамныя салдаты". Напрыклад, у ліпені 1959 г. з БССР на поўнач было адпраўлена 14 вагонаў з навабранцамі. Кожны вагон змяшчаў па 75 юнакоў. Яны трапілі ў розныя роды войскаў, а 45 з іх, найбольш здаровых і фізічна моцных, былі дастаўлены на адзін з населеных пунктаў архіпелага Новая Зямля. Па рашэнню савецкага ўрада тут вялося будаўніцтва "аб'екта-700". Яшчэ 25 верасня 1955 г. на палігоне, што знаходзіўся на марской губе пад назвай «Чорная», на глыбіні 50 м быў зроблены першы ў СССР падводны ядзерны выбух. На працягу 1958 г. тут правялі 26 выбухаў у атмасферы і пад вадой.

Прызваныя ў армію юнакі з Беларусі былі задзейнічаны на работах для падрыхтоўкі яшчэ больш магутных узрываў — 58 і нават 100 мегатонных супербомбаў. Аднак апошняя не была ўзарвана. Што

датычыць выбуху 58-мегатоннай бомбы, то ён быў здзейснены 30 кастрычніка 1961 г. — у гонар работы XXII з'езда КПСС. У гэты дзень планета Зямля прыняла на сябе самы страшэнны ўдар за ўсю гісторыю ядзерных выпрабаванняў. Дастаткова сказаць, што гіганцкае воблака пылу ўзнялося на вышыню каля 70 км. Афіцыйна ж паведамлялася, што радыяцыйны фон у межах нормы. Па сумарнай магутнасці ўсіх выпрабаванняў (87 — у атмасферы, 42 — падземныя, 3 — пад вадой) палігон на Новай Зямлі пабіў усе сусветныя рэкорды. У ажыццяўленне гэтых выпрабаванняў свой уклад унеслі і ваеннаслужачыя, прызваныя з БССР. Многія з іх назаўсёды страцілі здароўе і вярнуліся дамоў інвалідамі[1].

Чалавечае жыццё па-ранейшаму нізка цанілася і ў гэты перыяд існавання таталітарнай сістэмы. Цяпер шырока вядома, што акрамя Новай Зямлі падраздзяленні асаблівай рызыкі, якія ў першую чаргу абслугоўвалі выпрабаванні ядзернай зброі, шырока выкарыстоўваліся на Сяміпалацінскім палігоне, у Тоцкіх лагерах, у закрытых гарадах Томск-7, Чалябінск-40 і на іншых аб'ектах. Аб гэтых баках гісторыі савецкага грамадства стала вядома толькі ў апошнія гады. Заслона сакрэтнасці, якая заўсёды спадарожнічае таталітарызму, аказалася прыўзнятай. Новыя факты сведчаць, што ваеннае супрацьстаянне ў першую чаргу Савецкага Саюза капіталістычным дзяржавам, утрыманне на належным узроўні абараназдольнасці савецкай краіны ажыццяўляліся з вялікім напружаннем, што вялізныя ваенныя расходы, неймавернае разрастанне ваенна-прамысловага комплексу цяжкім грузам клаліся на эканоміку і сацыяльную сферу, на асабовы склад Узброеных Сіл. Нягледзячы на крытыку культу асобы і яго вынікаў, таталітарная сістэма ў час першай палітычнай «адлігі» поўнасцю працягвала ранейшую лінію ў ваеннай галіне, паступова пераходзячы да палітычнага дыялога з супрацьлеглым бокам, да пошуку шляхоў мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам.

Аднак у міжнародных справах, характэрных для адносін унутры сацыялістычнай сістэмы, пераважала міжпартыйная і міждзяржаўная дысцыпліна, падпарадкаванасць савецкаму кіраўніцтву. Найбольш яскравым праяўленнем гэтага ў дадзены пе-

[1] Звязда. 1993. 11, 12, 17 лістап.

рыяд было падаўленне ў лістападзе 1956 г. савецкімі войскамі, групоўка якіх налічвала да 60 тыс. салдат і афіцэраў, паўстання ў Венгрыі. Яно мела на мэце рэальную свабоду і незалежнасць сваёй краіны. У час баёў загінула амаль 4 тыс. венгерскіх грамадзян. Да 15 лістапада савецкія органы бяспекі арыштавалі і перадалі Міністэрству ўнутраных спраў Венгрыі 1372 чалавекі, над якімі пачаліся судовыя працэсы. Страты кантынгенту Савецкай Арміі склалі 669 салдат і афіцэраў забітымі, 1450 былі паранены і 51 чалавек прапаў без вестак[1]. Такой была цана навядзення адпаведнага парадку ў адной з краін сацыялістычнай садружнасці.

Між тым ва ўнутранай палітыцы працягваліся некаторыя спробы адысці ад таталітарных метадаў кіравання. Гэта закранула і такую важную сферу, як адукацыя. Змены ў ёй меркавалася зрабіць на аснове пастановы Вярхоўнага Савета СССР "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай асветы ў СССР", якая была прынята ў снежні 1958 г., а таксама на аснове шэрагу іншых заканадаўчых актаў. Разам з рэарганізацыяй школьнай сеткі пэўным чынам мяняўся змест адукацыі, асабліва гуманітарнай. У зацверджаных у 1959 г. Міністэрствам асветы БССР новых вучэбных планах прасочвалася лінія XX з'езда КПСС на пераадоленне культу асобы і яго вынікаў.

Некаторыя магчымасці для актывізацыі навуковага пошуку з'явіліся ў вучоных. Пачыналася рэабілітацыя цэлых галін навукі, перш за ўсё генетыкі і кібернетыкі. Пераадольваліся найбольш адыёзныя стэрэатыпы таталітарнага рэжыму ў гуманітарнай сферы. З цяжкасцю, але ажыццяўляўся адыход ад догмаў "Кароткага курсу гісторыі УКП(б)", пашыралася тэматыка і ўзбагачаўся змест навуковых даследаванняў.

Разам з гэтымі працэсамі ў час першай палітычнай "адлігі" працягваўся наступ на нацыянальныя культуры, адбывалася іх далейшая русіфікацыя. Тон у гэтым задаваў кіраўнік партыі і дзяржавы М. Хрушчоў. У прыватнасці, у час знаходжання ў 1959 г. у БССР у сувязі з 40-годдзем яе ўтварэння ён заявіў: "Чым хутчэй усе мы будзем размаўляць на рускай мове, тым хутчэй пабудуем камунізм"[2].

---

[1] Советская Белоруссия. 1997. 10 июня.

[2] Правда. 1989. 6 марта.

Згодна з практыкай бальшавіцкай таталітарнай сістэмы, любое выказванне першай асобы краіны павінна было ператварацца ў жыццё, нягледзячы на тое, адпавядала яно яго логіцы ці не. Так і ў дадзеным выпадку. Калі ў 1959 г. у рэспубліцы была выдадзена 571 кніга на беларускай мове, то ў 1960 г. — 425. Адпаведна за гэты час узраслі маштабы выдання рускамоўных кніг — з 744 да 1175 (у 1954 г. іх выдавалася 305). На працягу 1959 — 1960 гг. са 167 да 154 зменшылася колькасць газет на беларускай мове. Захавалася толькі выданне беларускамоўных часопісаў, перыядычных зборнікаў і бюлетэняў на ўзроўні 24 адзінак, але іх тыражы былі зусім нязначныя. Для параўнання трэба заўважыць, што лік такіх выданняў на рускай мове дасягаў амаль 70 і павялічыўся адносна 1955 г. прыблізна ў тры разы[1].

Значыць, наступ на нацыянальную беларускую культуру ў час першай палітычнай «адлігі» па-ранейшаму ўзмацняўся. Гэта было звязана з выпрацоўкай перспектыў развіцця савецкага грамадства, прынянцем XXII з'ездам КПСС новай праграмы партыі. Згодна з ёю на аснове стратэгічнай задачы аб пераходзе да камунізму на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў павінна было адбыцца зліццё нацый у адну, камуністычную, нацыю. Нацыянальным мовам пры гэтым належала зліцца ў адзіную сусветную мову. Хаця праграма прызнавала, што зліццё моў адбудзецца пасля пераадолення класавых адрозненняў[2], на практыцы многае рабілася для фарсіравання гэтага працэсу.

Наогул у галіне культуры ранейшыя адміністрацыйна-камандныя метады кіраўніцтва мелі паўсюднае, татальнае распаўсюджанне. Партыя і яе структуры пільна сачылі за ўсімі напрамкамі культурнага жыцця. Магчыма, у першую чаргу гэта адносілася да літаратуры — найбольш распаўсюджанага віду мастацтва з моцным уплывам на людзей.

Надзвычай паказальным фактарам ва ўзаемаадносінах партыі і ўсёй савецкай сістэмы з літаратарамі з'яўляецца трагічны лёс аднаго з класікаў сацыялістычнага рэалізму, які пасля смерці М. Горкага ўзначальваў Саюз савецкіх пісьменнікаў, кандыдата ў члены ЦК КПСС, старшыні Камітэта па прысу-

---

[1] *Станкевіч С.* Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР. Мн., 1994. С.20 — 22.

[2] Программа Коммунистической партии Советского Союза. М., 1961. С.113 — 114.

джэнню сталінскіх прэмій у галіне літаратуры А.Фадзеева. Стаміўшыся змагацца з партыйнымі і іншымі функцыянерамі, якія камандавалі літаратурным жыццём, ён свядома пайшоў 13 мая 1956 г. на самазабойства, пакінуўшы перад гэтым пісьмо, адрасаванае ў ЦК КПСС.

"Не бачу магчымасці далей жыць, так як мастацтва, якому я аддаў жыццё сваё, загублена самаўпэўнена-невуцкім кіраўніцтвам партыі і цяпер ужо не можа быць папраўлена", — такімі словамі пачаў аўтар сваю споведзь-абвінавачванне. Далей ён працягваў: "...Літаратура — гэта святая святых — аддадзена на расправу бюракратам... Сабрана група невукаў, за выключэннем нямногіх сумленных людзей, якія знаходзяцца ў стане такой жа затраўленасці і пагэтаму не могуць сказаць праўду... Літаратура аддадзена ва ўладу людзей не таленавітых, дробных, злапамятных. Адзінкі тых, хто захаваў у душы свяшчэнны агонь, знаходзяцца ў становішчы парыяў..." У пісьме таксама канстатавалася, што літаратура ўніжана, затраўлена, загублена[1].

Гэты пранізлівы дакумент уяўляе сабою крык душы, моцны адчай не радавога літаратара, а шматгадовага кіраўніка пісьменніцкай арганізацыі Савецкага Саюза. У ім ён адлюстраваў, несумненна, не толькі сваю пазіцыю, але і пазіцыі іншых сваіх калег і сяброў па пісьменніцкаму цэху. Высновы, якія ўтрымліваюцца ў пісьме, — вынік шматгадовай практыкі як з асабістай творчасці, так і з фактаў жыцця іншых пісьменнікаў.

Зробленыя канстатацыі характарызуюць абставіны, у якіх працавалі многія савецкія, у тым ліку беларускія літаратары нават у часы першай палітычнай "адлігі", калі, з аднаго боку, з цяжкасцю пераадольваўся культ асобы Сталіна, пачыналася рэабілітацыя ахвяр масавых рэпрэсій, а з другога — яшчэ моцна захоўваліся многія атрыбуты бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Гэты перыяд — пачатак доўгага і складанага пераходу ад класічнага яе праяўлення ў сталінскім варыянце. Адбывалася пэўная трансфармацыя савецкай сістэмы кіравання грамадствам пры захаванні многіх яе асноў.

Характэрна, што некаторыя найбольш цяжкія злачынствы Сталіна і яго бліжэйшага акружэння партыйныя і дзяржаўныя кіраўнікі СССР другой паловы 50-х — першай паловы 60-х гадоў палічылі за

[1] Народная воля. 1997. 17 ліп.

лепшае захаваць у сакрэце. Гэта адносілася, у прыватнасці, да матэрыялаў аб масавым расстрэле ў 1940 г. польскіх ваеннаслужачых, якія трапілі ў палон, у тым ліку ўраджэнцаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Аб лёсе дадзеных дакументаў сведчыць запіска старшыні Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі пры Савеце Міністраў СССР А. Шалепіна першаму сакратару ЦК КПСС М. Хрушчову. Яна была накіравана 3 сакавіка 1959 г. У ёй прапаноўвалася знішчыць уліковыя справы і іншыя матэрыялы расстраляных польскіх грамадзян.

"Для савецкіх органаў, — адзначаў тагачасны кіраўнік КДБ краіны, — усе гэтыя справы не ўяўляюць ні аператыўнай цікавасці, ні гістарычнай каштоўнасці. Наўрад ці яны могуць уяўляць сапраўдную цікавасць для нашых польскіх сяброў. Наадварот, якая-небудзь непрадбачаная выпадковасць можа прывесці да рэканспірацыі праведзенай аперацыі з усімі непажаданымі для нашай дзяржавы вынікамі..."[1] Мяркуючы па ўсім, вышэйшая партыйнае кіраўніцтва пагадзілася з унесенай прапановай.

Двaісты, непаслядоўны характар мелі адносіны самых высокіх партыйных і дзяржаўных дзеячаў краіны і да сталінскіх рэпрэсій. З аднаго боку, яны іх асудзілі і распачалі рэабілітацыю незаконна асуджаных, а з другога — працягвалі практыку, замацаваную ў рашэннях 1939 і 1945 гг. аб тым, каб не паведамляць сапраўдных звестак у адказ на запыты аб лёсе рэпрэсіраваных. Аднак у сувязі з пачаткам рэабілітацыі гэта праблема нарастала. Таму прэзідыум ЦК КПСС 18 жніўня 1958 г. прыняў пастанову, на аснове якой старшыня КДБ СССР таго часу І. Сяроў падпісаў разгорнутае ўказанне. Паводле гэтага дакумента, адносна расстраляных сталінскіх ахвяр, як і раней, можна было даць толькі стандартны адказ: прыгавораны да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў і памёр у час адбыцця пакарання.

У тых жа выпадках, калі неабходна было вырашаць маёмасныя ці прававыя пытанні, прадпісвалася рэгістраваць смерць у органах ЗАГСа па месцажыхарству асуджанага да арышту і выдаваць пасведчанне аб смерці. Пры гэтым яе дата вызначалася органамі КДБ адвольна ў межах 10 гадоў з часу арышту. Выдуманай павінна была быць і прычына смерці. Такія адносіны матываваліся тым, што ў час масавых рэпрэсій была неабгрунтавана асуджана вялікая

[1] Советская Белоруссия. 1997. 13 авг.

колькасць грамадзян, і таму паведамленне аб сапраўдным лёсе рэпрэсіраваных можа адмоўна паўплываць на становішча іх сем'яў. Да таго ж гэта магло быць "выкарыстана варожымі элементамі на шкоду інтарэсам савецкай дзяржавы".

Такія прыдуманыя звесткі, несапраўдныя пасведчанні атрымалі сотні тысяч савецкіх грамадзян, у тым ліку жыхароў БССР. Аднак ад падобных афіцыйных абманных звестак дадзеная праблема моцна абвастрылася. Толькі з 1963 г. па прапанове старшыні КДБ СССР У. Сямічаснага і з адабрэння палітбюро ЦК КПСС у адказ на запыты грамадзян аб лёсе іх родных, прыгавораных у пазасудовым парадку да расстрэлу, вусна пачалі паведамляць сапраўдныя абставіны смерці, а пры рэгістрацыі яе ў аддзелах ЗАГС указвалася рэальная дата расстрэлу. Але што датычылася тых рэпрэсіраваных асоб, на якіх прыдуманыя звесткі былі афіцыйна аформлены раней, усё заставалася без змен. Такое становішча праіснавала да канца 80-х гадоў[1]. Усе гэтыя абставіны сведчаць аб недастатковай палітычнай волі кіраўнікоў СССР другой паловы 50-х — першай паловы 60-х гадоў у больш поўным пераадоленні сталінскай спадчыны, звязанай з масавымі неабгрунтаванымі палітычнымі рэпрэсіямі.

Такім чынам, у час першай палітычнай «адлігі» адбыўся адыход ад найбольш адыёзных праяў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы — масавых неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій. Што датычыць іншых яе бакоў, то яны былі захаваны і толькі часткова рэфармаваны, часта непаслядоўна і супярэчліва. У выніку таталітарная сістэма ў СССР захавалася ў больш умераным варыянце. Рух наперад у грамадска-палітычным жыцці дапаўняўся пэўнымі поспехамі ў развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы, культуры, навукі.

## 2. Поспехі ў сацыяльна-эканамічным развіцці і праявы таталітарызму ў "застойны перыяд"

Амаль дваццацігадовы адрэзак часу, з 1964 па 1982 г., калі краінай кіраваў Л. І. Брэжнеў, цяпер

[1] Советская Белоруссия. 1997. 6 сент.

нярэдка называюць застойным. Гэта, зразумела, умоўная назва, бо дадзены перыяд не быў аднародным па сваіх характарыстыках. У яго пачатку, у другой палове 60-х гадоў, якія звязаны з выкананнем заданняў восьмага пяцігадовага плана, былі дасягнуты высокія тэмпы эканамічнага развіцця. Яны з'явіліся вынікам эканамічнай рэформы, якая праводзілася ў той час. Аднак затым вышэйшае партыйнае кіраўніцтва не пайшло на яе далейшае правядзенне, а стала на шлях згортвання, палічыла, што яна не адпавядае выпрацаваным, а фактычна неасталінісцкім уяўленням аб сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве. З гэтага часу, з пачатку 70-х гадоў, пачалі змяншацца, "застойвацца" тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Аднак некаторыя характарыстыкі гэтага перыяду сталі складвацца з самага пачатку прыходу да ўлады новага кіраўніцтва. У першую чаргу гэта адносілася да кадравай палітыкі. Усё больш рэльефна на першае месца выходзіла патрабаванне, каб адны і тыя ж людзі працавалі на адных і тых жа пасадах як мага больш працяглы час. Гэта акалічнасць дапаўнялася тым, што кіраўнікі розных узроўняў, пачынаючы з генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, падбіралі сабе акружэнне не столькі па прафесійных якасцях работнікаў, колькі па іх асабістай адданасці. Пастаянства кадравага складу вярхоўны кіраўнік краіны лічыў адным з гарантаў стабільнасці партыі, дзяржавы і асабістай службовай устойлівасці. Ён нават ганарыўся тым, што ў перыяд яго кіравання большасць мясцовых партыйных лідэраў моцна сядзелі на сваіх месцах і ў кадравых адносінах адбываліся толькі самыя мінімальныя змены.

Пад ідэю пастаянства ў кадравай палітыцы падвялі нават адпаведную тэарэтычную базу. На XXIII з'ездзе КПСС, які адбыўся 29 сакавіка — 8 красавіка 1966 г., былі зроблены змены ў статуце партыі, якія ліквідавалі палажэнне аб магчымасці выбрання адных і тых жа асоб на кіруючыя пасады не больш чым на тры тэрміны, якое зацвердзіў папярэдні XXII партыйны з'езд. Адмена дадзенага патрабавання стварала практычна неабмежаваныя магчымасці для росквіту кланавага кіраўніцтва ў партыі і дзяржаве на самых розных узроўнях. У выніку многія кіраўнікі пачалі адчуваць сябе незаменнымі і адпаведным чынам паводзіць пры вырашэнні партыйных і дзяржаўных спраў, не забываючы пры гэтым пра свае ўлас-

ныя. Усё больш шырокія памеры сталі набываць карупцыя, хабарніцтва, крадзеж грамадскай уласнасці.

Застой у кадравай палітыцы з'яўляецца важнай характарыстыкай дадзенага перыяду. Без прытоку свежых сіл таталітарная сістэма ў СССР хоць і не вярнулася поўнасцю да сталінскага рэжыму, аднак рабілася ўсё больш закасцянелай. Такая кадравая палітыка адпаведным чынам адбівалася літаральна на ўсіх баках дзейнасці грамадства.

Гэты перыяд у жыцці савецкіх людзей, у тым ліку жыхароў Беларускай ССР, характарызуецца яшчэ і тым, што ў вярхоўнага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва было імкненне да стабілізацыі і нават кансервацыі грамадска-палітычных адносін на аснове вяртання ў некалькі новых умовах да сталінскіх падыходаў, але без іх крайнасцей, звязаных перш за ўсё з выкарыстаннем шырокамаштабных палітычных рэпрэсій.

Асновай ідэалагічнай работы, як і ўсяго грамадска-палітычнага жыцця ў дадзены перыяд, з'явілася канцэпцыя развітога сацыялізму ў адрозненне ад паскоранага будаўніцтва камунізму, аб чым было аб'яўлена ў канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў. Гэта быў больш умераны падыход да перспектывы эвалюцыі савецкага грамадства і разам з тым вяртанне назад ад вызначаных раней рубяжоў, што сведчыла не толькі аб пошуках шляхоў развіцця, але і аб непаслядоўнасці ў гэтай важнейшай справе на самым высокім партыйна-дзяржаўным узроўні.

Важнай асаблівасцю палітычнага развіцця на гэтым этапе была адмова ад рэфармавання не толькі сацыяльна-эканамічнай сферы, але і грамадска-палітычнага жыцця, вяртанне ў некаторых адносінах да ранейшых, фактычна сталінскіх падыходаў у кіраванні грамадствам, толькі з улікам новых умоў. Гэта палітыка неасталінізму фактычна сведчыла аб імкненні да кансервацыі становішча ў розных сферах дзейнасці, што непазбежна вяло да застою.

Пры гэтым не ўлічвалася небяспека ўсё большага адставання ад галоўнай лініі развіцця сусветнага супольніцтва. Звесткі аб імклівым руху наперад многіх капіталістычных краін на аснове навукова-тэхнічнага прагрэсу пад адпаведную ўвагу не браліся. Дэкларатыўныя рашэнні аб неабходнасці спалучэння дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу з

перавагамі сацыялістычнай сістэмы гаспадарання фактычна на практыцы аказаліся не выкананымі нягледзячы на некаторыя захады ў гэтым напрамку. Таму ў эканоміцы і ў сацыяльнай сферы ўсё больш пераважалі не інтэнсіўныя, а экстэнсіўныя метады, што не магло не адбіцца на тэмпах сацыяльна-эканамічнага развіцця, якія ўсё больш запавольваліся.

Разам з тым трэба падкрэсліць, што ў Савецкім Саюзе, у тым ліку ў БССР, у пачатку дадзенага перыяду ў эканамічнай сферы былі дасягнуты высокія паказчыкі. Яны ў першую чаргу сталі вынікам правядзення эканамічнай рэформы. Згодна з ёю мясцовым уладам даваліся некалькі большыя правы ў вызначэнні прыярытэтных галін развіцця, быў крыху скарочаны пералік планавых паказчыкаў, пачалося стварэнне фондаў матэрыяльнага стымулявання, фінансаванне прамысловага будаўніцтва стала праводзіцца больш праз крэдыты, а не шляхам датацый. Гэтыя і іншыя меры, якія ажыццяўляліся ў сувязі з рэформай, выходзілі за межы таталітарнай формы кіравання грамадствам. Яны садзейнічалі некаторай дэцэнтралізацыі эканамічнага і сацыяльнага развіцця, у эканамічныя адносіны больш інтэнсіўна ўключалася матэрыяльнае стымуляванне, што павышала вытворчую актыўнасць работнікаў.

У той час, калі эканамічная рэформа праводзілася ў жыццё, былі дасягнуты ўражальныя вынікі. Гэта ў першую чаргу датычыць 1966 — 1970 гг. На працягу іх у БССР аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся амаль у 1,8 раза. Сярэднегадавыя тэмпы прыросту прадукцыі ў прамысловасці склалі 12,4 % супраць 10,4 % у папярэднім пяцігоддзі. За дадзены час у рэспубліцы ўступілі ў лік дзеючых 167 буйных прадпрыемстваў, у тым ліку Лукомльская ДРЭС, Салігорскі калійны камбінат, мінскія заводы халадзільнікаў, электронных вылічальных машын, Баранавіцкі баваўняны камбінат і інш.

Гэта было дасягнута дзякуючы не толькі рэфармаванню эканамічных адносін, працоўнай актыўнасці работнікаў, але і буйным капітальным укладанням. Аднак эканамічная рэформа не была завершана і ў пачатку 70-х гадоў фактычна спынена, хаця розныя галіны гаспадаркі працягвалі развівацца інерцыйна і яшчэ захоўвалі значныя тэмпы. Дастаткова сказаць, што на працягу 70-х — першай паловы 80-х гадоў у БССР было ўзведзена 186 буйных прадпрыемстваў.

Многія з дзеючых фабрык і заводаў працягвалі павялічваць выпуск прадукцыі. У 1985 г. адно з вядучых прадпрыемстваў рэспублікі — Мінскі трактарны завод — дасягнула штогадовай вытворчасці ў 96 тыс. трактароў. Прыкметнае развіццё атрымаў транспарт, у першую чаргу чыгуначны.

Такія паказчыкі садзейнічалі росту агульных тэмпаў руху наперад. У 1985 г. у параўнанні з 1960 г. аб'ём прамысловай прадукцыі ў Беларусі павялічыўся ў 8,9 раза[1]. Адметнай рысай дадзенага часу было інтэнсіўнае развіццё новых галін індустрыі — хімічнай і нафтахімічнай. У першую чаргу гэта звязана са стварэннем буйных вытворчых аб'яднанняў "АЗОТ", "Беларуськалій", "Бабруйскшына", Наваполацкім і Мазырскім нафтаперапрацоўчымі заводамі і інш. Істотным момантам у гэтых адносінах быў пачатак распрацоўкі ў 1965 г. Рэчыцкага нафтавага радовішча. Усё гэта дазволіла ў 1985 г. перавысіць агульны аб'ём прадукцыі прамысловасці БССР у параўнанні з даваенным часам у 38 разоў.

Разам з тым у 70-х — першай палове 80-х гадоў адбывалася паступовае зніжэнне тэмпаў развіцця прамысловасці рэспублікі. Перш за ўсё гэта адносілася да галін, якія выраблялі тавары шырокага ўжытку. На працягу дадзенага перыяду аб'ём прадукцыі лёгкай прамысловасці павялічыўся толькі ў 2,1 раза, а вырабы перапрацоўчых галін аграпрамысловага комплексу — у 1,9 раза. Гэта было звязана ў асноўным з тым, што пытанні тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасці Беларусі ў многім вырашаліся марудна і непаслядоўна. Развіццё адбывалася пераважна экстэнсіўным шляхам, прадпрыемствы былі малаўспрымальнымі да ўкараненняў навуковых распрацовак. Да таго ж шырока разрэкламаваная ідэя сацыялістычнага спаборніцтва фактычна сябе не апраўдвала. Нават рух за камуністычныя адносіны да працы, які пачаўся яшчэ ў канцы 50-х гадоў, не даваў прыкметных вынікаў.

Галоўнай перашкодай на шляху да захавання тэмпаў развіцця, дасягнутых у другой палове 60-х гадоў, было згортванне эканамічнай рэформы, вяртанне да ранейшага адміністравання ў эканамічным жыцці. Гэта скоўвала гаспадарчую ініцыятыву на месцах,

---

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1985 г. Статистический ежегодник. Мн., 1986. С.33.



19. Зак. 5022

павышала цэнтралізацыю кіравання вытворчасцю. Фактычна кожная ініцыятыва, якая магла даць добрыя вынікі, у рэшце рэшт аказвалася заблакіраванай груваскім гаспадарчым механізмам. Так адбылося з брыгадным падрадам, што прадугледжваў адыход ад ураўнілаўкі ў аплаце працы, а таксама з ініцыятывай работнікаў Шчокінскага камбіната, згодна з якой пры меншай колькасці работнікаў можна было даваць больш прадукцыі, і іншымі новаўвядзеннямі.

Асноўнай прычынай згортвання ў пачатку 70-х гадоў эканамічнай рэформы з'явілася тое, што яна прыйшла ў супярэчнасць з нязменнай грамадска-палітычнай сістэмай. Вышэйшым партыйным кіраўніцтвам прыярытэт быў аддадзены менавіта ёй. Гэта дазволіла вярнуцца да ранейшых метадаў у кіраванні гаспадарчым жыццём — звышвысокай цэнтралізацыі, слабога выкарыстання матэрыяльных стымулаў і інш. У аснове захаваная таталітарная сістэма аказалася няздольнай адрэагаваць на відавочныя патрабаванні часу. Яна была інертнай да рэфармавання, якое магло закрануць існуючыя асновы грамадскага ладу. Яе відавочная рыса — застойнасць — найбольш яскрава праявілася ў 70-я — пачатку 80-х гадоў.

Істотнай перашкодай на шляху развіцця прамысловасці было маруднае ўкараненне навуковых распрацовак і як вынік — недастатковая механізацыя вытворчых працэсаў. У 1977 г. удзельная вага работнікаў прамысловасці, занятых ручной працай, дасягала амаль 40 %. За кошт навукова-тэхнічных мерапрыемстваў забяспечвалася толькі палова прыросту прадукцыйнасці працы[1]. Вынікам усяго гэтага ў прамысловасці БССР з'явілася зніжэнне тэмпаў прыросту прадукцыі ў першай палове 80-х гадоў у параўнанні з гэтым жа перыядам 60-х гадоў амаль у два разы.

На працягу дадзенага перыяду значна меншымі крокамі, чым прамысловасць, развівалася сельская гаспадарка, хаця кіраўніцтва партыі і дзяржавы рабіла значныя намаганні ў гэтым напрамку. У прыватнасці, пленум ЦК КПСС, што адбыўся ў сакавіку 1965 г., прыняў рашэнні, згодна з якімі прадугледжваўся рост капітальных укладанняў у сельскагаспадарчую вытворчасць, павялічваліся пастаўкі

[1] Матэрыялы XXX з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. Мн., 1986. С.12.

тэхнікі, павышаліся закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю. Гэта садзейнічала паляпшэнню спраў у вёсцы. За другую палову 60-х гадоў ураджай збожжавых у Беларускай ССР узрос з 11,5 да 16 ц.

На працягу 70-х — першай паловы 80-х гадоў у сельскую гаспадарку былі ўкладзены значныя рэсурсы, што дазволіла зноў павысіць яе паказчыкі. За гэты час энергетычныя магутнасці сельскагаспадарчай вытворчасці ў рэспубліцы выраслі амаль у тры разы. Надзвычай шмат увагі надавалася спецыялізацыі, меліярацыі, хімізацыі сельскай гаспадаркі. У выніку ўраджайнасць збожжавых культур пачала дасягаць 30 ц і больш, бульбы — 150 ц і вышэй. Аднак вялікія фінансавыя ўкладанні не давалі адпаведнай аддачы. На працягу 1965 — 1985 гг. аб'ём валавой прадукцыі ў сельскай гаспадарцы рэспублікі павялічыўся ў 1,6 раза[1].

Вельмі значнымі з'яўляліся страты сельскагаспадарчай прадукцыі ў выніку безгаспадарчасці, неарганізаванасці, дрэннага захоўвання ўраджаю. Яны нярэдка перавышалі чвэрць усёй прадукцыі. Шмат негатыўных бакоў мелася ў шырокамаштабнай меліярацыі. Хімізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці павышала ўраджайнасць, але зніжала якасць прадуктаў харчавання. На вёсцы ўсё больш развіваліся абыякавыя адносіны да калгаснай і саўгаснай маёмасці. Прыярытэт калектыўнай уласнасці, які на працягу многіх дзесяцігоддзяў актыўна прапагандаваўся камуністычнай партыяй і савецкай уладай, урэшце рэшт абярнуўся раўнадушнымі адносінамі да яе з боку сельскіх працаўнікоў. Зямля страчвала руплівага гаспадара.

У гэты перыяд значная ўвага надавалася развіццю сацыяльнай сферы. Важнае месца ў дадзеных адносінах займала павышэнне мінімальнага ўзроўню заработнай платы. З 1 студзеня 1965 г. яна была ўстаноўлена ў памеры 45 — 50 руб. у месяц. З цягам часу дадзены паказчык патроху ўзрастаў. Павышалася і пенсійнае забеспячэнне працоўных. У першую чаргу яно адносілася да прадстаўнікоў рабочага класа і інтэлігенцыі. Што датычыць калгаснікаў, то толькі ў 1964 г. быў прыняты адпаведны закон. Аднак пенсіі

---

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1988 г. Статистический ежегодник. Мн., 1989. С.180.



20. Зак. 5022

калгаснікаў заставаліся надзвычай нізкімі. У 1966 г. яны раўняліся ў БССР 12 руб. 29 кап. у месяц, у той час як у іншых сферах дзейнасці іх памер вагаўся ад 30 да 120 руб.

Непасрэдны ўплыў на сацыяльную сферу аказвалі тэмпы нацыянальнага развіцця, а яны ў гэты перыяд істотна зніжаліся. Калі ў другой палове 60-х гадоў сярэднегадавы прырост нацыянальнага даходу ў БССР склаў 9,1 %, то ў другой палове 70-х гадоў — 5,1 %. Адпаведна зніжаліся паказчыкі рэальнага росту даходаў працоўных. У першай палове 80-х гадоў яны раўняліся 2,5 % супраць 7,1 % у другой палове 60-х гадоў[1].

У сацыяльнай сферы значную ролю адыгрывалі грамадскія фонды. Аднак іх размеркаванне было недастаткова звязана з укладам таго ці іншага працаўніка ў развіццё вытворчасці, што спрыяла развіццю ўраўняльнасці ў забеспячэнні грамадзян. Да таго ж у 70-х гадах працягвала нарастаць тэндэнцыя апераджальнага росту грашовых даходаў насельніцтва і іх гандлёвага попыту ў параўнанні з вытворчасцю тавараў. Такое становішча прывяло да зніжэння ў задавальненні патрэб працоўных, узнікнення чэргаў, прымянення ў гандлі талоннай сістэмы, росту іншых адмоўных тэндэнцый.

Поспехі ў сацыяльна-эканамічным развіцці і адначасова нарастаючыя праблемы і цяжкасці, звязаныя з падзеннем эканамічных і сацыяльных паказчыкаў, цесна перапляталіся з грамадска-палітычнымі працэсамі. Іх характар адпавядаў агульнай плыні жыцця — пераважалі ранейшыя, кансерватыўныя падыходы да вырашэння праблем у дзейнасці партыі, саветаў, грамадскіх арганізацый. У ідэалагічнай сферы працягваўся жорсткі кантроль за тым, каб вытрымлівалася афіцыйная лінія. Гэта была палітыка, якая не адпавядала дэмакратычнаму напрамку развіцця, што пераважаў у сусветным супольніцтве.

Характэрныя рысы дадзенага перыяду — поспехі і нарастанне застойных з'яў у сацыяльна-эканамічным жыцці, кансерватызм у вырашэнні грамадска-палітычных праблем — у поўнай ступені адлюстроўваліся ў культурнай сферы. Яна вызначалася не толькі пашырэннем адукацыі, выдавецкай справы, сеткі культурна-асветных устаноў, развіццём прафесійнага і самадзейнага мастацтва, але і ўціскам

---

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1988 г. С.7 — 8.

на тых, хто не падзяляў афіцыйную лінію. Яны саджаліся ў турмы, высылаліся з Савецкага Саюза. Барацьба з дысідэнтамі з'яўлялася значным напрамкам дзейнасці партыйных і дзяржаўных органаў, адпаведных карных структур. Вольнадумства па-ранейшаму жорстка праследавалася.

Характэрнай ілюстрацыяй гэтага з'яўляюцца адносіны вышэйшых улад да аднаго з вязняў сталінскіх лагераў, які цудам застаўся жыць, а затым стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі, А. І. Салжаніцына. Ён у пачатку 70-х гадоў жорстка праследаваўся за напісанне кнігі "Архіпелаг ГУЛАГ", хаця адлюстроўваў у ёй тое, што перажыў сам і сведкам чаго з'яўляўся, знаходзячыся ў заключэнні па сфабрыкаванаму абвінавачванню, г. зн. быў тыповым асуджаным, якіх налічвалася ў дзяржаве мільёны, у тым ліку сотні тысяч з БССР.

Нягледзячы на асуджэнне рэпрэсій XX з'ездам партыі і пастановай ЦК КПСС "Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў", на тое, што да гэтага часу ўжо было вядома аб велізарнай лагернай імперыі, створанай у СССР, афіцыйна гэты твор-споведзь Салжаніцына характарызаваўся як "грубы антысавецкі пасквіль", а яго аўтар быў аб'яўлены "хулиганствующим элементом" і "врагом". У кіруючых колах краіны быў намер правесці суд над стваральнікам дадзенага твора і выслаць яго ў Верхаянск, дзе вельмі моцныя маразы. Аднак у рэшце рэшт яго арыштавалі, адвезлі ў Лефортаўскую турму, а затым спецыяльным рэйсам адправілі за мяжу. На наступны дзень у друку з'явілася кароткае паведамленне ТАСС. У ім утрымлівалася інфармацыя, што адпаведна ўказу Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "за сістэматычнае здзяйсненне дзеянняў, не сумяшчальных з прыналежнасцю да грамадзянства СССР і якія наносяць шкоду Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, пазбаўлены грамадзянства і 13 лютага 1974 г. высланы за межы Савецкага Саюза Салжаніцын А. І."[1].

Таталітарная ў сваёй аснове сістэма ўлады ў СССР, заснаваная на аднапартыйнай сістэме, выклікала і іншыя пратэсты, у тым ліку нават сярод ваенных. Магчыма, найбольш паказальным у гэтых адносінах з'явілася выступленне матросаў карабля Балтыйскага флоту "Сторожевой" на чале з намеснікам камандзіра карабля па палітычнай частцы капітанам 3-га рангу В. Сабліным. Ён доўга вы-

---

[1] Правда. 1974. 14 февр.

ношваў ідэю пратэсту супраць існуючых у краіне парадкаў, манаполіі КПСС на кіраўніцтва грамадствам і сістэматычна праводзіў адпаведную работу з падначаленым яму асабовым складам карабля. Гутаркі аб заганнасці партыйна-савецкай бюракратычнай улады выклікалі павышаную цікавасць у маракоў.

Для выступлення быў выбраны час, калі 8 лістапада 1975 г. карабель знаходзіўся на марскім парадзе ў Рызе ў сувязі з чарговай гадавінай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нечакана ён зняўся з якара, разварнуўся і, набіраючы ход, пайшоў у адкрытае мора. Зампаліта падтрымалі матросы. Камандзір карабля і афіцэры былі ізаляваны. Аднак яшчэ ў савецкіх тэрытарыяльных водах пад пагрозай удараў авіяцыі карабель вымушаны быў спыніцца. Затым ён павярнуў назад. В. Сабліна арыштавалі, вялося следства, адбыўся суд, і 3 жніўня 1976 г. ён быў расстраляны. Бліжэйшы яго памочнік матрос А. Шэін атрымаў 8 гадоў турэмнага зняволення строгага рэжыму. Каманда карабля ў 400 чалавек была расфарміравана[1]. Гэта, безумоўна, палітычнае выступленне не адбілася на баяздольнасці краіны, але яно засведчыла, што і ў ваенным асяроддзі, нягледзячы на масіраваную агітацыйна-прапагандысцкую работу, могуць быць адчайныя акцыі супраць існуючых у краіне парадкаў.

Манаполія партыі на кіраўніцтва ўсімі бакамі жыцця выклікала і іншыя пратэсты, часамі стыхійныя, як гэта мела месца ў БССР, у Слуцку. Трагічныя падзеі адбыліся ў сувязі з забойствам чалавека, якое ўчыніў камуніст, загадчык аддзела мясцовага выканкома. Гараджане не верылі, што суд будзе аб'ектыўным, і на трэці дзень працэсу ў кастрычніку 1967 г. натоўп у некалькі тысяч чалавек асабліва настойліва запатрабаваў забойцу смяротнай кары. Узніклі беспарадкі. Памяшканне суда было спалена. Меліся ахвяры. У сувязі з гэтай трагедыяй двух чалавек затым асудзілі да смяротнай кары, двое іншых атрымалі па 15 гадоў турэмнага зняволення, пяць — па 10, адзін — 9 і тры — па 7 гадоў пазбаўлення волі. Усяго асудзілі больш за 70 чалавек. Былі пакараны нават тыя, хто ў сувязі з судовым працэсам збіраў подпісы пад пасланнем у ЦК КПСС[2]. Трагедыя ў Слуцку ўяўляла сабою і палітычны пратэст і антысавецкую акцыю. Яна мела і крымінальны аспект. Аднак у яе аснове быў

---

[1] Советская Белоруссия. 1997. 12 апр.

[2] Народная газета. 1997. 16 — 18 жн.

недавер да мясцовых партыйных органаў, савецкай улады і суда.

Гэтыя і іншыя акцыі пратэсту не былі вядомыя шырокай грамадскасці. Яны старанна замоўчваліся. Усе звязаныя з імі матэрыялы строга засакрэчваліся. Такі падыход — тыповы для таталітарных сістэм, калі пераводзяцца ў разрад сакрэтных дакументы, якія не ўяўляюць пагрозы для бяспекі краіны, але кіраўнікам непажадана, каб пра іх ведалі. Скрытнасць у намерах і тым больш у дзеяннях заўсёды вызначала вышэйшыя эшалоны ўлады ў Савецкім Саюзе. Гэта — агульная рыса многіх кіраўнікоў краіны.

Перш за ўсё, вядома, хаваліся недахопы ў працы, пралікі, злоўжыванні. Пры адсутнасці арганізаваных апазіцыйных сіл зрабіць гэта было няцяжка. Што датычыць поспехаў, то яны, зразумела, шырока рэкламаваліся. Да таго ж поспехі, як адзначалася, былі. Меліся яны і ў адукацыйнай сферы. Значным этапам з'явіўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, які быў аб'яўлены ў 1966 г. XXIII з'ездам КПСС. Гэты пераход ажыццяўляўся даволі настойліва і ў сярэдзіне 70-х гадоў у БССР быў у асноўным завершаны. Значныя памеры набыла падрыхтоўка кадраў праз сярэднія навучальныя ўстановы. На працягу 1960 — 1985 гг. іх колькасць у рэспубліцы павялічылася са 102 да 139, а агульны лік навучэнцаў — з 62,6 тыс. да 160,4 тыс. чалавек. Адпаведная ўвага надавалася і вышэйшай адукацыі. За адзначаны перыяд колькасць вышэйшых навучальных устаноў павялічылася з 24 да 33, а штогадовы лік іх выпускнікоў узрос з 10 тыс. да 31,9 тыс.

Інтэнсіўна развіваліся навуковыя даследаванні. Сетка навуковых устаноў у рэспубліцы на працягу 1956 — 1985 гг. пашырылася з 76 да 167. За гэты час колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў у рэспубліцы павялічылася з 4,4 тыс. чалавек да 42,4 тыс. Вядучая роля ў дадзенай сферы належала Акадэміі навук БССР. Аднак зусім недастатковая ўвага надавалася росту фондаў забеспячэння навукі. Па гэтым паказчыку савецкая навука больш чым у два разы адставала ад прамысловасці[1], што было ненармальнай з'явай. Вопыт індустрыяльна

---

[1] *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996. С.377 — 381.

развітых краін сведчыў аб тым, што тут неабходны адваротныя суадносіны.

Разам з намаганнямі партыйна-дзяржаўных улад па развіццю адукацыйна-навуковай сферы і значнымі поспехамі ў ёй працягваліся кансерватыўныя адносіны да нацыянальнага развіцця. Гэта ў першую чаргу вызначалася курсам на камуністычнае будаўніцтва, зліццё моў, нацый, аб'яднанне іх культур, фарміраванне ў СССР новай грамадзянскай супольнасці — савецкага народа. Нягледзячы на тое што ў розных нацыях існавала імкненне да захавання сваіх традыцый, побыту, далейшага развіцця культурнай спадчыны, з боку цэнтральных структур увесь час нaглядалася тэндэнцыя стрымаць дадзеныя працэсы.

Як заўсёды, гэта дапаўнялася націскам на любыя праяўленні нацыянальнага. У БССР, у прыватнасці, скарачалася выданне беларускамоўнай літаратуры. У 1985 г. колькасць кніг і брашур, іх тыражы, выдадзеныя ў рэспубліцы на рускай мове, амаль у 10 разоў перавысілі беларускамоўныя. У значна большых памерах выходзіла на рускай мове і перыядычных выданняў — газет і часопісаў.

Таталітарная сістэма заставалася вернай сабе ў адмоўных адносінах да ўсяго нацыянальнага. Яго развіццё дапускалася на пэўным мінімальным узроўні. Асабліва гэта было характэрна для БССР, дзе працэс дэнацыяналізацыі асноўнага этнасу зайшоў асабліва далёка. Сведчанняў гэтаму вельмі шмат. Дастаткова сказаць, што ў час перапісу насельніцтва ў 1970 г. колькасць тых беларусаў, што пражывалі ў гарадах і не прызнавалі беларускую мову, дасягнула 24,5 %[1].

У нацыянальна-культурным развіцці гэты перыяд шмат у чым нагадвае ранейшыя партыйна-дзяржаўныя падыходы. Аб яго сувязі са сталінскімі часамі сведчыць усёабдымная цэнзура, якая заўсёды існавала. Гэты напрамак работы значна ўзмацніўся пасля прыняцця ў студзені 1969 г. пастановы ЦК КПСС "Аб павышэнні адказнасці кіраўнікоў органаў друку, радыё, тэлебачання, кінематаграфіі, устаноў культуры і мастацтва за ідэйна-палітычны ўзровень публікуемых матэрыялаў і рэпертуару". Выконваючы дадзеную пастанову, бюро ЦК КПБ у сакавіку 1969 г. зацвердзіла адпаведныя мерапрыемствы. Яны

[1] Советская Белоруссия. 1995. 5 апр.

прадугледжвалі строгія меры адказнасці за любыя адхіленні ад афіцыйнай лініі ў змесце публікуемых матэрыялаў ці ў вусных выступленнях. У развіццё гэтых пастаноў былі нават уведзены адпаведныя артыкулы ў крымінальны кодэкс БССР, якія прадугледжвалі пазбаўленне волі да сямі гадоў альбо высылку ў аддаленыя рэгіёны дзяржавы. Гэтыя меры, звязаныя з наступам на ўсё тое, што не супадала з афіцыйнай лініяй, сведчылі аб працягванні ранейшай палітыкі, якая так жорстка праяўлялася на практыцы ва ўсе гады існавання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы.

Такім чынам, у так званы застойны перыяд таталітарны характар партыйна-дзяржаўнага праўлення ў СССР праявіўся не толькі са стваральнага, але і з кансерватыўнага бакоў, калі не было развіцця эканамічных рэформаў, на аснове якіх эканоміка зрабіла значны крок наперад. Разам з дасягненнямі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай, культурнай, навуковай сферах характэрным было паступовае падзенне тэмпаў прыросту вытворчасці, нацыянальнага даходу, іншых важных паказчыкаў. Захаваліся асновы грамадска-палітычнага жыцця з аднапартыйным праўленнем, ідэалагічны ўціск і негатыўныя адносіны да развіцця нацыянальных адметнасцей. Таталітарная сістэма ў сярэдзіне 80-х гадоў набліжалася да той мяжы, за якой пачыналася яе разбурэнне.

## 3. Крызіс сацыяльна-эканамічнай сферы і рэцыдывы таталітарнага праўлення ў час радыкальных пераўтварэнняў

Другая палова 80-х — пачатак 90-х гадоў у гісторыі Беларусі, як і іншых краін, што ўзніклі на абшарах былога СССР, звязаны з радыкальнымі пераўтварэннямі, пачатымі па ініцыятыве кіраўніцтва камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы. Аднак адсутнасць распрацаванай праграмы перамен, належнага прагназіравання іх вынікаў, у першую чаргу адмоўных, недастатковы ўлік фактычнага становішча спраў і іншыя фактары зрабілі гэты працэс цяжкім выпрабаваннем для народаў. Як адзначаў адзін з

натхняльнікаў гэтых пераўтварэнняў тагачасны член палітбюро і сакратар ЦК КПСС А. М. Якаўлеў: “Мы шмат чаго не ўлічылі, асабліва ў псіхалогіі, ілюзій было шмат”[1].

Крызісныя з'явы нарасталі паступова. У пачатку дадзенага перыяду стан спраў у некаторых рэгіёнах, у тым ліку ў БССР, быў нядрэнным. Эканоміка рэспублікі развівалася яшчэ даволі высокімі тэмпамі. Дастаткова сказаць, што ў 1986 г. аб'ём прамысловай прадукцыі склаў 107 % у параўнанні з 1985 г. У 1987 г. гэты паказчык дасягнуў 114 %, а ў 1988 г. — 122 %. На працягу 1986 — 1989 гг. былі пабудаваны і ўведзены ў дзеянне 24 новыя буйныя прамысловыя прадпрыемствы, некаторыя фабрыкі і заводы рэканструяваліся.

Аднак з канца 80-х гадоў эканоміка БССР, як і іншых рэспублік Савецкага Саюза, увайшла ў крызісную паласу, хаця агульныя паказчыкі за другую палову 80-х гадоў былі ў БССР яшчэ значнымі. Прамысловая галіна павялічыла выпуск прадукцыі на 26 %. За гэты час амаль на трэць узрасла і прадукцыйнасць працы. Тым не менш крызісныя з'явы нарасталі, і ў пачатку 90-х гадоў яны пачалі адчувацца ўсё больш і больш. На працягу 1992 г. аб'ём прамысловай вытворчасці ў Беларусі скараціўся амаль на 10 %. Гэта тэндэнцыя ўзмацнялася і пацягнула за сабой зніжэнне іншых паказчыкаў. За першае паўгоддзе 1994 г. аб'ём валавога ўнутранага прадукта знізіўся на 31 %, больш чым на 20 % скараціўся нацыянальны даход. Выпуск прамысловай прадукцыі склаў 68,5 % у параўнанні з адпаведным перыядам 1993 г.[2]

Крызіс распаўсюдзіўся і на транспарт. Аб'ём перавозак грузаў транспартам агульнага карыстання зменшыўся толькі на працягу першых дзевяці месяцаў 1991 г. на 30 %. Значна скарацілася колькасць аўтобусных, міжгародніх і гарадскіх маршрутаў.

Прыкладна такія ж працэсы, як у прамысловасці і на транспарце, назіраліся ў гэты час і ў сельскагаспадарчай вытворчасці. У другой палове 80-х гадоў яна яшчэ развівалася ў БССР дастаткова ўстойліва, калі сярэднегадавы ўраджай збожжавых склаў 29,5 ц супраць 21,5 ц у папярэдняе пяцігоддзе. Нядрэнныя вынікі мела і жывёлагадоўчая галіна. На працягу другой паловы 80-х гадоў сярэднегадавая вытвор-

---

[1] Советская Белоруссия. 1996. 12 июня.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.423 — 427.

часць малака ў рэспубліцы дасягнула 7 млн 318 тыс. т супраць 6 млн 306 тыс. т у першай палове дадзенага дзесяцігоддзя. За гэты час нарыхтоўка мяса ва ўбойнай вазе павялічылася з 933 тыс. т да 1 млн 178 тыс. т[1].

Гэтыя дасягненні вывелі Беларусь на ўзровень высокаразвітых краін. У 1990 г. на аднаго чалавека ў рэспубліцы ў сярэднім выраблялася 115 кг мяса, 727 кг малака, вырошчвалася 686 кг збожжавых. Дадзеныя паказчыкі былі не на многа меншыя, чым у некаторых дзяржавах Захаду. Аднак гэтыя дасягненні не садзейнічалі адпаведнаму спажыванню насельніцтвам прадуктаў харчавання. Гэта тлумачыцца тым, што Беларусь заўсёды значную частку сваёй сельскагаспадарчай прадукцыі аддавала для агульнадзяржаўных патрэб. У 1991 г., напрыклад, удзельная вага рэспублікі ў фарміраванні гэтых фондаў складала: па мясных прадуктах — 16 %, па малаку — 22, маргарыну — 41, бульбе — 44 %[2].

У агульным рэчышчы рэфармавання эканомікі нямала новаўвядзенняў рабілася і ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак яны не давалі належных вынікаў. Калгасна-саўгасная сістэма як адна з важнейшых апор таталітарызму ў СССР аказалася кансерватыўнай і мала ўспрымальнай да рэфармавання. У прыватнасці, гэта адлюстроўвалася на развіцці фермерскіх гаспадарак. У пачатку красавіка 1995 г. іх колькасць склала ў Рэспубліцы Беларусь толькі 3013. Яны валодалі зусім невялікай зямельнай плошчай — 62,5 тыс. гектараў[3]. У рабоце фермераў сустракалася шмат цяжкасцей. У першую чаргу яны звязаны з нежаданнем кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў мець альтэрнатыўны варыянт у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Таму ім, нягледзячы на шэраг законаў, ствараюцца многія перашкоды ў гаспадарчай дзейнасці: адводзяцца горшыя землі, значна завышаюцца цэны на сельгасмашыны, інвентар, пасяўны матэрыял і інш. Тым не менш нямала фермерскіх гаспадарак паказваюць добрыя вынікі. Гэтым самым яны на практыцы даказваюць, што маюць права на існаванне.

---

[1] Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 году. Статистический сборник. Мн., 1993. С.212, 222.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.2. С.431.

[3] *Сакович В. С.* Фермерство Беларуси: становление и развитие. Мн., 1995. С.111.

У рэчышчы праводзімых пераўтварэнняў прымаліся меры па стабілізацыі становішча ў эканоміцы, аздараўленню фінансавай сістэмы. У цэлым станоўчае значэнне ў некаторым скарачэнні плацёжнага дэфіцыту меў увод у абарачэнне разліковых білетаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Гэта было зроблена ў 1992 г. Дадзеная мера дазволіла больш рэгулярна выплачваць заработную плату, пенсіі, весці іншыя разлікі.

Ва ўмовах рэфармавання эканомікі ўзніклі новыя цяжкасці ў гандлёвай дзейнасці, што было выклікана абмежаванасцю тавараў. У выніку нярэдка даводзілася звяртацца да талоннай сістэмы абслугоўвання. Хоць і марудна, але адбывалася фарміраванне рыначнай інфраструктуры. Пашыраўся прадпрымальніцкі рух. Па стану на канец верасня 1993 г. у Беларусі было зарэгістравана амаль 16 тыс. малых прадпрыемстваў, 12 тыс. таварыстваў з абмежаванай адказнасцю і больш за 4 тыс. кааператываў[1].

Эканамічныя працэсы аказвалі непасрэднае ўздзеянне на сацыяльныя змены ў грамадстве. Пры гэтым становішча ў горадзе і на вёсцы істотна адрознівалася. Перш за ўсё гэта датычыць дэмаграфічных паказчыкаў. Амаль трэцяя частка жыхароў вёскі мела пенсійны ўзрост, у той час як у горадзе ўдзельная вага пенсіянераў захоўвалася ў межах 13 — 14 %. Такія суадносіны ў дэмаграфічным становішчы гарадскога і сельскага насельніцтва з'яўляюцца вынікам палітыкі кіраўнікоў таталітарнай сістэмы фактычна за ўвесь час яе існавання. Ствараючы лепшыя ўмовы жыцця ў горадзе ў параўнанні з сельскай мясцовасцю, яны тым самым стымулявалі актыўны адток сельскага насельніцтва, асабліва моладзі, у гарады. Непрэстыжнасць працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці, інтэнсіўнае рассяляньванне беларускай вёскі прывялі да вялікай розніцы ва ўзроставых паказчыках жыхароў гарадоў і вёсак.

Адпаведна фарміравалася і працавала сацыяльная інфраструктура. На вёсцы яна заўсёды была значна слабейшай, чым у горадзе. Гэта выяўлялася як у яе насычанасці рознымі ўстановамі, так і ў вытворчых паказчыках. Акрамя таго, да сацыяльнай сферы заўсёды былі значныя прэтэнзіі не толькі жыхароў вёскі, але і горада. Такое ж становішча існавала і ў другой палове 80-х гадоў, калі яшчэ назіраўся пэўны

[1] Звязда. 1993. 30 верас.

рост рэальных заробкаў працоўных. Разам з тым нарастаў дэфіцыт тавараў, што заўсёды з'яўлялася істотнай прыкметай савецкага ладу жыцця. На працягу дзесяцігоддзяў існавання савецкіх парадкаў пастаянна адчуваўся недахоп тых ці іншых тавараў, што нярэдка прыводзіла да ўвядзення картачнай ці талоннай сістэмы. Гэта характэрнейшая рыса жыцця ва ўмовах таталітарнага праўлення ў СССР. Калі для простага савецкага чалавека заўсёды існавала праблема дзе і што купіць, дык у абсалютнай большасці краін з капіталістычнымі адносінамі пастаянна мела месца іншая дылема: як прадаць тавар. У ранейшай агітацыйна-прапагандысцкай рабоце партыйна-савецкай ідэалагічнай сістэмы гэта рыса капіталістычнага ладу заўсёды падавалася як адмоўная. Аднак цяпер мы разумеем, што праблема збыту тавара — гэта значна меншы недахоп для працоўных у параўнанні з тым становішчам, калі іх хранічна не хапае.

У сувязі з рэфармаваннем эканомікі ў другой палове 80-х гадоў дэфіцыт тавараў яшчэ больш узмацніўся. Напрыклад, у 1990 г. у свабодным гандлі адсутнічалі многія вырабы лёгкай прамысловасці, тавары культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння. Такое становішча прывяло да таго, што з пачатку 1992 г. у Рэспубліцы Беларусь пачала ўжывацца купонная сістэма для набыцця тавараў першай неабходнасці. Адначасова з гэтым цэны на тавары і паслугі сталі рэзка ўзрастаць. Толькі ў 1992 г. яны павысіліся ў 11 разоў, а калі параўноўваць гэты паказчык з 1990 г., то ў 22 разы. Гэта не магло не прывесці да скарачэння продажу тавараў. Так, на працягу 1992 г. яно дасягнула 26 %.

Усе гэтыя працэсы ў эканоміцы і сацыяльнай сферы садзейнічалі аднаўленню беспрацоўя, якое, як вядома, мела месца ў СССР у 20-я гады і было пераадолена на аснове планавай сістэмы вядзення гаспадаркі ў пачатку 30-х гадоў. У далейшым на працягу дзесяцігоддзяў існавання савецкай улады наяўнасць беспрацоўя ў краіне адмаўлялася, хаця фактычна яно існавала ў скрытай форме. Толькі ў 1991 г. афіцыйна быў прызнаны факт існавання беспрацоўя. У далейшым памеры гэтай з'явы павялічыліся. Паводле звестак на 1 жніўня 1993 г., на ўліку ў органах занятасці Рэспублікі Беларусь знаходзілася 58 тыс. чалавек. Для параўнання трэба зазначыць, што па стану на 1 красавіка 1926 г. у

БССР у яе тагачасных межах налічвалася 23,5 тыс. беспрацоўных[1].

Адмоўны ўплыў на сацыяльнае становішча часткі сем'яў у гарадах аказала рэзкае зніжэнне тэмпаў у будаўніцтве жылля за дзяржаўны кошт, што заўсёды з'яўлялася характэрнай рысай жыцця ва ўмовах СССР. Так, у Савецкім раёне Мінска ў 1990 г. на дзяржаўныя сродкі былі пабудаваны 324 кватэры, а ў 1992 г. — 72[2]. Калі ўлічваць нізкія даходы працоўных і фактычна поўную адсутнасць у іх магчымасцей будаваць жыллё за свой кошт, можна ўявіць, як цяжка адбілася дадзеная акалічнасць на становішчы тых сем'яў, перад якімі стаяла гэта праблема.

Моцнае ўздзеянне на становішча эканомікі, сацыяльнай сферы, усё грамадска-палітычнае жыццё Беларусі аказала аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, якая здарылася 26 красавіка 1986 г. Гэта буйнейшая экалагічная катастрофа з усіх, з якімі сутыкнулася чалавецтва за сваю гісторыю. І трэба ж так стацца, што асноўны ўдар гэтага страшэннага выбуху прыйшоўся на Беларусь, хаця сама станцыя знаходзіцца за яе межамі. Беларуская зямля прыняла на сябе 70 % усяго радыеактыўнага забруджвання. У небяспечнай зоне апынулася пятая частка насельніцтва. З сельскагаспадарчага абароту выведзена больш за 20 % угоддзяў, амаль 15 % лясоў.

Заканамерна, што такая глабальная аварыя здарылася менавіта ў Савецкім Саюзе. Асноўнымі прычынамі гэтага з'явіліся ненадзейны тэхнічны ўзровень дадзенага вельмі небяспечнага аб'екта, пагоня за яго датэрміновым увядзеннем у лік дзеючых, безадказнасць у адносінах да працы пэўнай часткі абслугоўваючага персаналу і інш.

Тыповай праявай таталітарных метадаў кіравання была рэакцыя вышэйшых партыйных і дзяржаўных асоб на гэту страшэнную па сваіх выніках катастрофу. Спачатку яны імкнуліся замоўчваць тое, што здарылася. Толькі праз чатыры дні, 30 красавіка, калі пачалі біць трывогу ў Скандынаўскіх і іншых краінах, паведамленне аб аварыі на Чарнобыльскай АЭС з'явілася ў газеце "Правда". Праз два тыдні пасля

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.64, арк.89; Советская Белоруссия. 1993. 17 авг.

[2] Звязда. 1997. 22 студз.

гэтага, а фактычна праз 18 дзён пасля аварыі па тэлебачанні выступіў тагачасны кіраўнік партыі і дзяржавы М. Гарбачоў.

Адпаведнай была рэакцыя вышэйшага партыйнага кіраўніцтв Беларускай ССР. Першы сакратар ЦК КПБ М. Слюнькоў ніяк не рэагаваў на трывожныя папярэджанні шэрагу вучоных, у першую чаргу дырэктара Інстытута ядзернай энергетыкі Акадэміі навук БССР члена-карэспандэнта АН В. Несцярэнкі, які ўжо 30 красавіка накіраваў на яго імя першае папярэджанне аб надзвычай высокай небяспецы для насельніцтва гэтай аварыі. У лісце гаварылася: “Нашы ацэнкі прагназуемай дозы апраменьвання ў гэтых раёнах па выніках аналізаў проб глебы паказваюць, што могуць узнікнуць істотныя наступствы для здароўя людзей”. Аўтар ліста прапаноўваў у самыя сціслыя тэрміны разгледзець і правесці арганізацыйныя мерапрыемствы, скіраваныя на змяншэнне шкоднага ўплыву радыяцыі на людзей. Характэрны бюракратычныя рэзалюцыі, а фактычна адпіскі, што зрабіў кіраўнік кампартыі Беларусі на гэтым і іншых надзвычай актуальных папярэджаннях, адрасуючы іх старшыні Савета Міністраў БССР: “т.Кавалёву М. В. Для вырашэння”, “т. Кавалёву М. В. Для інфармацыі”[1]. Вынікам такой злачыннай бяздзейнасці была высокая ступень апраменьвання многіх грамадзян Беларусі, асабліва дзяцей, у час не адмененых масавых першамайскіх дэманстрацый, паходаў і інш. Асабліва гэта датычылася Гомеля, яго ваколіц, іншых мясцін рэспублікі, якія найбольш пацярпелі ад атамнай стыхіі.

Чарнобыльская трагедыя, імкненне партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва замаўчаць яе, непрыняцце адпаведных мер, а затым непаслядоўнасць і супярэчлівасць у рабоце па пераадольванню трагічных вынікаў, як гэта асабліва моцна адчувалася і цяпер адчуваецца на Беларусі, з'явіліся яркім сведчаннем няздольнасці таталітарнай сістэмы паспяхова вырашаць тыя праблемы, якія ўзнікаюць у выніку надзвычайных абставін. Чарнобыльская катастрофа дапоўніла той спектр прычын, што прывялі ў пачатку 90-х гадоў да прынцыповых палітычных змен у жыцці народаў Савецкага Саюза.

Распад сацыялістычнай сістэмы, спыненне дзейнасці КПСС і існавання СССР, стварэнне на яго месцы незалежных і суверэнных дзяржаў з'явіліся

[1] Звязда. 1996. 27 крас.

важнейшымі глабальнымі палітычнымі падзеямі пачатку 90-х гадоў. Гэта мела не толькі еўрапейскае, але і сусветнае значэнне.

У такіх складаных палітычных абставінах узнікла новая дзяржава — Рэспубліка Беларусь. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. 25 жніўня 1991 г. Дэкларацыі быў нададзены статус канстытуцыйнага закону. Грамадска-палітычныя ўмовы ў аб'яўленай суверэннай краіне — Рэспубліцы Беларусь развіваліся ў напрамку пашырэння дэмакратыі і аднаўлення шматпартыйнасці. Ужо ў сярэдзіне 1993 г. у рэспубліцы прайшлі рэгістрацыю 12 партый і 7 грамадска-палітычных рухаў. Адбывалася вызваленне сродкаў масавай інфармацыі ад ідэалагічнага ўціску. Развіццё падзей у рэспубліцы прывяло да прыняцця 15 сакавіка 1994 г. Вярхоўным Саветам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, увядзення інстытута прэзідэнства. 10 ліпеня 1994 г. першым прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны А. Г. Лукашэнка.

Кардынальныя змены ў грамадска-палітычным жыцці непасрэдна перапляталіся з сацыяльна-эканамічным развіццём, якое ўсё больш і больш ускладнялася. Асабліва абвастрылася сацыяльна-эканамічнае становішча ў Рэспубліцы Беларусь у сярэдзіне 90-х гадоў. Нерытмічная і няпоўная праца прадпрыемстваў ускладнялася яшчэ і тым, што іх прадукцыя не знаходзіла попыту і залежвалася на складах. На канец 1995 г. яе колькасць ацэньвалася ў 7 трлн руб. Гэта — амярцвелыя абаротныя сродкі. З-за адміністрацыйнага ўсталявання валютнага курсу, разбурэння міжбанкаўскага валютнага рынку і абмежаванняў у дзейнасці валютнай біржы рэспубліка губляла рынкі збыту. У выніку рэзка знізіўся экспарт, які па сутнасці стаў стратным. У краіне засталіся вельмі абмежаваныя валютныя рэзервы. Гэтыя негатыўныя з'явы — вынік таго, што рыначныя адносіны развіваліся вельмі слаба. Пераважала адміністрацыйнае кіраванне эканомікай, што заўсёды з'яўлялася характэрнай рысай праўлення ў СССР. Яго моцныя праяўленні ў гэты час — неад'емная частка сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на напружаную працу работнікаў сельскай гаспадаркі, яе стан быў складаным. На па-

чатак жніўня 1995 г. толькі 67 калгасаў і саўгасаў Рэспублікі Беларусь мелі абаротныя сродкі і больш-менш выходзілі са становішча. Гэта толькі 3% ад агульнай колькасці калектыўных і савецкіх гаспадарак. Астатнія спадзяваліся толькі на дзяржаўную дапамогу. К гэтаму часу аб'ём вытворчасці ў калгасна-саўгаснай сістэме ў параўнанні з 1986 г. скараціўся на 35 %. У сярэдзіне 90-х гадоў сельскагаспадарчай прадукцыі па Беларусі выраблялася столькі, колькі ў пачатку 70-х гадоў[1].

Вялікія маштабы ў сельскагаспадарчай галіне працягвалі мець крадзяжы маёмасці. Гэта заўсёды было характэрна для савецкай дзяржаўнай і кааператыўна-калгаснай форм уласнасці. Трэба прызнаць, што таталітарная сістэма пастаянна змагалася з гэтай заганнай з'явай, але пераадолець яе так і не змагла. Дастаткова адзначыць, што ў час правядзення супрацоўнікамі органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь сумесна са спецыялістамі Мінсельгасхарчу і Мінфіна краіны аперацыі "Аграрнік", якая працягвалася з сакавіка па снежань 1994 г., з правераных 2769 гаспадарак былі прадухілены страты сельгаспрадукцыі ў тагачасных цэнах на 326,6 млн руб. Калгасам вярнулі звыш 50 т гаруча-змазачных матэрыялаў, 280 т зерня, шмат іншай прадукцыі. За крадзяжы да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 2429 чалавек. Сярод іх 117 кіраўнікоў розных узроўняў[2].

У сувязі з крызісам эканомікі працягвалі пагаршацца сацыяльныя ўмовы жыцця насельніцтва. Яны зусім несуцяшальныя ў параўнанні з іншымі краінамі. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць "Індэкс чалавечага развіцця" — інтэгральны паказчык цывілізаванасці розных дзяржаў, які ўтрымлівае звесткі аб сярэдняй працягласці жыцця, рэальных даходах на душу насельніцтва, пакупной здольнасцю народа, яго пісьменнасці і інш. У завершанай у Рэспубліцы Беларусь першай нацыянальнай справаздачы па развіццю грамадства, якая выканана для Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Рэспубліка Беларусь аказалася па выніках 1993 г. на 40-м месцы.

Адным з вынікаў зніжэння жыццёвага ўзроўню жыхароў Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца сведчанні аб тым, што памірае людзей больш, чым нараджаецца. У прыватнасці, у Віцебскай вобласці за першыя дзе-

---

[1] Звязда. 1995. 3 снеж.

[2] Звязда. 1994. 17 снеж.

вяць месяцаў 1993 г. смяротнасць сярод жыхароў перавысіла нараджальнасць на 4041 чалавека. У выніку ў сярэдзіне лістапада таго ж года ў вобласці пражывала толькі 1 млн 451 тыс. чалавек. Для параўнання трэба зазначыць, што ў 1939 г. на тэрыторыі, якую цяпер займае вобласць, жыло 1 млн 702,5 тыс. чалавек[1]. Такім чынам, пад канец XX ст. прыкметна знізілася заселенасць тэрыторыі вобласці.

Прычынамі зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва з'яўляецца ў першую чаргу непрафесійнае, часта спантаннае правядзенне рэформаў ці, наадварот, іх адсутнасць. Аднак сярод гэтых прычын ёсць і тыя, што заўсёды спадарожнічалі таталітарнай сістэме кіравання грамадствам у Савецкім Саюзе. На адным з першых месцаў тут знаходзіцца надзвычай высокая ступень мілітарызацыі эканомікі і як вынік — каласальная колькасць узбраенняў, што былі размешчаны не толькі на абшарах былога СССР, але і ў многіх краінах свету. Вядома, што на адным з пасяджэнняў палітбюро сакратар ЦК КПСС Я. Лігачоў заўважыў: "Калі мы і далей так будзем весці палітыку нарошчвання ўзбраенняў, разорым краіну канчаткова"[2].

Канцэнтрацыя ўзбраенняў заўсёды была вельмі высокай на Беларусі. У першую чаргу гэта тлумачыцца выгадным геаграфічным становішчам. У 1991 г. на яе тэрыторыі было размешчана каля 3,5 тыс. танкаў, амаль 4 тыс. баявых машын пяхоты, вялікая колькасць іншай тэхнікі. Асабовы склад Савецкай Арміі тут дасягаў 200 тыс. чалавек. У выніку Беларусь з вялікім адрывам ад суседніх і іншых краін займала першае месца ў разліку на пэўную колькасць жыхароў па самалётах, танках, іншай тэхніцы[3].

Буйным ваенна-палітычным пралікам кіраўнікоў СССР стала ўвядзенне кантынгенту Узброеных Сіл у Афганістан. Рашэнне, прынятае вузкім колам асоб з вышэйшага партыйнага і дзяржаўнага эшалона ўлады, уцягнула дзяржаву ў жорсткую, бессэнсоўную, шматгадовую вайну, якая дорага абышлася савецкім людзям, у тым ліку жыхарам Беларусі. Каля 30 тыс. яе прадстаўнікоў, самаадданна выконваючы інтэрнацыянальны абавязак, прынялі ўдзел у гэтай вайне, з іх 771 аддаў жыццё, больш за 800 засталіся пакале-

---

[1] Звязда. 1993. 24 лістап.

[2] Советская Белоруссия. 1996. 12 июня.

[3] Звязда. 1994. 25 мая.

чанымі. Да сённяшняга дня тыя падзеі пякучым болем аддаюцца ў сэрцах жыхароў Беларусі, як і іншых грамадзян былога СССР.

Утрыманне вялізных Узброеных Сіл не толькі клалася непамерным цяжарам на эканоміку краіны, але заўсёды было небяспечна з-за розных надзвычайных здарэнняў. Нягледзячы на пастаянную ўвагу да гэтага ваеннага камандавання і адпаведных партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў, яны перыядычна мелі месца. Адно з найбольш небяспечных з іх адбылося 3 — 6 кастрычніка 1986 г. з савецкай атамнай падводнай лодкай "К-219", што несла баявое патруляванне каля берагоў Злучаных Штатаў Амерыкі. Яна мела на борце 16 ракет, кожная з якіх была аснашчана дзвюма боегалоўкамі з тратылавым эквівалентам у 32 мегатоны, што нацэльваліся на амерыканскія гарады. Робячы рэзкае манеўраванне, каб адарвацца ад амерыканскай супрацьлодачнай субмарыны, яна сутыкнулася з ёю і атрымала пашкоджанні. На савецкай падлодцы пачаўся пажар, узнікла пагроза некіруемай ядзернай рэакцыі. Экіпаж, які меў ахвяры, тры дні бяспеку, аднак яму давялося эвакуіравацца. Лодка затанула[1].

Гэта трагедыя, якая магла мець непрадказальныя вынікі, да таго ж адбылася ў час сустрэчы ў сталіцы Ісландыі — Рэйк'явіку кіраўнікоў СССР і ЗША М. Гарбачова і Р. Рэйгана. У выніку праведзеных перамоў на ёй было аб'яўлена аб заканчэнні "халоднай вайны". Даволі характэрнае супадзенне сустрэчы з інцыдэнтам у моры. Яно сімвалізуе ўвесь пасляваенны час, калі вялікія краіны, а з імі і ўсё чалавецтва не раз знаходзіліся на мяжы атамнай катастрофы, хаця ўвесь час імкнуліся пазбегнуць яе.

Разам са складанымі працэсамі ў эканоміцы, сацыяльнай сферы, грамадска-палітычным жыцці на хвалі дэмакратычных пераўтварэнняў у канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў нямала было зроблена па важнейшай для беларускага народа праблеме — нацыянальным адраджэнні. Пачыналася яно з супрацьдзеяння вышэйшага партыйнага кіраўніцтва Беларускай ССР, аднак з прыпыненнем дзейнасці КПБ гэты працэс пайшоў лягчэй. На ніве развіцця беларускай нацыянальнай культуры, пашырэння ўжытку бела-

[1] Советская Белоруссия. 1997. 6 февр.

рускай мовы пачалася новая хваля нацыянальнага адраджэння. Яна была звязана з важнымі крокамі, у першую чаргу па выкарыстанню роднай мовы. У чэрвені 1989 г. узнікла Таварыства беларускай мовы, якому надалі імя Ф. Скарыны. 26 студзеня 1990 г. чатырнаццатая сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі прыняла Закон “Аб мовах у Беларускай ССР”. Згодна з ім беларускай мове быў нададзены статус дзяржаўнай. Разам з тым забяспечвалася права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін. На аснове дадзенага закону ў верасні 1990 г. Савет Міністраў рэспублікі зацвердзіў Дзяржаўную праграму развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у БССР.

У пачатку 90-х гадоў выкананне Закону аб мовах ішло даволі актыўна. Гэта ў першую чаргу адбывалася ў сістэме адукацыі. У 1993/94 навучальным годзе 80 % першакласнікаў вучыліся ў Рэспубліцы Беларусь на роднай мове. Пры гэтым сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы працавалі пераважна на рускай мове. Пастурова становішча са станам адукацыі на мове карэннага насельніцтва ўскладнялася.

Аднак культурная сфера апынулася ў пачатку 90-х гадоў у складаным становішчы. Перш за ўсё значна скарацілася яе фінансаванне, што прывяло да цяжкасцей у развіцці фактычна ўсіх напрамкаў культурнага жыцця.

Гэта ж адносіцца і да навуковых даследаванняў. Яны ў савецкія часы, трэба прызнаць, нядрэнна фінансаваліся. У дадзеным выпадку неабходна аддаць належнае кіраўнікам таталітарнай сістэмы ў СССР, якія разумелі ролю навукі ў жыцці краіны. Аднак у час радыкальных пераўтварэнняў новае кіраўніцтва (ва ўсякім разе ў Рэспубліцы Беларусь) не надавала належнай увагі гэтай праблеме. Калі ў 1985 г. на навукова-тэхнічныя работы з рэспубліканскага бюджэту выдзялялася 3,8 % валавога прадукта, то ў 1994 г. — толькі 0,8 %[1].

Адзначаныя вышэй факты сведчаць, што таталітарныя метады кіравання грамадствам надзвычай жывучыя, нягледзячы на ўзніклыя ў апошнія гады магчымасці пераходу да дэмакратыі. Аднак дэмакратычныя механізмы яшчэ слабыя, а выхаванае ва

[1] Советская Белоруссия. 1996. 16 июля.

ўмовах таталітарнай сістэмы грамадства, асабліва яго старэйшая частка, многія кіраўнікі розных узроўняў не ўяўляюць сабе іншых падыходаў акрамя адміністрацыйна-камандных. Гэта робіць працэс пераадолення таталітарнай практыкі складаным, супярэчлівым і адносна працяглым.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Тое, што характар улады ў СССР уяўляў сабою менавіта таталітарную сістэму, цяпер лічаць усё больш і больш даследчыкаў. Прыйсці да гэтай высновы няпроста. На працягу дзесяцігоддзяў навукоўцам (і яны ў сваю чаргу таксама) імкнуліся паказаць, што савецкая форма праўлення — самая дэмакратычная ў свеце, што яна — вяршыня прагрэсу, да якой павінна імкнуцца чалавецтва. Гэта, магчыма, найбольш значны міф у гістарыяграфіі і ва ўсёй грамадска-гуманітарнай навуцы. Характэрна, што ствараўся гэты міф нягледзячы на такі відавочны факт, як аднапартыйнасць, адсутнасць апазіцыі, што ніяк не сумяшчаецца з дэмакратыяй. А калі ўзяць пад увагу татальнае, жорсткае, строга планавае кіраванне эканомікай, сацыяльнай сферай, грамадскім і культурным жыццём, імкненне да татальнага падпарадкавання думак і дзеянняў людзей пад адну, афіцыйную ідэалагічную лінію і многія іншыя напрамкі уніфікацыі дзейнасці грамадства, то сумненні адступаюць. Так, бальшавіцкая ўлада ўяўляла сабою таталітарную сістэму кіравання грамадствам. Такія асновы былі закладзены ў першыя дні, тыдні, месяцы яе існавання. На працягу дзесяцігоддзяў сістэма прайшла пэўную эвалюцыю, таталітарных прыкмет у ёй станавілася больш ці менш, аднак у аснове яна захоўвалася. Нават у пачатку 90-х гадоў, калі ўжо перасталі існаваць сацыялістычны лагер, Варшаўскі дагавор, была прыпынена дзейнасць КПСС — КПБ, распалася магутная дзяржава — Савецкі Саюз, праявы таталітарызму, у прыватнасці на Беларусі, адчуваліся даволі моцна, нягледзячы на тое што яна была аб'яўлена суверэннай дзяржавай і станавілася на шлях дэмакратыі і рыначных рэформаў.

Наогул таталітарная сістэма ў СССР прайшла два асноўных этапы. Першы з іх звязаны з яе ўзыходжаннем і ўмацаваннем з канца 1917 г. і да пачатку 1953 г. У гэты час адбылося яе фарміраванне і развіццё, яна дасягнула пры жыцці Сталіна свайго эпагею. Гэты этап пачаўся з усталяваннем савецкай улады, калі бальшавіцкая партыя настойліва імкнулася да ад-

наасобнага праўлення і вяла непрымірымую барацьбу з меншавікамі, эсэрамі, іншымі палітычнымі партыямі і грамадскімі рухамі. Менавіта ў першыя гады існавання новай улады былі закладзены многія асновы таталітарызму: дзяржаўная ўласнасць на асноўныя сродкі вытворчасці ў прамысловасці і на транспарце, выкарыстанне надзвычайных форм праўлення і інш.

У гады новай эканамічнай палітыкі адбылося некаторае замаруджванне ў фарміраванні бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. Перш за ўсё гэта звязана са шматукладным развіццём эканомікі. Аднак у палітычнай сферы таталітарныя працэсы нарасталі. Асноўная частка партыі, што групавалася вакол генеральнага сакратара, вяла жорсткую барацьбу з прадстаўнікамі розных плыняў унутры сваіх радоў, па чарзе нанесла ім паражэнне, дабілася пераадолення іх поглядаў і фактычнага выключэння апазіцыі з грамадска-палітычнага жыцця.

З усталяваннем кантролю дзяржавы за сельскай гаспадаркай у выніку правядзення масавай калектывізацыі, калі ад сялян быў адняты іх асноўны набытак з часоў Кастрычніцкай рэвалюцыі — зямля, было завершана стварэнне эканамічнай асновы бальшавіцкай таталітарнай сістэмы. У 30-я гады не толькі закончылася яе фарміраванне, але яна атрымала сваё далейшае развіццё і ўкараненне ў розныя сферы дзейнасці грамадства. Спецыфічныя і экстрэмальныя ўмовы Вялікай Айчыннай вайны садзейнічалі ўзмацненню таталітарнага праўлення. Яго кансерватыўны характар выразна праявіўся ў пасляваенны час.

Другі этап у гісторыі таталітарнай сістэмы ў СССР, у тым ліку на Беларусі, пачаўся з 1953 г., калі адразу пасля адыходу з палітычнай арэны яе асноўнага натхняльніка і сімвала — Сталіна пачаліся спробы пераадолення найбольш відавочных і заганных бакоў яго праўлення. Аднак гэты адыход быў вельмі павольным, непаслядоўным і нярэдка супярэчлівым, з рухам наперад і вяртаннем назад. Бальшавіцкія асновы таталітарнай сістэмы пастаянна праяўляліся літаральна ва ўсіх сферах жыцця: эканамічнай, сацыяльнай, грамадска-палітычнай, культурнай, ідэалагічнай, ваеннай і інш. Фактычна таталітарнае

праўленне засталося, але толькі без найбольш адыёзных яго бакоў, у першую чаргу шырокамаштабных неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій.

Першая спроба пераадолення самых заганных праяў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы была зроблена ў час палітычнай "адлігі" другой паловы 50-х — першай паловы 60-х гадоў, другая — найбольш значная — пачалася з сярэдзіны 80-х гадоў. Яна прывяла да глыбокіх змен не толькі ў шэрагу дзяржаў Еўразіі, дзе на працягу дзесяцігоддзяў будавалася сацыялістычнае і камуністычнае грамадства, — у СССР і краінах народнай дэмакратыі, але і ў сусветным маштабе. Змяніліся ваенна-палітычныя суадносіны сіл, якія раней супрацьстаялі адна адной, іншымі сталі многія арыенціры.

Зразумела, што ў сувязі з гэтымі працэсамі паўстала пытанне пераасэнсавання нашага недалёкага мінулага. Частка гісторыкаў, у тым ліку ў Рэспубліцы Беларусь, па-ранейшаму разумее сутнасць савецкай улады толькі як выключна станоўчую з'яву пры некаторых недахопах, ні ў якім разе не прызнае яе таталітарнага характару. Другая частка акцэнтуе ўвагу на шматлікіх негатыўных баках бальшавіцкага праўлення, што асабліва сталі вядомы ў апошні час. Аўтар дадзенай кнігі зыходзіць з таго, што неабходна адлюстроўваць і першае і другое. Толькі ў такім спалучэнні можна дасягнуць аб'ектыўнага і поўнага адлюстравання гістарычнага працэсу.

Да таго ж Беларусь у першыя гады савецкай улады і ў пачатку 90-х гадоў XX ст. уяўляла сабою і ўяўляе цяпер прынцыпова іншы ўзровень сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. Гэтага нельга не бачыць.

Бальшавіцкая таталітарная сістэма напорыста імкнулася аднавіць дашчэнту разбураную першай сусветнай і грамадзянскай войнамі краіну, што было зроблена на аснове НЭПа ў даволі кароткі тэрмін. На падставе сваёй канцэптуальнай устаноўкі на пабудову сацыялізму кіраўнікам партыйна-савецкай улады ўдалося зрабіць прарыў у індустрыяльным і культурным развіцці. Значна горш ішлі справы ў сельскай гаспадарцы.

Таталітарная сістэма мабілізавала савецкі народ на гераічную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і дабілася цяжкай Перамогі, узняла народ на аднаўленне і далейшае развіццё гаспадаркі. У пасляваенныя дзесяцігоддзі на аснове тых жа канцэптуальных

падыходаў, дзякуючы самаадданай працы народа ўдалося дасягнуць значных поспехаў у гаспадарцы, сацыяльнай сферы, культуры і навуцы. Гэта было характэрна як для ўсяго Савецкага Саюза, так і для Беларусі.

З іншага боку, гісторык не мае права не сказаць аб тым, якім неймаверным коштам, якімі метадамі і сродкамі гэта дасягалася, у тым ліку аб тым, што раней старанна замоўчвалася, — катаржнай працы мільёнаў зняволеных, рэпрэсіраванні найбольш гаспадарлівай часткі сялянства, многіх вядомых прадстаўнікоў творчай і навуковай інтэлігенцыі, кіраўнікоў розных узроўняў і радавых членаў бальшавіцкай партыі, вялікай часткі каманднага саставу Чырвонай Арміі, многіх рабочых і калгаснікаў, моцнага ўціску на рэлігію, усё грамадства і інш. Толькі ў такім спалучэнні дадатнага і адмоўнага вопыту можна максімальна наблізіцца да гістарычнай праўды.

Аднак ёсць асаблівасць, на якую нельга не звярнуць увагу. Станоўчыя зрухі ў жыцці грамадства надзвычай шырока адлюстраваны ў савецкай, у тым ліку беларускай гістарычнай і гісторыка-партыйнай літаратуры, у той час як адмоўны вопыт давялося даследаваць з дапамогай новых дакументальных матэрыялаў і публікацый. Гэты вопыт яшчэ недастаткова вядомы чытачу, таму ён прадстаўлены ў дадзенай кнізе больш шырока. У далейшым суадносіны дадатных і адмоўных бакоў жыцця могуць вызначацца ў залежнасці ад характару кожнага канкрэтнага даследавання. Аднак неабходна імкнуцца, каб гэтыя суадносіны былі такімі, як склаліся ў жыцці.

З кнігі вынікае: таталітарная форма дзяржаўнай улады ўрэшце рэшт павінна саступіць месца агульнай плыні развіцця сусветнага супольніцтва — пашырэнню і ўмацаванню дэмакратычных тэндэнцый, усталяванню шматпартыйнасці, плюралізму думак, агульначалавечым каштоўнасцям, шматукладнай эканоміцы, рыначным адносінам пры адпаведнай ролі дзяржавы ў іх развіцці, іншым важнейшым фактарам сучаснай эвалюцыі грамадства.

Паказальны ў гэтых адносінах лёс сімвала таталітарнай сістэмы ў СССР — газеты "Правда", якая рыхтавала ўзнікненне дадзенай формы праўлення яшчэ значна раней, да кастрычніка 1917 г. і надзвычай шмат зрабіла для яе развіцця і ўмацавання, з'яўляючыся асноўным друкаваным органам

кампартыі і савецкай дзяржавы. У свае лепшыя часы газета мела наклад у 13 млн і з'яўлялася самым шматтыражным выданнем у свеце. У выніку радыкальных пераўтварэнняў канца 80-х — пачатку 90-х гадоў газета нават трапіла ў рукі замежных камерсантаў, яе наклад знізіўся да 200 тыс. і яна апынулася на мяжы закрыцця. Разам з ёю паступова адыходзіць таталітарная эпоха на абшарах былога Савецкага Саюза са сваім стваральным пафасам, гераізмам, жорсткасцю, рэпрэсіямі, ганеннямі свабоды, уніфікацыяй жыцця грамадства і іншымі неад'емнымі атрыбутамі. Аднак для некалькіх пакаленняў савецкіх людзей гэта іх жыццё, іх лёс, іх мінулае, іншага яны не ведаюць і шмат хто з іх ведаць не хоча. У гэтым і заключаецца асноўная складанасць пераадолення цяжкай спадчыны таталітарнай сістэмы.

Дадзеная кніга, як спадзяецца аўтар, дапаможа і людзям ва ўзросце і асабліва маладому пакаленню глыбей разабрацца ў айчыннай гісторыі, уявіць яе больш аб'ёмна, усебакова, чым гэта можна было зрабіць раней. Раскрыццё праблемы таталітарызму ў СССР ( у дадзеным выпадку ў значнай ступені на матэрыялах Беларусі) набліжае наша разуменне свайго мінулага да ацэнак, якія існуюць у суседзяў — гісторыкаў Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі, у еўрапейскай і сусветнай гістарыяграфіі.

Манаграфічнае даследаванне, як уяўляецца, — найлепшы сродак самавыражэння аўтара. У ім ёсць магчымасць больш-менш поўна адлюстраваць розныя бакі тэмы на аснове ўласнага тэарытычнага асэнсавання, раскрыць свае падыходы, сваё творчае крэда. Дадзеная манаграфія — вынік напружанай працы і сучаснага разумення аўтарам гістарычнага працэсу. Аўтар спадзяецца, што аб'ектыўнаму і поўнаму падыходу да любой гістарычнай тэмы, дзе будуць адлюстраваны розныя бакі жыцця, належыць будучае ў беларускай гістарычнай навуцы.

# ЗМЕСТ

УСТУП ... 3
**РАЗДЗЕЛ 1.** ТАТАЛІТАРЫЗМ — З'ЯВА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ ... 12
1. Сутнасць таталітарызму ... 12
2. Прычыны і этапы ўсталявання бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ... 24
3. Беларусь — звяно таталітарызму ў СССР ... 37
**РАЗДЗЕЛ 2.** ВЫКАРЫСТАННЕ ТАТАЛІТАРНЫХ МЕТАДАЎ КІРАВАННЯ НА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ ... 49
1. У час грамадзянскай вайны і барацьбы з інтэрвентамі ... 49
2. Поспехі ў ажыццяўленні НЭПа і стаўка на таталітарызм – асноўная супярэчнасць 20-х гадоў ... 59
**РАЗДЗЕЛ 3.** УКАРАНЕННЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ ТАТАЛІТАРНАЙ СІСТЭМЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР У ЧАС БУДАЎНІЦТВА НОВАГА ГРАМАДСТВА ... 79
1. Камандныя метады ў эканоміцы: дасягненні і пралікі ... 79
2. Адміністраванне ў сацыяльнай сферы ... 98
3. Дыктат у грамадска-палітычным жыцці ... 115
4. Культурнае будаўніцтва: поспехі, наступленне на нацыянальныя адметнасці ... 132
5. Ажыццяўленне рэпрэсіўнай палітыкі ... 155
**РАЗДЗЕЛ 4.** УЗДЗЕЯННЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ ТАТАЛІТАРНАЙ СІСТЭМЫ НА ЗАХОДНЮЮ БЕЛАРУСЬ ... 180
1. Уплыў на сацыяльны і нацыянальна-вызваленчы рух ... 180
2. Стваральная дзейнасць і рэпрэсіўныя акты сярод насельніцтва Заходняй Беларусі пасля ўз'яднання з БССР ... 195
**РАЗДЗЕЛ 5.** У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ПАСЛЯ ЯЕ ... 213
1. Гераічная барацьба з ворагам і таталітарныя метады кіраўніцтва ... 213
2.Бальшавіцкая таталітарная сістэма і аднаўленне гаспадаркі ў рэспубліцы: цяжкасці і дасягненні ... 228
3. Працяг уціску ў грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным жыцці ... 244
**РАЗДЗЕЛ 6.** СПРОБЫ ПЕРААДОЛЕННЯ ТАТАЛІТАРЫЗМУ І ІХ НЕПАСЛЯДОЎНЫ ХАРАКТАР ... 264
1. Крытыка некаторых асноў бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ў час першай палітычнай «адлігі». Рух грамадства наперад ... 264
2. Поспехі ў сацыяльна-эканамічным развіцці і праявы таталітарызму ў "застойны перыяд" ... 277
3. Крызіс сацыяльна-эканамічнай сферы і рэцыдывы таталітарнага праўлення ў час радыкальных пераўтварэнняў ... 289
ЗАКЛЮЧЭННЕ ... 302

Навуковае выданне

**Касцюк** Міхаіл Паўлавіч

Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі

Рэдактар *Л.М. Салаўёва*
Тэхнічны рэдактар *В.П. Безбародава*
Камп'ютэрная вёрстка *Т.В. Дуганава*

Падпісана ў друк 10. 02. 2000. Фармат 84x108 1/32.
Папера газетная. Гарнітура Кудрашоўская.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 16,17. Ул.-выд. 18,5 арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 5022.

Выдавецкае прадпрыемства «Экаперспектыва».
Ліцэнзія ЛВ № 65 ад 05. 11. 1997 г.
220072, г. Мінск-70, пр. Партызанскі, 14.

Надрукавана ў друкарні «Перамога».
222310, г. Маладзечна, вул. Таўлая, 11.

ISBN 985-6102-30-8
9789856102304

БАЛЬШАВІЦКАЯ СІСТЭМА ЎЛАДЫ НА БЕЛАРУСІ